БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

3

БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛА АКДЭМІІ НАВУК
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

У 6 ТАМАХ

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ
1994

ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛА АКДЭМІІ НАВУК
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ

БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

ТОМ 3

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ ПРАФЕСАРА А. В. МАЛЬДЗІСА

ІВАШЫН—КУЧАР

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ
1994

ББК 91.9:83.3Бел
Б 43
УДК 0160000000

ГАЛОЎНАЯ РЭДАКЦЫЯ
"БЕЛАРУСКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ":

Б.І. САЧАНКА (галоўны рэдактар),
Я.В. МАЛАШЭВІЧ,
С.П. САМУЭЛЬ, І.П. ХАЎРАТОВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

І.Э. БАГДАНОВІЧ, А.Л. ВЕРАБЕЙ, П.К. ДЗЮБАЙЛА, В.А. КАВАЛЕНКА,
А.В. МАЛЬДЗІС, У.І. МАРХЕЛЬ, І.Я. НАВУМЕНКА, Л.С. САВІК,
В.С. СЕМЕНЯКОЎ, В.У. СКАЛАБАН.

This edition is a table reference book for all those who have an interest and concern in the Byelorussian culture. The book comprises more than 1100 articles containing full, manysided and systematized information on the Byelorussian literature representatives who created their works in Old Slavonic, Byelorussian, Russian, Latin, Polish and other literary languages of Belarus. The bibliographic references represent more than 600 thousand various publications.

0160000000–12
Б ——————— 30–94
М318(03)–94

ISBN 5–85700-123-4 (т.3)
ISBN 5–85700-060-2

© Выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя"
імя Петруся Броўкі, 1994

ІВАШЫН ВАСІЛЬ

Івашын Васіль Уладзіміравіч [н. 26.4(9.5).1913, в. Ляхавічы Мінскага пав. Мінскай губ., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл.], літаратуразнавец, педагог. Член СП Беларусі з 1954. Акадэмік АПН СССР (1967). Доктар філалагічных навук (1965), прафесар (1973).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. У 1933 скончыў Мінскі транспартна-эканамічны тэхнікум, год працаваў тэхнікам эканамістам Белкааппрамсавета. З 1934 студэнт літаратурнага факультэта Мінскага педінстытута. Пасля яго заканчэння (1938) выкладчык мовы і літаратуры ў Віцебскім педвучылішчы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1946—48 выкладчык Рэспубліканскай партыйнай школы пры ЦК КП/б/Б. У 1949 скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры АН БССР. Пасля аспірантуры старшы навуковы супрацоўнік (1949—54), загадчык сектара беларускай савецкай літаратуры (1954—67) гэтага інстытута. У 1967—78 дырэктар Навукова-даследчага інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР. Член Прэзідыума АПН (1970—79). Член калегіі Міністэрства асветы БССР (1969—79). З 1979 вядучы навуковы супрацоўнік-кансультант Інстытута адукацыі. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

З літаратурна-крытычнымі артыкуламі В.Івашын выступае ў друку з 1949. Асноўныя яго навуковыя працы прысвечаны пытанням тэорыі і гісторыі беларускай літаратуры, праблемам развіцця крытычнага і сацыялістычнага рэалізму, беларуска-рускіх, беларуска-ўкраінскіх літаратурных узаемасувязей, метадалогіі і методыкі выкладання літаратуры ў школе. Адзін з галоўных кірункаў яго даследаванняў — купалаўская спадчына. У манаграфіі «Янка Купала: Творчасць перыяду рэвалюцыі 1905—1907 гг.» упершыню грунтоўна прааналізаваны асаблівасці эстэтычных поглядаў, творчага метаду і стылю маладога паэта. Кніга адыграла значную ролю ў раскрыцці рэвалюцыйнага зместу ранняй паэзіі Я.Купалы, у вызваленні купалазнаўства ад вульгарызатарскай метадалогіі. У 1956 выйшла манаграфія В. Івашына «М. Горкі і беларуская літаратура пачатку XX стагоддзя», у якой на новым архіўным матэрыяле раскрываецца значэнне горкаўскіх традыцый у ідэйна-эстэтычным развіцці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча і інш. Манаграфія «Ля вытокаў сацыялістычнага рэалізму» (1963; доктарская дысертацыя) асвятляла шляхі развіцця рэалізму беларускай літаратуры пачатку 20 ст., яго нацыянальна-гістарычныя і эстэтычныя асаблівасці, суадносіны з рамантызмам і новым творчым метадам. Манаграфія «Да вышынь рэалізму» развівала на новай, больш шырокай аснове галоўныя ідэі папярэдняй кнігі. У ёй абгрунтавана канцэпцыя паскоранага развіцця беларускай літаратуры, асэнсаваны яе творчыя, метадалагічныя, ідэйна-эстэтычныя прынцыпы ў святле вядучых тэндэнцый перадкастрычніцкага і паслякастрычніцкага літаратурнага працэсу. Кніга «Выверанае жыццём» звернута да праблемы творчай індывідуальнасці пісьменніка. В. Івашыну належыць шэраг брашур, дакладаў на міжнародных з'ездах славістаў, даследаванняў, выкананых у сааўтарстве, створаных у сааўтарстве падручнікаў па беларускай літаратуры для 8-га класа. Пад яго рэдакцыяй выйшлі многія літаратуразнаўчыя і метадычныя працы. Ён адзін з навуковых рэдактараў двухтомнай «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры». У сталыя гады пачаў пісаць лірычныя вершы (ЛіМ. 1992. 8 мая).

Жыве ў Мінску.

Л.С. Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Янка Купала — вялікі народны паэт. Мн., 1952.

Янка Купала: Творчасць перыяду рэвалюцыі 1905—1907 гг. Мн., 1953. Рэц.: Бурносаў В. Кніга аб творчасці Янкі Купалы // Полымя. 1954. № 7; Карабан С. Кніга аб ранняй творчасці Янкі Купалы // Звязда. 1953. 26 снеж.; Палітыка Д. Каштоўнае даследаванне // ЛіМ. 1954. 20 сак.; Папп-

коўскі К. Новае даследаванне творчасці Янкі Купалы // Наст. газ. 1954. 5 жн.

Рэвалюцыя 1905—1907 гг. і развіццё беларускай літаратуры. Мн., 1955.

М. Горький и белорусская литература начала XX века. Мн., 1956. Рэц.: Александровіч Р. Факты і іх вытлумачэнне // ЛіМ. 1956. 10 ліст.; Александрович С. Книги о горьковских традициях // Сов. Отчизна. 1956. № 6; Бугаёў Д. Патрэбнае даследаванне // Звязда. 1957. 6 студз.; Бурносов В. Великое содружество // Сов. Бел. 1956. 15 дек.; В русле горьковских традиций // Дружба народов. 1957. № 3; Рудакоўскі В. Вялікая садружнасць // Полымя. 1956. № 2.

Асноўныя асаблівасці развіцця сучаснай беларускай літаратуры. Мн., 1958. [IV Міжнародны з'езд славістаў. Даклады] / Сааўт. Н.Перкін.

Беларуская літаратура: Падручнік для 8 кл. сярэд. школы. Мн., 1959 / Сааўт. В.Барысенка. Рэц.: Александровіч С. Новыя падручнікі па беларускай літаратуры // Полымя. 1959. № 10; Каваленка В. Якасці, якіх раней не было // ЛіМ. 1959. 7 кастр.; Пятровіч М. Два падручнікі // Нар. асвета. 1960. № 3; 2 выд. Мн., 1960; 3 выд. Мн., 1961; 4 выд. Мн., 1963; 5 выд. Мн., 1964; 6 выд. Мн., 1965; 7 выд. Мн., 1966; 8 выд. Мн., 1967; 9 выд. Мн., 1968; 10 выд. Мн., 1969; 11 выд. Мн., 1970; 12 выд. Мн., 1971; 13 выд. 1972; 14 выд. Мн., 1973; 15 выд. Мн., 1974; 16 выд. Мн., 1975; 17 выд. Мн., 1976; 18 выд. Мн., 1977; 19 выд. Мн., 1978.

Роля рускай класічнай літаратуры ў развіцці рэалізму беларускай літаратуры пачатку XX ст. Мн., 1963. [V Міжнар. з'езд славістаў. Даклады] / Сааўт. В.Барысенка. Рэц.: Мальдзіс А. У сям'і славянскіх літаратур // Полымя. 1963. № 9.

У истоков социалистического реализма. Мн., 1963. Рэц.: Казека Я. Ля вытокаў сацыялістычнага рэалізму // Полымя. 1963. № 12; Лазарук М. Глыбока, пераканаўча // ЛіМ. 1963. 13 вер.; Перкин Н. Об исторических путях белорусской литературы // Неман. 1963. № 6.

Беларуская літаратура: Падручнік для 8-га кл. сярэд. школы. Мн., 1979 / Сааўт. М.Лазарук. Рэц.: Гніламёдаў У. З веданнем справы // ЛіМ. 1980. 25 студз.; Шаўлоўская М., Мішчанчук М. Глыбока, доказна, зацікаўлена // Наст. газ. 1980. 27 лют.; 2 выд. Мн., 1980; 3 выд. Мн., 1981; 4 выд. Мн., 1982; 5 выд. Мн., 1984; 6 выд. Мн., 1986; 7 выд. Мн., 1988; 8 выд. Мн., 1990.

Да вышынь рэалізму: Асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускай дакастрычніцкай і савецкай літаратуры. Мн., 1983. Рэц.: Жураўлёў В. Эстэтыка рэалізму // Звязда. 1984. 20 ліст.; Коваленко В. На пути творческих обобщений // Вопр. лит. 1983. № 2; Рагуля А. Пазіцыя даследчыка // Полымя. 1984. № 2

Выверанае жыццём: Творчая індывідуальнасць пісьменніка — народнасць і партыйнасць літаратуры. Мн., 1988.

Изучение русской литературы во взаимосвязи с белорусской. Мн., 1988 / Сааўт. М. Лазарук, Е. Ленсу.

Беларуская літаратура: Падручнік для 9-га кл. сярэд. школы. Мн., 1992 / Сааўт. М.Лазарук.

1.3.

1949. Янка Лучына // Беларуская літаратура: Падручнік для 8-га класа сярэдняй школы. Мн.: Ачысціць літаратуразнаўства ад касмапалітаў // Звязда. 8 крас.

1950. Першае літаратурнае выступленне Янкі Купалы // Беларусь. № 5; Янка Купала і газета «Северо-Западный край» // Полымя. № 5; Народны паэт // Сав. селянін. 27 чэрв.

1951. Літаратурна-эстэтычныя погляды маладога Янкі Купалы // Полымя. № 6; Максім Горкі і беларуская літаратура // Звязда. 17 чэрв.; Вялікі пясняр беларускага народа // Там жа. 27 чэрв.; Паэт-дэмакрат // Там жа. 6 ліп.; Раннія рукапісы Якуба Коласа // ЛіМ. 29 вер. / Сааўт. А. Семяновіч; Новыя раннія рукапісы Якуба Коласа // Там жа. 6 кастр / Сааўт. А. Семяновіч; Таленавітая беларуская паэтэса // Мін. праўда. 15 ліп.; Дапамога школам // Наст. газ. 19 крас.

1952. Янка Купала // Купала Я. Выбр. тв. Мн.; Янка Купала и газета «Северо-Западный край» // Янка Купала: Зборнік матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці народнага паэта БССР Янкі Купалы. Мн.; Пясняр дружбы народаў // Беларусь. № 6; Заснавальнік беларускай прозы // Там жа. № 11; Гродзен. праўда. 15 ліст.; Янка Купала и русская литература // Изв. АН БССР. № 4; Вялікі народны паэт // Віцеб. рабочы. 6 ліп.; Гомел. праўда. 6 ліп.; Гродзен. праўда. 6 ліп.; Палес. праўда. 6 ліп.; Выдатны майстар беларускай прозы // За Радзіму. 14 ліст.; Вялікі мастак слова: (Да 70-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы) // Бальш. Пал. 6 ліп.; Звязда. 6 ліп.; Жыватворчая дружба // ЛіМ. 5 ліп.; Нястомны барацьбіт за шчасце народа // Мін. праўда. 15 ліст.; Палес. праўда. 18 ліст.; Сав. Радзіма. 14 ліст.; Чырв. звязда. 14 ліст.; Поэт, ученый, общественный деятель // Сов. Киргизия. 5 нояб.; Сов. Латвия. 4 нояб.; Народный поэт Белоруссии // Сов. Литва. 6 июля; Паэт, вучоны, грамадскі дзеяч // Сталін. шлях. 31 кастр.

1953. Слаўныя традыцыі // ЛіМ. 28 сак.

1954. Введение; Янка Купала // Очерк истории белорусской советской литературы. М.; Людас Гіра пра Янку Купалу // Беларусь. № 9; Максім Багдановіч аб украінскай літаратуры // Полымя. № 4; Неўміручая паэзія: Да выхаду ў свет Збору твораў Янкі Купалы // Звязда. 28 ліст.; Новае аб зборніку Цёткі «Скрыпка беларуская»: З архіўных матэрыялаў // ЛіМ. 7 жн.

1955. Прадмова // Бібліяграфія твораў Янкі Купалы: 1905—1917. Мн. Ч. I; Янка Купала і руская літаратура // Янка Купала. Мн.; Невядомыя пераклады твораў Янкі Купалы // Беларусь. № 5; Важная падзея ў культурным жыцці рэспублікі: (Да выхаду ў свет Збору твораў Янкі Купалы ў 6-ці тамах) // Камуніст Бел. № 11; Янка Купала в оценке дооктябрьской критики // Сов. Отчизна. № 3; Уплыў першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гг. на развіццё беларускай літаратуры: [З даклада] // Гомел. праўда. 29 ліст.; Паэзія барацьбы // ЛіМ. 28 мая.

1956. Кандрат Крапіва // Крапіва К. Зб. тв.: У 3 т. Мн. Т. 1; Літаратура пачатку XX ст.: [Уступ]; Янка Купала; Асноўныя этапы развіцця беларускай савецкай літаратуры: [Уступ] // Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры. Мн.; Настаўнік, друг, натхніцель // ЛіМ. 16 чэрв.; Народны паэт // Там жа. 15 вер.

1957. Прадмова // Бібліяграфія твораў Янкі Купалы: 1917—1942. Мн. Ч. 2; Вялікі мастак слова // Блакнот агітатара. № 17; Народны пясняр // Камуніст Бел. № 6; Певец белорусского народа // Славяне. № 7; За творчую распрацоўку тэарэтычных праблем сацыялістычнага рэалізму // ЛіМ. 30 сак.; Літаратурная спадчына і пытанні рэалізму: [Рэц. на кн.: Барысенка В. Францішак Багушэвіч і праблема рэалізму ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Мн., 1957] // Там жа. 13 крас.; Паэзія вялікай праўды // Там жа. 6 ліп.

1958. Асноўныя асаблівасці нашай літаратуры // ЛіМ. 10 вер. / Сааўт. Н.Перкін.

1959. Аб некаторых асаблівасцях рэалізму Янкі Купалы дакастрычніцкага перыяду // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 2; Янка Купала // Янка Купала: Жыццё і творчасць: Альбом. Мн.; Фальклорна-літаратурныя сувязі: [Рэц. на кн.: Ахрыменка П. Фальклорна-літаратурныя сувязі ўкраінскага і беларускага народаў. Мн., 1959] // Полымя. № 12.

1960. Асноўныя асаблівасці развіцця сучаснай беларускай літаратуры // Беларуская літаратура. Мн. Вып. 3 / Сааўт. Н. Перкін.

1961. Аб вытоках і станаўленні сацыялістычнага рэалізму ў беларускай літаратуры // Полымя. № 2; Неўміручыя традыцыі // ЛіМ. 16 чэрв.

1962. Наш Янка Купала // Беларусь. № 7; Сонца ўзяўшы агністае ў рукі... // ЛіМ. 6 ліп.; Плыні адной ракі // Там жа. 11 ліст.; Паэзія Янкі Купалы // Ніва. 10 чэрв.; В его стихах — душа народа: (К 80-летию со дня рождения Я. Купалы) // Правда Укр. 7 июля.

1963. Пафас крытыка і навуковасць крытыкі // ЛіМ. 8 сак.

1964. Высокі прыклад // ЛіМ. 10 сак.; Паводле законаў жанру // Там жа. 29 вер.

1966. Літаратурна-крытычныя працы Кандрата Крапівы // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 1 / Сааўт. В. Барысенка.

1967. Выдающийся художник слова // Коммунист Бел. № 7.

1968. Горкаўскія традыцыі ў беларускай літаратуры // Максім Горкі і Беларусь. Мн.; Заснавальнік літаратуры сацыялістычнага рэалізму // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 1; Сцяганосец сацыялістычнай літаратуры // Нар. асвета. № 3; Народжаная Кастрычнікам // ЛіМ. 31 мая; Педагагічная навука — школе // Наст. газ. 24 сак.: [Выступленне] // Там жа. 3 крас.; Великий наставник // Сов. Бел. 28 марта.

1969. Принцип коммунистической партийности литературы // Коммунист Бел. № 11.

1970. У.І. Ленін і праблема творчай індывідуальнасці пісьменніка // У.І. Ленін і літаратура. Мн.; Творчая індывідуальнасць пісьменніка // Полымя. № 3; Дапаможам школе ў вырашэнні яе ключавых праблем // Нар. асвета. № 8; На новыя рубяжы // Наст. газ. 22 жн.

1971. Ленинская теория познания и проблема личности в обучении // Воспитание учащихся на примере жизни и деятельности В.И.Ленина. Мн.; Ленінскі прынцып партыйнасці мастацтва — метадалагічная аснова выкладання літаратуры // Нар. асвета. № 9; Анамалія ці заканамерны працэс? // Полымя. № 11; Прызванне // ЛіМ. 5 сак.; Педагагічныя чытанні — 72 // Наст. газ. 10 ліп.

1972. Садружнасць навукі і практыкі // Нар. асвета. № 6; Веліч народнага песняра // Там жа. № 7; Сацыялістычны рэалізм і садружнасць савецкіх літаратур // Полымя. № 12; Чалавеку, чалавецтву // ЛіМ. 7 ліп.

1973. Дзейсная духоўная сіла // Беларусь. № 3; Літаратура і школа // Полымя. № 4; Працяг традыцыі: [Рэц. на кн.: Лойка А. Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя. Мн., 1972] // Там жа. № 11.

1974. Педагогическую науку — в практику школы // Коммунист Бел. № 12; З пазіцый гістарызму: [Рэц. на кн.: Казека Я. Няходжанай дарогай. Мн., 1973] // Полымя. № 5; У агульную скарбніцу: (Метад сацыялістычнага рэалізму і нацыянальная літаратура) // Там жа. № 10; Скарбонка педагагічнай думкі // Наст. газ. 7 вер.

1975. Павышэнне выхаваўчай ролі літаратуры // Пытанні выкладання літаратуры ў школе. Мн.; Ленинский принцип партийности литературы // Коммунист Бел. № 11; Партыйнасць літаратуры і свабода творчасці // Полымя. № 11; Паэзія — праўда жыцця // ЛіМ. 27 чэрв.

1976. На пульсе часу // Наст. газ. 21 люг.

1977. Пясняр народнага жыцця // Нар. асвета. № 6; Літаратура, народжаная Кастрычнікам // Полымя. № 11.

1978. Выдатнае дасягненне шаўчэнказнаўства // ЛіМ. 13 студз.

1979. На пути к совершенству // Лит. в школе. № 2; Павышаць грамадска-выхаваўчую і эстэтычную накіраванасць літаратурнай адукацыі // Нар. асвета. № 10; Адкрываць у жыцці новае, камуністычнае // ЛіМ. 30 ліст.

1980. Метадалагічныя прынцыпы выкладання літаратуры // Вывучэнне літаратуры: Пытанні методыкі. Мн.; Идейно-воспитательная роль литературы // Коммунист Бел. № 1; Жыватворная сіла ленінскай эстэтыкі // Полымя. № 4.

1982. З пазіцый выхаваўчага навучання // Адзінства навучання і выхавання на ўроках літаратуры. Мн.; Уладар беларускай песні // Янка Купала і Якуб Колас: Некаторыя аспекты творчасці. Мн.; Гордасць і слава беларускага народа // Нар. асвета. № 7; І рамантык, і рэаліст // Полымя. № 6; Пісьменнік-рэаліст, мастак // Там жа. № 10.

1983. Сучаснае «прачытанне» класікі // Нар. асвета. № 5; Еднасць з жыццём народа // Полымя. № 5.

1984. Адзінства навучання і выхавання на ўроках літаратуры // Ідэйна-маральнае выхаванне на ўроках літаратуры. Мн.

1985. Маніфест рэвалюцыйнага мастацтва // Звязда. 26 ліст.

1.5.

На азербайджанскую мову. Іанка Купаланын поезијасы: (Анадан олмасынын 80 иллији) // Азербајчан. 1962. № 7.

На балгарскую мову. Янка Купала — любим народен поет: (75 години от рождението му) // Лит. фронт. 1957. 1 авг.; [Выступленне на 5 Міжнар. кангрэсе славістаў у Балгарыі] // Славянска филология: Литературознание. София, 1966. Т. 8.

На казахскую мову. Акын, галым, когам кайраткері: (Белоруссиянын халык акыны Якуб Коластын туганына 70 жыл) // Екпінді. 1952. 4 нояб.; Соц. Казакстан. 1952. 4 нояб.

На латышскую мову. Dzejnieks, zinatnieks un sabiedrisks darbinieks // Cina. 1952. 2.Nov.; Sarkanais Karogs. 1952. 2. Nov.; Baltkrevu dzejnieks Janka Kupala // Lit. un Maksla. 1962. 7. Jul.

На туркменскую мову. Шахыр, алым жемгыетчилик ишгари: (Я.Коласын доглан гунунин 70 йыллыгына) // Совет Туркменистаны. 1952. 2 нояб.; Янка Купаланын поэзиясы: (Шахырын 80 йыллыгына) // Эдебият ве сунгат. 1962. 8 июль.

На ўкраінскую мову. Народний поет Білорусі: (До 70-річчя з дня народження Я.Купалы) // Літ. в школі. 1952. № 4; Поет, учений, громадський діяч // Вільна Укр. 1952. 2 лист.; Закарп. правда. 1952. 4 лист.; Наддніпр. правда. 1952. 2 лист.; Півд. правда. 1952. 2 лист.; Прапор перемоги. 1952. 2 лист.; Придунайська правда. 1952. 2 лист.; Прикарп. правда. 1952. 2 лист.; Рад. Донеччина. 1952. 4 лист.; Рад. Житомир. 1952. 2 лист.; Рад. Поділля. 1952. 4 лист.; Рад. слово. 1952. 4 лист.; Соц. Харків. 1952. 4 лист.; Черв. Запоріжжя. 1952. 2 лист.; Черномор. комуна. 1952. 2 лист.; Творчість Шевченка в оцінці Богдановича // Збірник праць наукових шевченківських конференцій. К., 1955; Шевченко та шляхи розвитку білоруської поезії // Збірник праць наукових шевченківських конференцій. К., 1965.

На чувашскую мову. Поэт, учёный, общественалла деятель // Коммунизм ялаве. 1952. Ноябрен 4-меше.

1.6.

Бібліяграфія твораў Янкі Купалы: 1905—1917. Мн., 1955. Ч. І / Рэд.

Бібліяграфія твораў Янкі Купалы: 1917—1942. Мн., 1957. Ч. 2 / Рэд.

Беларуская літаратура: Даследаванні і публікацыі. Мн., 1958. Вып. І / Рэд. у сааўт.

Беларуская літаратура: Даследаванні і публікацыі. Мн., 1960. Вып. 3 / Рэд. у сааўт.

Купала Я. Зб. тв.: У 6 т. Мн., 1961. Т. 3 / Рэд.

Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: У 2 т. Т. 1. Мн., 1964. Т. 2. Мн., 1966 / Рэд. у сааўт.

Дзюбайла П., Жураўлёў В., Лупераў М. Праблемы сучаснай беларускай прозы. Мн., 1967 / Рэд.

Ралько І. Беларускі верш: Старонкі гісторыі і тэорыі. Мн., 1969 / Рэд.

Каваленка В. Голас чалавечнасці. Мн., 1970 / Рэд.

Тычына М. Кузьма Чорны: Эвалюцыя мастацкага мыслення. Мн., 1973 / Рэд.

Пытанні выкладання літаратуры ў школе: Зборнік артыкулаў. Мн., 1975 / Рэд.

Аналіз мастацкага твора ў школе: Зборнік навуковых прац. Мн., 1976 / Рэд.

Павышэнне эфектыўнасці выкладання літаратуры ў школе. Мн., 1978 / Рэд.

Вывучэнне літаратуры: Пытанні методыкі. Мн., 1980. (Б-ка настаўніка бел. мовы і літ.) / Рэд.

Ідэйна-маральнае выхаванне на ўроках літаратуры: Кніга для настаўніка. Мн., 1984 / Рэд.

2.3.

На беларускай мове. Александровіч С. Гады абуджэння // ЛіМ. 1955. 24 снеж.; Аляхновіч Р. Усё жыццё — любімай справе // Нар. асвета. 1983.

№ 5; Барсток М. Грунтоўна, цікава // ЛіМ. 1963. 17 снеж.; Бас І. Пераканаўча! // Там жа. 1964. 25 снеж.; Боган У. Ля самых вытокаў // Там жа. 1964. 22 снеж.; Варановіч С. Новыя кнігі пра творчасць Я. Купалы і Я. Коласа // Беларусь. 1954. № 2; Васілю Івашыну — 70: [Віншаванне] // ЛіМ. 1983. 6 мая; Віншаванне юбіляра! Да пяцідзесяцігоддзя з дня нараджэння // Беларусь. 1963. № 4; Віншуем! // ЛіМ. 1963. 26 крас.; Вышэй прафесійны ўзровень крытыкі! // Там жа. 1951. 10 лют.; Дзюбайла П. Сталасць // Там жа. 1973. 5 мая; Ермаловіч М. У святле неўміручых ідэй // Полымя. 1970. № 11; Зубкоўскі Б. Удзячнасць настаўніка // ЛіМ. 1963. 27 снеж.; Казбярук У. Багаты плён // Там жа. 1983. 6 мая; Кірпічэнкаў А., Якубовіч У. Час мудрай сталасці // Наст. газ. 1983. 7 мая; Кудраўцаў І. Пра аргументаванасць і шчырасць у крытыцы // ЛіМ. 1952. 15 сак.; Лазарук М. Ля вытокаў сацыялістычнага рэалізму // Лазарук М. Часу непадуладнае. Мн., 1981; Марчанка Л. Літаратар і вучоны // Беларусь. 1973. № 4; Мушынскі М. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства: 40-я — першая палавіна 60-х гадоў. Мн., 1985. С. 283—286; Нікановіч Б. На перадавых пазіцыях // Наст. газ. 1973. 25 крас.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Сергіевіч М. Настаўнік, салдат, акадэмік // Нар. асвета. 1973. № 5; Сідарэвіч А. Партыйнасць, народнасць, класавасць і сучасная беларуская літаратура // Там жа. 1985. 19 крас.; Шарахоўскі Я. Заўвагі аб крытыцы // ЛіМ. 1951. 21 крас.

Г.І.Рэут.

ІВЕРС АНАТОЛЬ

Іверс Анатоль [інш.псеўданімы Васіль Двоеў, Іван Іванавіч, А.Івэрс, Анатоль Івэрс; сапр. Міско Іван Дарафеевіч; н. 2 (15). 5. 1912, в. Чамяры Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Слонімскі р-н Гродзенскай вобл.], паэт. Член СП Беларусі з 1940.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Маці вяла гаспадарку, бацька часта працаваў на будаўніцтве дарог і мастоў. У 1915 сям'я эвакуіравалася пад Кіеў. Пасля вяртання на радзіму бацька некаторы час быў сакратаром валаснога Савета, за што потым за ім пастаянна сачылі польскія жандары. У 1935 трагічна загінула маці. Пад час Вялікай Айчыннай вайны фашысты замучылі ў лагеры смерці Калдычэва бацьку і жонку А. Іверса. Чытаць па-руску паэта навучыў бацька, потым некалькі месяцаў хлапчук вучыўся ў мясцовай беларускай школе, але яна была закрыта. Летам 1926 паступіў у Віленскую беларускую гімназію, у 1928 выключаны за актыўную падпольную дзейнасць. Працягваў вучыцца ў Клецкай і Навагрудскай гімназіях, але закончыць поўны курс навучання польскія ўлады так і не далі. Паліцыя некалькі разоў арыштоўвала паэта; яго дапытвалі і катавалі на пастарунку і ў дэфензіве, тры разы судзілі за ўдзел у дэманстрацыях і супраціўленне ўладам пры затрыманні. Невялікія тэрміны прыгавораў падпадалі пад амністыю. Псеўданім Анатоль Іверс следчыя так і не раскрылі.

З верасня 1939 па чэрвень 1941 А.Іверс літработнік слонімскай раённай газеты «Вольная праца». У час вайны паводле загада штаба партызанскага атрада быў накіраваны ў Слонім для стварэння антыфашысцкай арганізацыі. Знаходзячыся на нелегальным становішчы, працаваў у гарадской управе. У лістападзе 1943, калі пачаліся арышты, уступіў у партызанскую брыгаду імя Ракасоўскага. Быў абраны сакратаром Слонімскага міжраённага антыфашысцкага камітэта. Пазней прызначаны намеснікам камандзіра атрада імя Дзяржынскага па разведцы, адначасова адказваў за выпуск органа падпольнага райкома партыі «Вольная праца», выдаваў лістоўкі і газету «Барацьба». Пасля вайны працаваў адказным сакратаром раённай газеты, сакратаром Слонімскага гарвыканкома. У 1949—66 займаў пасады майстра смалакурнага завода і тэхнолага лесахімзавода. У 1966 вярнуўся ў рэдакцыю слонімскай газеты «За перамогу камунізму» (былая «Вольная праца»). З 1976 да 1984 — адказны сакратар раённага аддзялення Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. З мая 1972 на пенсіі.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі.

Вершы пачаў дасылаць у віленскія беларускія газеты і часопісы ў 1933. Першы верш «Вёска» апублікаваны ў часопісе «Літаратурная старонка» ў студзені 1934. Друкаваўся ў часопісах «Беларускі летапіс», «Калоссе», «Асва» і інш. У 1939 творы выйшлі асобным зборнікам «Песні на загонах» (Вільня). Характэрная іх рыса — лірычнасць, пераважаюць матывы свабадалюбства, патрыятычнай вернасці Радзіме. У вершах спалучаецца журботнае ўспрыняцце народнага гора і адчуванне красы беларускай прыроды, свету. У «Паэме пра камсамольца Валодзю Бялько» ўславіў подзвіг юнага падпольшчыка.

Жыве ў г. Слонім Гродзенскай вобл.

А.М.Ненадавец.

Бібліяграфія

1.2.

Песні на загонах: Вершы. Вільня, 1939. Рэц.: «Песні на загонах» // Шлях моладзі. 1939. № 15; Шарапаў А. «Песні на загонах» // ЛіМ. 1940. 3 лют.

З пройдзеных дарог: Вершы. Мн., 1970. Рэц.: Лойка А. Чалавек у дарозе // ЛіМ. 1971. 21 мая; Петкевич А. Из народных глубин // Гродн. правда. 1970. 8 дек.; Ягож. Голас роднай зямлі // Звязда. 1971. 13 крас.

Жыву ў бацькоўскім краі: Вершы і паэмы. Мн., 1982. Рэц.: Арочка М. Песня з бацькоўскага краю // Полымя. 1983. № 6; Бічэль-Загнетава Д. Учую сіл прыліў... // ЛіМ. 1983. 14 студз.

Я пайшоў бы ўслед за летам..: Вершы. Мн., 1987.

1.3.

1934. Там, дзе вёскі з пахілымі хатамі; За варштатам: [Вершы] // Асва. № 4; Вёска: [Верш] // Літ. старонка. № 1.

1936. Восень: [Верш] // Бел. летапіс. № 1; Летапіс ТБШ. № 4—8; Шлях моладзі. № 10; Касьба: [Верш] // Там жа. № 7—8; Мая песня: [Верш] // Наша воля. 12 крас.; «Сонца даль абвеяна туманом над ніваю...»: [Верш] // Там жа. 16 чэрв.

1937. Веснавыя думы: [Верш] // Бел. летапіс. № 5; У шуме жыта; З чужыны: [Вершы] // Там жа. № 6—7; Загарэліся іскрамі зорнымі: [Верш] // Там жа. № 8; Пасля ночы; Мо заззяюць апоўначы зоры: [Вершы] // Там жа. № 9; Восень; «Каб не злыя шугавеі..»: [Вершы] // Там жа. № 10—11; На далёкіх курганах: [Верш] // Калоссе. № 4; «Ужо нізка сонца коціцца...»: [Верш] // Шлях моладзі. № 1.

1938. Малюнкі:[Верш] // Бел. летапіс. № 1; Зорныя дарогі: [Верш] // Там жа № 2; Спатканне: [Верш] // Там жа. № 3; «Я шукаў яшчэ вясною..»; «Неяк раніцай гарачай..»: [Вершы] // Калоссе. № 1; Ці то песні?: [Верш] // Там жа. № 2; Да жніва; «Ізноў ліюцца песні...»; Над Шчарай: [Вершы] // Там жа. № 3; Залацілася раніца; На бруку: [Вершы] //Там жа. № 4; Касьба: [Верш] // Шлях моладзі. № 7—8 / Пад псеўд. А. Івэрс; З вёскі: [Верш] // Там жа. № 19.

1939. Вясняны парыў: [Верш] // Бел. летапіс. № 1; «Чым прыкавала ты, вёска, мяне...»; Збуджаны верш: [Верш] // Калоссе. № 1; «Часамі сумна быць паэтам...»; Сон; «Апошнім шляхам...»; Пад раніак; Вясёлай раніцай: [Вершы] // Там жа. № 2; З песняй; Хтось расчэсваў зялёныя сосны; Звоняць дні: [Вершы] // Там жа. № 3; Ці то песні?..: [Верш] // Шлях моладзі. № 14; Прывітанне пісьменнікам і паэтам Савецкай Беларусі / Сааўт. С.Хмара; Вітаем музыку волі: [Вершы] // ЛіМ. 3 кастр.; У сінеючыя паплавы...; У вольныя палі: [Вершы] // Там жа. 23 кастр.; Кастрычнік; Песні на загонах: [Вершы] // Чырв. змена. 18 ліст.

1940. Леніну: [Верш] // Звязда. 21 студз.; Вясенні парыў: [Верш] // ЛіМ. 3 жн.; Дарога: [Верш] // Сталін. молодежь. 20 авг.; Да юбілею вялікага польскага паэта // Чырв. звязда. 14 ліст. / Пад сваім прозв.

1946. Бібліятэка-чытальня імя Янкі Купалы // ЛіМ. 24 вер.

1947. З партызанскіх напеваў: [Верш] // Сав. селянін. 1 чэрв.

1949. Дарагое кожнаму імя: [Верш] // Полымя. № 12; Абеліскі; «Закаласуе новы дзень...»; «Ты пра сэрца казала...» [Вершы] // Звязда. 29 вер.; Слонім учора і сёння // Чырв. змена. 7 кастр. / Пад сваім прозв.

1950. Новы шлях: [Верш] // Беларусь. № 1; За Сталіна: [Верш] // Полымя. № 3.

1959. У імя праўды; Мая песня; З чужыны; Ліст у Нямеччыну; Наш горад; Валянціну Таўлаю: [Вершы] // За вярт. на Радзіму. № 32; Здабытае ў працы і барацьбе // Там жа. № 57; Валянціну Таўлаю: [Верш] // Полымя. № 4.

1962. Негр у Мінску: [Верш] // Калг. праўда. 21 сак.

1964. Партызанскія прасторы: [Верш] // Сел. газ. 5 июля.

1965. Вёска; За варштатам; На этапнай дарозе; Мая песня; З чужыны; Верасень; Аганёк; Пароль; Прыляцелі снегіры; Сасна; Жураўлі; Паэзія; Спарыш; Слонім — мой родны горад; На світанні; Гляджу на лес; Партызанскія прасторы; «Прыціхшая вёска...»; «Плыве сонца без вясла...»; «Па правадах...»; Лісткі календара: [Вершы]; Паэма пра камсамольца Валодзю Бялько // Сцягі і паходні. Мн.

1966. Тры сасны: [Верш] // Дзень паэзіі—66. Мн.; Лясная ідылія: [Верш] // Голас Радзімы. № 39; Бібліятэка з аўтографам // ЛіМ. 24 мая; «Вецер прайшоўся па соснах...»; «Ой, лясы сасновыя...»: [Вершы] // Сел. газ. 11 сент.; Там, где жил поэт // Там жа. 24 сент.

1967. Узнялося сонца над запрудай ...: [Верш] // Гродн. правда. 16 июля; Мой родны горад: [Верш] // Там жа. 20 сент.; Скульптура, кераміка, жывапіс // ЛіМ. 25 студз.

1968. Сустрэча з класікай // ЛіМ. 9 жн.

1972. Бібліятэцы — імя песняра // ЛіМ. 12 мая; Партрэт Леніна: [Верш] // Сел. газ. 21 мая.

1973. Родны край кліча // Вытокі песні. Мн.; Гальяш Леўчык у «Нашай ніве» // Беларусь. № 2.

1975. В прозрачной тишине: [Рэц. на кн.: Копанев Н. Грозовое безмолвие. Мн., 1975] // Гродн. правда. 15 февр. / Пад сваім прозв.

1976. Пасылка Валянціна Таўлая // ЛіМ. 20 лют.

1977. Зацесна Нарве ў берагах; У Плоцку: [Вершы] // ЛіМ. 29 ліп.; Ніва. 28 жн.; Як завітае ў госці «Ніва»; Успамінаю Беласток; Дзе тыя Пясчанікі?: [Вершы] // Ніва. 13 сак.

1978. Дарога; Скарына; Тое поле; Дабрадзея: [Вершы] // Полымя. № 3; «Па-над Слонімам стыне...»: [Верш] // ЛіМ. 18 жн.; У зімовым лесе: [Верш] // Ніва. 29 студз.; На братняй зямлі: [Верш] // Там жа. 19 лют.

1979. Абеліскі; Закаласуе новы дзень...; Ты пра сэрца казала...: [Вершы] // Звязда. 29 вер.; На лыжах: [Верш] // Ніва. 14 студз.

1980. Далёкі ўспамін // Леўчык Г. Доля і хлеб. Мн.; Пошта: [Ліст у рэдакцыю] // Ніва. 24 лют.

1981. Тэатр, які любяць // Беларусь. № 6; Ён адкрыў мне Беларусь: [Успаміны] // Полымя. № 11; Пачатак шляху; Успаміны: [Вершы] // Гродн. правда. 10 янв.

1982. Ён адкрыў мне Беларусь // Успаміны пра Янку Купалу. Мн.; Песні на загонах; «Не выпускаю аўтамат...»; Жыву ў бацькоўскім краі: [Вершы] //

Гродн. правда. 15 мая; Незабываемые встречи // Там жа. 7 июля; Не абышлося без агрэхаў: [Рэц. на кн.: Рылко М., Шпыркова И. Слоним. Мн., 1981] // Звязда. 24 сак. / Сааўт. А.Руцкая.

1983. Дарога да Звестуна // ЛіМ. 25 ліст.

1984. Пасылка Валянціна Таўлая // Валянцін Таўлай: Дакументы, успаміны, артыкулы. Мн.: Родная мова; Валянціну Таўлаю: [Вершы] // Гродн. правда. 1 сент.; Добры след паэта // ЛіМ. 10 лют.

1985. Яго вясна: [Верш] // Гродн. правда. 20 апр.; На родных загонах; Сустрэчы; Ты жывеш пад небам сінім: [Вершы] // ЛіМ. 24 мая.

1.5.

На рускую мову. Беласток: [Верш] // Сталин молодежь. 1939. 7 нояб.; Дорогое имя: [Верш] / Пер. В.Милованов // Сов. Бел. 1949. 21 дек.; Пароль; Портрет Ленина; Ходили мы походами...: [Вершы] / Пер. А.Чепуров // Партизанская слава. Л., 1985.

2.3.

На беларускай мове. Анатолю Іверсу — 60 гадоў // ЛіМ. 1972. 19 мая; Анатолю Іверсу — 70 // Там жа. 1982, 14 мая; Арочка М. Балючая памяць зямлі // Полымя. 1984. № 7; Беларускі маладняк пяе // Рэха (Парыж). 1938. № 2; Калеснік У. Лёсам пазнанае. Мн., 1982. С. 262—268; Лехерзак С. Малады паэт: (Творчы шлях А.Іверса) // Чырв. звязда. 1940. 16 кастр.; Лойка А. «Хачу не проста жыць...» // Іверс А. Жыву ў бацькоўскім краі. Мн., 1982; Яго ж. Чалавек у дарозе // Лойка А. Паэзія і час. Мн., 1981; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Сяброўскія радкі Анатолія Іверса // Ніва. 1977. 13 сак.; У гэтым месяцы... // Беларусь. 1972. № 5; Хмара С. Пяе беларускі маладняк // Шлях моладзі. 1938. № 20.

На рускай мове. Бичель-Загнетова Д. «Я ушел бы вслед за летом...»: (К 70-летию поэта А.Иверса) // Гродн. правда. 1982. 15 мая; Петкевич А. Дорога по родной земле: А.Иверсу — 60 лет // Там жа. 1972. 17 мая.

3.1.

ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, с. 145; ЦБ АН Літвы, аддз. рукап., ф. 21, адз. зах. 187.

Т.М. Махнач.

ІГНАЦІЙ СМАЛЬНЯНІН

Ігнацій Смальнянін [? — каля 1405 (паводле іншых звестак 1423), Афон], смаленскі дыякан, аўтар «Хаджэння» — падарожных нататак на старажытнарускай мове.

Пра месца і час нараджэння іх аўтара, а таксама яго дзіцячыя і юнацкія гады нічога невядома. У 1389 адправіўся разам з кіеўскім мітрапалітам Піменам у Царград (Канстанцінопаль), дзе застаўся і пасля заканчэння місіі да 1393. Пэўны час Ігнацій жыў у Іерусаліме, у 1396 пераехаў на Афон, дзе і памёр.

«Хаджэнне Ігнація Смальняніна» ("Піменава хаджэнне") з'яўляецца адзінай крыніцай звестак пра яго аўтара. Распачата ў 1389 па наказу смаленскага епіскапа Міхаіла, які выконваў наказ мітрапаліта Пімена. Твор гэты захаваўся ў 24 спісах 16—18 ст., якія належаць да дзвюх рэдакцый (кароткай і поўнай). Верагодна, што ў аснову першай з іх лёг падарожны дзённік Ігнація. Другая, летапісная, рэдакцыя з'яўляецца пазнейшай стылёвай перапрацоўкай з пэўнымі зменамі ідэалагічнага характару (напрыклад, у ёй апушчаны эпізод пра дзяржаўны пераварот 1393). «Хаджэнне» не з'яўляецца цэласным творам: яно складаецца з шэрагу апавяданняў, якія часам маюць свае падзагалоўкі. Некаторыя з апавяданняў, далучаныя да тэксту летапіснай рэдакцыі ("Аповесць пра Амурата", «Хаджэнне ў Іерусалім»), хутчэй за ўсё, не належаць пяру Ігнація, хаця і прыпісваюцца яму. Стыль «Хаджэння», асабліва яго першай рэдакцыі, вызначаецца лапідарнасцю мовы, эканомным ужываннем тропаў, адсутнасцю рытарычных упрыгожанняў. Ігнацій дакладна і падрабязна апісвае хрысціянскія святыні, выкарыстоўваючы звычайны для жанру хаджэнняў прасторава-часавы прынцып, апавядаючы пра гісторыю той ці іншай рэліквіі. Аўтар дэталёва расказвае пра палітычныя падзеі ў Візантыі (змаганне за трон паміж Калуянам і Мануілам Палеалогам, вянчанне на царства Мануіла II), згадвае або толькі намякае на палітычныя абставіны на Русі (сварка Пімена з маскоўскім вялікім князем Дзмітрыем Данскім). «Хаджэнне» Ігнація вылучаецца фактычнай дакладнасцю; у ім відаць спробы выкарыстання іншых крыніц, у тым ліку дакументальных ("Чын вянчання на царства"). Гэта робіць сачыненне смаленскага пілігрыма цікавай крыніцай звестак па царкоўнай і грамадзянскай гісторыі, духоўнай культуры старажытнай Русі.

А.А. Мельнікаў.

Бібліяграфія

1.3.

1887. Хождение Игнатия Смольнянина / Под ред. С. Арсеньева // Православный палестинский сборник. Спб. Вып. 12.

1897. Хождение Игнатия Смольнянина / Под ред. С.Арсеньева // Полное собрание русских летописей. Спб. Т. 11.

1965. Хождение Игнатия Смольянина / Под ред. С.Арсеньева // Полное собрание русских летописей. 2 изд. М. Т. 11.

1984. Хожение Игнатия Смольнянина в Царьград; Пименово хожение в Царьград // Книга хожений. Записки русских путешественников XI—XV вв. М. (Сокровища древнерус. литературы). 1.5.

На англійскую мову. «The Journery to Constantinople» of Ignatius of Smolensk // Russian Travels to Constantinople in the fourteenth and fifteenth Centuries by G.P. Majeska. Washington, 1984. 2.3.

На беларускай мове. Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1. С. 79—80.

На нямецкай мове. Seeman K. Die altrussische Wallfahrtsliteratur München, 1976. S. 236—242.

На рускай мове. Андрианова-Перетц В. Путешествия XIV—XV вв. // История русской литературы. М.; Л., 1945. Т. 2. Ч. 1. С. 227—228; Арсеньев С. Предпринятое исследование по поводу Хождения чернеца Игнатия Смолянина в Царьград и Иерусалим // Сборник импер. АН. 1880. № 3; Барсов Е. Древнерусские памятники священного венчания царей на царство в связи с греческими их оригиналами // Чтения в ОИДР. 1883. Кн. 1; Варлаам, архиманд. Описание сборника XV столетия Кирилло-Белозерского монастыря // Уч. Зап. II отд. имп. АН. 1859. Кн. 5; История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 51—52; Мисников Н. О приписываемом Игнатию Смольнянину описании Иерусалима // Чтения в ОИДР. 1901. Кн. 2; Попов А. Обзор хронографов русской редакции. Мн., 1869. Ч. 2. С. 50—51; Прокофьев Н. Игнатий Смольянин — древнерусский мастер литературного слова // Рус. речь. 1973. № 1; Яго ж. Русские хождения XII—XV вв. // Литература Древней Руси и XVIII в. М., 1970. С. 144—170; Яго ж. Хождение Игнатия Смольнянина // Литература Древней Руси: Сборник науч. статей. М., 1978. Вып. 2; Прохоров Г. Повесть о Митяе. Л., 1978. С. 183—185, 225—228; Сахаров И. Сказания русского народа. Спб., 1849. Т. 2. Кн. 8. С. 95—107; Татищев В. История Российская. М.; Л., 1965. Т. 5. С. 165—172.

Т.М. Махнач.

ІЛЬІНСКІ МІКОЛА

Ільінскі Мікола (Мікалай Канстанцінавіч; 21.3.1899, м. Мір Навагрудскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. — 1943, Мінск), драматург, празаік, акцёр.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў Навагрудскую гімназію, вучыўся ў Беларускай драматычнай студыі ў Маскве, БДУ, Маскоўскім тэхнікуме кінематаграфіі. Служыў у Чырвонай Арміі. Працаваў у Белдзяржтэатры і Інбелкульце, з'яўляўся намеснікам адказнага сакратара Беларускага таварыства драматычных пісьменнікаў і кампазітараў, загадваў літаратурнай часткай БДТ-II, быў кіраўніком справамі СП Беларусі. Уваходзіў у літаратурнае аб'яднанне «Маладняк». У 1937 выключаны з Саюза пісьменнікаў за неэтычныя паводзіны, спробу дыскрэдытацыі некаторых пісьменнікаў: у яго п'есах адмоўныя персанажы (шкоднікі, кулакі, падкулачнікі), нібы ўласныя, чыталі вершы В.Маракова, У.Хадыкі і інш., што ў той час успрымалася звычайным палітычным даносам. У пісьмах І.Сталіну і некаторым іншым крамлёўскім кіраўнікам, адстойваючы права на пастаноўку ўласных п'ес, дапускаў грубыя ідэалагічныя выпады супраць сваіх творчых працiўнікаў. У час Вялікай Айчыннай вайны заставаўся ў акупаваным Мінску, працаваў ва ўправе па справах мастацтва. У 1943 забіты ў СД.

Літаратурную працу М.Ільінскі пачаў у 1920, але першыя публікацыі не выяўлены. Пачатак драматургічнай творчасці адносіцца да 1926, калі трупай БДТ-I была пастаўлена яго драма «Лес цёмны», прысвечаная жыццю прыгранічнай вёскі. У далейшым п'есы М.Ільінскага ставіліся і БДТ—II ("На прадвесні", 1929), а таксама ў некаторых калгасна-саўгасных тэатрах Беларусі. Тэматыка яго ранніх п'ес грунтавалася на тагачаснай актуальнасці: ломка ўстояў дарэвалюцыйнага жыцця, калектывізацыя, нараджэнне новых традыцый і г.д. Паслядоўны прыхільнік палітычнага тэатра, Ільінскі разам з тым не быў абмежаваным у сваіх жанрава-тэматычных прыхільнасцях. Прынамсі, ад дэтэктыўнай меладрамы «Лес цёмны» ён нязмушана пераходзіў да лірычнай «Камедыі пачуццяў альбо Уласнасць» (нап. 1933), ад сацыяльнай драмы «Рунь вясновая» — да дыялагічнага апавядання ў вершах «Пра Кліма, Тараса, Свірыда ды Панаса» і, нарэшце, ад псіхалагічнай драмы «Айцец Мікалай альбо знойдзены шлях» (нап. 1933) — да сатырычнай камедыі «Апошні пехацінец». Пісаў таксама агітп'есы, скетчы, сцэнічныя эцюды і інш. Большасць п'ес напісана на «патрэбу дня» і не вызначаецца высокім мастацкім узроўнем.

Празаічная спадчына М.Ільінскага параўнаўча нешматлікая колькасна і небагатая ў жанравых адносінах. У нарысах «Вясна пераможная», «Міхаіл Рыгоравіч Захараў» і інш. апалагетычна паказваюцца дасягненні паслярэвалюцыйнай Беларусі. Ідэйна-тэматычную аснову яго апавяданняў склала асэнсаванне перажыткаў старой вёскі ("Слабада"), паказ будняў пагранічнікаў ("У летнюю ноч", «На дачы»), і працы калгаснікаў ("Залом", «Шчасце»). Аповесць «Чалавек у штоніках» у гіпербалічна-сатырычнай манеры высмейвае прыстасаванцаў, якія дзеля сваёй кар'еры здольны пайсці на данос і подласць, прыкрываючы сапраўдны свой твар дву

рушніцтвам і мімікрыяй. Значнае месца ў творчасці Ільінскага заняла перакладчыцкая дзейнасць: ім перакладзена больш за 20 п'ес рускай і украінскай драматургіі.

С.С.Лаўшук.

Бібліяграфія

1.2.

Лес цёмны: П'еса. Мн., 1930.

Любоў да «бліжняга»: Драматычны эцюд. Мн., 1930.

На суд грамадскі: Аратары за ліквідацыю прарываў: [П'еса]. Мн., 1930.

Рунь вясновая: Сацыяльная драма. Мн., 1930.

Як Мікіта і Панас працаваць ішлі ў калгас: Сцэнкі. Мн., 1930.

Кавалі жыцця: Агіт-п'еса. Мн., 1931.

Пустазелле: Драматычны эцюд. Мн., 1931.

На прадвесні: П'еса. Мн., 1932.

Месія: Драматычны эцюд. Мн., 1940. Рэц.: Есакоў А. «Месія» // ЛіМ. 1940. 21 вер.

1.3.

1931. "Пра Кліма, Тараса, Свірыда ды Панаса": (Дыялагічнае апавяданне ў вершах) // Другая бальшавіцкая. Мн.

1933. Пісьменнікі і крытыкі ў 1933 г. // ЛіМ. 28 студз.; Камедыя пачуццяў: [Урывак з п'есы] // Там жа. 9 ліп.

1934. Вясна пераможная: Нарыс // ЛіМ. 6 крас.

1935. Апошні пехацінец: Урывак з камедыі // ЛіМ. 31 жн.

1936. Пра мову перакладаў п'ес // ЛіМ. 18 ліп.; «Апошняя ахвяра» Астроўскага ў ЦТЧА // Там жа. 17 жн.; Водзыў на пастаноўку п'есы Транёва «Любоў Яравая» // Там жа. 14 вер.

1937. «Жыць»: Слова пра творчыя планы // ЛіМ. 23 крас.

1938. Слабада: Апавяданне // Полымя рэвалюцыі. № 3; Нашы старыя: Камедыя // Там жа. № 6; Тэлефон: Апавяданне // Там жа. № 12; У ССП БССР // ЛіМ. 27 ліст.

1939. Чалавек у штоніках: (Гісторыя адной кар'еры) // Полымя рэвалюцыі. № 5—6. Рэц.: Герцовіч Я. Замысел і вырашэнне // ЛіМ. 1939. 3 вер.

1940. Месія: Драматычны эцюд // Полымя рэвалюцыі. № 3; Міхаіл Рыгоравіч Захараў: (Біяграфічны нарыс) // Вольная праца. 12 сак.; «Што пасееш — то й пажнеш»: Урывак з камедыі // ЛіМ. 10 жн.; «Браты» // Правда. 25 марта.

1941. «Залом»; Паядынак: Апавяданні // Полымя. № 1; У летнюю ноч; На «дачы»: Апавяданні // Там жа. № 2; Шчасце: Апавяданне // ЛіМ. 7 чэрв.

1.4.

Бухаў А. Такія, якія ёсць: Эстрадны скетч / З рус. Мн., 1930.

Валжэнін Р. Рунь: П'еса / З рус. Мн., 1930.

Дальні С. Ваўкі: П'еса / З рус. Мн., 1930.

Касьянаў Д. Першае сакавіка: [П'еса] / З рус. Мн., 1930.

Курын Г. Сакрэт: Камедыя / З рус. Мн., 1930.

Пронін І. У поцемках / З рус. Мн., 1930.

Селіхава В. Фрыц Бадэр / З рус. Мн., 1930.

Сокалаў К. Панскае чэрава / З рус. Мн., 1930.

Трусаў С. Прызнанне Клуні: Рэвізор з вёскі Клуні: Камедыя / Вольны пер. з рус. Мн., 1930.

Трыгер М. Доктарскі сакрэт: Драматычны эцюд / З рус. Мн., 1930.

Глебаў А. Адаплата: П'еса / З рус. Мн., 1931.

Чыркоў А. Чорны гальштук: Драма / З рус. Мн., 1931.

Шлок Э. Крушэнне: Драма / З рус. Мн., 1931.

1934. Івін С. Базылькаў май: [П'еса]; Гэдзь Ю. Кавалі: [П'еска] / З укр. // Вясна пераможная. Мн. 2.3.

На беларускай мове. А. [Есакоў А.] Чытка п'есы М.Ільінскага // ЛіМ. 1937. 6 крас.; Звонак А. Аб адной п'есе // Чырв. змена. 1929. № 123; Яго ж. Чаму зрабіў памылку БДТ-2 // Віцеб. пралетарый. 1929. 24 ліст.; Ларчанка М. Супраць пошласці // Звязда. 1940. 4 кастр.; М.П. Новая п'еса Ул.Глазырына // ЛіМ. 1934. 24 кастр.; Розанаў С. «На прадвесні» // Віцеб. пралетарый. 1929. 1 ліп.

М.П.Барташэвіч.

ІЛЬЮШЧЫЦ КАСТУСЬ

Ільюшчыц
Канстанцін Мікалаевіч
(н. 2.1.1947,
м. Наваельня
Дзятлаўскага р-на
Гродзенскай вобл.),
паэт. Член СП Беларусі
з 1991.

Нарадзіўся ў сям'і служачага. Радзіма бацькоў — в. Рог каля Старобіна. У 1960 скончыў сямігадовую Рогаўскую школу, у 1963 сярэднюю школу ў в. Скаўшын. Пасля заканчэння Беларускага тэхналагічнага інстытута (1968) атрымаў спецыяльнасць інжынера-механіка. Служыў у Савецкай Арміі (1968—80). Закончыў Усурыйскае ваеннае аўтамабільнае камандиае вучылішча (1971). З 1980 да 1985 знаходзіўся ў Заходняй групе войск, у 1992 вярнуўся на радзіму. Узнагароджаны ордэнам «Знак пашаны», медалямі.

Друкавацца пачаў у раённай газеце «Шахцёр» (Салігорск). Але пачаткам творчасці, лічыць 1965, калі ў газеце «Літаратура і мастацтва» з'явілася першая падборка яго вершаў. Друкуецца ў рэспубліканскай перыёдыцы, зб. «Дзень паэзіі». Выдаў зборнікі вершаў «Армейскія будні» і «Таёжны гарнізон». Вершы К.Ільюшчыца перакладаліся на рускую мову, друкаваліся ў акруговых армейскіх газетах, часопісе «Советский воин». Шмат вершаў К.Ільюшчыца прысвечана роднай Беларусі, будням воінаў Савецкай арміі, службу якіх, псіхалогію, ваенны побыт паэт добра ведае. К.Ільюшчыц не абмяжоўваецца нацыянальнай тэматыкай: гады армейскай службы за межамі Беларусі пашырылі яго кругагляд, далі магчымасць для параўнанняў, дазволілі звяртацца да самых розных праблем сучаснага жыцця.

Л.С.Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Армейскія будні: Вершы. Мн., 1977 (Першая кніга паэта). Рэц.: Федзюковіч М. Пазначана сучаснасцю // Маладосць. 1978. № 4.

Таёжны гарнізон: Вершы. Мн., 1982. Рэц.: Чыгрын С. Пра святы і будні армейскія // ЛіМ. 1983. 13 мая.

1.3.

1965. У лесе: Пара сенакосу; Рабінавая ноч; Першы пералёт; Папары; Восень; Тапаліны пух: [Вершы] // ЛіМ. 23 ліст.

1966. «У цесным стане паднябессе...»: [Верш] // Дзень паэзіі — 66. Мн.; Палешукі; Лось; Найда: [Вершы] // ЛіМ. 16 жн.; Веснавое: [Верш] // Там жа. 30 крас.; Мае сябры; Дачка лесніка: [Вершы] // Чырв. змена. 11 мая.

1967. Кедравыя арэхі; «Вясковыя хлопцы чубатыя...»; Перад адлётам: [Вершы] // Маладосць. № 4; Хлебароб; «Астыла сонца за нядзелю...»; «Двурогі месяц выплыў высака...»: [Вершы] // Чырв. змена. 11 крас.

1968. 1917; «А вы былі ў лясах сасновых...»; Асенняе: [Вершы] // Маладосць. № 12; «Я працаваў паўгода паштальёнам...»: [Верш] // Вяч. Мінск. 18 крас.; «А вы былі ў лясах сасновых...»: [Верш] // Чырв. змена. 6 крас.

1969. А вы былі ў лясах сасновых... [Верш] // Беларускі каляндар на 1970 год. Беласток; Упішу сваё слова...: [Верш] // Чырв. змена. 22 мая.

1971. Паштальён; «У траве густой...»: [Вершы] // Дзень паэзіі — 71. Мн.

1972. Запасны раён: [Верш] // Дзень паэзіі — 72. Мн.

1973. 1917: [Верш] // Голас Радзімы. № 46; «Штурмуюць войскі палігон...»; «Тайгі каляровая хустка...»: [Вершы] // Маладосць. № 2; З армейскага сшытка: [Вершы] // Чырв. змена. 3 чэрв.

1976. «А мы ўсім жадаем шчасця...»; «Граніцы слухаю дыханне..»; Святло ў акне; «Палессе... Палессе... Палессе...»: [Вершы] // Маладосць. № 2.

1977. Палешукі; Жадаем шчасця; Хлебароб; Салдацкі хлеб; «Граніцы слухаю дыханне...»; Карань жыцця; Курылы: [Вершы] // Полымя. № 6; «Маладзік, як пілотка...»: [Верш] // ЛіМ. 10 чэрв.; «Не знайшоў бы я шчасця...»; «Мы пішам, што служыцца добра...»; Папаўненне: [Верш] // Чырв. змена. 26 кастр.

1978. Палешукі: [Верш] // Адданасць. Мн.; Маладзік, як пілотка; Таёжны гарнізон; Ручэй: [Вершы]

// Маладосць. № 2; «Служу. Цяпер на мне пагоны...»: [Верш] // ЛіМ. 7 крас.; «І чаму я не стаў лесніком...»; Лысая гара: [Вершы] // Чырв. змена. 28 лют.; Каханай: [Верш] // Там жа. 8 кастр.; Трывога: [Верш] // Там жа. 5 ліст.; Праводзіны лета; «Бусел спраўна да буслянкі...»; «А я закаханы ў Палессе...»: [Вершы] // Там жа. 12 ліст.

1980. Хлебароб; «Я вырас там...»: [Вершы] // Мін. праўда. 9 вер.; Крыніцы: [Верш] // Чырв. змена. 29 чэрв.

1982. Вучэнні: [Верш] // Чырв. змена. 18 вер.

1984. На заходніх рубяжах; Пад Берлінам; Сорак пяты; Палігон; Афіцэрскія зоркі: [Вершы] // ЛіМ. 24 лют.; Бацькі; Вяртанне; Афіцэрскія зоркі: [Вершы] // Мін: праўда. 30 кастр.; Дзе бацькі ваявалі...: [Верш] // Там жа. 28 снеж.

1985. Павесткі выдала Айчына; Бацькі; Суніцы; Апорны пункт: [Вершы] // ЛіМ. 22 лют.

1.5.

На грузінскую мову. Жадаем шчасця: [Верш] / Пер. В.Салпа // Сабчота Абхазеці. 1979. 1 сак.

На рускую мову. Жыву в предчувствии атаки: [Верш] / Пер. автор // Сов. воин. 1978. № 23; Я помню...: [Верш] / Пер. автор // Сов. Армия. 1982. 7 марта; Живу в предчувствии атаки; Рассвет: [Вершы] / Пер. автор // Там жа. 13 марта; «Штурмуют роты полигон...»: [Верш] / Пер. Н.Малашич // Подъем. 1985. № 7; Всегда готов: [Верш] / Пер. автор // Сов. Армия. 1985. 22 сент.

На украінскую мову. Поліщуки: [Верш] / Пер. В.Ганущак // Прикарпат. правда. 1982. 19 груд.

2.3.

На беларускай мове. Бураўкін Г. Кастусь Ільюшчыц // ЛіМ. 1965. 23 ліст.; Яфімаў Ф. Улада часу // Там жа. 1977. 22 ліп.

В.М.Грышкевіч.

ІЛЬЯШЭВІЧ ХВЕДАР

Ільяшэвіч Хведар (псеўд. М. Дальны, Святаслаў Залужны, Л. Іскра, Малады, крыпт. І — ч, Х. І.; 17.3.1910, Вільня — 7.11.1948, Ватэнштат, ФРГ; пахаваны ў г. Галенсдорф паблізу Брауншвейга), паэт, крытык, празаік, грамадска-культурны дзеяч.

З сям'і паштальёна. Скончыў Віленскую беларускую гімназію, гістарычны факультэт Віленскага універсітэта. За дысертацыю «Друкарня дома Мамонічаў у Вільні (1572—1622)» (на польскай мове) атрымаў званне магістра філасофіі (1936). У даваеннай Польшчы праследаваўся, быў засуджаны, сядзеў у турме. У час фашысцкай акупацыі супрацоўнічаў з гітлераўцамі, рэдагаваў беластоцкую газету «Новая дарога». З 1945 у ФРГ. Належаў да літаратурнага аб'яднання «Шыпшына», рэдагаваў часопіс «Шляхам жыцця», інфармацыйны лісток «Апошнія весткі» (Ватэнштат). Удзельнічаў у барацьбе розных эмігранцкіх груповак. Загінуў у аўтамабільнай катастрофе.

Дэбютаваў у друку абразкамі і вершамі ў 1925 («Студэнцкая думка», «Беларуская ніва», «Крыніца»). Аўтар зборнікаў вершаў «Веснапесні», «Зорным шляхам», «Захварбаваныя вершы». У паэтычных і празаічных творах паказваў супярэчнасці буржуазнага горада («Вочы места», «Валакуся ўтомлены, змораны...»), заклікаў да барацьбы за нацыянальнае вызваленне («Куйце волю, браты...», «Песні жыцця»). Значную частку яго паэзіі віленскага перыяду складае пейзажная і інтымная лірыка. Аддаў даніну ўпадніцкім настроям, эстэцтву. Напісаў літаратуразнаўчую працу пра Ядвігіна Ш., нямала крытычных артыкулаў і рэцэнзій. У эміграцыі друкаваўся ў часопісе «Шыпшына». Пасмяротна выйшлі яго «Апавяданні» (Ватэнштат, 1948. Пад пеэўд. Святаслаў Залужны), «Недапетая песня» (Без месца, 1982. Гектагр.; 2 выд. Ляймен, 1987). У эміграцкай творчасці Х.Ільяшэвіча пераважаюць матывы тугі, адчаю (вершы «Чорныя цені», «Сябрам»). Перакладаў з нямецкай мовы Г.Гейнэ. Рукапісы Х.Ільяшэвіча захоўваюцца ў Беларускім музеі г.Ляймена (Германія).

А.В.Мальдзіс.

1.2.

Веснапесні. Вільня, 1929. Рэц.: F r . H r . // Slovanský přehled. 1931. T. 23.

Зорным шляхам: Зборнік вершаў. Вільня, 1932.

Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі): Жыццё і літаратурная творчасць. Вільня, 1933.

Захварбаваныя вершы. Вільня, 1936. Рэц.: B — i ч . Я. // Калоссе. 1937. № 1; S . S . «Zachwarbawanyja wierszy» — nowy zbiorek poezyj Teodora Iljaszewicza // Środy Literackie. 1937. Nr 6.

Drukarnia domu Mamoniczów w Wilnie (1575—1622). Wilno, 1938.

1.3.

1925. Вясеннія матывы: [Абразок] // Студэнцкая думка. № 3 / Пад крыпт. Х.І.; «На прадмесцях...»: [Верш] // Бел. крыніца. 20 вер.; «У вакно маё ноч пазірае...»: [Верш] // Там жа. 11 кастр.; З цыкла «Зіма»: Тройка: [Верш] // Бел. ніва. 23 снеж.: Плач-жальба: [Верш] // Крыніца. 15 сак.; Толькі вер: [Верш] // Там жа. 3 мая; Вясна: [Верш] // Там жа. 18 мая; Без павароту: [Верш] // Там жа. 5 ліп.; Месячная ноч: [Верш] // Там жа. 9 жн.

1926. З лета: [Верш] // Бел. крыніца. 31 ліп.; Бура; Штрых: [Вершы] // Бел. ніва. 20 студз.; Вясна: [Верш] // Там жа. 6 сак.; Адцвітанне: [Верш] // Нар. справа. 16 кастр.; «Свечка васковая сумна гарыць...»; «Сінія ночы шэптам калоссім...»; «Вясна — адраджэнне! І родныя скібы...»: [Вершы] // Сіла працы. 11 лют.; Віхор: [Верш] // Сялян. ніва. 31 студз. / Пад крыпт. І-ч.

1927. «На турэмнай глебе смягнуць...»: [Верш] // Родныя гоні. № 6; Песня жаўранка: [Верш] // Наша праўда. 27 крас.; Сон.: [Верш] // Там жа. 31 мая; «Я гляджу на свет вачыма паэта...»; «Сіняе, сіняе неба...»; «Часамі ў душы маёй дзіўнай мелодыяй...»: [Вершы] // Там жа. 24 жн.; З-за кратаў: [Вершы] // Наша праца. 8 кастр.; «Дрэвы шапочуць у боскай драмоце...»; «Творчая, нябная сінь смяецца ў вясенніх калужах...»; «Веснавістая рань. Яшчэ росы блішчаць...»: [Вершы] // Права працы. 24 снеж.; «Над сінімі снягамі...»; «Цэлую зімачку буду чакаць...»: [Вершы] // Праца. 12 ліст.

Нарадзіўся ў праваслаўнай шляхецкай сям'і. Прозвішча Пацей паходзіць ад імя дзеда Пацея Тышкевіча, падляшскага ляснічага, родавым маёнткам якога было неіснуючае цяпер Каранёва ў Камянецкім пав. Брэсцкага ваяв. Бацькамі Іпація Пацея былі Леў Тышкевіч, у 1537—46 прыдворны каралевы Боны Сфорца, а пасля літоўскі пісар, і Ганна, дачка Андрэя Лозкі, намесніка брэсцкага кашталяна. Пасля смерці бацькі (1550) і другога шлюбу маці з смаленскім кашталянам Д.Пацам апекуном Іпація стаў князь М.Радзівіл Чорны. Знаходзячыся пры двары гэтага магната, Іпацій скончыў кальвінскую школу. Атрымаўшы практычную падрыхтоўку да палітычнай дзейнасці, праз пэўны час стаў сакратаром свайго апекуна. Выказваліся меркаванні, што вучыўся ў Кракаўскім універсітэце, аднак пацвярджэння гэтаму ў гістарычных крыніцах няма. Атрымаўшы ў спадчыну Ружанку, у 1561 ажаніўся з дачкой князя Ф.Галоўкі Астрожацкага Ганнай. Дзякуючы добрай адукацыі і ўплывовым апекунам Іпацій пачаў адыгрываць значную ролю ў Брэсцкім ваяв.: прадстаўляў яго на Люблінскім сейме 1569, дзе падпісаў акт уніі Вялікага княства Літоўскага з Польскім каралеўствам. На пачатку 1577 атрымаў пасаду брэсцкага суддзі. У 1578—79 прымаў удзел у баях з маскоўскімі войскамі пад Полацкам. Пасля смерці Стафана Баторыя ўваходзіў у склад каптуровага суда Брэсцкага ваяв. 2.12.1588 кароль Сігізмунд III Ваза прызначыў яго брэсцкім кашталянам. У 1573 ці 1574, відаць, пад уплывам жонкі Пацей вярнуўся ў праваслаўе. У час знаходжання ў Рэчы Паспалітай канстанцінопальскага патрыярха Ераміі (1588) выступіў з ініцыятывай пачаць перагаворы аб царкоўнай уніі. На працягу 1590—92 прымаў актыўны ўдзел у рабоце праваслаўных сінодаў, падтрымліваў дзейнасць царкоўных брацтваў (быў членам Львоўскага і заснавальнікам Брэсцкага). Пасля смерці жонкі (1592) пастрыгся ў манахі пад імем Іпацій, а пасля смерці ўладзімірска-брэсцкага епіскапа Мялецій Храптовіча пры падтрымцы князя Канстанціна (Васіля) Астрожскага на пачатку 1593 заняў вакантную кафедру. У сярэдзіне 90-х гадоў 16 ст. актывізавалася справа наконт уніі праваслаўнай царквы з каталіцкай, гарачым прыхільнікам якой быў Іпацій. У 1595 ён апублікаваў ананімна ў Вільні ў абарону аб'яднання дзвюх цэркваў свой першы публіцыстычны твор «Унія...», а ў канцы таго ж — пачатку 1596 у складзе спецыяльнай дэлегацыі ездзіў у Рым для канчатковага вырашэння з папскім тронам пытання пра унію. У 1596 быў адным з арганізатараў і чынным удзельнікам Брэсцкага царкоўнага сабора і падпісаў акт уніі. Прызначаны ў 1599 уніяцкім мітрапалітам, Іпацій энергічна стаў праводзіць у жыццё рашэнні Брэсцкага сабора, настойліва імкнуўся падпарадкаваць сваёму ўплыву праваслаўнае духавенства і веруючых, словам і справай змагаўся за пашырэнне і ўмацаванне уніі. У тым жа 1599 атрымаў пасаду архімандрыта Кіева-Пячорскай лаўры, ад якой быў вымушаны ў 1605 адмовіцца на карысць Елісея Плецянецкага. Тады ж атрымаў прывілей на валоданне Ляшчынскім манастыром ля Пінска. Праводзіў вялікую прапагандысцкую работу і ў свецкім асяроддзі, удзельнічаў у розных сеймах, сеймах, трыбуналах, дзе вёў зацятую барацьбу з праціўнікамі уніі.

Нецярпімасць і націск Іпація выклікалі незадавальненне не толькі сярод праваслаўнага духавенства, але і патрыятычна настроенай часткі праваслаўнай шляхты (асабліва на Валыні). Яна абвінавачвала Іпація ў парушэнні грамадскага спакою і законаў, у насіллі, выклікала яго на сеймавы суд і нават патрабавала адхілення ад пасады мітрапаліта. Шмат увагі аддаваў царкоўна-арганізацыйным справам, імкнуўся падпарадкаваць сваёй уладзе царкоўныя брацтвы, у т.л. Віленскае праваслаўнае брацтва св. Духа. Не жадаючы падпарадкоўвацца Іпацію, яно выступіла супраць яго і выклікала ў віленскі трыбунал, які сваім рашэннем вызваліў брацтва ад паслушэнства уніяцкаму мітрапаліту. Калі ж кароль скасаваў рашэнне трыбунала, брацтва выклікала Іпація на сеймавы суд (1606). На гэтым сейме пры падтрымцы канцлера Вялікага кня-

ства Літоўскага Льва Сапегі і каталіцкага біскупа Іпацій здолеў сарваць імкненні праваслаўных ліквідаваць царкоўную унію. Сейм 1607, нягледзячы на просьбы і пратэсты Іпація, фактычна прызнаў рэальнае існаванне праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай. Сваё незадавальненне дзеяннямі праваслаўнага брацтва св. Духа ён выказаў у вострапубліцыстычным творы на польскай мове «Уваскрэшаны Налівайка» (1607; аўтарства спрэчнае). На гэтым цяжба мітрапаліта з Віленскім брацтвам не скончылася. У 1609 Іпацій пачаў на яго новы наступ. У выніку справа дайшла да прамой сутычкі, у якой мітрапаліт быў паранены: засланяючыся ад шаблі рэлігійнага фанатыка, ён страціў два пальцы на левай руцэ. З гэтага часу яго грамадская актыўнасць прыкметна аслабла. Вядучую ролю ва уніяцкім лагеры стаў адыгрываць яго намеснік Іосіф Вельямін-Руцкі.

Іпацій жыў у гушчы напружанай царкоўна-рэлігійнай барацьбы канца 16 — пачатку 17 ст. Як адзін з галоўных лідэраў прауніяцкага лагера і заснавальнікаў уніяцкай царквы ў Беларусі і Украіне ён горача абараняў прынцыпы і пазіцыі, якія, з яго пункту гледжання, былі апраўданы ў надзвычай складаных культурна-гістарычных умовах грамадска-палітычнага развіцця краіны ў эпоху Контррэфармацыі. Быў неардынарнай асобай, смелым, рашучым, мэтанакіраваным чалавекам. Меў талент бойкага, дасціпнага пісьменніка-палеміста, які добра валодаў пяром, любіў ужыць рэзкае, часам грубаватае прастамоўнае слова. Пісаў па-беларуску і па-польску. Аўтар шэрагу палемічных твораў востарай крытычнай накіраванасці, напісаных на розныя надзённыя тэмы, у прыватнасці ў абарону Брэсцкага сабора і уніі, супраць «Апокрысіса» Х.Філалета ("Антырызіс") і Віленскага брацтва. Яго пяру належаць шматлікія лісты, прамовы-пропаведзі, граматы, павучанні і інш. Лічыцца аўтарам «Водпісу на ліст нейкага Клірыка Астрожскага» (1599). Іпацію прыпісваюцца творы «Размова берасцяніна з братчыкам» (1603), «Ерасі, невуцтва і палітыка паноў і мяшчан віленскага брацтва» (1608), якія не захаваліся. Мяркуюць таксама, што ён пераклаў з польскай мовы на беларускую шэраг твораў П.Скаргі, прысвечаных Брэсцкаму сабору 1596, якія ў 1597 былі выдадзены ў Вільні пад агульнай назвай «Описанье и оборона събору руского берестейского».

А.Ф.Коршунаў, В.А.Чамярыцкі.

Бібліяграфія

1.2.

Унія алъбо выклад преднейших арътыкулов ку зъодноченью греков с костелом рымским належащых. Вильно, 1595.

Unia, albo wykład przedniejszych artykułow ku zjednoczeniu greków z kościołem rzymskim należących. Wilno, 1595.

Synopsis, zawierający w sobie opisanie Synodu Brzeskiego. Б. м., [1596] / Аўт. спрэчнае.

Справедливое описанье поступку и справы... Вильно, 1597 / Аўт. спрэчнае.

Антирризис. Вильно, [каля 1599] / Аўт. спрэчнае.

Antirrisis, albo apologja przeciwko Krzystofowi Philaletowi. Wilno, 1600 / Аўт. спрэчнае.

Оборона собору флорентийского. Вильно, 1604 / Аўт. спрэчнае.

O przywilejach nadanych od królów polskich... które swiętą unie wielce zalecają i potwierdzają. Wilno, 1605.

Poselstwo do papieża rzymskiego Sixta III od duchowieństwa i od książąt i panów ruskich w r. 1476. Wilno, 1605.

Гаръмония алъбо согласие веры, сакраменътов и церемоней святое восточное церъкви с костелом рымъским. Вильно. 1608.

Relacya y uważenie postępków niektórych około Cerkwi ruskich wileńskich roku 1608 y 1609 Wilnu wszystkiemu wiadomych... Б.м., [1609?].

Prawa i prywileje od królów Polskich y wielkich xiążat Litewskich nadane obywatelom korony Polskiej y W.X.Lit. religiey greckiej, w jedności z kościołem rzymskim będącym. Wilno, 1632.

Kazania y homilije. Supraśl, 1674.

Kazania y homilije męża bożego nieśmiertelnej sławy y pamięci Hipacyusza Pocieja... Supraśl, 1714.

1.3.

1610. List do prawosławnych // Skarga P. Na threny i lament Theophila Orthologa... Kraków.

1851. [Лісты, пасланні] // Акты, относящиеся к истории Западной России. Спб. Т. 4 С. 66—71, 77—82, 85—90, 92—93, 97—99, 175—176, 182—183, 188—189, 196—200, 202—203, 245—246, 248—249, 262—264, 312—313, 429—432.

1863. [Лісты, граматы...] // Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. Спб. Т. 1. С. 266—267, 280—289.

1865. [Лісты, граматы...] // Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. Спб. Т. 2. С. 3—5, 7—8, 10—12, 29—31, 34—38, 42—49, 53—57, 60—65.

1866. Выпись из книг оршанского замка жалобы управляющего именнями митрополита Ипатия Потея на монахов киево-печерского монастыря, что они при заступничестве казаков и киевских мещан не позволили ввести его во владение имений, 1599; Грамота митрополита киевского и галицкого Ипатия Потея Антонию Грековичу на архимандрию Вогдутицкую и на киевскую протопопию 1610 года, генваря 22 дня // Вестн. Зап. России. Т. 4. № 8.

1882. Гармония восточной церкви с костелом римским... // Памятники полемической литературы в Западной Руси. Спб. Т. 7. Кн. 2. (РИБ).

1883. [Лісты, граматы...] // Архив Юго-Западной России. К. Т. 4. Ч. I. С. 208—211, 220—221, 301—303, 306—313, 320—331, 338—340, 352—357, 388—396, 411—415, 424—430; [Ліст да К.Радзівіла] // Голубев С. Киевский митрополит Петр Могила и его сподвижники. К. Т. I.

1892. [Лісты да Льва Caneri] // Archiwum domu Sapiehów. Lwów.

1903. Антиризис, или Апология против Христофора Филалета в двух текстах: западно-русском (1599 г.) и польском (1600 г.); Лист... к князю Константину Константиновичу Острожскому; Отпис на лист неякого Клирика Острозского // Памятники полемической литературы в Западной Русн. Пб., Т. 19. Кн. 3. (РИБ).

1906. Relacia y Uwazenie... // Студинський К. Пам'ятки полемічного письменства кінця XVI и поч. XVII в. Львів. Т. 1.

1923. З «Жыцця Генадзія, Патрыярха Канстанцінопальскага»: [Урывак] // Гарэцкі М. Хрэстаматыя беларускае літаратуры. Вільня.

1.4.

[Скарга П.]. Описанье и оборона събору руского берестейского / С пол. Вильно, 1597.

2.2.

На лацінскай мове. Documenta unionis Berestensis eiusque auctorum (1590—1600). Romae, 1970.

На польскай мове. Chodynicki K. Kościół prawosławny a Rzeczpospolita Polska (1370—1632). Warszawa, 1934.

Krukowski J. Krytyczny rozbiór Kazań i homilij Hipacyusza Pocieja metropolity Kijowskiego, halickiego i całej Rusi. Lwów, 1899.

Lewicki K. Książe Konstanty Ostrogski a unia brzeska 1596 r. Lwów, 1933.
Likowski E. Unia brzeska (1596). Warszawa, 1907.
Studziński C. Pierwszy występ literacki Hypacjusza Pocieja. Lwów, 1902.
На рускай мове. Жукович П. Сеймовая борьба православного западно-русского дворянства с церковной унией / до 1609 г./, Спб., 1901.
Харлампович. К. Западнорусские православные школы XVI и начала XVII века... Казань, 1898.
На украінскай мове. В тристаліття смерти митрополита Іпатія Потія. Львів, 1914.
Загайко П. Українські письменники-полеміст кінця XVI — початку XVII ст. в боротьбі проти Ватікану і уніі. К., 1957.
Студинський К. Пам'ятки полемічного письменства кінця XVI і поч. XVII в. Львів, 1906. Т. I.
Чубатий М. Митрополит Іпатій Потій, апостол церковної єдности. Львів, 1913.
2.3.
На беларускай мове. Вольскі В. Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры эпохі феадалізма. Мн., 1952. С. 126—130; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. I. С. 283—285, 305—306; Ларчанка М. Літаратура канца XVI — першай паловы XVII ст. // Ахрыменка П., Ларчанка М. Старажытная беларуская літаратура. Мн., 1968; Майхровіч С. Нарыс гісторыі старажытнай беларускай літаратуры XVI—XVIII ст. Мн., 1980. С. 133—134.
На нямецкай мове. Amman A. Der Aufenthalt der ruthenischen Bischofe Hypathius Pociej und Cyrillus Terlecki in Rom in Dezember und Januar 1595—1596 // Orientalia Christiana Periodica. Roma, 1945. Nr 11.
На польскай мове. Historia Kościoła w Polsce. Poznań; Warszawa, 1974. T. 1. Cz. 2. S. 266—269, 282—286, 292—296; Kiszka L. Zywot męża bożego pamięci nieśmiertelnej Hypacyusza Pocieja // Kazania y homilije męża bożego niesmiertelnej sławy y pamięci Hypacyusza Pocieja. Supraśl, 1714; Rychcicki J. Piotr Skarga i jego wiek. Kraków, 1850. T. 2. S. 519—524; Studziński C. Polemiczne pismo Pocieja // Przegląd powszechny. 1897. T. 3; Testament Hipacego Pocieja i Genealogia imienia naszego... // Prz. Poznański. 1860. T. 30; Tretiak J. Piotr Skarga w dziejach i literaturze Unii Brzeskiej. Kraków, 1912. S. 209—232; Zieleński L. Pociej Adam Hippacy, metropolita Kijowski // Lwowianin. 1841.
На рускай мове. А. Т. Отрывок из истории унии в Белоруссии // Виленский календарь на 1885 год. Вильна, 1884; А-ский. Гедеон Балабан: (Биографический очерк) // Вестн. Юго-Зап. и Зап. России. 1864. Т. I. № 1, 2; Апокрисис Христофора Филалета // Вестн. Зап. России. 1870. Т. 3. № 7; Афонский П. Что такое уния, как она началась и как окончилась?: (Исторический рассказ для народного чтения) // Мин. епарх. вед. 1889. № 7—9; Бедрицкий Н. Литературная полемика православных с протестантами в юго-западной Руси в XVI и XVII вв. // Там жа. 1888. № 2, 5, 18; Белецкий А. Родопроисхождение Западнорусского митрополита Иосифа II Солтана // Там жа. 1895. № 16—17; Голенченко Г. Литературная полемика XVI — первой пол. XVII вв. // Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белоруссии. Мн., 1972. Вып. 2; Документ, касающийся отношения к православию польского духовенства и администрации // Вестн. Зап. России. 1871. Т. I. № 3; Документы для истории унии // Вестн. Юго-Зап. и Зап. России. 1864. Т. I. № 3; Документы, относящиеся к эпохе унии // Вестн. Юго-Зап. и Зап. России. 1864. Т. I. № 1; Жалоба, записанная в главные книги минского трибунала, православных монахов Павла и Пафнутия на униатского митрополита Ипатия Потея, который преследует их и наносит разным лицам нестерпимые обиды, — 1609 года, октября 29 дня // Вестн. Зап. России. 1866. Т. 4 № 10; Жукович П. Последняя борьба духовенства митрополичьей епархии с Потеем и унией (1609—1611) // Христианское чтение. 1901. № 2; Завитневич В. Палинодия Захарии Копыстенского... Варшава, 1883. С. 103—110, 163—174; И. А. Западно-русские православно-церковные братства // Вестн. Зап. Руссии. 1870. Т. 2. № 5; Ивановский К. Виленская святая и чудотворная икона Божией Матери // Виленский календарь на 1896 год. Вильна, 1895; Иезуит Петр Скарга // Мин. епарх. вед. 1912. № 21; Извлечение из газет и журналов... // Вестн. Зап. России. 1870. Т. 2. № 4; История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 164—167, 170—173; К. Ш. Церковная уния: (Краткий историч. очерк) // Виленский календарь на 1889 год. Вильна, 1888; Карский Е. Белорусы. Пг., 1921. Т. 3. Вып. 2. С. 198—200; Квит вознаго виленского Яна Кильбора, которым объявлено митрополиту Ипатию Потею, что он зовется на суд сейма вольного королевского, православными братствами. 1605 года, октября 22 дня // Вестн. Зап. России. 1866. Т. 4. № 10; Коноплев Н. Вопрос о родопроисхождении Западно-русского митрополита Иосифа II Солтана // Мин. епарх. вед. 1897. № 10; Ягож. Предстоящее в 1896 г. римско-католическое торжество по случаю трехсотлетнего юбилея Брестской унии // Там жа. 1895. № 22; Коялович М. Борьба униатского митрополита Ипатия Потея с литовско-русскими православными с 1599 по 1613 год // Христианское чтение. 1860. № 2; Ягож. Литовская церковная уния. Спб., 1861. Т. 2. С. 54—79; Крачковский Ю. Очерки униатской церкви // Чт. ОИДР. 1871. № 1; Кульчинский И. Съезды базилиян в Западной Руси // Вестн. Зап. России. 1870. Т. 2. № 4; Левицкий О. Ипатий Потей, киевский униатский митрополит // Памятники русской старины в Западных губерниях империи. 1885. Вып. 7; Макарий. История русской церкви. Спб., 1879. Т. 9. С. 502, 534—541, 548—689; 1881. Т. 10. С. 262—265, 303—413; Н. П. [Петров Н.] Об учреждении Ипатием Потеем униатской капитулы во Владимире Волынском // Труды Киевской духовной академии. 1869. № 6; Начало унии в юго-западной России // Православный собеседник. 1858. Ч. 3; Недельский С. Униатский митрополит Лев Кишка и его значение в истории унии // Лит. епарх. вед. 1893. № 46, 47, 49—51; 1894. № 1, 8, 10, 11, 15, 16, 19, 23, 28, 29, 38, 39; Пашкевич М. Князь Богдан Матвеевич Огинский, защитник православия в первые времена унии // Там жа. 1903. № 26—27; Перепечин В. «Наука» святого Кирилла Лукариса о противной унии (неисследованный памятник западно-русской историко-полемической литературы) // Мин. епарх. вед. 1894. № 1—10; Переписка литовского канцлера Льва Ивановича Сапеги // Лит. епарх. вед. 1893. № 9; Петров Н. Супрасльский монастырь как защитник православия в XVI и в начале XVII века // Виленский календарь на 1896 год. Вильна, 1895; Подокшин С. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы: (Вторая половина XVI — начало XVII в.). Мн., 1970. С. 179—181; Синявский С. Константин Иванович и Константин Константинович князья Острожские // Виленский календарь на 1891 год. Вильна, 1890; Сокол О. Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI — первой половины XVII в. Мн., 1984. С. 118—119; Сцепуро Д. Виленское Святодуховское братство в XVII и XVIII столетиях // Труды Киевской духовной академии. 1898. № 11; Т-ч А. Виленский Свято-Духовский монастырь: (Историч. очерк) // Виленский календарь на 1892 год. Вильна, 1891; Трипольский Н. Униатский митрополит Ипатий Поцей и его проповедническая деятельность // Труды Киевской духовной академии. 1877. № 9—12; 1878. № 2; Чемерицкий В. Белорусская литература // История всемирной литературы: В 9 т. М., 1985. Т. 3; Юрашкевич А. Общий взгляд на западно-русскую униатскую церковь до и во время воссоединения униатов с Православною церковью в 1839 году // Мин. епарх. вед. 1889. № 13.
На украінскай мове. Бучинський Б. Грамота Місаіла і грамота Ніфонта // Зап. Укр. Наук. товариства в Києві. К., 1914. № 13; Возняк М. Три статейки з полемічного письменства // Зап. Наук. товариства ім. Шевченка: Ювілейний збірник на пошану акад. К.Студинського. Львів. 1930. Т. I; Грушевський М. Потій // Грушевський М. Історія української

літератури. К., 1927. Т. 5. Друга половина; Студинський К. «Антиграфи» — полемічний твір Максима (Мелетія) Смотрицького з 1608 р. // Зап. Наук. товариства ім. Шевченка. 1925. Т. 141—143; Яго ж. Полемічне письменство в р. 1608 // Там жа. 1911. Т. 104; Яго ж. Хто був автором «Антиррисиса» з р. 1599 // Там жа. 1900. Т. 35—36. № 3—4.

3.1.

ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, с. 229.

Т.М.Махнач.

ІЯЎЛЕВІЧ ІГНАЦІЙ

Іяўлевіч (Яўлевіч) Ігнацій [26.9.1619, Магілёў (?) — каля 1686], педагог-асветнік, пісьменнік, грамадскі і царкоўны дзеяч.

Нарадзіўся ў сям'і небагатага магілёўскага мешчаніна. Першапачатковую адукацыю атрымаў у г. Шклове, потым вучыўся ў розных бакалаўраў у Магілёўскай брацкай школе і тры гады ў Замойскай акадэміі (Польшча), дзе вывучаў тэалогію і медыцыну. Пасля вучобы працаваў выкладчыкам у Кіева-Магілянскай калегіі (быў прафесарам свабодных навук). Разам з рэктарам гэтай калегіі С. Пачаскім удзельнічаў у арганізацыі ў Ясах (цяпер Румынія) славяна-грэка-лацінскай акадэміі — першай буйной малдаўскай навучальнай установы, якая адкрылася ў 1640. Будучы студэнтам другога курса філасофіі, 31.8.1647 пастрыгся ў Кіеве ў манахі. Пэўны час пражываў у Львове, Яраслаўлі (у Галіцыі), Кракаве, Скіце, Камянцы, Сочаве ў Валахіі, Оршы і інш. месцах. З 1655 быў у Полацку ігуменам Багаяўленскага манастыра, пры якім адкрыў школу і бібліятэку. У 1660 стаў таксама архімандрытам полацкага Барысаглебскага манастыра. Жывучы ў Полацку, апекаваўся мясцовымі паэтамі Філарэтам Утчыцкім і Сімяонам Полацкім, падтрымліваў прыязныя адносіны з тагачаснымі рускімі дзяржаўнымі і культурнымі дзеячамі Ф.Рцішчавым і Л.Ардын-Нашчокіным. Выступіў з прамовай на прыезд у Полацк цара Аляксея Міхайлавіча (1656). Прымаў актыўны ўдзел у Маскоўскім царкоўным саборы 1660 па справе патрыярха Нікана. Апошнія звесткі пра І.Іяўлевіча ўтрымліваюцца ў перапісцы з маскоўскім патрыярхам Іакімам за студзень — сакавік 1686.

З літаратурнай спадчыны І.Іяўлевіча да нашага часу дайшла яго аўтабіяграфічная запіска на польскай мове, якая была апублікавана С.Голубевым у 1886. У ёй прыведзены важныя матэрыялы па гісторыі гарадской адукацыі другой чвэрці 17 ст., якія сведчаць пра цесныя культурныя і педагагічныя ўзаемасувязі беларускага і ўкраінскага народаў. Захаваліся некалькі лістоў І.Іяўлевіча да Сімяона Полацкага, прамовы з нагоды розных рэлігійных і палітычных падзей таго часу. Вядомы таксама яго дэкламацыя на прыезд у Магілёў віцебскага, аршанскага, мсціслаўскага і магілёўскага епіскапа Іосіфа Гарбацкага (4.8.1650) і некалькі незакончаных элегічных вершаў, створаных па ўзору элегій Авідзія. У паэзіі І.Іяўлевіча яскрава выявіліся рысы сілабізму.

А.Ф.Коршунаў.

Бібліяграфія

1.3.

1788. [Творы] // Древняя российская вивлиофика... 2 изд. М. Ч. 3. С. 309—312, 316—322, 335—337, 367—369, 372—374, 392.

1886. Автобиографическая записка // Голубев С. История Киевской духовной академии. К. Вып. 1.

2.3.

На беларускай мове. Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. І. С. 363—364.

На рускай мове. Белецкий А. Из начальных лет литературной деятельности Симеона Полоцкого // Сборник ОРЯС. 1928. Т. 101. № 3; Макарий. История русской церкви. Спб., 1883. Т. 12. С. 92—94.

Т.М.Махнач.

К

КАБАКОВІЧ АЛА

Кабаковіч (па першаму мужу Кісліцына) Ала Канстанцінаўна (7.3.1943, в. Гутава Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. — 11.2.1985, Мінск; пахавана на Паўночных могілках), літаратуразнавец, паэтэса, перакладчыца. Кандыдат філалагічных навук (1975).

Нарадзілася ў сялянскай сям'і. Бацька, Кабаковіч Канстанцін Карпавіч, у ліпені 1942 быў расстраляны гітлераўцамі як камуніст і партызан. Маці, Замкавец Надзея Сяргееўна, — калгасніца. У 1959 А.Кабаковіч скончыла з залатым медалём Гутаўскую СШ і паступіла на аддзяленне журналістыкі БДУ, якое скончыла ў 1964. Яшчэ да заканчэння універсітэта (з красавіка 1964) працавала рэдактарам літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё (да 1966). Па рэкамендацыі Саюза пісьменнікаў БССР у 1966 паступіла ў Літаратурны інстытут імя А.М.Горкага ў Маскве (на аддзяленне перакладу паэзіі), які скончыла з адзнакай у 1971. Як слухачка славістычных курсаў пры Варшаўскім універсітэце ў 1969, 1970 і 1971 выязджала ў Польшчу. Дзве яе працы, выкананыя ў студэнцкім навуковым таварыстве, былі адзначаны дыпломамі і медалямі ВДНГ. У час навучання ў інстытуце ў 1970—71 працавала рэдактарам і рэцэнзентам аддзела паэзіі часопіса «Дружба народов». З 1971 малодшы, з 1981 — старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры АН БССР. Адначасова ў 1973—77 працавала рэдактарам Народнага універсітэта культуры Будтрэста № 1 у Мінску. Жонка пісьменніка М.Тычыны.

А.Кабаковіч — аўтар манаграфій «Паэзія Максіма Багдановіча: Дыялектыка рацыянальнага і эмацыянальнага», «Беларускі свабодны верш». Ёй належыць раздзел у кнізе «Паэзія абнаўлення свету». Даследавала пытанні гісторыі і тэорыі беларускай паэзіі, узаемасувязі таленту мастака з рэчаіснасцю, асаблівасці свабоднага верша. Выступала ў перыядычным друку з артыкуламі, прысвечанымі творчасці М.Танка, Я.Сіпакова, М.Стральцова, П.Макаля, Р.Барадуліна, А.Разанава і інш. Пісала вершы, перакладала на рускую мову.

Л.М.Гарэлік.

Бібліяграфія

1.2.

Диалектика рационального и эмоционального в поэзии Максима Богдановича: Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1975 / Пад прозв. А.Кісліцына.

Паэзія Максіма Багдановіча: Дыялектыка рацыянальнага і эмацыянальнага. Мн., 1978. Рэц.: Нікіфаровіч В. Аб'ект даследавання — паэтыка

// Полымя. 1979. № 5; Рагуля А. Цікавы аспект даследавання // ЛіМ. 1979. 20 крас.

Беларускі свабодны верш. Мн., 1984.

Фальклорныя і анталагічныя традыцыі у беларускай паэзіі. Мн., 1989.

Пасеянае ўзыйдзе: Вершы, пераклады, літаратурна-крытычныя артыкулы. Мн., 1991.

1.3.

1970. Из лирической тетради: «Цветет береза...»; «Ни капли не пролить...»; «Мне плачется...»; Старинный портрет: [Вершы] // Неман. № 7; «Cień Mickiewicza nade mną...» // Życie Lit. Nr 45 / Сааўт. М. Даліньска.

1972. Каб муза па начах будзіла // ЛіМ. 29 вер.

1974. Аб праблеме рацыянальнага і эмацыянальнага ў паэзіі Максіма Багдановіча // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 3 / Пад прозв. А.Кісліцына; «Этот старый, как мир, сюжет...»: Заметки о постановке оперы «Дон Жуан» в Бел. театре оперы и балета // Знамя юности. 19 февр.; Феномен успеха // Там жа. 2 июня.

1975. Обещание глубины: [Рэц. на кн.: Баравікова Р. Рамонкавы бераг. Мн., 1974] // Знамя юности. 25 июля / Пад прозв. А.Кісліцына; Калі мы любім Ціля... // ЛіМ. 28 сак.

1979. Пасеянае ўзыдзе // Маладосць. № 4; Высокае неба Радзімы: [Рэц. на кн.: Адданасць. Мн., 1978] // Полымя. № 1; Чысцінёй светліцца слова... // Там[Рэц. на кн.: Някляеў У. Вынаходцы вятроў. Мн., 1979] // ЛіМ. 21 вер.; «І тчэцца беларускі верш...» // Там жа. 16 ліст.

1980. Бясконцай дарогі пачатак: [Рэц. на кн.: Нашчадкі. Мн., 1979] // Маладосць. № 9; Зрабіце дождж!: [Рэц. на кн.: Гілевіч Н. У добрай згодзе. Мн., 1979] // ЛіМ. 25 студз.; Туга па дасканаласці: [Рэц. на кн.: Стральцоў М. Цень ад вясла. Мн., 1979] // Там жа. 18 ліп.; Мара навырост // Там жа. 17 кастр.

1981. Ідэйна-стылявыя пошукі беларускай паэзіі 20-х гадоў // Шукліна Н., Кабаковіч А., Шпакоўскі І. Паэзія абнаўлення свету. Мн. Рэц.: Няхай М. Даследуючы заканамернасці сацыялістычнага рэалізму // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. 1984. № 2; «Я хотел бы встретиться с Вами...» // Лит. обозрение. № 12; Святло надзей — мелодыя радка: [Рэц. на кн.: Баравікова Р. Такое кароткае лета. Мн., 1981] // Маладосць. № 10; Паэзіі хлеб надзённы: [Рэц. на кн.: Танк М. Зб. тв.: У 6 т. Мн., 1978—81] // Звязда. 18 снеж.; Права на пошук // ЛіМ. 3 крас.

1982. Каб хатнім стаў непасціжымы свет: [Рэц. на кн.: Барадулін Р. Вечалле. Мн., 1980] // Маладосць. № 5; Усхожае зерне слова: [Рэц. на кн.: Русецкі А. Крокі сэрца. Мн., 1980] // Полымя. № 1; Шляхамі жыцця // Там жа. № 9.

1983. Прыручэнне слова: [Рэц. на кн.: Салтук А. Святло зямлі. Мн., 1982] // Маладосць. № 5.

1984. Працяг будзе // Дзень паэзіі—84. Мн.; «Люблю, надеюсь, ожидаю!»: О стихах Р.Боровиковой // Лит. учеба. № 1; «Якая песня ў лебедзя?»: Дыялог крытыка з паэтам [М.Мятліцкім] // Маладосць. № 9.

1985. З грэкаў у варагі // Вобраз —85. Мн.; Са сваёй чарадой // Маладосць. № 2; Зоркі свецяць усім: [Рэц. на кн.: Скобелев Э. Из тьмы светлеющие лики. Мн., 1983] // Полымя. № 3.

1.5.

На венгерскую мову. Jegyzetek a mai belorusz költészetről / F. P. Misley // Szovjet Irodalom. 1984. Nr 2.

На польскую мову. Stary portret / Tł. M. Dolińska // Nasz Świat. 1971. Nr 11; Życie Lit. 1971. Nr 32.

2.4.

На беларускай мове. Баравікова Р. Пастукайся ў акно маё галінкай: [Верш] // ЛіМ. 1985. 8 сак.

М.П.Барташэвіч.

КАБАШНІКАЎ КАНСТАНЦІН

Кабашнікаў Канстанцін Паўлавіч [н. 24.7.1927, Гомель], фалькларыст. Доктар філалагічных навук (1971), прафесар (1980). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986; за ўдзел у выданні шматтомнага збору «Беларуская народная творчасць»).

Нарадзіўся ў сям'і служачых. З дзяцінства жыў у Гомелі, але быў цесна звязаны з сям'ёй дзеда Захара Антонавіча Кабашнікава — патомнага селяніна, у вялікай сям'і якога трымаліся некаторыя старажытныя звычаі, абрады, гучалі песні, казкі, знаходзілася месца трапнаму народнаму слову, што пэўным чынам і прадвызначыла любоў К.Кабашнікава да вуснай народнай творчасці. Да вайны

ён паспеў скончыць сямігодку. У час вайны разам з маці знаходзіўся ў эвакуацыі ў Горкаўскай вобл. Скончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1951), аспірантуру Маскоўскага універсітэта (1954), дзе вучыўся ў такіх вядомых фалькларыстаў, як У.Чычэраў, П.Багатыроў, Э.Памяранцава, што вызначыла канчатковы шлях у фалькларыстыку. З 1954 працуе ў АН БССР. Спачатку быў малодшым, потым старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі, з 1957 старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (ІМЭФ), а з 1976 загадчык сектара параўнальнага вывучэння народнай творчасці славян (цяпер аддзел славістыкі).

Асноўны кірунак навуковай дзейнасці — фальклярыстыка, апавядальныя жанры, фальклор рабочых, рэвалюцыйная паэзія, параўнальнае вывучэнне беларускага фальклору. Апублікаваў звыш 150 навуковых прац, асабіста і ў сааўтарстве, сярод іх — зборнікі «Беларускі эпас», «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны», першы паслявае нны дапаможнік па вуснапаэтычнай творчасці для студэнтаў ВНУ «Нарысы па беларускаму фальклору». Студэнтам і выкладчыкам адрасаваны «Хрэстаматыя па беларускаму фальклору», другое выданне якой (1977) адзначана медалём ВДНГ, праграма па фальклору і дапаможнік «Беларуская вуснапаэтычная творчасць». У манаграфіях («Ад традыцыйнага фальклору да рэвалюцыйнай паэзіі», «Беларускі фальклор у параўнальным асвятленні», «Беларуска-рускія фальклорныя сувязі» і інш.) даследуюцца дынаміка фальклорнага працэсу, зараджэнне і развіццё параўнальнага вывучэння беларускага фальклору з пачатку мінулага стагоддзя да нашых дзён, фальклорныя ўзаемасувязі двух братніх народаў. У якасці члена рэдкалегіі, рэдактара, складальніка асобных тамоў, аўтара прадмоў і каментарыяў прымаў удзел у выданні збору «Беларуская народная творчасць» (БНТ). Непасрэдна працаваў над тамамі «Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі»; «Чарадзейныя казкі», ч. 1—2. Разам з І.Беразоўскім, Л.Барагам, М.Новікавым выдаў «Параўнальны паказальнік сюжэтаў: Усходнеславянская казка». З 1952 займаецца збіральніцкай дзейнасцю, рэгулярна выязджае ў экспедыцыі, сабраў каля 2500 твораў, сярод якіх унікальныя запісы казак, паданняў, народнай драмы. У дапамогу збіральнікам апублікаваў некалькі артыкулаў і брашур («Методыка збірання беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці»). Удзельнічаў у 4, 6, 7, 9 Міжнародных з'ездах славістаў.

Жыве ў Мінску.

Л.С.Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Белорусская антикрепостническая сказка XIX в.: Автореф. дис. ... канд. филол. н. М., 1955.

Беларускі эпас. Мн., 1959.

Інструкцыя па збіранню беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці. Мн., 1959.

Беларускі народ аб рэлігіі. Мн., 1960 / Сааўт. А.Фядосік.

Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны. Мн., 1961 / У сааўт.

Нарысы па беларускаму фальклору: Дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ. Мн., 1963. Рэц.: Ахрыменка П. Першая спроба... // Полымя. 1964. № 6; Базарэвіч М. Люстра народнай душы // ЛіМ. 1964. 28 студз.; Боган В. // Сов. Бел. 1964. 20 февр.; Слагада Н. // Наст. газ. 1964. 27 мая; Яршэвіч М. // Звязда. 1964. 5 чэрв.

Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць: Гісторыка-тэарэтычная даследаванне. Мн., 1967 / У сааўт.

У.І.Ленін у беларускай народнай творчасці. Мн., 1967 / У сааўт.

Беларуская казка ў казачным эпасе славян. Мн., 1968. (VI Міжнародны з'езд славістаў).

Ад традыцыйнага фальклору да рэвалюцыйнай паэзіі. Мн., 1969. Рэц.: Бандарчык В. // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. 1969. № 4; Березовський І. // Нар. творчість та етнографія. 1970. № 5; Ліс А. Паэзія змагання // Звязда. 1969. 5 жн.; Рэвіцкі В. Плённыя скарбы // Наст. газ. 1969. 28 мая.

Белорусский фольклор второй половины XIX — начала XX века: (Судьбы традиционных жанров, новые виды народного творчества): Автореф. дис. ... д-ра филол. н. К., 1969.

Сучасны стан беларускай паэтычнай творчасці. Мн., 1973 / Сааўт. Г.Барташэвіч.

Методыка збірання беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці. Мн., 1978.

Беларуская народна-паэтычная творчасць: Дапаможнік для філфакаў ВНУ. Мн., 1979 / У сааўт.

Сравнительный указатель сюжетов: Восточнославянская сказка. Л., 1979 / У сааўт.

Беларускі фальклор у параўнальным асвятленні: Гістарыяграфічны нарыс. Мн., 1981. Рэц.: Канстанцінаў В. Крыніцы жыватворныя // Звязда. 1981. 3 чэрв.; Равіцкі В. Параўнальнае вывучэнне беларускага фальклора // Наст. газ. 1982. 19 чэрв.

Інтэрнацыянальнае і нацыянальнае ва ўсходнеславянскай народнай паэзіі Вялікай Айчыннай вайны. Мн., 1982. (IX Міжнародны з'езд славістаў).

Сустрэчы з казкай: Кніга для настаўніка. Мн., 1984 / Сааўт. Г.Барташэвіч. Рэц.: Літвінаў Р. Добры лёс казкі // Голас Радзімы. 1984. 20 вер.

Беларуская вуснапаэтычная творчасць: Праграма для філалагічных факультэтаў універсітэтаў. Мн., 1985 / У сааўт.

Беларуска-рускія фальклорныя сувязі. Мн., 1988.

Узаемадзеянне ўсходнеславянскіх фальклорных традыцый на сучасным этапе. Мн., 1988.

1.3.

1955. Выдаваць матэрыялы фальклорных экспедыцый // ЛіМ. 15 кастр.

1956. Атэістычныя ідэі ў беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 3.

1958. Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць савецкай эпохі // Беларускі этнаграфічны зборнік. Мн. Т. І. Вып. І; Традиции героического эпоса в белорусском народном творчестве // Основные проблемы эпоса восточных славян. М.; Паходжанне і шкоднасць забабонаў // Звязда. 18 снеж. / Сааўт. Л.Малчанава.

1959. Беларускія народныя песні // Шырма Р. Беларускія народныя песні. Мн. Т. І.; Зброяй трапнага слова // Звязда. 28 ліст.

1960. Паходжанне і шкоднасць забабонаў; Антырэлігійныя матывы ў беларускім фальклоры // Праблемы рэлігіі і атэізму. Мн. / У сааўт.; Гэта патрабуе гаворкі // ЛіМ. 4 студз.; Да ўвагі збіральнікаў фальклору // Там жа. 7 чэрв.; Запісана ў Мінскай вобласці // Там жа. 9 вер.

1961. Методыка збірання беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці // Інструктыўныя і метадыч-

ныя матэрыялы па збіранню і вывучэнню беларускага фальклору. Мн.

1962. П.В.Шэйн — збіральнік вуснапаэтычнай творчасці беларускага народа // Беларускія народныя песні: Са зборнікаў П.В.Шэйна. Мн.; О некоторых проблемах эпической поэзии // IV Международный съезд славистов: Материалы дискуссии. М. Т. I. С. 489—499.

1963. Атэістычныя ідэі ў беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 3; З сыноўняй беражлівасцю // ЛіМ. 13 снеж.

1964. Белорусы // Народы европейской части СССР. М. Т. I. С. 780—906, 911, 929—931 / У сааўт.; У дарозе да людскіх сэрцаў // ЛіМ. 14 студз.; З любоўю да свайго народа: Да 100-годдзя з дня нараджэння А.К.Сержпутоўскага // № Там жа. 19 чэрв.

1965. Падарожжа па песню // Беларусь. № 1.

1966. Аб выніках фальклорных экспедыцый 1965 г. // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 3 / У сааўт.

1967. Аўтар блакітнага сшытка // ЛіМ. 17 студз.

1968. VI Міжнародны з'езд славістаў // ЛіМ. 30 жн.

1969. Некаторыя асаблівасці развіцця народнапаэтычнай творчасці Савецкай Беларусі // Праблемы сучаснага беларускага фальклору. Мн.; Выступление о белорусском рабочем фольклоре // Труды VII Междунар. конгресса антропологических и этнографических наук. М. Т. 6. С. 452—453; Гісторыя ўкраінскай савецкай фалькларыстыкі // Весці АН БССР: Сер. грамад. н. № 2.

1970. Сіла і хараство народных казак: [Рэц. на кн.: Бараг Л. Беларуская казка. Мн., 1969] // Полымя. № 10; Крыніцы жыватворныя: [Рэц. на кн.: Захарава В., Рэвіцкі В. З жыватворчых крыніц. Мн., 1970] // Наст. газ. 8 ліп.; Фальклорныя традыцыі: [Рэц. на кн.: Грынчык М. Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі. Мн., 1969] // Там жа. 17 кастр.

1971. На парадку дня — народная казка // ЛіМ. 15 кастр.

1972. Беларускі фальклор у другой палавіне XIX ст.; Народная паэтычная творчасць у пачатку XX ст. // Гісторыя Беларускай ССР. Мн. Т. 2.

1973. Сучасны стан беларускага фальклору // VII Międzynarodowy Kongres sławistów w Warszawie. Warszawa / У сааўт., Усесаюзная навуковая канферэнцыя «Праблемы тэорыі фальклору» // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 3; Новае пра вядомага фальклярыста: [Рэц. на кн.: Новиков Н. Павел Васильевич Шейн. Мн., 1972] // Полымя. № 2; Жыватворная крыніца // Наст. газ. 14 ліп.; Форум славістаў // Там жа. 31 кастр.; Народа творчество живое // Сов. Бел. 3 нояб. / У сааўт.

1974. «Царь-Максимильян» в постановке белорусских рабочих-стеклодувов // Народный театр. Л., 1974; Прозаические жанры белорусского фольклора // Прозаические жанры фольклора народов СССР. Мн.; К характеристике жанрового состава белорусской народной прозы // Нар. творчість та етнографія. № 4; Коротко об экспедициях // Сов. этнография. № 3.

1975. Народнапаэтычная творчасць // Беларуская савецкая энцыклапедыя. Мн. Т. 12 / Сааўт. А.Фядосік; Каталог народных паданняў // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 5; Сказки о животных и волшебные сказки // Научно-реферативный бюллетень. № 13 / У сааўт.; Коротко об экспедициях // Сов. этнография. № 3.

1979. Сацыяльна-бытавыя і навелістычныя казкі / Сааўт. А.Фядосік; Развіццё народнай паэзіі ў дакастрычніцкі час; Казкі; Казкі аб жывёлах; Чарадзейныя казкі; Казачнікі; Легенды і паданні // Беларуская народнапаэтычная творчасць. Мн.; Новыя запісы народнай драмы // Помнікі гіст. і культ. Бел. № 4 / У сааўт.; А ці песня народная ? // ЛіМ. 16 сак.; Пасля парадаў ведаў // Наст. газ. 4 ліп / У сааўт.

1980. Узаемадзеянне рознаэтнічных фальклорных традыцый — важны фактар фарміравання рэгіянальных асаблівасцей фальклора Гомельшчыны // Рэгіянальныя традыцыі ва ўсходнеславянскіх мовах, літаратурах і фальклоры. Гомель; Аб выніках фальклорнай экспедыцыі ў Гомельскую вобласць // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 5 / У сааўт.; Выяўляць, улічваць, прапагандаваць // ЛіМ. 6 чэрв.; У вянку фальклору // Наст. газ. 19 крас.

1981. Традиционный фольклор в наши дни // Всесоюзная научная конференция «Фольклорное наследие народов СССР и его роль в художественной культуре развитого социализма». М. / У сааўт.; Экспедыцыі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ў 1980 г. // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 4.

1982. Мифологическая школа в белорусской фольклористике и ее связи со славянской и западноевропейской наукой // Международная научная конференция: Славянские культуры и мировой культурный процесс. Мн.; О современном состоянии календарной обрядовой поэзии в Белоруссии (по материалам экспедиций 1975—1978 г.) // Обряды и обрядовый фольклор. М.; Фальклорны працэс і дынаміка фальклорных жанраў // Узроўні фальклорных уплываў. Мн.; Белорусский фольклор в сравнительном освещении: Историографический очерк (реферат) // Научно-реферативный бюллетень (отечественная литература). № 47; Большой сбор славистов // Сов. Бел. 27 сент.

1983. О некоторых региональных особенностях фольклора Гомельской области // Полесье и этногенез славян. М.; Міжнародная канферэнцыя славістаў // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 1.

1984. Принципы издания народных песен в своде белорусского фольклора // Народное песенное наследие и современность. Рига. Ч. 2; Традиционный фольклор в наши дни // Фольклорное наследие народов СССР и современность. Кишинев; Пражскі манускрыпт // ЛіМ. 20 студз. / Сааўт. Г.Кісялёў.

1985. Апавядальныя жанры беларускага фальклору Вялікай Айчыннай вайны (пытанні класіфікацыі) // Вялікая Айчынная вайна ў фальклоры і мастацтве Беларусі. Мн.; Собирание и изучение фольклора Гомельщины в ИИЭФ АН БССР // Региональные особенности восточнославянских языков, литератур, фольклора и методы их изучения. Гомель. Ч. 2; Мифологическая школа в белорусской фольклористике и ее связи со славянской и западноевропейской наукой // Славянские культуры и мировой культурный процесс. Мн.; Энциклопедия литературы и искусства Белоруссии // МАИРСК Информац. бюллетень. Вып. 13 / У сааўт.; Белорусская народная поэзия периода Великой Отечественной войны // Сов. этнография. № 3.

1.4.

1958. Черемшинка; Кирила Кожемяка; Мужик и барин; Бондаревна; Как барин лошадей из тыквы высиживал; Ответы мужика; Как мужик хитро гуся раздемолил; Шемякин суд; Великий грешник; Урожай в Мозыре: [Казкі] / С бел. // Белорусские народные сказки. М.

1.5.

На польскую мову. Bajka białoruska w eposie bajkowym Słowian // VI Mežinárodni s'jezd slavistú v Praze 1968. Rezumé přednašek, prispěšku a zděleni. Praha, 1968.

На ўкраінскую мову. Традиції східнослов'янського героічного епосу в білоруській творчості // Історічний епос східних слов'ян. К., 1958; Мудре слово народу // Нар. творчісць та етнографія. 1963. № 1; Збирання і вивчення білоруської народної поетичної творчості періоду Великої Вітчизняної війни // Там жа. 1977. № 3; Книга казок про тварин: [Рэц. на кн.: Казки про тварин. К., 1976] // Там жа. 1977. № 4; Сучасний фольклор українсько-білоруського пограниччя // Там жа. 1981. № 4 / У сааўт.

1.6.

Антырэлігійныя казкі, частушкі, прыказкі. Мн., 1957. 2 выд. Мн., 1961 / Рэд.

Белорусские народные сказки. М., 1958 / Рэд.

Беларускі эпас. Мн., 1959 / Скл. з інш.

Беларускія частушкі. Мн., 1960 / Скл. з інш.

Казкі і легенды роднага краю. Мн., 1960 / Скл.

Якуніна Л. Слуцкія паясы. Мн., 1960 / Рэд.
Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны. Мн., 1961 / Скл. з інш.
Міхалап Я. Беларускія пісьменнікі аб рэлігіі. Мн., 1961 / Рэд.
Беларускія народныя песні: Са зб. П.В.Шэйна. Мн., 1962 / Рэд. з інш.
Фядосік А. Антырэлігійныя матывы ў беларускім фальклоры. Мн., 1963 / Рэд. з інш.
Тэзісы дакладаў на канферэнцыі, прысвечанай вынікам даследаванняў беларускай народнай творчасці: (люты 1969 г.). Мн., 1969 / Рэд. з інш.
Беларускі фальклор: Хрэстаматыя. Мн., 1970; 2 выд. дап. Мн., 1977; 3 выд., перапрац. Мн., 1985 / Рэд. з інш.
Песні савецкага часу. Мн., 1970 / Рэд. з інш.
Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі. Мн., 1971 / Скл. Рэц.: Якімовіч А. Незлічоныя скарбы // ЛіМ. 1971. 18 чэрв.; Hajduk M. // Kontrasty. 1972. № 3.
Дзіцячы фальклор. Мн., 1972 / Рэд.
Чарадзейныя казкі. Ч. І. Мн., 1973; Ч. 2. Мн., 1978 / Рэд. з інш.
Барташэвіч Г. Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору. Мн., 1976 / Рэд.
Балады: У 2 кн. Мн., 1978 / Рэд. з інш.
Салавей Л. Беларуская народная балада. Мн., 1978 / Рэд.
Веснавыя песні. Мн., 1979 / Рэд.
Валачобныя песні. Мн., 1980 / Рэд.
Беларускія народныя казкі. Мн., 1981; 2 выд. Мн., 1986 / Скл. з інш.
Славянские культуры и мировой культурный процесс: Тезисы докладов и сообщений международной научной конференции. Мн., 1982 / Рэд. з інш.
Барташэвіч Г. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя. Мн., 1985 / Рэд.
Русские народные бытовые сказки Сибири. Новосибирск, 1985 / Рэд.
Славянские культуры и мировой культурный процесс: Материалы международной научной конференции Мн., 1985 / Рэд.
Казкі ў сучасных запісах. Мн., 1989 / Скл., уступ. арт. і камент.

Г.І.Рэут.

КАБРЖЫЦКАЯ ТАЦЦЯНА

Кабржыцкая Таццяна Вячаславаўна [н. 15.8 (сапр. 10.11). 1941, Кіеў], літаратуразнавец, крытык, перакладчык. Кандыдат філалагічных навук (1971). Член СП Беларусі з 1990. Піша на беларускай і ўкраінскай мовах.

Бацька, Вячаслаў Апанасавіч, быў заслужаным артыстам УССР, прафесарам Львоўскай кансерваторыі. Маці, Клаўдзія Васілеўна, — урач. Дзяцінства Т.Кабржыцкай прайшло ў Алма-Аце, куды эвакуіравалася сям'я ў час вайны, і Львове. Пасля сканчэння сярэдняй школы ў Львове вучылася на філалагічным факультэце Львоўскага універсітэта (1959—64), працавала намеснікам дырэктара Вязоўскай і загадчыцай Грыбовіцкай вочна-завочнай школы Несцераўскага р-на Львоўскай вобл. (1964—66). З 1966 да 1967 рэдактар, старшы рэдактар выдавецтва Львоўскага універсітэта. У 1967—71 займалася ў аспірантуры пры кафедры ўкраінскай літаратуры таго ж універсітэта. Калі выйшла замуж за беларускага пісьменніка В.Рагойшу, пераехала ў Мінск. У 1971 малодшы, з 1972 старшы навуковы супрацоўнік Інстытута педагогікі пры Міністэрстве асветы БССР. З 1980 дацэнт кафедры рускай літаратуры БДУ.

Першая публікацыя Т.Кабржыцкай была змешчана ў 1963 (украінскі часопіс «Жовтень»). Шмат яе артыкулаў, рэцэнзій па пытаннях методыкі выкладання, тэорыі, гісторыі літаратуры і літаратурных узаемасувязей надрукавана ў беларускіх і ўкраінскіх навукова-метадычных і перыядычных выданнях. Асаблівую навуковую зацікаўленасць даследчыцы выклікаюць тыпалогія і ўзаемадзеянне ўсходнеславянскіх літаратур (М.Рыльскі і А.Блок, Я.Купала і М.Рыльскі, Цётка і І.Свянціцкі і інш). Пры ўдзеле Т.Кабржыцкай у Інстытуце педагогікі напісаны метадычныя ўказанні да падручнікаў па беларускай літаратуры для 6 і 9 класаў. Разам з на-

вуковай і выкладчыцкай дзейнасцю яна актыўна займаецца перакладамі беларускіх твораў на ўкраінскую мову (В.Быкаў, М.Багдановіч, У.Караткевіч і інш.).

Жыве ў Мінску.

Л.М.Гарэлік, Т.М.Тарасава.

Бібліяграфія

1.2.

Украинско-белорусские литературные связи начала XX века: Автореф. дисс. ... канд. филол. н. Львов, 1971.

Карані дружбы: Беларуска-ўкраінскія літаратурныя ўзаемасувязі пачатку XX ст. Мн., 1976 / Сааўт. В.Рагойша. Рэц.: Ахрыменка П. Ад адных каранёў // ЛіМ. 1976. 10 снеж.; Дзенісюк І. Спрадвечнай дружбы летапіс // Звязда. 1976. 9 ліп.; Мартынава Э. На шляхах літаратурнага яднання // Полымя. 1977. № 1; Охрименко П. Глубокие корни // Радуга. 1978. № 1; Хланта І. // Закарпат. правда. 1976. 11 лип.; Чабаненко В. Глубоке коріння // Народна творчість та етнографія. 1976. № 6; Poźniak T. // Sl. Orient. 1977. Nr 1.

Слядамі знічкі: Пра Сяргея Палуяна. Мн., 1990. (Бка час. «Маладосць») / Сааўт. В.Рагойша.

1.3.

1963. До братніх сердець // Жовтень. № 8.

1965. М.Рильский і О.Блок // Тези доповідей республіканської міжвузівскої наукової конференції, присвяченої 70-річчю з дня народження М.Т.Рильського. Львів.

1968. Богданович на Украине: [Рэц. на кн.: Богданович М. Лірика К., 1967] // Неман. № 4; Украіна чытае Купалу // Полымя. № 5.

1969. Украіністика в «Нашай ніве»; Максим Рильський про Янку Купалу // Укр. літ.-знавство. Вип. 6; Сяргей Палуян на Украіне // ЛіМ. 17 студз.

1970. Цётка і Свянціцкі // Полымя. № 8 / Сааўт. В.Рагойша; З невідомого про Сергія Полуяна // Укр. літ.-знавство. Вип. 8; До українсько-білоруських громадсько-літературних зв'язків: Свенціцький і Цьотка // Там жа. Вип. 10 / Сааўт. В.Рагойша; Масты да сэрцаў украінцаў: [Рэц. на кн.: Калиновi мости. К., 1969] // ЛіМ. 3 крас.

1972. В.О.Сухомлинський і Білорусія // Тэзи доповідей і повідомлень другої наукової конференції по вивченню білорусько-українських літературних зв'язків, присвяченої 50-річчю утворення СРСР (29—30 вересня 1972 р.). Львів; Беларускія песняры на Украіне // Наст. газ. 14 чэрв.

1973. Беларуская літаратура ва ўкраінскай «Школьнай бібліятэцы» // Тыпалогія і ўзаемадзеянне славянскіх моў і літаратур. Мн.; Творчае пабрацімства // ЛіМ. 19 студз.; ...И народився письменник // Літ. Укр. 12 січ.

1974. Краіна під білими крилами бусла: [Рэц. на кн.: Караткевич У. Земля під білими крилами. К., 1972] // Жовтень. № 2; Беларуская літаратура — украінскім школьнікам // Полымя. № 1; Барвы і слова друга з Украіны: [Рэц. на кн.: Ющенко О. Безсмертники. К., 1974] // Там жа. № 12 / Сааўт. В.Рагойша; Урокі адной камедыі // ЛіМ. 27 вер.; На поўны голас: [Рэц. на кн.: П'есы. Мн., 1973] // Наст. газ. 17 жн.

1975. Вывучэнне драматычнага твора як метадычная праблема // Пытанні выкладання літаратуры ў школе. Мн.; Вывучэнне драматургічных твораў // Нар. асвета. № 11; Будаўнік мастоў дружбы: Да 80 годдзя з дня нараджэння Максіма Рыльскага // Полымя. № 3; І думак палёт, і часу адчуванне // ЛіМ. 16 мая. / Сааўт. У.Кабржыцкі.

1976. Сюжэтны аналіз драмы Кандрата Крапівы «Партызаны» // Аналіз мастацкага твора ў школе. Мн.; Піянер беларусістыкі // ЛіМ. 28 мая / Сааўт. В.Рагойша; Яе альма-матэр // Там жа. 16 ліп.

1977. Алесь Ганчар і Беларусь // Тыпалогія славянскіх моў і ўзаемадзеянне славянскіх літаратур. Мн.; Грамадзянская сталасць даследчыка: [Рэц. на кн.: Усікаў Я. Грамадзянскае сумленне мастака. Мн., 1976] // Полымя. № 6; З клопатам пра сучасніка: [Рэц. на кн.: Петрашкевіч А. П'есы. Мн., 1976] // Там жа. № 12; Вянок братэрства // ЛіМ. 15 крас.

1978. Восприятие В.Г.Короленко в Белоруссии // Тезисы докладов Короленковских чтений, посвященных 125-летию со дня рождения В.Г.Короленко. Полтава / Сааўт. В.Рагойша.

1979. Асаблівасці драматычнага твора і асноўны накірунак яго аналізу ў сярэдняй школе // Асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу ў Беларусі на сучасным этапе. Мн.

1980. Аналіз драматычных твораў // Вывучэнне літаратуры: Пытанні методыкі. Мн.; Жыццялюб і сонцапаклоннік // Кацюбінскі М. Аповесці. Мн. / Сааўт. В.Рагойша; Сучасны — назаўжды! // ЛіМ. 28 ліст.

1981. У еднасці славянскай // Звязда. 9 снеж.; Гармонія адзінства і разнастайнасці // ЛіМ. 13 ліст.; Фадзееў і Беларусь // Там жа. 25 снеж.

1982. Урок прысвячаецца «Чымгану» // З глыбінь народных. Мн.; Александр Фадеев и белорусские песняры // Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа і развіццё славянскіх моў і літаратур. Мн.; Вывучэнне лірыкі Якуба Коласа ў 9-м класе // Веснік БДУ. Сер. 4. № 1; Аналіз твораў Якуба Коласа «Да працы» і «Наперад» у школе // Там жа. № 2; Письмо Александра Фадеева // Неман. № 5 / Сааўт. В.Літвінка; Казачнік жыве ў Беларусі: Да 100-годдзя з дня нарадж. К.Чукоўскага // ЛіМ. 9 крас.

1983. Яшчэ далёка да зімы: [Рэц. на кн.: Грахоўскі С. Асеннія гнёзды. Мн., 1982] // ЛіМ. 8 крас.

1984. Друг украінскої літератури // Жовтень. № 4; У імя братэрства // Маладосць. № 1; Паслухайце!: [Рэц. на кн.: Маякоўскі У. Паслухайце! Мн., 1983] // Полымя. № 3; Самапартрэт перакладчыка: [Рэц. на кн.: Гілевіч Н. Роднасць. Мн., 1983] // ЛіМ. 18 мая; Рыцар слова і чалавечнасці: [Рэц. на кн.: Варанько П. Калыска памяці. Мн., 1983] // Там жа. 27 ліп.; Падушка Сяргея Палуяна // Там жа. 26 кастр. / Сааўт. В.Рагойша; Букавінскі кабзар // Там жа. 14 снеж.

1985. Слядамі знічкі // Маладосць. № 10 / Сааўт. В.Рагойша; Вывучэнне творчасці Петруся Броўкі ў IX класе // Нар. асвета. № 7, 10; Акрылены рэвалюцыяй // Полымя. № 12 / Сааўт. В.Рагойша; Ускрылёны рэвалюцыяй // ЛіМ. 19 крас. / Сааўт. В.Рагойша; Сустрэча з паэтам // Там жа. 19 ліп.

1.4.

Тхоржевский Д., Гектта В. Проблемное обучение на уроках труда: Книга для учителя / С укр. Мн., 1986.

Быков В. Мертвым не болить / З біл. К., 1990.

1.6.

Палуян С. Лісты ў будучыню. Мн., 1986 / Скл., падрыхт. тэксту, камент. з В.Рагойшам.

М.П.Барташэвіч.

КАВАЛЕНКА ВІКТАР

Каваленка Віктар Антонавіч (н. 21.7.1929, в. Сакаўшчына Валожынскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл.), крытык, літаратуразнавец, празаік. Член СП Беларусі з 1962. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1981), член-карэспандэнт АН Беларусі (1984). Доктар філалагічных навук (1978). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я.Коласа (1980, за ўдзел у 2-томным даследаванні «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» і «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры», на рускай мове) і Літаратурнай прэміі Саюза пісьменнікаў СССР (1976, за кнігу «Прага духоўнасці»).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька яго загінуў на першай сусветнай вайне. У 1929 скончыў Грэскую сямігодку, у 1930 паступіў на пазашкольнае аддзяленне Мінскага Белпедтэхнікума. На апошнім курсе педтэхнікума, 23.2.1933, быў беспадстаўна арыштаваны. У турме спрабаваў пакончыць жыццё самагубствам. Асуджаны на тры гады зняволення за прыналежнасць да ўяўнага «Саюза вызвалення Беларусі». Пакаранне адбываў на Далёкім Усходзе (4-е аддзяленне Дальлага). У кастрычніку 1935 вызвалены, жыў у Варонежы (1935—41), вучыўся там на рабфаку мединстытута, потым на літаратурным факультэце пединстытута, працаваў на машынабудаўнічым заводзе «Камінтэрн», а таксама настаўнікам. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ваяваў на Украінскім фронце. У маі 1942 трапіў у палон да румынаў. У 1943 выпушчаны на волю, вярнуўся ў Мінск. З 1944 у Германіі, потым — у Бельгіі, дзе працаваў на шахтах. У 1950 выехаў у ЗША.

Літаратурнай творчасцю М.Кавыль пачаў займацца рана. Першы свой верш, «Лён», напісаў у 1929. Друкавацца пачаў у 1929 (верш «Гудкі», апублікаваны ў газеце «Беларуская вёска»), супрацоўнічаў з часопісамі «Вясна» і «Маладняк». Быў членам літаратурнай арганізацыі «Маладняк». У 1942—44 друкаваўся ў газеце «Раніца», затым, у эміграцыі, у часопісах «Беларуская думка», «Конадні», «Шыпшына», газетах «Бацькаўшчына» і «Беларус», зборніку «Ля чужых берагоў» (Мюнхен, 1955). Выдаў зборнікі паэзіі «Ростань», «Пад зорамі белымі», «Першая рана», «Цяжкія думы», «Міжагнёўе» . Піша таксама прозу (незакончаны раман «Із агню ды ў полымя»), драматычныя творы («Недаспяваная песня», «Марылька»). У паэзіі прытрымліваецца традыцыйных формаў, звязаных з народнай творчасцю. Шмат увагі ўдзяляе перажытаму ў вайну. Ёсць у М.Кавыля вершы пра перажытае ў турмах і лагерах. У паэмах «Пад небам Случчыны каханай» (1943) і «Міжагнёўе» (1982) стварыў нетрадыцыйную панараму жыцця ў Савецкай Беларусі і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Значнае месца ў яго эмігранцкай паэзіі займаюць творы пра Радзіму. М.Кавыль рэдагуе часопіс «Беларуская думка». На вершы паэта напісаны песні (К.Барысавец, А.Карповіч, М.Куліковіч, Ю.Рымко).

Жыве ў г. Саўт Рывер (штата Нью Джэрсі, ЗША).

Б.І.Сачанка.

Бібліяграфія

1.1.
Міжагнёўе: Выбр. тв. Ню Ёрк. 1990.
1.2.
Ростань: Вершы. Рэгенсбург, 1947.
Пад зорамі белымі: Зб. вершаў. Нью-Йорк, 1954.
Першая рана: Зборнік вершаў. Манчэстэр, 1960.
Цяжкія думы: Зборнік вершаў. [Нью-Йорк], 1961.
1.3.
1930. Жыцця на прадвесцні: [Верш] // Вясна. № 9 / Пад псеўд. Я.Маёвы
1931. Расцвітуць сады: [Верш] // Маладняк. № 4 / Пад псеўд. Я.Маёвы; З прастораў: [Верш] // Там жа. № 5 / Пад псеўд. Я.Маёвы.

М.П.Барташэвіч.

КАГАН САРА

Каган Сара Рувімаўна (3.7.1895, в. Максімавічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 1941, Мінск), паэтэса, празаік. Член СП Беларусі з 1934. Пісала на яўрэйскай, беларускай і рускай мовах.

Бацька С.Каган служыў на лесараспрацоўках, маці была хатняй гаспадыняй, вельмі любіла літаратуру і імкнулася гэтую любоў перадаць дзецям, якіх у сям'і было дзесяцёра. Паколькі школы ў вёсцы не было, сама вучыла дзяцей грамаце. У дзяцінстве С.Каган любіла народную музыку, песні, пачала пісаць вершы. Звесткі пра яе юнацкія гады не захаваліся. Выйшаўшы замуж, жыла ў Бабруйску, выхоўвала трох сыноў. Загадвала гарадской бібліятэкай, была рабкорам газеты «Актобэр» («Кастрычнік»). У 1935 разам з сям'ёй пераехала ў Мінск, працавала ў бібліятэчным калектары, вучылася на вячэрнім аддзяленні філфака Мінскага педінстытута. Загінула ў мінскім гета ў першыя месяцы вайны.

Першыя вершы С.Каган былі надрукаваны ў газеце «Актобэр» ў 1929 (публікацыі не выяўлены). З 1932 змяшчала вершы ў часопісе «Штэрн» («Зорка») і артыкулы ў беларускім друку. Аўтар паэтычных зборнікаў «У дарозе», «Мая радзіма», «Нашы людзі», кніг прозы «Першая прэмія», «Скрыпач». Творам С.Каган уласцівы эмацыянальнасць, багацце паэтычнага ўяўлення, душэўная высакароднасць, шчыры патрыятызм. Лепшыя апавяданні пісьменніцы выйшлі асобным зборнікам на беларускай мове ў перакладзе З.Бядулі.

Р.Л.Рэлес.

Бібліяграфія

1.2.
У дарозе: Вершы. Мн., 1934 / Яўр.
Мая радзіма: (Вершы). Мн., 1938 / Яўр. Рэц.: Дзіменштэйн Н. Вершы Сары Каган // ЛіМ. 1939. 30 студз.
Першая прэмія: (Маналог старой жанчыны). Мн., 1938 / Яўр.
Нашы людзі: [Вершы]. Мн., 1940.
Скрыпач: [Апавяданні]. Мн., 1941 / Яўр.
1.3.
1932. Напамінак: [Верш] // Штэрн. № 7—8 / Яўр.; Піша Сеўрук Аляксандра // Чырв. змена. 1 мая.
1935. Старшыня гаворыць: [Паэма] // Штэрн. № 7 / Яўр.
1936. Дзяцінства: [Верш] // Штэрн. № 5 / Яўр.; «Вузкая баковачка з мокрымі сценамі...»: [Верш] // Там жа. № 12 / Яўр.

1937. У пакоі: [Верш] // Штэрн. № 10—11 / Яўр.; Женщина нашей советской страны: [Верш] // Сов. Бел. 24 окт.

1938. Джамбулу: [Верш] // Штэрн. № 5—6 / Яўр.; Счастливой стране: [Верш] // Работніца і калгасніца Бел. № 10; Материнский привет: [Верш] // Сталин. молодежь. № 99.

1939. Былое дзяцінства; Самае дарагое імя: [Вершы]; Прафесар Сяргей Міхайлавіч Мелкіх // Ардэнаносная Беларусь. Мн. / Яўр.; У гасцях: Апавяданне // Работніца і калгасніца Бел. № 18, 19; Радасныя сустрэчы: Апавяданне // Там жа. № 21; Крупская: [Верш] // Штэрн. № 2 / Яўр.; Прывітанне правадыру: [Верш] // Там жа. № 12 / Яўр.; Ён любіў свой народ: (Шолам-Алейхем) // Звязда. 15 крас.

1940. Мечты: [Верш] // Работніца і калгасніца Бел. № 1; [Вершы] // Штэрн. № 7—8 / Яўр.

1.5.

На беларускую мову. Апавяданні / Пер. З.Бядуля. Мн., 1940. Рэц.: М у р а ш к а Р. Два зборнікі апавяданняў // ЛіМ. 1940. 24 жн.

Бал пана Казіміра: Урывак з паэмы «Прамова старшыні» / Пер. І.Плаўнік // ЛіМ. 1935. 16 вер.; Радзіма: [Верш] / Пер. А.Жаўрук // Полымя рэвалюцыі. 1938. № 10; Звязда. 1938. 12 кастр.; Тры «Лявоніхі»: Паэма / Пер. К.Цітоў // Полымя рэвалюцыі. 1938. № 11; Букет Сталіну: [Верш] / Пер. Э.Агняцвет // Іскры Ілыча. 1939. № 10; Ганарлівы гусак: Байка / Пер. К.Цітоў // Звязда. 1939. 9 чэрв.; Першая прэмія: (Маналог пажылой жанчыны): Апавяданне / Пер. З.Бядуля // ЛіМ. 1939. 9 сак.

Т.М.Махнач.

КАГАН ЭЛЯ

Каган
Эля Шоламавіч
(10.2.1909, Мінск — 22.6.1944; пахаваны на армейскіх могілках каля Зэльвы Гродзенскай вобл.), паэт, празаік. Пісаў на яўрэйскай мове.

З сям'і настаўніка. Атрымаўшы пачатковую адукацыю, паступіў у прафтэхшколу абутнікоў, але ў 1928 яе пакінуў, бо жадаў цалкам аддаць сябе творчасці. У 1936—39 супрацоўнік часопіса «Штэрн» («Зорка»). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, быў карэспандэнтам газеты «Красный артиллерист». Загінуў у баі пад Зэльвай.

Выступаў у друку з 1926. Навелы Э.Кагана прывабліваюць дакладнасцю псіхалагічных дэталяў, гумарам і лірызмам. Сваіх герояў пісьменнік шукаў пераважна сярод дэкласіраваных элементаў, якія ў гады першых пяцігодак уцягваліся ў сацыялістычнае будаўніцтва, станавіліся рабочымі, членамі арцеляў, калгаснікамі. Дэмакратычны змест апавяданняў Э.Кагана здабыў яму папулярнасць сярод яўрэйскамоўнага чытача. Зрабіў (разам з З.Аксельродам) інсцэніроўку па творах М.Мойхер-Сфорыма «Маленькі чалавечак» (паст. у 1938). Перакладаў з рускай і беларускай моў.

І.Э.Багдановіч.

Бібліяграфія

1.2.

Апавяданні і мініяцюры. Мн., 1932 / Яўр. Рэц.: С е р а б р а н і Й. Добры пачатак // Штэрн. 1932. № 7—8 / Яўр.

Вершы. Мн., 1932 / Яўр. Рэц.: В і т к і н В. Аб кнізе Кагана «Вершы» // Штэрн. 1933. № 2 / Яўр.

Горад без цэркваў. Мн., 1935 / Яўр. К.; Харкаў, 1936 / Яўр.

Дзіцячыя апавяданні. Мн., 1936 / Яўр.

Вясёлая сямейка: Апавяданні. Харкаў; Адэса, 1937 / Яўр.

Розныя апавяданні. Мн., 1940 / Яўр. Рэц.: Я б р а ў Г. Навелы Элі Кагана // ЛіМ. 1941. 8 лют.

1.3.

1928. Гліняная нявеста: [Апавяданне] // Штэрн. № 3—4 / Яўр.; У мяне ў люстэрку: [Апавяданне] // Там жа. № 5—6 / Яўр.

1929. Зялёны месяц травень: [Апавяданне] // Штэрн. № 8—9 / Яўр.

1930. Нованароджаны: [Апавяданне] // Штэрн. № 1 / Яўр.; Сёлетняя зіма; Электрычнасць: [Апавяданні] // Там жа. № 2—3 / Яўр.

1932. Роднае поле: [П'еса ў 3 дзеях] // Штэрн. № 3 / Яўр.

1933. Горад без цэркваў: [Апавяданне] // Штэрн. № 7. / Яўр.; Наган будзе страляць: [Апавяданне]; Заметкі аб нашай маладой прозе // Там жа. № 10—11 / Яўр.; Там, дзе быў стэп...: (Ліст з Магнітагорска) // ЛіМ. 26 чэрв. / Сааўт. Б.Мікуліч; Нататкі пра яўрэйскую маладую прозу // Там жа. 26 кастр.

1934. Вясёлыя падзеі: [Апавяданне] // Штэрн. № 8—9 / Яўр.; Тры прыступкі: [Апавяданне] // Там жа. № 12 / Яўр.

1935. Вялікі пажар: [Апавяданне] // Штэрн. № 7 / Яўр.

1936. [Гумарэска] // Штэрн. № 3 / Яўр.; Дзяржаўны яўрэйскі тэатр Беларусі ў Бабруйску // Камуніст. 10 лют.; «Бойтрэ» на сцэне // ЛіМ. 31 мая.

1937. Настаўніца: [Апавяданне] // Штэрн. № 5 / Яўр.

1938. Тры яблыкі: [Навела] // Штэрн. № 2 / Яўр.

1947. Маладое жыццё; Берэшухман: [Апавяданне] // Цвёрдым поступам. Мн. / Яўр.

1.4.

Гогаль М. Каляска / З рус. Мн., 1938 / Яўр.

Гогаль М. Аповесці / З рус. Мн., 1939 / Яўр.

Герцэн А. Хто вінаваты? / З рус. Мн., 1940 / Яўр.

1937. Пушкін А. Гісторыя сяла Гарухіна / З рус. // Штэрн. № 1 / Яўр.

1938. Самуйлёнак Э. Дружба / З бел. // Штэрн. № 8 / Яўр.

1939. Салтыкоў-Шчадрын М. Шалёны памешчык: [Апавяданне] / З рус. // Штэрн. № 5 / Яўр.

1940. Іваноў У. Няшчасце: [Апавяданне] / З рус. // Штэрн. № 5 / Яўр.; Бядуля З. У дрымучых лясах: [Аповесць] / З бел. // Там жа. № 9—10 / Яўр.

1.5.

На беларускую мову. Дружная сямейка: Апавяданне / Пер. З.Бядуля. Мн., 1940.

Маем зялёным: Апавяданні / Пер. Я.Скрыган. Мн., 1979.

Вялікі пажар: Навела / Пер. С.Левін // Полымя рэвалюцыі. 1936. № 7; Радзіма: [Верш] / Пер. А.Жаўрук // Іскры Ілыча. 1938. № 11; Дружная сямейка: Апавяданне / Пер. З.Бядуля // Там жа. 1939. № 4; Люстэрка: Апавяданне / Пер. З.Бядуля // Полымя рэвалюцыі. 1939. № 5—6; Выкліканне: Апавяданне / Пер. З.Бядуля // ЛіМ. 1939. 3 кастр.

На рускую мову. От весны до осени: Новелла / Пер. М.Минский // Рабочий. 1929. 13 авг.

2.3.

На беларускай мове. Даўгапольскі Ц. Ад «Глінянай нявесты» да «Васюткіна» // ЛіМ. 1933. 31 кастр.; Клімковіч М. Маладая драматургія // Там жа. 1950 19 жн.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Рэлес Р. У памяці сяброў і чытачоў: Да 60-годдзя з дня нараджэння Элі Кагана // ЛіМ. 1969. 7 лют.; Хведаровіч М. Загінуў у баях за Радзіму // Там жа. 1979. 9 лют.; Ш. Літаратурная канферэнцыя нацменшасцей // Палес. праўда. 1930. 20 чэрв.

На яўрэйскай мове. Даўгапольскі Ц. Ад «Глінянай нявесты» да «Васюткіна» // Штэрн. 1933. № 10—11; Дунец Х. Аб творчасці Х.Сітаса і Э.Кагана // Там жа. 1933. № 5—6; Платнер А. Глядзеў на свет здзіўленымі вачыма: [Успаміны] // Савеціш Геймланд. 1979. № 3.

З.У.Драздова.

КАГАНЕЦ КАРУСЬ

Каганец Карусь
[сапр. Кастравіцкі Казімір-Рафаіл Карлавіч; інш. псеўд. Будзімір, К.Шашаль; крыпт. К.К.; 29.1(10.2). 1868, Табольск — 20.5.1918, в. Прымагілле Койданаўскай вол. Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл.; пахаваны ў в. Навасёлкі ля Койданава (Дзяржынска)],
празаік, паэт, драматург, мастак, грамадскі дзеяч.

Выйшаў са старадаўняга беларускага шляхецкага роду (даводзіўся сваяком Гіёму Апалінэру). Бацька пісьменніка Карл Самуілавіч Кастравіцкі (1813—73), валодаў невялікім спадчынным маёнткам Навасёлкі на Койданаўшчыне, меў агранамічную адукацыю, любіў музыку. Маці, Юлія, паходзіла з вя-

домага на Беларусі шляхецкага роду Свентарэцкіх (з-пад Стоўбцаў), скончыла інстытут у Вільні. За ўдзел у паўстанні 1963 бацьку (ён быў членам-рэферэнтам паўстанцкай арганізацыі на Міншчыне) саслалі ў Табольск, а яго маёнтак канфіскавалі. У Табольску з ім жыла і сям'я (жонка, дзеці Станіслаў і Дарота). Тут нарадзіўся і будучы пісьменнік. У 1870 ссыльнаму з сям'ёй было дазволена перабрацца ў Казанскую губ. і пасяліцца ў г. Цывільску (цяпер Чувашыя). У 1872 Кастравіцкім было дазволена вярнуцца на радзіму, і яны пасяліліся ў вёсцы Засулле (цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл.). Хутка пасля вяртання бацька памёр. Праз некаторы час маці другі раз выйшла замуж — узяла ў прымы селяніна. У 1880 г. сям'я пераехала ў в. Юцкі (Прымагілле) ля Койданава. У дзяцінстве Казімір пакалечыўся, і ў яго вырас горб. Пачатковую адукацыю атрымаў дома, пасля вучыўся ў Мінскім гарадскім вучылішчы. Імкнучыся авалодаць жывапісным і скульптурным майстэрствам, у 1890-я г. паступіў у Маскоўскае вучылішча жывапісу, лепкі і дойлідства. Ёсць звесткі, што К.Каганец вучыўся таксама ў Пецярбургу. Аднак адукацыю не завяршыў з-за адсутнасці сродкаў і вымушаны быў вярнуцца ў Прымагілле, каб заняцца сялянскай працай. У 1899 К.Каганец ажаніўся з Ганнай Канстанцінаўнай Пракаповіч і асеў на сталае жыхарства ва ўрочышчы Ліссі Норы (Прымагілле). Кавалак зямлі аказаўся малаўрадлівы, таму, каб утрымаць сям'ю, у якой было чацвёра дзяцей (Янка, Мірон, Галіна і Мілена) ён вымушаны быў шукаць дадатковы заробак — працаваў у чайной у Мінску (1901—02), мастацкай майстэрні ў Рызе (1902), Мінскім таварыстве дабрачыннасці (1902—04), потым служыў дзесятнікам у Лідзе на будаўніцтве чыгункі Балагое — Седльцэ. К.Каганец — актыўны ўдзельнік і ідэолаг нацыянальна-вызваленчага руху ў Беларусі, быў адным з заснавальнікаў і кіраўнікоў Беларускай рэвалюцыйнай грамады і Беларускай сацыялістычнай грамады, удзельнічаў у іх з'ездах, распрацоўваў праекты праграм і рэзалюцый. У 1904 і 1905 без выніку звяртаўся ў галоўнае ўпраўленне па справах друку аб выданні ў Мінску беларускай газеты «Палессе» (рэдактарам меўся быць Д.Бохан). Прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях 1905—07. За агітацыйную дзейнасць сярод сялян Койданаўшчыны 19 снежня 1905 быў арыштаваны і, пакуль ішло следства, да 16 мая 1906 сядзеў у мінскай турме. Выпушчаны з турмы да суда, жыў выпадковымі заробкамі. Вясной 1910 адбыўся суд: Віленская судовая палата на пасяджэнні ў Мінску прыгаварыла К.Каганца да года зняволення ў мінскай турме. За турэмнымі сценамі многа пісаў, маляваў, зрабіў ілюстрацыі да твораў Я.Коласа, які знаходзіўся ў той жа турме (малюнкі не захаваліся). Пасля выхаду на волю доўга не мог знайсці работу. Толькі ў пачатку 1912 удалося атрымаць пасаду аканома ў фальварку Жортай (цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл.) у пана Копаця, дзе працаваў да вясны 1918. Старшынстваваў на з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый (Мінск, 25—27 сакавіка 1917). Абвастрэнне даўняй хваробы — туберкулёзу лёгкіх — вымусіла пераехаць да брата ў Прымагілле, дзе пісьменнік памёр.

Літаратурную дзейнасць К.Каганец пачаў у канцы 19 ст. Самыя раннія з дайшоўшых да нас яго твораў датуюцца 1893. Артыкулы, апрацоўкі народных легенд друкаваў ў газетах «Минский листок» і «Северо-Западный край», потым супрацоўнічаў з «Нашай нівай». Пры жыцці асобным выданнем выйшлі «Беларускі лемантар» і вадэвіль «Модны шляхцюк». Творчая спадчына пісьменніка жанрава разнастайная: проза, паэзія, драматургія, публіцыстыка. Большасць яго апавяданняў маюць легендарны каларыт, асаблівую рытмічна-сказавую стылёвую манеру. У аснове іх ляжаць мясцовыя легенды, народныя паданні. Адштурхоўваючыся ад фальклорнай асновы, К.Каганец ярка і дынамічна перадае сюжэт, напаўняе творы трапнымі мастацкімі дэталямі. Заўважаецца моцны ўплыў гутарковай мовы. Ёсць у пісьменніка апавяданні, напісаныя на сучасным яму матэрыяле, якія вызначаюцца рэалістычнасцю малюнкаў з побыту плытнікаў і леснікоў, завостранасцю матываў сацыяльнай няроўнасці. Пісаў навукова-папулярныя нарысы для дзяцей, якія ўвайшлі ў школьную чытанку, заказаную К.Каганцу выдавецтвам «Загляне сонца і ў наша аконца» (па невядомых прычынах кніга не выйшла). У публіцыстычных артыкулах К.Каганца ставяцца праблемы беларускага нацыянальнага адраджэння, пытанні культуры, мовы, асветы. Паэзія К.Каганца пераважна публіцыстычная, у ідэйным плане яна пераклікаецца з некаторымі вершамі Ф.Багушэвіча, Цёткі. Ужо ў першым вядомым вершы «Наш сымболь» (1893) заклікаў: «За родную краіну, звычай і мову, За гонар груддзю ставайце!». Аўтар рэлігійных вершаў, паэмы «Чысты чацвер». У паэзіі актыўна карыстаўся фальклорнай вобразнасцю, паэтыкай. Гэтую яго асаблівасць заўважыў і станоўча ацаніў М.Багдановіч. Значнае месца ў творчасці пісьменніка займала драматургія: ён аўтар вадэвіля «Модны шляхцюк», бытавых драм «У іншым шчасці няшчасце схавана» і «Двойчы прапілі», няскончаных гістарычных драм «Старажавы курган» і «Сын Даніла». Вадэвіль «Модны шляхцюк» карыстаўся вялікай папулярнасцю, быў адным з першых твораў нацыянальнага тэатральнага рэпертуару (у 1910 ставіўся трупай І.Буйніцкага, у 1918 — Першым беларускім таварыствам драмы і камедыі, у 1928 — БДТ—2). К.Каганец вёў таксама актыўную асветніцкую дзейнасць, выступаў як вучоны-мовазнавец, фалькларыст і этнограф, збіраў матэрыялы да слоўніка роднай мовы, складаў беларускую граматыку. Таленавіты жывапісец, графік і скульптар. У час вучобы ў Маскоўскім мастацкім вучылішчы вылепіў бюст Івана Грознага (гэта праца была высока ацэнена яго настаўнікамі). Займаўся разьбой па дрэве і слановай косці. Захаваліся яго цікавыя графічныя малюнкі алеем, тушшу і алоўкам («Тып беларуса», «Зімовы краявід», «Маці», «За сахой», «На ростаньках», «Буслы»). Рабіў палітычныя карыкатуры, упрыгожваў пейзажамі і арнаментам бытавыя рэчы, афарміў вокладку кнігі Я.Коласа «Другое чытанне для дзяцей беларусаў». М.Багдановіч прысвяціў К.Каганцу верш, у якім высока ацаніў яго літаратурную і грамадскую дзейнасць. Л.Рагоўскі паклаў на музыку яго верш «О Божэ, Спасе наш». Частка рукапіснай спадчыны пісьменніка пасля яго смерці трапіла да Я.Лёсіка, які апублікаваў яе ў «Беларусі» (1919) і «Вольным сцягу» (1921). Рукапісы К.Каганца захоўваюцца ў Нацыянальнай б-цы Беларусі, асобныя аўтографы і творы мастацтва — у БДАМЛіМ, Цэнтральнай б-цы АН Літвы ў Вільнюсе.

У 1988 на магіле пісьменніка ў Навасёлках пастаўлены помнік.

З.П.Мельнікава.

Бібліяграфія

1.1.

Творы. Мн., 1979. Рэц.: Ермаловіч М. Выдадзена ўпершыню // Полымя. 1979. № 12; Лойка А. Вяртанне // ЛіМ. 1979. 29 чэрв.

1.2.

Беларускі лемантар, або Першая навука чытання. Пб., 1906 / Кірыл., лац. Без подпісу.

Модны шляхцюк: Бытавая камедыя ў 1-ой дзеі. Пб., 1910.

У іншым шчасці няшчасце схавана. Вільня, 1919.

Модны шляхцюк: П'еса ў 1-ой дзеі. Крапіўніцкі М. Па рэвізіі: Камедыя ў 1-ой дзеі. Вільня, 1928. Рэц.: Новая кніжка // Бел. крыніца. 1928. 6 сак.

1.3.

1902. Бывалы Юр у Менску: [Апавяданне] // Мин. листок. 5 сент.; «Чым болей хто мае, тым болей жадае», або Адкуль мядзведзі на свеце ўзяліся: (З оповеданя Петра Самохвала у Новом Селе) // Сев.-Зап. край. 25 дек.

1903. Белорусские легенды. Прилуки: Поведанне з-под Кейданова // Сев.-Зап. край. 19 янв.; Засульскія туры: (Белорусские легенды) // Там жа. 28 мая; Навасадскае замчышча // Там жа. № 35; Яшчэ некалькі слоў пра перажыткі паганства ў беларусаў // Там жа. № 113.

1904. «Адважна, браце, уперад ідзіце!...»: [Верш] // Вялікодная пісанка. Пб., [1904] / Пад крыпт. К.К.; Окліч: [Верш] // Песні. [Б.м.] / Без подпісу.

1909. Прамова // Н.н. 17 снеж.

1910. Малітва: [Верш] // Першы беларускі каляндар «Нашай Нівы» на 1910 год. Вільня; Кабзар: [Верш] // Н.н. 14 студз.

1911. Прамова; Наш сімвал: (Гімн) // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1911 год. Вільня; Сцяты камень: [Верш] // Н.н. 7 ліп.; Прылукі: Апавяданне // Там жа. 28 ліп.; Навасадскае замчышча: (Народная легенда) // Там жа. 1 вер.; Журавель і чапля: Казка // Там жа. 3 ліст.; Што кажух, то не вата: Апавяданне // Там жа. 15 снеж.

1912. Кабзар: [Верш] // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1912 год. Вільня; Бярэзіна-Любошанская, Мін. губ., Бар. пав.: [Карэспандэнцыя] // Н.н. 26 крас.

1914. Сцяты камень: [Верш] // Апавяданні і легенды розных аўтараў. Вільня; Песня зіме; Сцяты камень: [Вершы]; Што кажух, то не вата: Апавяданне // Беларускі каляндар на 1914 г. Вільня.

1917. Навасадскае замчышча; Халера 40-га року: [Апавяданні] // Вольная Беларусь. 23 жн.; Засульскія Турэ; Ваўчок: [Апавяданні] // Там жа. 28 жн.

1918. Модны шляхцюк: Бытавая камедыя ў 1-ой дзеі // Зборнік сцэнічных твораў. Мн. Сш. 2; Адкуль зязюля ўзялася?: (З народнага апавядання з-пад Немну) // Вольная Беларусь. № 29; Прылукі; Вітаўка; Чым болей хто мае, тым болей жадае, або Адкуль мядзведзі на свет узяліся; Ня той міл Богу, хто многа знае, а той, хто шчыра да Яго павяртае: (З цыклу «Беларускія легенды») // Там жа. 22 вер.; Вандроўка кроплі вады; Машэка; Скрыпач і ваўкі: [Апавяданні] // Там жа. 29 вер.; Такая доля: [Апавяданне] // Там жа. 20 кастр.; З папераў К.Каганца: Атвет дзяўчыны; Мужык і пан; Кра-Кра; Ку-ку і інш. // Там жа. № 37; Сцяты камень: [Верш] // Гоман. 7 чэрв.; Навасадскае замчышча: [Апавяданне] // Там жа. 11 чэрв.

1919. Адважна, браця, наперад ідзіце: [Верш] // Бацькаўшчына (Гродна). 15 сак.; Жніва: [Верш] // Бел. жыццё. 15 жн.; Іскры: [Верш] // Бел. думка. 10 чэрв.; Пра пана Ленскага; Нёман; Згадка пра Галубка; Чы праўда гэта?; Думка пра кн. Рамана Сангушку; Былое: [Вершы] // Беларусь. 12 снеж.; Збор; Наша доля маладзецкая: [Вершы] // Там жа. 13 снеж.; Наш покліч; Наш сімвал; Плач беларуса: [Вершы] // Там жа. 14 снеж.; Старажовы курган: [П'еса ў 3-х актах] // Там жа. 16 снеж.; Беларус; На мабілізацыю; Палессе: [Вершы] // Там жа. 18 снеж.; У іншым шчасці няшчасце схавана: П'еса ў 5 частках; Парада // Там жа. 19 снеж.; Каляды: [Верш] // Там жа. 25 снеж.; Двойчы прапілі: Драма ў 4-х часцях // Там жа. 25, 28, 30 снеж.

1920. Год: [Апавяданне] // Беларусь. 1 студз.; З рэферату на калядны сход Беларускай грамады 1903 года // Там жа. № 6; Сын Даніла: (П'еса ў 3-х актах) // Там жа. 31 сак., 4 крас.

1921. Модны шляхцюк: [П'еса] // П'есы. Вільня, [1921]; Адважна, браццяі: [Верш] // Дэкламатар. Вільня; Бел. ведамасці. 23 кастр.; «Да настала ж бо маё святанька...»; «Лясы, боры і дубровы...» [Вершы] // Вольны сцяг. № 2; Нашы птушкі: Варона; Крумкач; Груган або грач; Галіца; Сарока; Сіневаронка; Сойка; Шпак; Мірэза й дрозд; Салавей // Зоркі. № 2.

1922. Няскончаныя творы: Бутрымава прыгода; Страшнае заклінанне; З нашага жыцця; На сплаў; На сплаве; Тры алешыны; Забойства ў пушчы // Адраджэнне. Сш. 1.

1923. Кабзар; Нёман; Наш покліч: [Вершы]; У іншым шчасці няшчасце схавана: [П'еса] // Выпісы з беларускае літаратуры. Мн.

1927. Прамова; Прылукі; Што кажух, то не вата; Журавель і чапля: [Байка]; На сплаў; Навасадскае замчышча: [Апавяданні]; Кабзар; Сцяты камень: [Вершы]; Модны шляхцюк: [П'еса] // Дварчанін І. Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры (ад 1905 году). Вільня.

1928. Адважна, браццяі: [Верш] // Беларускі дэкламатар. Вільня; Салавейка мілы; Жайваронча малы; Сонейка прыгрэла: [Вершы] // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел». № 17; Мая першая ахота; Ахота віцгубернатара на мядзведзя; Забойства Захаркі; Восенню: [Апавяданні]: «Браты мае родныя...»; «Які ж то вецер буйны грае...»; «Ветры буйны загулялі...»: [Вершы] // Маладняк. № 10.

1961. Кабзар: [Верш] // Анталогія беларускай паэзіі: У 3 т. Мн. Т. 1.

1965. Прылукі; Што кажух, то не вата: [Апавяданні] // Беларуская дакастрычніцкая проза. Мн.

1967. Бывалы Юр у Менску; Што кажух, то не вата: [Апавяданні] // Анталогія беларускага апавядання: У 2 т. Мн. Т. 1; Кабзар; Песня зіме: [Вершы] // Беларуская дакастрычніцкая паэзія. Мн.

1968. Што кажух, то не вата: [Апавяданне] // Вожык. № 3.

1972. Што кажух, то не вата: [Апавяданне] // Ніва. 16 студз.

1975. У іншым шчасці няшчасце схавана: [Драматычны абразок]; Модны шляхцюк: [П'еса] // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі. Мн. Т. 1.

1978. Модны шляхцюк: Бытавая камедыя ў адной дзеі; Старажовы курган; Сын Даніла: [Драмы]; У іншым шчасці няшчасце схавана; Двойчы прапілі: [П'есы] // Беларуская дакастрычніцкая драматургія. Мн.

1.4.

Гутаркі аб небе і зямлі. Пб., 1907 / Пер. пад сваім прозв. Сааўт. пер. С.Шаўлоўскі.

1921. Залескі Б. «У тры шляхі ідуць ляхі...»: [Верш] / З укр. // Вольны сцяг. № 2.

1.5.

На нямецкую мову. Am Bogen / Übers. N.Randow // Störche über den Sümpfen. Berlin, 1971.

На ўкраінскую мову. Кобзар: [Верш] / Пер Р.Лубківський // Слов'янське небо. Львів, 1972.

2.3.

На беларускай мове. А.Л.[Луцкевіч А.] Каганец: (Пасмертны ўспамін) // Гоман. 1918. 7 чэрв.; Александровіч С. Без надзеі і жыццё не жыццё... // ЛіМ. 1978. 10 лют.; Яго ж. Карусь Каганец // Каганец К. Творы. Мн., 1979; Яго ж. На глебе народнай: Да стагоддзя з дня нараджэння Каруся Каганца // ЛіМ. 1968. 9 лют.; Ахрыменка П. Тарас Шаўчэнка і Беларусь. Мн., 1969. С. 72—73; Б-і Н.

[Дыла Я.] Палкае сэрца: (Памяці К.Каганца) // Сав. Бел. 1928. 20 мая; Багдановіч А. Новая беларуская літаратура. Віцебск, 1925. С. 5; Баршчэўскі А. Нашаніўская пара: Карусь Каганец (1868—1918) // Ніва. 1973. 2, 9, 16, 23 снеж.; 1974. 6, 13, 20 студз.; Біч М. Ад родных ніў: Грамадска-палітычныя погляды Каруся Каганца // Полымя. 1988. № 3; Бутакоў А. Беларускі тэатр у перыяд паміж дзвюма рэвалюцыямі // Там жа. 1954. № 12; Бядуля З. Загінуўшыя на цяжкім шляху // Сав. Бел. 1926. 14 вер.; Віж М. «Хай люд прачынаецца...»: Да 120-годдзя Каруся Каганца // Голас Радзімы. 1988. 18 лют.; Власт [Ластоўскі В.]. Да характарыстыкі Каганца // Сав. Бел. 1928. 20 мая; Вуэс. Карусь Каганец // Грамадзянін. 1928. № 10; Гардзіцкі А. Чарговыя тамы... // ЛіМ. 1973. 3 жн.; Гарэцкі М. Карусь Каганец // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1920; 2 выд. Вільня, 1921; 3 выд. Вільня, 1924; 4 выд. Мн., 1926; Германовіч І. Карусь Каганец // Германовіч І. Беларускія моваз-наўцы. Мн., 1985; Яго ж. Карусь Каганец як моваз-навец // Веснік БДУ. Серыя 4. 1974. № 3; Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. Мн., 1983. Т. 1. С. 366—369, 397—398; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1969. Т. 2. С. 264—268, 273—275; Гісторыя беларускай літаратуры. XIX — пачатак XX ст. Мн., 1981. С. 180—185; Грынчык М. Максім Багдановіч і народная паэзія. Мн., 1963. С. 115—117; Знаёмы. Беларускі тэатр // Бел. шлях. 1918. 8 крас., 16 ліп.; Зямкевіч Р. Стары Мінск у беларускіх успамінах: Календары [Мітрафана] Доўнар-Запольскага і А.Слупскага; Генрык Татур; Іван Неслухоўскі [Янка Лучына]; Карусь Каганец // Беларусь. 1919. 26, 27 ліст.; 1920, 3, 13 студз.; К. Б. Карусь Каганец (К.Каструвіцкі) // Бацькаўшчына (Гродна). 1919. 15 сак.; Кабаковіч А. Беларускі свабодны верш. Мн., 1984; С. 46—48; Карусь Каганец: [Некралог] // Бел. шлях. 1918. 24 мая; Каспяровіч М. Карусь Каганец: (Да 10-й гадавіны смерці) // Маладняк. 1928. № 10; Яго ж. На Каганцовай магіле // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.». 1928. № 17; Яго ж. Там, дзе тварыў Каганец // Наш край. 1928. № 10; Каханоўскі Г. Вяртанне // Каханоўскі Г. Адчыніся, таямніца часу. Мн., 1984. С. 107—110; Яго ж. Так пачыналася // ЛіМ. 1980. 8 жн.; Ластаўка П. У 20-я ўгодкі смерці К.Каганца // Злучэнне. 1938. № 9; Лаўшук С. Станаўленне беларускай савецкай драматургіі: (20-я — пач. 30-х гг.). Мн., 1984. С. 8—10; Ліс А. Ушанаваць памяць пісьменніка-дэмакрата // ЛіМ. 1984. 20 студз.; Лойка А. Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд. Мн., 1977. Ч. 1. С. 226—227; Яго ж. Плеяда старэйшых адраджэнцаў // Лойка А. Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд. Мн., 1980. Ч. 2. С. 375—379; Марціновіч А. На сёння і на ўсе часы // Голас Радзімы. 1979. 1 ліст.; Мачульскі В. К.Каганец як пісьменнік і грамадзянін // Сав. Бел. 1928. 20 мая; Нашы песняры // Бел. жыццё. 1919. 21 вер.; Палуян С. Таленавіты мастак // Беларусь. 1956. № 7; С.П. Карусь Каганец (Каструвіцкі) // Варта. 1918. № 1; Сабалеўскі А. Карусь Каганец // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі. Мн., 1975. Т. 1; Семяновіч А. Беларуская драматургія: (Дакастрычніцкі перыяд). Мн., 1961. С. 102—115; 220—222; Яго ж. Карусь Каганец // Семяновіч А. Гісторыя беларускай драматургіі: XIX — пач. XX ст. Мн., 1985; Яго ж. Проза Якуба Коласа: (Дакастрычніцкі пераяд). Мн., 1953. С. 35—36; Скалабан В. Па слядах Сяргея Мглінскага // Мастацтва Беларусі. 1986. № 1; Тутэйшы. Весткі з краю: Радашковічы, 23 чэрвеня // Бел. шлях. 1918. 11 ліп.; Уласаў А. К.Каструвіцкі і Г.Татур // Там жа. 1918. 26 мая; Усікаў Я. Беларуская камедыя. Мн., 1979. С. 166—169; Фіглоўская Л. Карусь Каганец // Беларусь. 1946. № 1; Шкраба Р. Карусь Каганец // ЛіМ. 1946. 27 мая; Шлюбскі А. Беларуская палітычная карыкатура // Маладняк. 1927. № 10; Ь. Дзве страты // Вольная Беларусь. 1918. 9 чэрв.; Я.Н. [Найдзюк Я.] Прыкладная постаць Каруся Каганца // Шлях моладзі. 1938. № 16; Ярош М. Янка Купала і беларуская паэзія. Мн., 1971. С. 123.

На нямецкай мове. Randow N. Über die Autoren // Störche über den Sümpfen. Berlin, 1971. S. 491.

На польскай мове. Turonek J. Geneza i autorstwo pierwszego elementarza białoruskiego // Sl. Orient. 1986. Nr 3.

На рускай мове. Дробов Л. Живопись Белоруссии XIX — начала XX в. Мн., 1974. С. 221, 252, 265, 280—284, 302; Зайцев М. «Чтоб люд пробуждался...» // Неман. 1988. № 3; История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 505—506; Карский Е. Белорусы. Пг., 1922. Т. 3. Вып. 3. С. 400—401; Киселев В. К границе Гродненской области // Киселев В. На истоках неманских. Мн., 1985. С. 106; Клейнборт Л. Карусь Каганец (Казимир Костровицкий) // Клейнборт Л. Молодая Белоруссия. Мн., 1928. С. 259—266; Неопубликованные рукописи // Сов. Бел. 1941. 9 янв.; Селиванова О. Детская книга // Там жа. 1941. 16 марта.

На ўкраінскай мове. Охрименко П. Шляхамі братання. К., 1968. С. 77—78.

2.4.

На беларускай мове. Багдановіч М. Каганцу: [Верш] // Багдановіч М. Зб. тв.: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1.

3.1.

Нац. б-ка Беларусі, аддз рукап., адз. зах. 091/4297, 091/4298, 091/4299, 091/4300; ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап., ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, с. 152; ЦБ АН Літвы, аддз. рукап., ф. 21, адз. зах. 208, 209.

З.У.Драздова.

КАЖАДУБ АЛЕСЬ

Кажадуб Алесь (Аляксандр Канстанцінавіч; н. 27.9.1952, Ганцавічы Брэсцкай вобл.), празаік. Член СП Беларусі з 1981.

З сям'і служачых. Бацькі пісьменніка, Канстанцін Александравіч і Лідзія Адамаўна, адпраўляючыся на работу, часта былі вымушаны пакідаць сына ў суседзяў-настаўнікаў. І хлапчук, застаўшыся адзін, гартаючы кніжкі, даволі рана, амаль самастойна навучыўся чытаць. У 1974 А.Кажадуб скончыў аддзяленне рускай мовы і літаратуры філфака БДУ, затым настаўнічаў у в. Крайск Лагойскага р-на. З 1975 малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства АН БССР, з 1977 рэдактар рэспубліканскага тэлебачання, з 1981 літсупрацоўнік аддзела публіцыстыкі часопіса «Маладосць». У 1983—85 вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве. З 1986 на творчай працы.

Першае апавяданне «У канцы лета», якое можна лічыць пачаткам сталай літаратурнай працы, надрукавана ў часопісе «Маладосць» у 1976. У 1980 выйшла першая кніга прозы «Гарадок». У цэнтры ўвагі пісьменніка штодзённы побыт вясковага чалавека. Разам з тым канкрэтнаму назіранню ён імкнецца надаць абагульняючы сэнс, найчасцей — праз скразное, умоўна-алегарычнае гучанне цэлага твора, якому ўласцівы элементы травесційнасці, іншасказальнасці, разняволенай умоўнасці апавядання. Аўтар аповесці «Дуб» (1990), прысвечанай сучаснай вясковай моладзі.

Жыве ў Маскве.

І.В.Жук.

Бібліяграфія

1.2.

Гарадок: Апавяданні і аповесці. Мн., 1980 (Першая кніга празаіка). Рэц.: Марціновіч А. Знайсці сябе — няпроста... // ЛіМ. 1980. 18 ліп.; Чигринова Т. «Городок» на планете Земля: Заметки о первой книге прозы // Знамя юности. 1981. 7 апр.

Размова: Аповесці і апавяданні. Мн., 1985.

Лесавік: Аповесці і апавяданні. Мн., 1987.

Дарога на замчышча: Аповесці. Мн., 1990.

1.3.

1976. У канцы лета: Апавяданне // Маладосць. № 12.

1977. Трэці круг: Апавяданне // Маладосць. № 7.

1979. Два мужыкі і пан: [Казка] // Бярозка. № 11.

1980. Лютаўскай замецццю: Апавяданне // Маладосць. № 1; Размова; Транзістар: Апавяданні // Полымя. № 11; У канцы лета: Урывак з апавядання // Голас Радзімы. 10 ліп.

1981. Мае рэкі: [Апавяданне] // ЛіМ. 30 кастр.

1982. Вяселле ў паўднёвым горадзе; Настаўнікі: Апавяданні // Маладосць. № 12; Старая хата: Маленькая аповесць // Полымя. № 2.

1984. Высока сонейка, высока: Аповесць // Маладосць. № 7. Рэц.: Астраўцоў С. Буслы застаюцца // ЛіМ. 1984. 26 кастр.; Крокі Валюхі, красавік, 46-ы; На восеньскай рацэ; Вяселлі: Апавяданні // Полымя. № 4.

1985. Кудаса: Апавяданне // Беларусь. № 9.

1.5.

На рускую мову. Высоко солнышко, высоко: Повести, рассказы / Пер. О.Афанасьев. М., 1989.

Февральские метели: Рассказ / Пер. Н.Коняев // Неман. 1981. № 6; Старая хата: Маленькая повесть / Пер. Т.Смолянская // Там жа. 1983. № 12; Ошибка: Рассказ / Пер. автор // Юность. 1985. № 6.

На ўкраінскую мову. У кінці літа: [Апавяданне] / Пер. М.Крилов // Рідня. К., 1980.

2.3.

На беларускай мове. Савік Л. Дарогі ў жыццё // Маладосць. 1985. № 2; Шамякіна Т. У імкненні да ідэалу // Полымя. 1983. № 7; Шкраба Р. Пошукі слова // Там жа. 1985. № 10; Шупенька Г. Найважней — біяграфія душы // Голас Радзімы. 1980. 10 ліп.

Я.А.Гарадніцкі.

КАЗАК РЫГОР

Казак Рыгор (псеўд. Кастусь Рамановіч, Рыгор Крушына, 3.12.1908, в. Бязверхавічы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. — 27.3.1979, штат Вірджынія, ЗША, пахаваны на могілках ля Саўт Рывер, штат Нью-Джэрсі), паэт, празаік, крытык. Член СП Беларусі з 1934.

З сям'і паштовага служачага. Дзіцячыя гады правёў у Вільні. На летнія канікулы выязджаў на Случчыну, дзе жыў сярод беларускіх сялян. З 1914 разам з бацькамі знаходзіўся ў Разані; пасля вайны вярнуўся на Случчыну. У 1925 паступіў у Мінскі педтэхнікум, дзе зблізіўся з творчай моладдзю (у 1927 уступіў у «Маладняк»). У 1935 закончыў Маскоўскі інстытут кінематаграфіі. Застаўшыся на акупіраванай тэрыторыі, супрацоўнічаў у друку («Беларуская газэта», «Беларускі работнік», «Раніца»). З 1944 у Германіі. У 60—70 г. жыў у ЗША. Быў прыняты ў ПЭН-клуб.

Друкавацца пачаў у 1927. У 1930 (у сааўтарстве) выдаў у Гомелі зборнік вершаў «Разгон». Пісаў пра сацыялістычныя пераўтварэнні, прыроду Случчыны і Гомельшчыны, каханне. У 1931 аб'яднаў свае вершы ў зборнік «Паэзія чырвонаармейца». Перакладаў на беларускую мову творы рускіх, грузінскіх, украінскіх, польскіх і інш. аўтараў. У канцы 1930-х г. падрыхтаваў да друку зборнік вершаў «Шкумат пачуцця», які застаўся нявыдадзеным. У перыяд акупацыі публікаваў пераважна пейзажна-інтымную лірыку. У эміграцыі выдаў пад псеўданімам Рыгор Крушына зборнікі паэзіі «Лебедзь чорная», «Выбраныя творы», «Вячорная лірыка», «Хвіліна роздуму», «Вясна ўвосень», «Дарогі», «Сны і мары», у якіх выказаны пачуцці тугі па Радзіме, любві да жанчыны (паэма «Эротава скрыпка»). Пасля смерці Р.Казака застаўся ў рукапісе зборнік «Рэквіем», незакончаныя паэмы. У ЗША жыве яго сын Ігар, які захоўвае спадчыну пісьменніка.

А.В.Мальдзіс.

Бібліяграфія

1.1.

Выбраныя творы. Нью-Ёрк; Мюнхен, 1957 / Пад псеўд. Рыгор Крушына

1.2.

Паэзія чырвонаармейца: [Вершы]. Мн., 1931. Рэц.: Ажгірэй В. Цёплы ўспамін на адлежаным фрэнчы, або «Паэзія чырвонаармейца» Р.Казака // Сав. Бел. 1932. 9 крас.

Лебедзь чорная: [Вершы]. [Б.м.], 1947 / Пад псеўд. Рыгор Крушына.

Kalychanka: Paema. Rym, 1953 / Пад псеўд. Рыгор Крушына.

Вячорная лірыка: [Вершы]. Нью-Ёрк; Мюнхен, 1963 /. Пад псеўд. Рыгор Крушына.

Хвіліна роздуму: [Вершы]. Нью-Ёрк; Мюнхен, 1968 / Пад псеўд. Рыгор Крушына.

Вясна ўвосень: [Вершы]. Нью-Ёрк; Мюнхен, 1972 / Пад псеўд. Рыгор Крушына

Дарогі: [Вершы]. Нью-Ёрк; Мюнхен, 1974 / Пад псеўд. Рыгор Крушына.

Сны і мары: [Вершы]. Нью-Ёрк; Мюнхен, 1975 / Пад псеўд. Рыгор Крушына.

1.3.

1927. Круцель: [Апавяданне] // Чырв. сейбіт. № 17.

1928. Уночы: [Верш] // Бел. піянер. № 24; Сучаснай песняй; У вагоне; Восень — ня сум: [Вершы] // Росквіт. № 1; У надвячорку: [Верш]; Былынёг: Апавяданне // Там жа. № 2; Непераможныя: [Верш] // Чырв. змена. 22 лют.; Люба гуслям...: [Верш] // Там жа. 12 вер.; «Я шукаю прыгожыя словы...»: [Верш] // Там жа. 30 снеж.

1929. «Багна воч і вуснаў цеплыня...»: [Верш] // Полымя. № 7; Былынёг: (Апавяданне) // На Беларусі. 22 сак.; 5 крас.; Перад касаю: (Апавяданне) // Там жа. 18 ліп.; Пастушок Мікола: [Верш] // Піянер Бел. 14 ліст.; Былі часы: [Верш] // Сав. Бел. 13 студз.; Грай, цымбаліст!: [Верш] // Там жа. 27 студз.; Чырвонаармейцу: [Верш] // Там жа. 23 лют.; Успамін: [Верш] // Там жа. 31 сак.; Першамайскія Крэзы: [Верш] // Там жа. 1 мая; Будуем: [Верш] // Чырв. змена. 7 ліст.

1930. Таварышам; Мы; Чырвонаармейцаў ліхі эскадрон; Хто румзае?; У манэжы; Каля канавязі; Бівак; У тэмпах дзён: [Вершы] // Ракіта С., Палескі В., Казак Р. Разгон: Кніжка вершаў. Гомель. Рэц.: Бур Л. «Разгон» // Палес. праўда. 1930. 5 ліст.; Шынклер Х. Бібліяграфія // Вясна. 1930. № 8; Гараць вякі: [Верш] // Палес. праўда. 8 чэрв.; За газетай: [Верш] // Там жа. 15 кастр.; Караць бязлітасна: [Верш] // Там жа. 2 снеж.; Таварышам: [Верш] // Чырв. змена. 27 студз.; Чырвоныя кветкі: [Верш] // Там жа. 22 сак.; Хто румзае: [Верш] // Там жа. 24 крас.; Ударнікі: [Верш] // Там жа. 24 жн.

1932. Ударнікі: [Верш] // Партыя, слухай. Мн.

1935. Маладыя аўтары чакаюць дапамогі // Больш. друк. № 20—21; За чыстату мовы, за сэнсавую дакладнасць // ЛіМ. 6 вер.; Літаратурна-мастацкае выхаванне дзяцей // Там жа. 29 кастр.; Вершы Пімена Панчанкі // Там жа 28 снеж; Падарунак: [Верш] // Піянер Бел. 24 жн.

1936. Маці: [Верш] // ЛіМ. 18 ліп.

1937. Навагодняя елка: [Верш] // Піянер Бел. 1 студз.

1938. Падарунак пілота: [Верш] // Піянер Бел. 29 вер.; Галасуем: [Верш] // Чырв. змена. 16 мая; Скрыпка: [Верш] // Там жа. 14 ліп.; Расцвітае ўсё

навокал: [Верш] // Там жа. 5 вер.; У лабараторыі творчасці: [Апавяданне] // Там жа. 12 кастр.

1939. Усе на выбары!: [Верш] // Звязда. 22 кастр.; Спеў з Дняпра і Нёмана: [Верш] // Чырв. змена. 30 кастр.

1940. Жывое пудзіла: [Подпісы пад малюнкамі] // Іскры Ільіча. № 11.

1.4.

Бальзак О. Габсек / З фр. Мн., 1937.

1936. Рыльскі М. Песня пра Сталіна: [Верш] / З укр. // Піянер Бел. 17 крас.; Купала Я. Мое мне солнце — вождь / С бел. // Рабочий. 20 марта.

1939. Міхалкоў С. Пастух Міхась: [Верш] / З рус. // Піянер Бел. 17 кастр.

1940. Джамбул. У маўзалеі: [Верш] / З каз. // Іскры Ільіча. № 1; Бранеўская Я. Прачка: [Апавяданне] / З пол. // Звязда. 17 ліст. / Сааўт. пер. Ц.Зарэчны; Вільдэ Э. Атэстацыя старасты Карла: Апавяданне / З эст. // ЛіМ. 3 жн.; Главацкі Т. Лётчыкі: [Верш] / З пол. // Там жа. 21 вер.; Фядзьковіч В.-Ю. Думкі: [Верш] / З укр. // Там жа. 17 жн.; Гіра Л. Не тужы; Дзень добры, вецер!: [Вершы] / З літ. // Там жа. 12 кастр.; Маякоўскі У. Паводзіны Уласа Лабатраса: Урывак з верша «Гісторыя Уласа Гультая і лабатраса» / З рус. // Піянер Бел. 5 сак.; Высоцкая Л. Песня пра Мамлакат: [Верш] / З рус. // Там жа. 17 кастр.; Міцкевіч А. Акерманскія стэпы: [Верш] / З пол. // Чырв. звязда. 26 ліст.; Асееў М. Дзень выбараў: [Верш] / З рус. // Там жа. 15 снеж.

1941. Тычына П. На майдане: [Верш] // ЛіМ. 1 лют.; Украінка Л. Слова; Мой шлях: [Вершы] // Там жа. 19 крас.

2.3.

На беларускай мове. Хатулёў П. Супраць безадказных адносін да класікі // ЛіМ. 1936. 26 крас.

Т.М.Махнач.

КАЗАКОЎ МІХАСЬ

Казакоў Міхась (Міхаіл Аўрамавіч; псеўд. М.Бярозкін, К.Міхайлаў; н. 8.10.1938, в. Халіпы Горацкага р-на Магілёўскай вобл.), паэт, перакладчык. Член СП Украіны з 1984. Піша на беларускай і рускай мовах.

Бацькі, Аўрам Гаўрылавіч і Агрыпіна Рыгораўна, былі калгаснікамі. Вучыўся ў Халіпскай пачатковай, Карэбскай сямігадовай школах. У 1952 паступіў у Мсціслаўскае педвучылішча, пасля яго закрыцця (1954) скончыў Крычаўскае педвучылішча (1956). Вучыўся на філалагічным факультэце Магілёўскага педінстытута (скончыў у 1961). У 1961—64 працаваў настаўнікам, затым дырэктарам Галабоўскай васьмігадовай школы Горацкага р-на. У 1964 пераехаў у Крым, дзе стаў працаваць у рэдакцыі сакскай раённай газеты «Красное знамя» — карэктарам, адказным сакратаром, намеснікам рэдактара. У 1970—72 слухач Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК Кампартыі Украіны, з 1972 адказны сакратар, першы намеснік рэдактара абласной «Курортной газеты» (цяпер «Курортный Крым», Ялта). Узнагароджаны медалём, Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета УССР.

Першыя вершы М.Казакова на рускай мове былі надрукаваны ў крычаўскай раённай газеце «Шлях сацыялізма» у 1956. У рэспубліканскім друку упершыню выступіў у 1958. Аўтар зборнікаў вершаў «Млечны шлях», «Сем калодзезяў», «Родныя гарызонты», «Вечная крыніца», «Вянок васільковы». Яго вершы — гэта прызнанне лірычнага героя, сучасніка ў любві да Радзімы, прысяга на вернасць бацькоўскім запаветам. Піша і гумарыстычныя вершы. Перакладае на рускую і беларускую мовы.

Жыве ў Ялце.

В.І.Атрашкевіч.

1.2.

Млечны шлях. Мн., 1969. (Першая кніга паэта). Рэц.: Шыханцоў В. Улюбёнасць // Вяч. Мінск. 1970. 16 сак.; Яфімаў Ф. Уласнае і запазычанае // Беларусь. 1970. № 6.

Семь колодезей: [Вершы]. К., 1976. Рэц.: Никоноркин А. И в сердце слово прорастёт... // Комс. знамя. 1978. 22 янв.

Родныя гарызонты: Вершы. Мн., 1982.

Вечный родник: [Вершы]. Симферополь, 1988.

Вянок васільковы: Вершы. Мн., 1992.

1.3.

1958. Вечер: [Верш] // Знамя юности. 30 апр.; У окна вагона; Весенний ветер: [Вершы] // Там жа. 18 июля; Победа: [Верш] // Фізкультурнік Бел. 15 крас.

1959. Насустрач чэхаўскім дням // ЛіМ. 26 снеж.; Мая радасць: [Верш] // Маг. праўда. 13 чэрв.

1960. Родны край: [Верш] // ЛіМ. 13 студз.; «Ты не ведаеш, пэўна...»: [Верш] // Там жа. 16 крас.; Крымчанка: [Верш] // Маг. праўда. 23 вер.; Не спяшай хавацца, сонца!; Ігнатка-капітан; Жывы гадзіннік: [Вершы] // Там жа. 2 кастр.; Прызнанне: [Верш] // Там жа. 21 кастр.; Маё шчасце ў тым...: [Верш] // Там жа. 27 ліст.; Артыстка: [Верш] // Там жа. 11 снеж.

1961. Крымчанка; Балада пра жураўля; «Больш чым год я жыву ля мора...»; Замест ліста: [Вершы] // Маладосць. № 2; Ты нам крылы дала: [Верш] // Калг. праўда. 26 вер.; Свята: [Верш] // Маг. праўда. 1 мая; Наш сад; Мячык; Цікавая кніжка: [Вершы] // Наст. газ. 31 мая.

1962. «Нас чацвёра ў пакоі, дзе два акны...»: [Вершы] // Маладосць. № 4; Бацьку: [Верш] // Наст. газ. 22 снеж.; Млечны шлях; «Я спяцоўку ўскінуў на плячо...»: [Вершы] // Чырв. змена. 1 крас.; «І чаму крычаць цягнікі...»: [Верш] // Там жа. 4 кастр.

1963. Я — сын твой, Радзіма!: [Верш] // Бярозка. № 1; Вочы; У дарозе; На вуліцы касманаўтаў: [Вершы] // Маладосць. № 1; «Кукуруза — слупам тэлеграфным...»; Чаму крычаць цягнікі; Бацьку; «Нас бязлітасна шкуматалі...»; У кіназале; У дарозе: [Вершы] // Маг. праўда. 3 студз.; Жывы гадзіннік; Капітан; Не спяшай: [Вершы] // Наст. газ. 23 студз.

1964. Млечны шлях: [Верш] // Наст. газ. 17 чэрв.

1966. Чэрвень; «Я спяцоўку ўскінуў на плячо...»; «З поўначы прыходзяць цягнікі...»: [Вершы] // Маладосць. № 11; «З поўначы прыходзяць цягнікі...»: [Верш] // ЛіМ. 4 ліст.

1967. «І чаму крычаць цягнікі...»: [Верш] // Маладосць. № 10; ЛіМ. 6 кастр.; Забалоцце: [Верш] // ЛіМ. 30 крас.; Лінатыпіст; «Я веру ў святасць...»: [Вершы] // Там жа. 21 ліст.

1968. Палігон; Будуем канал; Крокі: [Вершы] // Маладосць. № 8; Палігон: [Верш] // Ніва. 13 кастр.

1969. Аловак: [Верш] // Вясёлка. № 10.

1971. «Грыміць раптоўнае...»: [Верш] // Слава Арміі Савецкай. Мн.

1972. Вішня: [Верш] // Сел. газ. 19 марта.

1973. Площадь у военкомата; «И зачем кричат поезда...»: [Вершы] // Комс. знамя. 8 апр.; На току; Улица космонавтов: [Вершы] // Там жа. 8 июля; Журавлиных два крыла; Высота; У окна вагона: [Вершы] // Там жа. 24 окт.

1975. «Ты прабач, што за столькі гадоў...»: [Верш] // Беларусь. № 8; «Спалохаў цішыню кароткі стрэл...»; «Дзень сакавіцкі думку непакоіць...»: [Вершы] // Маладосць. № 4; Семь колодезей: [Урыўкі з паэмы] // Комс. знамя. 1 июня; Крымский колос: [Верш] // Там жа. 6 июля; Берег здоровья: [Верш] // Курорт. газ. 4 июля; Перестарались; Вечно в ожидании; Жаль парня: [Вершы] // Там жа. 31 окт.; Страна Пионерия: [Верш] // Там жа. 12 нояб.

1976. Лінатыпіст: [Верш] // Люблю будзённы дзень... Мн.; Семь колодезей: (Поэма) // Радуга. № 8; Белград; Березы в Фажино: [Вершы] // Курорт. газ. 19 сент.; Хатынь; Полигон: [Вершы] // Сов. Крым. 29 дек.

1977. Песня; Паўднёвы стэп: [Вершы] // Маладосць. № 5; Отцу; Станция Темный Лес; Верность: [Вершы] // Крым. правда. 19 марта; «Хлеб румяный, как солнца слепок...»: [Верш] // Там жа. 20 июля; Страда: [Верш] // Там жа. 27 июля; Цёплыя адносіны: [Верш] // ЛіМ. 15 крас.; Сестра Хатыни; Настроение: [Вершы] // Сов. Крым. 30 сент.

1978. Карацелькі: [Вершы] // Вожык. № 16; «Не, не адолець тваё прыцягненне...»; Пахне вясною: [Вершы] // Маладосць. № 4; Страда: [Вершы] // Радуга. № 8; Перед жатвой: [Верш] // Комс. знамя. 13 авг.; Белград; Встреча; Березы в Фажино: [Вершы] // Крым. правда. 16 апр.; Станцыя Цёмны Лес; «Восень цёплая, вёска, ранне...»; «Лета ў Кіеў прыйшло нечакана...»: [Вершы] // ЛіМ. 20 студз.; Сестра Хатыни: [Верш] // Сов. Крым. 29 нояб.; Хлеб: [Верш] // Там жа. 27 дек.

1979. «Рукі могуць расціць сады...»; «Вазьмі дарогі на аснову...»: [Вершы] // Дзень паэзіі—79. Мн.; Спадчына: [Верш] // Маладосць. № 7; «Сонца мабыць...»; «Для мяне яна будзе Проняй...»; «Хлясталі хмары нізкія дажджом...»: [Вершы] // Родная прырода. № 3; Войску Польскаму: [Верш] // Звязда. 12 кастр.; Начало; Хлеб; Высокое небо: [Вершы] // Комс. знамя. 28 янв.; Страна Пионерия: [Верш] // Крым. правда. 19 мая; Высокае неба; Залатая кніга; «А Проня сонцам перасыпана!..»: [Вершы] // ЛіМ. 20 крас.; Апрель; Ожидание: [Вершы] // Сов. Крым. 13 апр.; Политрук: [Верш] // Там жа. 13 мая; На экскурсии; Варне; «Собрались мы на отходины...»: [Вершы] // Сов. Крым. 19 окт.

1980. Ультиматум; Море; Вместо письма; Весеннее; Красные сосны: [Вершы] // Радуга. № 12; «Памятаю: цёплымі начамі...»: [Верш] // Родная прырода. № 1; Солдатские шаги; Красные сосны; Отцу; Колокола Хатыни: [Вершы] // Ленин. знамя. 14 февр.; Дарога: [Верш] // ЛіМ. 11 студз.

1981. «Апошнія вёрсты Расіі...»; Бярозавыя коні; Вышыня: [Вершы] // ЛіМ. 14 жн.; «Я стою на Владимирской горке...»; «Выросла ты на Хороле...»: [Вершы] // Сов. Крым. 18 янв.; Родная песня; «Югославии берег...»: [Вершы] // Там жа. 29 марта; Наша поступь: [Верш] // Там жа. 1 мая; Выстрелы в Ястребино: [Верш] // Там жа. 12 окт.

1982. Карацелькі: [Вершы] // Вожык. № 13; Новы хлеб; Настаўнік; Сястра Хатыні; Сакавік; «У нашым парку...»: [Вершы] // Маладосць. № 3; Родная песня: [Вершы] // Радуга. № 4; Лясная казка; «Дзень на свеце пражыць...»; Чорнае мора: [Вершы] // ЛіМ. 20 жн.

1983. «Сумёты — белыя мядзведзі...»: [Верш] // Бярозка. № 2; Лох над гранитом: [Верш] // Ленин. знамя. 1 нояб.; Как зерна на весы: [Вершы] // Неделя. 18—24 апр.

1984. Баллада о политруке; «Болен песней»; Вместо письма: [Вершы] // Крым. правда. 8 янв.; Лесная сказка; На отдыхе: [Вершы] // Там жа. 18 марта; «А Проня солнцем пересыпана!..»; Черное море; «Мне рубаху, как парус...»; «Смотрю в глаза...»: [Вершы] // Там жа. 8 июля; «Льецца мякка месяца святло...»; Чэхаў у Ялце; У адпачынку; «Свінец, бы зерне...»; У лабірынце»; «Да цябе прыйду ў зорны вечар...»: [Вершы] // ЛіМ. 20 ліп.; Березовые кони: [Верш] // Сов. Крым. 25 нояб.

1985. Березовые кони; «Каждый шел...»: [Вершы] // Радуга. № 9; «К тебе приду я...»; «Если тяжко тебе...»: [Вершы] // Вяч. Мінск. 6 вер.; Высокое небо; «Я — солдат...»: [Вершы] // Крым. правда. 28 дек.;

Память: [Верш] // Сов. Крым. 1 марта; Наследство: [Верш] // Там жа. 24 марта; Постриглись: (Фельетон) // Там жа. 30 июня; Зовут дороги; Река детства; Росток: [Вершы] // Там жа. 27 окт.; Вечный родник: [Верш] // Там жа. 7 нояб.

1.4.

1978. Быков В. «Постараюсь вернуться»: (Отрывок из повести «Пойти и не вернуться») / С бел. // Сов. Крым. 16 апр.

1980. Аврамчик М. Курский соловей; «Впервые встретил я фронтовика...»; Встреча с матерями краснодонцев; «Транзитный зал...»: [Вершы] / С бел. // Сов. Крым. 13 янв.

1981. Панизник С. Вспоминаю; Сябры: [Вершы] / С бел. // Сов. Крым. 19 мая.

1982. Варанько П. Беларускі матыў; Каламіец Т. Два берагі; Максіму Багдановічу: [Вершы] / З укр. // ЛіМ. 5 лют.; Каламіец Т. Два берагі: [Верш] / З укр. // Піянер Бел. 30 снеж.

1983. Варанько П. Беларускі матыў: [Верш] / З укр. // Варанько П. Калыска памяці. Мн.; Дмітэрка Л. Хатынь; Забашта Л. Край азёрны: [Вершы] // З укр. // ЛіМ. 12 жн.

1985. Аврамчик М. Университетский городок; Баллада об освобожденном поэте; Чуфут-Кале: [Вершы] / С бел. // Сов. Крым. 29 янв.

1.5.

На мардоўска-эрзя мову. Ки лангсо; Мацеень кавто селмот: [Вершы] / Мартынов А. ичкохнь кн. // Сятко. 1974. № 4.

На татарскую мову. Вагон тэрэзэсе янында: [Верш] / М.Хесэен тэрж. // Соц. Татарстан. 1982. 21 нояб.

На ўкраінскую мову. Балада про журавля / Пер. Л.Дмитерко // Комс. гарт. 1974. 23 бер.; Краща порада: [Верш] / Пер. В.Косяченко // Рад. Буковина. 1979. 25 лют.; Сосни; Батькові: [Вершы] / Пер. О.Матійко // Літ. Укр. 1982. 1 квіт.; По колу вірності; Володимирська сонячна гірка; Творення; У полях; Пісня: [Вершы] / Пер. О.Матійко // Там жа. 1985. 11 лип.

2.3.

На беларускай мове. Барсток М. Душа захацела марской прасторы // ЛіМ. 1983. 30 вер.; Гілевіч Н. Будзем верыць! // Там жа. 1970. 3 крас.

На рускай мове. Алтайский К. Сердцу песню сложить... (Заметки о поэзии Михаила Казакова) // Крым. правда. 1977. 5 янв.; Лойко О. Племя младое и знакомое // ЛГ. 1970. 24 июня.

На ўкраінскай мове. Лешченко М. І рости, і діяти! // Україна. 1976. № 47.

Т.М.Махнач.

КАЗАНАЎ БАРЫС

Казанаў Барыс (сапр. Лапіцкі Барыс Міхайлавіч; н. 26.12.1938, в. Расна Горацкага р-на Магілёўскай вобл.), празаік. Член Саюза журналістаў Беларусі з 1971, СП Беларусі з 1987. Піша на рускай і беларускай мовах.

Нарадзіўся ў сям'і служачых. У гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў дзіцячым доме на Урале. Пасля вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў вярнуўся ў родныя мясціны, закончыў Расненскую СШ і паступіў у Магілёўскі педінстытут на філалагічны факультэт (закончыў у 1962). У 1962—64 служыў матросам на параходзе «Бранск» на Далёкім Усходзе. Завочна закончыў Уладзівастоцкую мараходную школу (1963). З 1966 працаваў матросам зверабойнай флатыліі. З 1967 старшы рэдактар Беларускага тэлебачання, з 1971 на творчай рабоце. У 1976—82 працаваў матросам у Мурманскім экспедыцыйным атрадзе, якому належала падняць параход, што затануў у Арктыцы.

Друкавацца пачаў з 1962 у рэспубліканскіх і ўсесаюзных часопісах «Неман», «Полымя», «Юность», «Дальний Восток» і інш. Тэма мора — галоўная і адзіная тэма ў творчасці пісьменніка. Па сцэнарыях Б.Казанава зняты тэле- і дакументальныя фільмы («Эшалон», «Старэйшыя», «Дні выпрабаванняў», «Паляванне са старым сабакам», «Прыцягненне вады»).

Жыве ў Мінску.

Т.М.Тарасава.

1.2.

Прописан в Тихом океане: Повесть. Мн., 1966. Рэц.: Акимов И. Путь к океану // ЛГ. 1967. 29 марта; Букчин С. Вопросы без ответов // Неман. 1967. № 6; Ратнер І. Хлопцы мараць пра мора // ЛіМ. 1967. 14 крас.

Антоновские яблоки: Рассказы и повесть. Мн., 1968.

Осень на Шантарских островах: Рассказы. М., 1972. Рэц.: Алечиц Н. // Лит. Россия. 1973. 10 авг.; Заборский М. Запах моря // Лит. обозрение. 1973. № 9.

Я з вогненнай вёскі... Мн., 1983 / Сааўт. А.Адамовіч, Я. Брыль.

Ветразі Адысея: У.Жылка і рамант. традыцыя ў бел. паэзіі. Мн., 1977. Рэц.: Конан У. На шляхах літаратурнай «Адысеі» // Полымя. 1979. № 4; Ліс А. Шляхамі Уладзіміра Жылкі // ЛіМ. 1978. 16 чэрв.; Мойсейчик А. Страницы романтизма // Заря. 1978. 28 апр.; Рагуля А. Вышыня крытэрыяў // ЛіМ. 1977. 11 сак.; Mc. Millin A. // Journal of Biel. Studies. V. IV (1979—1980). N 3—4.

Максім Танк: Нарыс жыцця і творчасці. Мн., 1981. Рэц.: Кулагин А. Логика эволюции // Лит. обозрение. 1982. № 11; Ляшук В. Грані творчасці Максіма Танка // Наст. газ. 1981. 25 ліст.; Прашковіч Л. Змястоўна, эстэтычна, глыбока // ЛіМ. 1981. 30 кастр.; Яговдик В. Миссия критического слова // Заря. 1981. 18 сент.

Пасланец Праметэя: Дакумент. аповесць. Мн., 1984. Рэц.: Гніламёдаў У. Чалавек і яго час // ЛіМ. 1985. 1 сак.

Тварэнне легенды: Літ. партрэты і нарысы. Мн., 1987.

Янка Брыль: Нарыс жыцця і творчасці. Мн., 1990.

1.3.

1949. Гэта нам дадзена родным Сталінам // Наст. газ. 21 снеж.

1953. Крыніцы сапраўднай радасці // Сав. Радзіма. 19 крас.; Выбраныя творы польскага паэта-дэмакрата // Там жа. 7 ліп.; Каб сцерліся межы // Там жа. 19 вер.; На чыстую воду // Там жа. 18 кастр.

1954. Кузьма Чорны // Зара. 23 ліст.; З добрымі намерамі // Чырв. змена. 8 мая; Помнікі вечнай дружбы: (Нац.-вызв. рух укр. і бел. народаў у літ. помніках XVI—XVII стагоддзяў) // Там жа. 22 мая; Прыкметы росту // Там жа. 5 вер.

1955. Паэтычныя падарожжы // Зара. 20 сак.; Міцкевіч і Беларусь // Там жа. 26 ліст.; Наш рахунак школе // Наст. газ. 13 кастр.; Песні вызвалення // Чырв. змена. 4 снеж.

1956. Рэвалюцыйныя песні былой Заходняй Беларусі // Полымя. № 9; Кандрат Крапіва // Зара. 23 сак.; Мужныя людзі // ЛіМ. 3 ліст.

1957. Тема воспитания молодежи в белорусских журналах // Камуніст Бел. № 11; Борьба и поэзия: Из истории борьбы за реализм в западнобел. литературе // Сов. Отчизна. № 1; Максім Багдановіч // Зара. 24 мая; Сталасць дружбы // Там жа. 28 чэрв.; Усебакова асвятляць гісторыю літаратуры // ЛіМ. 17 крас.; Песні рэвалюцыйнага падполля // Там жа. 20 ліп.; Народ і яго мудрасць: [Рэц. на кн.: Беларускія прыказкі і прымаўкі. Мн., 1957] // Там жа. 31 жн.; Налібоцкія сосны // Там жа. 14 снеж.

1958. Лірыка Танка перыяду «Нашай волі» // Ученые записки (Брестский пединститут). Мн. Вып. 4; Пафос человечности: [Рэц. на кн.: Танк М. След бліскавіцы. Мн., 1957] // Сов. Отчизна. № 1; Нацыянальныя традыцыі і сучаснасць: Нататкі аб маладзёжнай аповесці // ЛіМ. 9 жн.; Шляхі сацыялістычнай паэзіі // Там жа. 17 вер.

1959. Гераічная паэма «Нарач» // Ученые записки (Брестский пединститут). Мн. Вып. 2; Душа паэта: [Рэц. на кн.: Караткевіч У. Матчына душа. Мн., 1958] // Дружба народов. № 8; Мікола Засім: Літаратурны партрэт // Полымя. № 4; Звяно легенды // Там жа. № 9; Молодость таланта: [Рэц. на кн.: Василек М. Зори над Неманам. М.; Л., 1958] // Сов. Отчизна. № 5; Беларуская паэзія сёння // ЛіМ. 17, 21 студз.

1960. Талент і густ самародка // Засім М. Выбранае. Мн.; Встреча с хорошим парнем: [Рэц. на кн.: Барадулін Р. Маладзік над стэпам. Мн., 1959] // Дружба народов. № 11; Зара. 4 ліст.

1961. Слова з-за крат // Полымя. № 4; Паэзія Канстанціна Турко // Зара. 22 ліст.; Перад яго мудрасцю // ЛіМ. 13 чэрв.; Подзвіг перайшоў на палотны // Там жа. 14 ліп.

1962. Глазами поэта и критика: [Рэц. на кн.: Лойка А. «Новая зямля» Якуба Коласа. Мн., 1962] // Вопр. лит. № 11; Значыць, не было сумлення // Голас Радзімы. № 57; Дорогой ценой: [Рэц. на кн.: Карпюк А. Данута. Мн., 1960] // Дружба народов. № 1; Міхась Васілёк: Літаратурны партрэт // Полымя. № 9; Народны паэт // Зара. 6 ліп.: З нашага акенца — сонечны зайчык: [Рэц. на кн.: Гелер М.

На качелях. Мн., 1962] // Там жа. 10 жн.; Голас мужны, чалавечны // Там жа. 16 вер.; Залаты колас беларускай нівы // Там жа. 3 ліст.; З крыніц жыцця // Калг. праўда. 16 вер.; Ручаямі жывяцца рэкі // ЛіМ. 29 мая; О старом по-новому // ЛГ. 30 янв.; На страже человечности // Серп и молот (Рыга). 16 сент.

1963. Жыццё і прызванне // Васілёк М. Зоры над Нёманам. Мн.; З гушчы народнай // Голас Радзімы. № 63; Інтэлігентнасць без позы: [Рэц.: на кн.: Ліхадзіеўскі С. Берасцянка жывых трывог. Мн., 1962] // Полымя. № 7; По законам красоты // Заря. 12 февр.; Свой стиль и правда жизни // Там жа. 4 мая; Вступая в жизнь: [Рэц. на кн.: Рудкоўскі М. Першыя вёрсты. Мн., 1963] // Там жа. 9 июня; Человек двух романтических профессий // Там жа. 23 июня; На первом перегоне: [Рэц. на кн.: Теличко Н. Добрый ливень. Мн., 1963] // Там жа. 25 сент.; Взращенный революцией // Там жа. 27 нояб.; Маю шчасце ведаць яго // ЛіМ. 22 лют.

1964. Літаратура Заходняй Беларусі // Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: У 2 т. Мн. Т. 1; Пути и судьбы литературы Западной Белоруссии // Дружба народов. № 11; Раман-паэма: [Рэц. на кн.: Брыль Я. Птушкі і гнёзды. Мн., 1964] // Маладосць. № 5; Аповесць пра Таўлая: Фрагменты // Полымя. № 10; Валентин Тавлай: К 50-летию со дня рождения // Заря. 26 янв.; Поэзия — всегда открытие: (Обзор стихов начинающих поэтов) // Там жа. 25 февр.; Воспитатель белорусских литературоведов // Там жа. 25 апр.; Первые удачи обязывают // Там жа. 6 сент.; Учителя — словеснику в поисках // Там жа. 15 нояб.; Ці ёсць патрэба абараняць?: Пісьмо ў рэдакцыю // ЛіМ. 28 крас. / Сааўт. Р.Кароткі, Л.Смалякова.

1965. Іскры з вогнішча; Заўвагі складальніка // Сцягі і паходні. Мн.; Будним днем с Максимом Танком // Дружба народов. № 6; Аповесць пра Таўлая // Полымя. № 8, 9; Мир стоцветный и чудесный // Заря. 1 июня; Комсомолец Таджикистана. 19 нояб.; Алё! Вам звоняць з рэдакцыі: Адказ на пытанні рэдакцыі «ЛіМа» // ЛіМ. 1 студз.; Пясняр вясны і маладосці // Там жа. 19 ліст.

1966. Сваім следам // Пра час і пра сябе. Мн.; Партрэт друга: [Нарыс] // Сейбіты разумнага, добрага, вечнага. Мн.: Яго чалавечнасць // Танк М. Зб. тв.: У 4 т. Мн. Т. 1; Первая // Заря. 15 июля; Помочь найти тропинку к счастью // Там жа. 2 окт.; Наши заботы, наши надежды // Сов. Бел. 19 февр.

1967. Барвы таленту // Брыль Я. Зб. тв.: У 4 т. Мн. Т. 1; Быль, что легенды краше // Стельмашук В. Шумят ели. Мн.; Слова пра Валянціна Таўлая // Таўлай В. Выбраныя вершы і паэмы. Мн.; З аднаго вогнішча // Голас Радзімы. № 25; Горад над Бугам: Рэпартаж // Маладосць. № 4; Партрэт друга: Нарыс // Полымя. № 1; Последний на обелиске: [Нарыс] // Заря. 7 марта; За верстами — Синие Броды // Там жа. 21 окт.; Свет па-свойму ляпіць: [Рэц. на кн.: Пысін А. Твае далоні. Мн., 1966] // ЛіМ. 28 ліп.; Паслявае нная паэзія // Наст. газ. 20 снеж. / Сааўт. Л.Смалякова.

1968. Крылья художника // Брыль Я. Птицы и гнезда. М.; Перад першай старонкай // Полымя. № 10; Письма в Березу: [Нарыс] // Заря. 9, 10, 13, 15, 20, 27, 29 февр., 1 марта; Самародак // Там жа. 20 нояб.; Праменны, радасны і шчодры // ЛіМ. 19 ліст.; Утоление тревоги // ЛГ. 24 апр.

1969. Старонкі беларускага рамантызму // Полымя. № 1; Адчараваныя скарбы: [Рэц. на кн.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т.1] // Полымя. № 6; Его звезда // Заря. 24 мая; Счастливого поиска // Заря. 30 нояб.; Кірмаш: Урывак з аповесці // ЛіМ. 21 лют.

1970. Задуманасць Пілігрыма // Жылка У. Вершы. Мн.; Наша Брэстчына: [Нарыс] // Слова пра родны кут. Мн.; На всходах ранних // Неман. № 7; Ветразь Адысея // Полымя. № 5; Раскованный дух края // Заря. 24 апр.; Слово о народном поэте // Там жа. 28 мая; Встреча труда и таланта // Там жа. 25 нояб.

1971. Індывідуальныя і групавыя формы работы са студэнтамі // Беларуская мова і літаратура ў ВНУ: Тэзісы рэспубліканскай навукова-метад. канферэнцыі. Брэст; Литература Западной Белоруссии // История советской многонациональной литературы: В 6 т. М. Т. 2. Кн. 1; Гняздо паэтаў: Нарыс // Маладосць. № 3; Памяць: Нарыс // Там жа. № 6 / Сааўт. А.Адамовіч, Я.Брыль; Вяртанне зор // Полымя. № 7; Руская поўнач // Помнікі гіст. і культуры Бел. № 1; Огонь с баррикад // Заря. 23 апр.; Урожай талантов // Там жа. 10 июля; Третьи побеги: [Рэц. на кн.: Рудкоўскі М. Позвы лірыка. Мн., 1971] // Там жа. 18 сент.; Грозовое поле: [Нарыс] // Там жа. 6, 7, 23, 24 нояб., 1, 4, 9, 11, 17 дек.; Наша сябрына // Чырв. змена. 15 крас.

1972. Аблудныя сцежкі // Голас Радзімы. № 39, 43; Возвращение блуждающей звезды // Дружба народов. № 5; У нас в Бресте // Информационный бюллетень СП СССР. № 7, 8; Много лиц у героизма // Заря. 15 янв.; Героическим слогом: [Рэц. на кн.: Теличко Н. Дерево в бору. Мн., 1971] // Там жа. 11 марта; В венок народным поэтам; Факел дружбы // Там жа. 12 апр.; Знакомство // Там жа. 19 авг.; Гармония, проверенная алгеброй: [Рэц. на кн.: Арабейка І. У след за сонцам. Мн., 1972] // Там жа. 21 окт.; Подвиг поэта // Там жа. 3 нояб.; Ключ к общению // Там жа. 9 дек.

1973. На доўгі век // Засім М. Вершы. Мн.; Пакінутае людзям // Гусак С. Пафас праўды. Мн. / Сааўт. Ю.Пшыркоў; Мужнасць і дружба: Урывак з кнігі «Я — з вогненнай вёскі» // Беларусь. № 7; / Сааўт. А. Адамовіч, Я.Брыль; Я з вогненнай вёскі: Раздзелы з кнігі // Маладосць. № 7, 8, 9, 10, 1974. № 3, 4, 5 / Сааўт. А.Адамовіч, Я.Брыль. Рэц.: Ляшук В., Лебедев В. Слова боли и гнева // Заря. 1974. 5 июня; Таланты и школа // Заря. 1973. 20 янв.; Ф.С.Пестраку — 70 лет // ЛГ. 5 дек.

1974. З лістоў Леапольда Родзевіча да Уладзіміра Жылкі // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Мн. Вып. 2; Несыходнае гора: З кнігі «Я — з вогненнай вёскі» // Беларусь. № 5, 6 / Сааўт. А.Адамовіч, Я.Брыль; Я з вогненнай вёскі...: Раздзелы з кнігі // Голас Радзімы. № 13—16, 18, 21 / Сааўт. А.Адамовіч, Я.Брыль; На мове Адама Міцкевіча // Полымя. № 1; Берасцейскае вогнішча // Там жа. № 9; Второй виток орбиты: [Рэц. на кн.: Мацяш Н. Удзячнасць. Мн., 1973] // Заря. 5 янв.; Быть человеком // Там жа. 19 июня; Поклон совести: [Рэц. на кн.: Жуковіч В. Поклон. Мн., 1974] // Там жа. 19 окт.; «Я — з вогненнай вёскі»: Урывак з новай кнігі // Там жа. 23 нояб. / Сааўт. А.Адамовіч, Я.Брыль; Поэзия ускорений: [Рэц. на кн.: Разанаў А. Назаўжды. Мн., 1974] // Там жа. 26 дек.; Пройдзенае // ЛіМ. 14 чэрв.

1975. «Я — з вогненнай вёскі...»: Раздзелы з кнігі // Голас Радзімы. № 12—16 / Сааўт. А.Адамовіч, Я.Брыль.

1976. У польскім друку // Далягляды. Мн.; Яго чалавечнасць // Пра таварышаў па пяру. Мн.; Матэрыя пачуцця: [Рэц. на кн.: Гілевіч Н. Актавы. Мн., 1976] // Маладосць. № 11; Паэт у страі: [Рысы да літ. партрэта Ніла Гілевіча] // Полымя. № 4; Тварэнне легенды // Там жа. № 9; «...З пачуццём асабістай адказнасці» // ЛіМ. 23 крас.

1977. Литература Западной Белоруссии // История белорусской советской литературы. Мн.; Сонеты В. Бутрыма // Заря. 30 апр.

1978. Призван в поэзию Родиной // Заря. 18 февр.; Ожидая книгу поэта // Там жа. 25 окт.; Жить в легенде: К 70-летию со дня рождения поэта-революционера Н.А.Засима // Там жа. 17 нояб.; Крытэрый самабытнасці: [Рэц. на кн.: Бярозкін Р. Звенні. Мн., 1976] // ЛіМ. 18 сак.; Раней і напярэдадні // Там жа. 26 мая; Наабапал пераваду: [Рэц. на кн.: Янішчыц Я. Ясельда. Мн., 1978] // Там жа. 6 кастр.

1979. Да пытання аб тыпалагічных асаблівасцях беларускага рамантызму // Асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу ў Беларусі на сучасным этапе. Мн.; Нарачанская сустрэча // Святло яго душы. Мн.; Пасланец Праметэя: Дакумент. аповесць // Маладосць. № 5; Пчала Скарыны // Полымя. № 9; Дакументальны твор — плод калектыўнай памяці // Голас

Радзімы. 20 вер.; Долг памяти // Заря. 16, 17, 20 февр.; Ветвится стих: [Рэц. на кн.: Гардзей В. Вефсв

1963. 27 снеж.; Гіламёдаў У. Такім яго ведаю // Там жа. 1982. 10 вер.; Кавалёнка В. Жывое аблічча дзён. Мн., 1979. С. 86—88, 90—91; Канэ Ю. Плынь. Мн., 1983. С. 237; Караткевіч У. Шляхі ў палях: Слова пра таварыша // Полымя. 1972. № 9; Клышка А. Блытаныя думкі аб ясных праблемах // Звязда. 1959. 20 лют.; Лецка Я. Выхаваўчая роля літаратуры. Мн., 1980. С. 95—99; Ляшук В., Малажай Г. Слова пра настаўніка // Наст. газ. 1982. 18 вер.; Майсейчык А., Ляшук В. Шчодрасць душы // Там жа. 1972. 16 вер.; Мальдзіс А. «Балючая памяць Беларусі» // ЛіМ. 1979. 18 мая; Місько П. Гнеўная праўда і памяць Беларусі // На стрыжні часу. Мн., 1978; Мушынскі М. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства: 40-я — першая палавіна 60-х гадоў. Мн., 1985. С. 207—208, 252—256; Над чым працуе... Уладзімір Калеснік // ЛіМ. 1971. 17 снеж.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Семашкевіч Р. Даследчык-рэстаўратар // ЛіМ. 1963. 20 снеж.; Стральцоў М. Забыць — небяспечна // Стральцоў М. У полі зроку. Мн., 1976. С. 137—141; У гэтым месяцы // Беларусь. 1972. № 9; Уладзіміру Калесніку — 50 // ЛіМ. 1972. 22 вер.; Уладзіміру Калесніку — 60 // Там жа. 1982. 10 вер.; Шупенька Г. Свой след на зямлі // Звязда. 1982. 16 вер.; Ягоўдзік У. Вартавы берасцейскага вогнішча // Чырв. змена. 1982. 5 вер.; Янкоўскі Ф. Слова пра сябра // ЛіМ. 1972. 22 вер.

На польскай мове. Huszcza J. Opowieści w czarnych ramkach. Łódź, 1979. S. 178, 185, 194; Stroińska A. Na Białorusi // Stroińska A. Droga długa jak Rosja. Warszawa, 1979. S. 131—139.

На рускай мове. Бобкова А. От имени каждого четвертого // Сов. Бел. 1977. 12 мая; Гарай А. Высокий полдень // Заря. 1972. 15 сент.; Гаранин Л. На скрижалях истории. Мн., 1985. С. 39—55; Жуковин В. Знакомьтесь: «Зарянка» // Знамя юности. 1972. 15 сент.; Казько В. Память отчей земли // Литература о войне и проблемы века. Мн., 1986; Каленкович И., Лебедев В. Щедрость таланта // Заря. 1982. 17 сент.; Коваленко В. Часовой правды в литературе — документ // Неман. 1979. № 5; Копченов Н. Колокола памяти // Заря. 1981. 14 авг.; Овчаренко А. Современный белорусский роман. М., 1978. С 36—45; Петкевич А. Огонь Прометея не гаснет // Гродн. правда. 1982. 16 сент.; Шарова Е. Колокола памяти // Сов. культура. 1982. 12 марта.

2.4.

На беларускай мове. Караткевіч У. Беласежскі алень: (Ул. і З. Калеснікам): [Верш] // Караткевіч У. Мая Іліяда. Мн., 1969.; Рудкоўскі М. Мой дзед быў сельскім кавалём: [Верш] // Рудкоўскі М. Сінія брады. Мн., 1967.

3.1.

БДАМЛіМ, ф. 161, воп. 1, с. 1—11.

В.І.Козіч.

КАЛІНА КЛАЎДЗІЯ

Каліна
(Капелян, дзяв.
Лукашэвіч
Клаўдзія Якаўлеўна;
н. 1.1.1925, в. Блювінічы
Брэсцкага р-на),
празаік.
Член СП Беларусі
з 1975.

З сям'і вясковага настаўніка. У 1932—39 вучылася ў польскай сямігадовай школе. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі працягвала вучобу ў Чарнаўчыцкай сярэдняй школе Брэсцкага р-на. У час вайны жыла разам з бацькамі ў в. Блювінічы. У 1953 скончыла Брэсцкае музычнае вучылішча. Працавала інструктарам мастацкай самадзейнасці ў Брэсцкім доме афіцэраў (1954—55) і вайсковай часці (1955—56), настаўніцай спеваў (1956—57), выкладчыцай тэорыі музыкі музычнай школы № 1 Кобрына (1958—59), настаўніцай спеваў СШ № 3 Віцебска (1959—60). У 1960 пераехала ў Мінск, працавала ў школах настаўніцай спеваў. З 1971 на творчай рабоце.

Пісаць і друкаваць допісы пачала з 1962. Першае апавяданне «Калючы госць» апублікавана ў часопісе «Вясёлка» (1962). Піша для дзяцей школьнага ўзросту (кнігі «Хлопчык-пакідайчык», «Каляровыя

мясціны»). Аповесць К. Каліны «Забароненая песня» напісана па матэрыялах жыцця заходнебеларускай вёскі. У сваіх творах яна распрацоўвае маральна-этычныя праблемы сучаснасці («Маці і сын», «Світанне»). Друкуецца ў часопісах «Вясёлка», «Работніца і сялянка», «Маладосць».

Жыве ў Мінску.

Л.С.Савіх.

Бібліяграфія

1.2.

Хлопчык-пакідайчык: Апавяданні і казкі. Мн., 1970.

Забароненая песня: Аповесць. Мн., 1971. Рэц.: Марціновіч А. Дзяўчынка Кася і яе сябры // Полымя. 1972. № 4; Пальчэўскі А. Вачыма дзяўчынкі // ЛіМ. 1972. 28 студз.

Каляровыя месяцы: [Казкі]. Мн., 1975.

Маці і сын: Аповесць, апавяданні. Мн., 1977. Рэц.: Дайнека Л. Дзеля радасці чалавечай // Полымя. 1978. № 6; Хорсун С. Крок да сталасці // ЛіМ. 1977. 17 чэрв.

Світанак: Аповесць. Мн., 1983.

Бабуля Насця, дзед Адам, Петрык і каза Рагуля: Аповесць. Мн., 1985.

Крылаты конь: Аповесці. Мн., 1989.

1.3.

1964. Калючы госць: [Апавяданне] // Вясёлка. № 2; Ласун: Апавяданне // Там жа. № 3; Фіялка: Апавяданне //Там жа. № 5; Як грыбы збіраліся на парад: [Казка] // Там жа. № 8; Праводзіны: [Апавяданне] // Там жа. № 9.

1965. Песня вясны: [Апавяданне] // Вясёлка. № 3; Фіялка: (Лірыч. замалёўка) // Ніва. 6 чэрв.

1966. Буслы: Казка // Вясёлка. № 3; Касманаўт: [Апавяданне] // Там жа. № 4; Якар: [Апавяданне] // Там жа. № 8; Хлопчык — пакідайчык: Казка // Там жа. № 9.

1968. Сойка стракатая: Казка // Вясёлка. № 1.

1969. Забароненая песня: Аповесць // Маладосць. № 11, 12.

1970. Чужое пяро: [Апавяданне] // Вясёлка. № 9; Сіняя пляма: [Апавяданне] // Там жа. № 11.

1971. Сустрэча: [Апавяданне] // Вясёлка. № 1; Люты: Апавяданне // Там жа. № 2; Красавік: [Казка] // Там жа. № 4; Чэрвень і сонейка: [Казка] // Там жа. № 6; Верасень: Апавяданне // Там жа. № 9.

1972. Жнівень: [Апавяданне] // Вясёлка. № 8; Зімовы дуб: [Апавяданне] // Там жа. № 11.

1973. Сем чароўных дудачак: [Апавяданне] // Вясёлка. № 2; Перасмешнік: Казка // Там жа. № 5.

1974. Маці і сын: Аповесць // Маладосць. № 9.

1975. Бурштынавыя пацеркі: Апавяданне // Беларусь. № 6.

1976. Бярэзінка: Апавяданне // Полымя. № 1; Дарога: Апавяданне // Работніца і сялянка. № 11.

1977. Прымірэнне: Апавяданне // Маладосць. № 7; Кручаны сабака: Апавяданне // Полымя. № 3.

1979. Світанак: Аповесць // Маладосць. № 9.

1981. Красавік: [Апавяданне] // Вясёлка. Мн.

1983. Касманаўт: [Апавяданне] // Вяснянка. Мн.; Перасмешнік: [Казка] // Казкі беларускіх пісьменнікаў. Мн.; Салодкі калодзеж: Урывак з аповесці // ЛіМ. 28 кастр.

1985. Пацерка: [Апавяданне] // Работніца і сялянка. № 11.

2.3.

На беларускай мове. Клаўдзіі Каліне — 60 // ЛіМ. 1985. 1 ліст.; Козліч П. [Біябібліяграфічная нататка да 60-годдзя нараджэння] // Полымя. 1985. № 11; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Ярош М. Проза маладых у «Маладосці» // ЛіМ. 1975. 14 сак.

М.П.Барташэвіч.

КАЛІНКОВІЧ МІКАЛАЙ

Калінковіч (Калянковіч) Мікалай Мікалаевіч [псеўд. Н. Антонов, Н. Ивашкевич, К. Ивашкевич, А. Каменогорский, А. Криничный, В. Лунин, Н. Луниневцкий, Н. Никольский, А. Никифоров, А. Полесский, В. Припятский, Н. Цнянский, В. Перелесков; 18.12.1950 (па пашпарту 15.1.1951), в. Цна Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.—24.7.1990, Тбілісі; пахаваны ў Лунінцы], літаратуразнавец, крытык, публіцыст. Член Саюза журналістаў з 1977 і СП Грузіі з 1984.

З сям'і рабочага. Вучыўся М. Калінковіч спачатку ў школе г. Усць-Каменагорска, з 1958 у сямігодцы в. Цна, куды пераехалі бацькі, а з 1966 — у Лунінецкай сярэдняй школе № 2. Пасля сканчэння школы (1968) некалькі месяцаў настаўнічаў у Гаўрыльчыцкай васьмігадовай школе Лунінецкага р-на. У 1968—69 М. Калінковіч літаратурны супрацоўнік лунінецкай раённай газеты «Ленінскі шлях». З 1969—71 служыў у Савецкай Арміі. Падтрымліваў цесныя сувязі з акруговай армейскай газетай «На страже Родины», абласной «Заря» (Брэст), раённай «Ленінскі шлях» (Лунінец). Пасля дэмабілізацыі зноў вярнуўся на працу ў раённую газету. У 1971 паступіў на факультэт журналістыкі БДУ, адначасова працаваў у «Сельской газете» (1973). У 1972 стаў членам КПСС. Скончыўшы ў 1976 універсітэт, М. Калінковіч быў карэспандэнтам брэсцкай абласной газеты «Заря», потым у 1976—78 намеснікам рэдактара лунінецкай раённай газеты «Ленінскі шлях». У 1978 прызваны на тэрміновую афіцэрскую службу. Служыў на Беларусі, у Туркменіі, Маскве, Грузіі. У 1984—87 працягваў вучобу ў аспірантуры пры Маскоўскім вышэйшым вучылішчы КДБ. Узнагароджаны медалямі.

Друкавацца М. Калінковіч пачаў у 1968 у лунінецкай раённай газеце «Ленінскі шлях». Пазней з'явіліся публікацыі ў абласной газеце «Заря» (1975). Асноўная тэматыка яго творчасці — гісторыка-рэвалюцыйныя падзеі, ваенна-патрыятычнае выхаванне, літаратуразнаўчыя даследаванні. Асаблівую цікавасць яго як даследчыка выклікаюць беларуска-рускія, беларуска-туркменскія літаратурныя сувязі, знаходжанне А. Блока на Палессі, жыццё і служба А.С. Грыбаедава на Беларусі (Брэст-Літоўск), «палескі перыяд» Якуба Коласа. Ён напісаў таксама шмат дакументальных нарысаў.

Т.М.Тарасава.

Бібліяграфія

1.2.

Лунинец. Мн., 1981.

Не обрывается земная связь: Докум. повести и рассказы. Ашхабад, 1982. Рэц.: Ленский А. «Но память вечна, и они — средь нас» // Знамя труда (Красноводск). 1982. 12 авг.; Марціновіч А. ...І памяць у нас адна // ЛіМ. 1982. 31 снеж.; Семенова Л. Тема и ее воплощение // Веч. Ашхабад. 1983. 16 февр.; Юрина Л. В семье единой // Знамя Октября (Ашхабад). 1982. 22 сент.

Имя мое — Свобода. Ашхабад, 1984. Беразоўскі А. Дружба мацавалася ў змаганні // ЛіМ. 1985. 18 студз.; Петрова Т. «Их подвиг — пример живым» // Веч. Ашхабад. 1984. 5 нояб.

На рубежах тайной войны. Ашхабад, 1985 / У саавўт. Рэц.: Гурджиянец Н. О бойцах незримого фронта // Туркмен. искра. 1985. 19 мая.

Палескія дні Аляксандра Блока: Нарыс. Мн., 1985.

Возвращение рассветной рани: Докум. повесть и очерки. Ашхабад, 1987.

Лунинец: Историко-докум. очерки. Мн., 1989.

Не должен неизвестным быть солдат: Докум. рассказы и очерки. Ашхабад, 1989.

Лунинец: Ист.-эконом. очерк. Мн., 1990. (Города Белоруссии).

1.3.

1975. Строки судьбы огневой // Заря. 23 янв.; Цена жизни // Там жа. 20 февр.; В ритме каждого дня // Там жа. 7 июня; Готовность номер один: Репортаж // Там жа. 24 июня; «Мы живем в деревне»: [Рэц. на кн.: Бородовский С., Шабалин А. Мы живем в деревне. Мн., 1975] // Там жа. 12 июля; Струны настроения // Там жа. 12 авг.; Рождение гимнастки // Там жа. 19 сент.; Полесские дни Александра Блока // Там жа. 27 сент., 1 окт.; Путь к пьедесталу // Там жа. 11 окт.; Звезда героя // Там жа. 12 дек.; Телефоны в лесу // Сел. газ. 7 янв.; Бостынская марка // Там жа. 13 марта; В ответе каждый // Там жа. 21 сент.; Достоево меняет облик // Там жа. 24 окт.; Конструктор из Богдановки // Там жа. 12 нояб.; «В сердце бьет прибой...» // Там жа. 5 дек.; Браво, тре-

нер! // Физкультурник Бел. 12 сент.; Отставка чемпиону // Там жа. 14 окт.

1976. Высота майора Волошина: [Рэц. на: Быков В. Его батальон // Наш современник. 1976. № 1] // Неман. № 9; За тебя, Беларусь! // Заря. 6 февр.; «О себе надо меньше думать...»: Докум. очерк // Там жа. 19 июня; «Такая, брат, специфика» // Там жа. 20 окт. Клопаты паэта // ЛіМ. 30 крас.

1977. «Оставлено без удовлетворения...» // Нарыс. № 4; Оживают образы // Заря. 11 нояб.; Человек у станка // Там жа. 19 нояб.; Человеческая доброта: [Рэц. на кн.: Грахоўскі С. Суровая дабрата. Мн., 1977] // Там жа. 6 дек.; Сослуживец Александра Блока // Лит. Россия. 17 июня; Родам з Луніца // Чырв. змена. 19 ліст.

1978. ...Где шумела Белая Береза // Неман. № 7; Боевой соратник Щорса // Заря. 18 янв.; Прогрессивная газета ("Северо-Западный край") // Там жа. 11 февр.; Родом из Лунинца... // Там жа. 22 июня; Прызванне абавязвае: Майстры прапаганды // «Звязда» на меліярацыі Палесся. 18 лют.; Крытык, публіцыст, журналіст // ЛіМ. 3 лют.; Горячая точка завода // Сов. Бел. 6 янв.; И дерево умеет говорить // Там жа. 27 мая.

1979. «Дело зачесть конченым...» // Неман. № 2; Память // Там жа. № 4; Как дань глубокого уважения: Письма В.Самойло к А.Блоку // Там жа. № 11; «С поля виднеется Пинск...»: А.Блок в Белоруссии // Знамя юности. 28 нояб.; В сраженье за счастье людское: [Рэц. на кн.: Курбаннепесов К. Избранное. М., 1979] // Комсомолец Туркменистана. 6 дек. Пад псеўд. Н. Цнянский; Что дает силу разведчику в логове врага: [Рэц. на кн.: Эсенов Р. Крушение «Великого Турана». М., 1979] // Там жа. 18 дек. / Пад псеўд. Н.Цнянский; Шлях праз вернасць: [Рэц. на кн.: Мацяш Н. Прыручэнне вясны. Мн., 1979] // ЛіМ. 13 жн.; «Калі ўсе мы былі адной сям'ёй // Там жа. 12 кастр.; Позірк за гарызонт: [Рэц. на кн.: Федзюковіч М. Макаў цвет. Мн., 1979] // Чырв. змена. 13 снеж.

1980. Палескія дні Аляксандра Блока // Маладосць. № 11; Командир полесских стрелков // Неман. № 2; Звезды славы Василя Воробьева // Там жа. № 6; Там, где цветет тамариск: [Дакум. аповесць] // Веч. Ашхабад. 7—10, 15—17, 21—22 июля / Пад псеўд. А.Полесский; Живи и помни // Знамя юности. 18 сент.; И время зачисляет в списки: [Дакум. апавяданне] // Комсомолец Трукменистана. 9 февр. / Пад псеўд. А. Каменогорский; И вечный бой // Там жа. 26 февр. / Пад псеўд. В. Припятский; Я буду честным перед Отчизной // Там жа. 8 марта / Пад псеўд. Н. Ивашкевич; Путь солдата: [Нарыс] // Там жа. 13 марта / Пад псеўд. А. Каменогорский; Кровь на белом снегу: [Нарыс] // Там жа. 25 марта / Пад псеўд. А. Каменогорский; И лиры чистое звучанье: [Рэц. на кн.: Рябинин Ю. В людском потоке. Ашхабад, 1977] // Там жа. 27 марта / Пад псеўд. Н.Цнянский; Последний бой в Каракумах: [Нарыс] // Там жа. 10 апр. / Пад псеўд. В. Припятский; Не обрывается земная связь: [Нарыс] // Там жа. 29 апр. / Пад псеўд. А.Каменогорский; Звезда Героя: [Дакум. аповесць] // Там жа. 1, 6, 9, 13, 15 мая / Пад псеўд. Н. Лунинецкий; На страже советских границ: [Рэц. на кн.: Часовые советских границ. М., 1979] // Там жа. 31 мая / Пад псеўд. Н.Антонов; Письма с фронта: [Дакум. аповесць] // Там жа. 12 июня / Пад псеўд. Н.Никольский; В атаке — конники Кулиева: [Рэц. на кн.: Кибальников А. Огненные рубежи. Ашхабад, 1980] // Там жа. 21 июня / Пад псеўд. В. Лунин; Эскадрон остается на высоте: [Нарыс] // Там жа. 5 июля / Пад псеўд. А. Каменогорский; Нить сердца: [Нарыс] // Там жа. 15 июля / Пад псеўд. А.Каменогорский; Первомайцы: [Нарыс] // Там жа. 26, 29, 31 июля / Пад псеўд. А.Каменогорский; Недопетые песни юности / Пад псеўд. Н.Цнянский; Бессмертие гвардейца: [Нарыс] / Пад псеўд. А.Каменогорский // Там жа. 7 авг.; Взметнется в небо монумент: [Нарыс] // Там жа. 19 авг. / Пад псеўд. А.Каменогорский; Эхо июльского дня: [Дакум. аповесць] // Там жа. 1, 4, 7 нояб. / Пад псеўд. А. Каменогорский; В списках — навечно: 50 лет со дня гибели Д.Д.Ярошевского // Там жа. 22 нояб. / Пад псеўд. А.Каменогорский; Вдаль идя державным шагом // Там жа. 27 нояб.; Комиссар Закаспия: [Дакум. аповесць] // Там жа. 18, 20, 27 дек.; 1981. 8, 15, 22, 27, 29 янв.; 3, 5, 12 февр. / Пад псеўд. А. Полесский; Не толькі службай..... // ЛіМ. 8 лют.; Ішлі на Палессе пісьмы... // Там жа. 22 жн.; О людях молчаливого подвига // Марыйская правда. 4 июня / Пад псеўд. К.Ивашкевич; Истоки великой Победы // Там жа. 21 июня / Пад псеўд. К. Ивашкевич; Наш земляк генерал Петрушевский // Сел. газ. 9 апр.

1981. Встречный ветер // Ашхабад. № 6; Тамариск цветет в пустыне: [Нарыс] // Знамя юности. 19, 20, 23 авг.; «Кто пал за народ, тот не умирает»: [Рэц. на кн.: Герои Шипки. М., 1979] // Комсомолец Туркменистана. 10 февр. / Пад псеўд. В. Перелесков; Память жива // Там жа. 19 февр. / Пад псеўд. А. Криничный; Белый цвет хризантем: [Нарыс] // Там жа. 28 апр.; Лицом к жизни и смерти: [Дакум. апавяданне] // Там жа. 23 мая; Кто за Советскую власть — за мной!: [Дакум. нарыс] // Там жа. 9 июня / Пад псеўд. А. Каменогорский; Стоит на Полесье обелиск: [Дакум. апавяданне] // Там жа. 12, 15 сент. / Пад псеўд. А. Каменогорский; Вызываю огонь на себя: [Нарыс] // Там жа. 10 окт. / Пад псеўд. А.Каменогорский; Подвиг в песках: [Нарыс] // Там жа. 8 дек. / Пад псеўд. А. Каменогорский; Огненные барханы: [Дакум. апавяданне] // Там жа. 19 дек. / Пад псеўд. А. Каменогорский; Судьбы единой неразрывности // Там жа. 29 дек. / Пад псеўд. А.Каменогорский; Керкинская быль: [Дакум. аповесць] // Ташауз. правда. 2—4 июня; Высота Аннаклыча Атаева: [Дакум. апавяданне] // Там жа. 10—12 дек. / Пад псеўд. А.Полесский.

1982. Выбор Юлиана Зверева // Ашхабад. № 5; Комсомолец Турменистана. 22, 24, 27, 29 апр. / Пад псеўд. А. Каменогорский; Якуб Колас у Лунінцы // Маладосць. № 1; Последний рубеж: Докум. очерк // Комсомолец Туркменистана. 13, 16 марта / Пад псеўд. А. Каменогорский; Дороги Агагельды Бегназарова: Очерк // Там жа. 15 июня / Пад псеўд. А. Каменогорский; Мы ждем тебя, Овезберды: Докум. очерк // Там жа. 4 нояб. / Пад псеўд. А.Каменогорский.

1983. Комиссар Закаспия: Главы из докум. повести // Неман. № 2; Солнце всходит в Каракумах: Очерк // Комсомолец Туркменистана. 5 апр. / Пад псеўд. А. Каменогорский; Жизнь как легенда: [Нарыс] // Там жа. 26 июля / Пад псеўд. А. Каменогорский; Взлет — разрешить: Докум. рассказ о Герое Советского Союза Л.И.Горегляде // Там жа. 18 окт. / Пад псеўд. А.Каменогорский; Сын кузнеца: Очерк о Герое Советского Союза В.К.Щербакове // Там жа. 1 дек. / Пад псеўд. А. Каменогорский; Комиссар Закаспия // Туркм. искра. 6—9, 11 мая.

1984. Противостояние: [Дакум. аповесць] // Ашхабад. № 1—2.

1.5.

На туркменскую мову. Улы рус шахыры // Совет эдебияты. 1980. № 11; Сэхрада йылгын гуллейэр: [Дакум. аповесць] // Там жа. 1981. № 4; Омур билен олум йузбе: [Дакум. апавяданне] // Яш коммунисти. 1981. 23, 28 май, 2, 4 июнь.

1.6.

Герман А. Радость встречи со зрителем: [Інтэрв'ю] // Комсомолец Туркменистана. 1980. 5 апр. / Зап. пад псеўд. А.Никифоров.

Т.М.Махнач.

КАЛІНОЎСКІ КАСТУСЬ

Каліноўскі Кастусь [Канстанцін Вікенцій Сямёнавіч; псеўд. Яська-гаспадар з-пад Вільні, Хамовіч, Вітажэнец і інш.; 21.1(2.2.).1838, в. Мастаўляны Гродзенскага пав., цяпер Беластоцкае ваяв., Польшча — 10(22).3.1864, Вільня], рэвалюцыянер-дэмакрат, публіцыст і паэт, кіраўнік паўстання 1863—64 на Беларусі і Літве.

З незаможнага шляхецкага роду. Продкі К. Каліноўскага на працягу амаль ста гадоў валодалі маёнткам Калінава Бранскай зямлі на сумежжы Расійскай імперыі і Рэчы Паспалітай, але ў 2-й палове 18 ст. маёнтак бы прададзены, і Каліноўскія сталі беззямельнай шляхтай. Маці рэвалюцыянера, Вераніка Рыбінская, памерла маладой, калі Кастусю было пяць гадоў. Бацька, Сямён Сцяпанавіч, быў разумным і энергічным чалавекам. У в. Мастаўляны на зямлі памешчыка Радавіцкага 1835 ён заснаваў невялікую ткацкую фабрыку (па сутнасці майстэрню), дзе выраблялiся сурвэткі, абрусы і іншыя ільняныя вырабы, дамогся добрай якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі. Потым разам з другой жонкай, Ізабелай Лазарэвіч, набыў невялікі фальварак Якушоўка паблізу мяст. Свіслач у Ваўкавыскім пав. Туды ў 1849 перабралася сям'я, а таксама была перавedзена фабрыка. У 1855 бацька дамогся зацвярджэння сенатам Каліноўскіх у дваранскіх правах. Але матэрыяльнае становішча сям'і, у якой ад двух шлюбаў было 17 дзяцей, па-ранейшаму заставалася цяжкім. У 1847 К. Каліноўскі паступіў у 1-ы клас Свіслацкай гімназіі (пазней вучылішча), вядомай не толькі педагагічнымі дасягненнямі, але і багатымі традыцыямі ўдзелу навучэнцаў у вызваленчай барацьбе. Вялікі ўплыў на К. Каліноўскага аказаў яго старэйшы брат Віктар (1833—62). Пасля сканчэння вучылішча (каля 1852) К.Каліноўскі тры гады жыў, мабыць, у Якушоўцы, памагаючы бацьку ў гаспадарцы і займаючыся самаадукацыяй. Віктар, стаўшы студэнтам Маскоўскага універсітэта, клікаў яго да сябе.

У канцы 1855, напярэдадні свайго паўналецця, К.Каліноўскі паехаў у Маскву да брата з намерам таксама паступіць ва універсітэт. Але неўзабаве ў братоў змяніліся планы, і летам 1856 яны перабраліся ў Пецярбург. К. Каліноўскі паспяхова здаў уступныя экзамены ва універсітэт і стаў студэнтам 1-га курса юрыдычнага факультэта па разраду камеральных навук, які рыхтаваў да гаспадарчай або адміністрацыйнай кар'еры і даваў добрую агульную адукацыю. Апрача юрыдычных навук К. Каліноўскі вывучаў рускую і ўсеагульную гісторыю, палітэканомію, статыстыку, логіку, псіхалогію, заалогію, батаніку, сельскую гаспадарку, тэхналогію, архітэктуру, рускую і французскую мовы. Студэнцкія гады мелі вырашальнае значэнне для станаўлення рэвалюцыйнага светапогляду К. Каліноўскага. Ён захапляўся публікацыямі ў «Современнике» і «Колоколе», творамі рэвалюцыянераў-дэмакратаў, а магчыма, і асабіста быў знаёмы з правадырамі рускай рэвалюцыйнай дэмакратыі М.Чарнышэўскім і М.Дабралюбавым, як і з Т.Шаўчэнкам, які таксама жыў тады ў Пецярбургу. У тыя бурныя часы ў студэнцкім жыцці К. Каліноўскі неаднаразова выбіраўся бібліятэкарам-кіраўніком арганізацыі студэнтаў «Огул» — выхадцаў з Польшчы, Беларусі, Літвы і Украіны, узначальваў у «Огуле» найбольш радыкальнае крыло. З утварэннем каля 1858 у Пецярбургу ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі Сераковскага—Дамброўскага браты Каліноўскія сталі яе актыўнымі дзеячамі. Жылі яны ў Пецярбургу на заробкі Віктара, які перапісваў гістарычныя дакументы, і невялікую стыпендыю, прызначаную К. Каліноўскаму ў 1858. Каб здабыць дадатковыя сродкі, К. Каліноўскі займаўся рэпетытарствам, а нярэдка быў вымушаны звяртацца за дапамогай у рэктарат. Вядома таксама, што ён цяжка хварэў, асабліва ў кастрычніку 1859. Тым не менш ён выдатна вучыўся, летам 1860 паспяхова скончыў універсітэцкі курс і, пасля падачы дысертацыі ў студзені 1861, зацверджаны папячыцелем Пецярбургскай навучальнай акругі ў ступені кандыдата праў. Атрымаўшы ў лютым 1861 дыплом, ён праз 2 тыдні быў ужо ў Вільні, дзе зрабіў безвыніковую спробу ўладкавацца на службу ва ўпраўленне мясцовага генерал-губернатара.

Вяртанне К. Каліноўскага на радзіму супала з моцным уздымам вызваленчага руху на Беларусі і Літве, выкліканага абвяшчэннем сялянскай рэформы і абвастрэннем палітычнай сітуацыі ў Расіі і Польшчы. Ён стаў адным з правадыроў гэтага руху, лідэрам яго дэмакратычнай плыні («чырвоных»). Яго погляды мелі яскравы рэвалюцыйна-дэмакратычны характар. К.Каліноўскі імкнуўся надаць будучаму паўстанню супраць царызму характар аг-

рнай рэвалюцыі. На працягу 1861 ён стварыў на Гродзеншчыне з разначыннай інтэлігенцыі нелегальную рэвалюцыйную арганізацыю, звязаную з такімі ж арганізацыямі ў Вільні. К.Каліноўскі і яго прыхільнікі вялі па вёсках і мястэчках агітацыю сярод сялян, заклікалі іх на барацьбу з памешчыкамі і самаўладствам. Разам са сваім сябрам В. Урублеўскім, беларускім паэтам Ф.Ражанскім і іншымі паплечнікамі па гродзенскай арганізацыі летам 1862 ён прыступіў да выдання першай у гісторыі Беларусі нелегальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай газеты «Мужыцкая праўда». На працягу 1862—63 удалося выдаць сем нумароў, аўтарам і рэдактарам большасці з якіх быў Каліноўскі. «Мужыцкая праўда» ўпершыню на беларускай мове несла рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі ў асяроддзе сялянства, рыхтавала яго да паўстання. К. Каліноўскі асабіста ўдзельнічаў у пашырэнні газеты, дзёрзка раскідваючы яе на дарогах Слонімшчыны. Пасля таго, як мясцовыя ўлады аддалі загад пра яго арышт, ён цалкам перайшоў на нелегальнае становішча, хаваючыся пад рознымі прозвішчамі (Макарэвіч, Хамовіч або Хамуціус, Чарноцкі і інш.).

Адначасова з напружанай дзейнасцю на Гродзеншчыне К. Каліноўскі падтрымліваў цесныя сувязі з сябрамі-аднадумцамі далёка за яе межамі. Удзельнічаў у рабоце віленскага цэнтра па падрыхтоўцы паўстання ў Літве і на Беларусі — «Камітэта руху», перайменаванага неўзабаве ў Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК), вёў там барацьбу за рэвалюцыйна-дэмакратычнаую праграму паўстання. З восені 1862 К. Каліноўскі старшыня ЛПК, што сведчыла пра ўзмацненне ўплыву рэвалюцыйных дэмакратаў у вызвалечым руху на беларуска-літоўскіх землях. Вядомы прынцыповыя спрэчкі К. Каліноўскага і ўсяго ЛПК з рэвалюцыйнымі дзеячамі Варшавы за прызнанне суверэннасці Літвы і Беларусі. Вялікія надзеі К. Каліноўскі ўскладаў на супрацоўніцтва з рускімі рэвалюцыянерамі (у канцы 1862 для ўмацавання кантактаў ён прыязджаў у Пецярбург). Пасля выбуху паўстання ў Польшчы (студзень 1863) ЛПК заклікаў народы беларуска-літоўскага краю да актыўных дзеянняў і абвясціў сябе Часовым рэвалюцыйным урадам Літвы і Беларусі. Выпушчаная К. Каліноўскім «Паўстанцкая інструкцыя» патрабавала суровых захадаў супраць памешчыкаў — прыгнятальнікаў народа. Аднак прадстаўнікам ліберальнай плыні ў вызваленчым руху («белым») удалося зрабіць пераварот і, адхіліўшы К. Каліноўскага і яго паплечнікаў ад кіраўніцтва паўстаннем, захапіць уладу ў паўстанцкай арганізацыі.

З вясны 1863 К. Каліноўскі рэвалюцыйны камісар на Гродзеншчыне, працаваў у Беластоку і Гродна, шмат зрабіў, каб зламаць сабатаж памешчыкаў і ўцягнуць у паўстанне народныя масы. У тым жа годзе разам з паўстанцкім цывільным начальнікам Гродзенскага ваяводства Э. Заблоцкім ён аб'ехаў Слонімскі і Ваўкавыскі паветы, апошні раз пабываў у ф. Якушоўка, інспекціраваў злучаныя сілы паўстанцаў пад Мілавідамі ў Слонімскім пав. (напярэдадні вядомай бітвы) і Брэсцкі атрад за Бугам у Падляшшы. Хутка ў паўстанцкай арганізацыі адбыўся новы пераварот, «чырвоныя» зноў узялі ўладу ў свае рукі і К. Каліноўскі ўзначаліў віленскі паўстанцкі цэнтр. Адной з важнейшых канспіратыўных яго кватэр у Вільні была кватэра Ямантаў на Ратушнай плошчы (цяпер вул. Дзіджойі). Былы студэнт І. Ямант вёў важную перапіску паўстанцаў, а яго сястра Марыля была блізкім сябрам К. Каліноўскага. За кіраўніком паўстання ўлады арганізавалі сапраўднае паляванне. Але ён працягваў мужную барацьбу, мяняючы аблічча, імёны, адрасы. Паступова кола рэвалюцыянераў звужалася. Былі схоплены і публічна пакараны смерцю найбліжэйшыя яго паплечнікі І.Здановіч і Ц. Далеўскі. Для ўмацавання мясцовай арганізацыі ў Мінску паехаў І.Ямант. У кастрычніку 1863 К. Каліноўскі пад імем І. Вітажэнца пасяліўся ў т. зв. Святаянскіх мурах (комплекс будынкаў былога Віленскага універсітэта), насупраць генерал-губернатарскага палаца, дзе жыў душыцель паўстання Мураўёў-вешальнік. Псеўданім і адрас кіраўніка паўстання выдаў жандарму на допытах у Мінску ўдзельнік паўстанцкай арганізацыі В. Парфіяновіч. У студзені 1864 К. Каліноўскі быў арыштаваны ў «Святаянскіх мурах» і зняволены ў т. зв. Дамініканскім будынку (былы дамініканскі манастыр, цяпер вул. Гедрыса). Чалавек вялікай сілы духу, пачуцця ўласнай годнасці і мэтанакіраванасці, К. Каліноўскі паводзіў сябе пад час следства і суда вельмі мужна, у турме напісаў і здолеў перадаць на волю «Пісьмы з-пад шыбеніцы» — сваё ідэйна-палітычнае завяшчанне, яскравы мастацка-публіцыстычны твор, дакумент рэвалюцыйна-дэмакратычнай ідэалогіі. Асуджаны царскім ваенна-палявым судом, паводле канфірмацыі Мураўёва ён быў публічна павешаны ў Вільні на гандлёвай плошчы Лукішкі (цяпер плошча Лукішкю). Цела рэвалюцыянера паводле тагачасных правіл закапалі на месцы пакарання. Пазней яго прах тайна перанеслі на тэрыторыю Віленскай цытадэлі. Лічыцца, што рэшткі К. Каліноўскага, як і іншых змагароў 1863, пакараных смерцю ў Вільні, пахаваны на вяршыні гары Гедыміна, якая знаходзілася ў той час на тэрыторыі цытадэлі.

К. Каліноўскі вядомы нам не толькі як рэвалюцыянер-інтэрнацыяналіст, палымяны прыхільнік ідэі рэвалюцыйнага саюза ўсіх народаў у барацьбе з самадзяржаўем, але і як выдатны знаўца беларускай народнай мовы. Шырока і з вялікім майстэрствам ён карыстаўся ёю ў сваёй публіцыстыцы, садзейнічаў яе літаратурнаму развіццю. Пісаў таксама і вершы. Як родапачынальнік беларускай рэвалюцыйнай дэмакратыі К. Каліноўскі зрабіў вялікі ўплыў на ўсю наступную беларускую літаратуру і культуру, садзейнічаў паглыбленню ў літаратуры і мастацтве прынцыпаў рэалізму і народнасці, замацаванню высокіх ідэалаў барацьбы за свабоду. Ідэйныя прынцыпы К. Каліноўскага развівалі пасля ў сваёй творчасці Ф. Багушэвіч, Я. Купала, Я. Колас, Цётка і інш.

К. Каліноўскі — адзін з самых любімых нацыянальных герояў беларускага народа. Папулярны ён таксама ў Літве і Польшчы. Яго імем названы вуліцы ў Астраўцы, Ашмянах, Баранавічах, Беластоку, Вільнюсе, Ганцавічах, Гродне, Лідзе, Магілёве, Мінску і іншых месцах. У гады Вялікай Айчыннай вайны грамілі ворага партызанская брыгада і атрады імя Каліноўскага на Беларусі, у Літве і Польшчы. У яго гонар пастаўлены помнік у Свіслачы, устаноўлены мемарыяльныя дошкі ў Вільнюсе (на будынку, дзе ён быў зняволены, і на месцы пакарання смерцю), Мінску (на будынку кінатэатра «Вільнюс»), в. Мастаўляны (Польшча) і Свіслач (на будынку бальніцы, дзе знаходзілася вучылішча, у якім ён вучыўся). Жыццё і барацьба К. Каліноўскага адлюстраваны ў экспазіцыях Дзяржаўнага музея Беларусі, Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, Свіслацкага гісторыка-краязнаўчага музея. Прынята рашэнне пра будаўніцтва помніка

К.Каліноўскаму ў Гродне і адкрыцці музея ў Якушоўцы. Яму прысвечаны многія выдатныя творы літаратуры і мастацтва (паэмы М. Танка і А. Куляшова, драмы Е. Міровіча і У. Караткевіча, опера Д. Лукаса, балет А. Янчанкі, мастацкія і дакументальныя фільмы і інш.). Рукапісная спадчына К. Каліноўскага ў цэлым выглядзе не зберагласа: асобныя аўтографы ёсць у Санкт-Пецярбургу, Вільнюсе, Варшаве.

Г.В.Кісялёў.

Бібліяграфія

1.2.

Mużyckaja praŭda: [Газета-лістоўка]. Biełastok. 1862—1863. [Падпольнае выданне К. Каліноўскага]. № 1 (канец чэрвеня — пачатак ліпеня); № 2 (канец жніўня); № 3 (верасень); № 4 (кастрычнік); № 5 (лістапад); № 6 (снежань); № 7 / Пад псеўд. Яська гаспадар з-пад Вільні.

Prykaz ad Radu Polskaho nad cełym krajem Litouskim i Biełoruskim da Narodu ziemli Litouskoj i Biełoruskoj. Dan w mieści Wilni u Dzień Swiatoho Warfołomieja leto hospodnia 1863. К.Калиновский: Из печатного и рукописного наследия. Мн., 1988.

1.3.

1867. [Лісты з-пад шыбеніцы] // Giller A. Historia powstania narodu polskiego. Paryż. T. 1.

1916. «Беларуска зямелька, галубка мая...»: [Верш] // Гоман. 15 лют.

1919. Лісты з-пад шыбеніцы: «Беларусы, браты мае родныя!..»: [Урывак]; «Беларуска зямелька, галубка мая...»: [Верш] // Беларускі каляндар Сваяк на 1919 год. Вільня.

1922. Пісьмо «з-пад шыбеніцы»; «...Беларуска зямелька, галубка мая!..»: [Вершы] // Гарэцкі М. Хрэстаматыя беларускае літаратуры. Вільня.

1923. «Мужыцкая праўда», № 5 // Сав. Бел. 24 жн.

1926. Лісты з-пад шыбеніцы: «Беларусы, браты мае родныя!..»: [Урывак]; «Беларуска зямелька, галубка мая...»: [Верш] // Беларускі гаспадарскі каляндар на 1926 год. Вільня; «Мужыцкая праўда», № 3, 5, 7 // Полымя. № 1.

1928. «Мужыцкая праўда», № 1—7 // Агурский С. Очерки по истории революционного движения в Белоруссии (1863—1917). Мн.

1940. «Мужыцкая праўда», № 1, 5, 7 // Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн. Т. 2.

1950. «Мужыцкая праўда», № 1, 7 // Беларуская літаратура XIX ст. Мн.

1961. «Марыська чарнаброва, галубка мая!..»: [Верш] // Анталогія беларускай паэзіі: У 3 т. Мн. Т. 1.

1962. «Мужыцкая праўда», № 1, 4 // Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы. Мн. Ч. 2.

1963. «Бывай здаровы, даражэнькі народзе!»: [Верш] // Ніва. 24 сак.

1965. Показания [К.Каліноўскага]в Виленской особой следственной комиссии; Записка после окончания над ним следствия // Восстание в Литве и Белоруссии 1863—1864 гг. М.

1966. «Мужыцкая праўда», № 1—7 // Prasa tajna z lat 1861—1864. Wrocław etc. Cz. 1.

1971. «Мужыцкая праўда»; Пісьмо з-пад шыбеніцы // Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя. Мн.

1974. «Мужыцкая праўда», № 1 // Беларускі каляндар 1974. Беласток.

1988. «Мужыцкая праўда», № 1—7 / Падрыхт. да друку А.Гаўрон; Да беларускага люду: Лісты з-пад шыбеніцы Кастуся Каліноўскаа / Падрыхт. да друку Я. Янушкевіч // Маладосць. № 1.

1.5.

На польскую мову. Maryś czarnobrewa / Tł. J. Huszcza // Antologia poezji białoruskiej. Wrocław etc, 1978.

На рускую мову. «Мужицкая правда», № 1—6 / Пер. Г. Киселев // Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861—1862 гг.: Материалы и документы. М., 1964; «Мужицкая правда», № 7 / Пер. Г. Киселев // Восстание в Литве и Белоруссии 1863—1864 гг.: Материалы и документы. М., 1965; «Мужицкая правда», № 1, 3: [Урыўкі] // Антология мировой философии. М., 1972; «Марыся чернобровая, голубка моя!..»: [Верш] / Пер. Ю.Петров // Поэзия народов СССР. XIX — начало XX века. М., 1977; Из «Мужицкой правды»; К белорусскому народу: Письма из-под виселицы; «Марыська, моя дорогая голубка...»: [Вершы] / Пер. Г.Киселев, В.Шалькевич // Антология педагогической мысли Белорусской ССР. М., 1986; Из «Мужицкой правды»; Из «Писем из-под виселицы»; «Марыська, мое чернобровое диво...»: [Верш] / Пер. Г. Киселев // ЛГ. 1988. 2 марта.

2.1.

На рускай мове. За нашу и вашу свободу: (К 125-летию восстания 1863—1864 гг. и 150-лет. юбилею К.Калиновского): Библиогр. указ. лит. / Сост. Г.М.Тарюрская. Гродно, 1987.

2.2.

На англійскай мове. Shalkevich V. Kastus Kalinowski: Pages from Life-Story. Minsk, 1986. (Б-чка газ. «Голас Радзімы»).

На беларускай мове. Белы А. Вобраз змагара: (Да 150-годдзя з дня нараджэння К.Каліноўскага). Мн., 1988.

Белы А. Вобраз К. Каліноўскага ў літаратуры і мастацтве. Мн., 1988.

Кастусь Каліноўскі і студзеньскае паўстанне 1863 года на Беларусі: Каталог выст. Мн., 1988.

Кастусь Каліноўскі: Рэсп. маст. выстаўка, прысвечаная 150-годдзю з дня нараджэння і 125-годдзю паўстання 1863—1864 гг. (4—28 лют. 1988 г.). Каталог / Скл. Л. Бортнік з інш. Мн., 1989.

Кісялёў Г. Паплечнік Каліноўскага. Мн., 1976. (Школьнікам — аб гісторыі БССР). Рэц.: Бажко Ю. Пра легендарнага змагара // Беларусь. 1976. № 7; Батвінік М. Нарыс пра генерала Камуны // ЛіМ. 1977. 2 вер.

Смірноў А. Кастусь Каліноўскі ў паўстанні 1863 года. Мн., 1959. Рэц.: Васільеў В. Кніга пра Кастуся Каліноўскага // Беларусь. 1959. № 9; Яго ж. Палымяны патрыёт: Кніга пра Кастуся Каліноўскага // За вярт. на Радзіму. 1959. № 75; Кісялёў Г. Кнігі пра сына беларускага народа // ЛіМ. 1959. 18 ліст.; Копысский З., Мелешко В. Книга о народном герое // Сов. Бел. 1959. 20 окт.

Stankiewič A. Kastuś Kalinoŭski; «Mużyckaja praŭda» i ideja nezależnasci Biełarusi. Wilnia, 1933.

Шалькевіч В. Кастусь Каліноўскі: Старонкі біяграфіі. Мн., 1985. (Б-чка газ. «Голас Радзімы»). Рэц.: Краслаўскі В. // Голас Радзімы. 1985. 18 крас.

На літоўскай мове. 1863—1864 metai Lietuvoje: Straipsniai ir dokumentai. Kaunas, 1991.

На польскай мове. Biersdorf O. Konstanty Kalinowski: Popularny szkic o K.Kalinowskim, w ramach prac naukowo-badawczych Biblioteki przy Wojewódzkim klubie TPPR w Krakowie. Kraków, 1955.

Demokracja polska w powstaniu styczniowym: Wybór źródeł. Wrocław, 1961.

Kordowicz W. Konstanty Kalinowski: Rewolucyjna demokracja polska w powstaniu styczniowym na Litwie i Białorusi. Warszawa, 1955. Рэц.: Каленниченко П. Польский исследователь о Кастусе Калиновском // Славяне. 1957. № 4.

Kosztyła Z., Krasko R. Z dziejów powstania styczniowego na Białostocczyźnie 1863—1864. Białystok, 1963.

На рускай мове. Константин Калиновский (1838—1864): Материалы респ. науч. конференции, по-

священной 150-летию со дня рождения выдающегося белорусского революционера-демократа и мыслителя К. Калиновского. Гродно, 1988.

Смирнов А. Кастусь Калиновский. М., 1959. Рэц.: Каленичeнко П. Мужественные борцы за счастье народа // Сов. Литва. 1959. 2 сент.; Кісялёў Г. Кнігі пра сына беларускага народа // ЛіМ. 1959. 18 ліст.; Лазутка С. Их имена бессмертны // Коммунист (Вильнюс). 1959. № 12; Майхровіч С. Кастусь Каліноўскі быў такім // Звязда. 1959. 21 жн.; Koberdowa I. // Kwart. Historyczny. 1961. N 1.

Смирнов А. Кастусь Калиновский. Мн., 1963.

Смирнов А. Константин Калиновский (1838—1864): Вождь крестьянского восстания в Белоруссии и Литве. Мн., 1950.

Смирнов А. Революционный демократизм К.Калиновского: Автореф. дис.... канд. ист. н. Мн., 1950.

Шалькевич В. Кастусь Калиновский: Страницы биографии. Мн., 1988.
2.3.

На англійскай мове. Horoško L. Kastuś Kalinoŭski: Leader of the National Uprisind in Byelorussia 1863—64 / J. of Byelorus. Studies. 1965. V. 1. № 1.

Можно ли вернуть былое?: Рассказ // Сел. газ. 1972. 15 марта; Будет Нефтеград! // Сов. Клайпеда. 1972. 9 февр.; Белые гуси лето пророчат: [Апавяданне] / Пер. Ф.Архипов // Неман. 1974. № 3; Прочный сплав: [Нарыс] / Пер. А.Горчак // Там жа. 1976. № 1; Посмотреть за горизонт: Докум. повесть / Пер. Л.Кириллов // Пром-сть Бел. 1979. № 2—5; Запах живицы: [Апавяданне] / Пер. В.Лавров // Неман. 1980. № 9; Столетник: [Апавяданне] // Неман. 1984.

№ 1; Минута молчания: Рассказ / Пер. М.Волошка // Знамя юности. 1984. 10 февр.; Минута молчания: Рассказ / Пер. А.Бутевич // Сов. молодежь (Иркутск). 1985. 28 марта.

На татарскую мову. Тозлы чык: [Урывак з аповесці] // Казан. утлары. 1982. № 9; Язгы тендэ: [Апавяданне] / Ш.Рэкыйпов тэрж. // Соц. Татарстан. 1982. 10 окт.; Ленин байрагы (Бугульма). 1983. 5—26 февр.

На ўкраінскую мову. На сотому кілометрі: Оповідання // Літ. Укр. 1975. 1 лип.; Стаття до газети: Гумореска / Пер. О. Жолдак // Там жа. 1976. 21 трав.; На сотому кілометрі: Оповідання // Комсомолець Запоріжжя. 1976. 26 серп.

2.3.

На беларускай мове. Аляксандру Капусціну — 60 // ЛіМ. 1984. 10 лют.; Гамолка М. З уважай да чалавека: (Да 60-годдзя з дня нараджэння А.Капусціна) // Наст. газ. 1984. 18 лют.; Яго ж. Прадмова // Капусцін А. Чалавек з пазіцыяй. Мн., 1975; Марціновіч А. Шчаслівы лёс: Беларускаму пісьменніку А.Капусціну — 60 гадоў // Гомел. праўда. 1984. 12 лют.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Скрыган Я. Ненадрукаваныя апавяданні // Скрыган Я. Ранішнія росы. Мн., 1965. С. 134—141, 151—152; Яўменаў Ф. І словам, і справай народу служыць // Гомел. праўда. 1952. 25 студз.

2.4.

На беларускай мове. Пысін А. Аляксандру Капусціну: [Верш] // Беларусь. 1980. № 3; Яго ж. Сцяжынкі лясныя стаптаны да дзір...: [Верш] // Пысін А. Палёт. Мн., 1982.; Янчанка М. Запрашэнне: [Верш] // Чырв. змена. 1978. 18 студз.

На рускай мове. Пысин А. Лесная тропинка протерта до дыр: [Верш] // Пысин А. Есть на свете мой олень. М., 1983.

3.1.

БДАМЛіМ, ф. 299.

В.У.Смольская.

КАПУЦКІ АНДРЭЙ

Капуцкі Андрэй Рыгоравіч (псеўд. Я.Пралеска, Язэп Пралеска; 2.5.1897, Маладзечна — 1935), празаік, паэт, журналіст, дзеяч заходнебеларускага рэвалюцыйнага руху.

У сям'і Капуцкіх было 9 дзяцей. Да 16 год А.Капуцкі вучыўся ў народнай школе. Скончыўшы яе, паступіў працаваць у ваенна-будаўнічы атрад, дзе былі старыя камуністы, якія і прыцягнулі яго да ўдзелу ў падпольнай рабоце. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю. Сябраваў з М.Чарот там. Удзельнічаў у імперыялістычнай, затым — у грамадзянскай войнах. У 1917 жыў у Петраградзе. З 1918 працаваў на гаспадарцы бацькоў у Маладзечне, у гады акупацыі Беларусі кайзераўскімі войскамі і польскімі легіянерамі вёў падпольную работу, распаўсюджваў лістоўкі, вазіў іх у Мінск. Там яго арыштавалі, і ён тры месяцы адсядзеў у Мінскай турме. Другі раз арыштаваны ў 1921, сядзеў у турме на Лукішках у Вільні, але яго выпусцілі з-за недаказанасці віны. Быў адным з заснавальнікаў Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (1922), разам з якой у студзені 1924 уступіў у КПЗБ. Кааптаваны ў ЦК КПЗБ. Да 1925 працаваў з паслам польскага сейма П.Мятлой, С.Рак-Міхайлоўскім і Б.Тарашкевічам. 4.10.1925 зноў арыштаваны. Сядзеў у Вілейцы і Вільні. Без суда (не была ўстаноўлена яго віна) А.Капуцкага трымалі ў турме 14 месяцаў. Дзеля яго вызвалення сям'і, у якой было трое малых дзяцей, давялося заплаціць выкуп у 2 тыс. злотых. У 1926—27 на працягу 8 месяцаў ён знаходзіўся пад наглядам паліцыі. У ліпені 1927 падпольна перайшоў у СССР, куды пераправіў і сям'ю. Жыў у Мінску. Скончыў Камуністычны універсітэт Беларусі. Працаваў у рэдакцыях газеты «Звязда», часопіса «Полымя рэвалюцыі», дырэктарам універсітэта марксізма-ленінізма, загадчыкам сектара друку ЦК КП(б)Б, сектара Заходняй Беларусі ў Істытуце гісторыі партыі. Быў беспадстаўна арыштаваны і ў студзені 1934 прысуджаны да расстрэлу (аднак сваякі сцвярджаюць, што А.Капуцкага не стала ў 1935). Рэабілітаваны ў 1956.

У беларускай літаратуры А.Капуцкі выступіў як паэт пад псеўд. Я.Пралеска ў 1929, надрукаваўшы ў час. «Паляўнічы Беларусі» верш «У дарозе». У

1930 апублікаваў у «Полымі» свае лепшыя апавяданні «Парабкі» і «На расцяробе» (у 1932 яны выйшлі асобнай кнігай пад назвай «Паноў трэба знішчаць гуртам»), а таксама некалькі фельетонаў у газеце «Савецкая Беларусь». Прозу А.Капуцкага вызначаюць добрая каларытная мова, выключнае веданне жыцця, майстэрства дыялогу. Аўтар знаходзіў цікавыя характэрныя дэталі і жыва, вобразна перадаваў іх. Аднак яму не хапала ўмення кампазіцыйна з'яднаць багаты матэрыял. Жыццёвыя ўражанні, яскравыя дыялогі нанізваліся на сюжэтную схему, у аснове якой ляжаў класавы канфлікт. Відавочнай была зададзенасць у развіцці сюжэта, што абумовіла штучнасць некаторых эпізодаў і нераспрацаванасць сюжэтных ліній. Але, нягледзячы на відавочную тэндэнцыйнасць, творы К.Капуцкага дапаўняюць мастацкую літаратуру аб Заходняй Беларусі. Імем А.Капуцкага названа вуліца ў г. Маладзечна.

І.Э.Багдановіч, Г.А.Каханоўскі.

Бібліяграфія

1.2.

Паноў трэба знішчаць гуртам: Апавяданні з жыцця Заходняй Беларусі. Мн., 1932 / Пад псеўд. Я.Пралеска. Рэц.: Салагуб А. // Заклік. 1933. № 1.

1.3.

1929. У дарозе: [Верш] // Паляўнічы Бел. № 3 / Пад псеўд. Я.Пралеска.

1930. Парабкі: Апавяданне // Полымя. № 3; На расцяробе: Апавяданне // Там жа. № 9—10; І выюць, і когці востраць: [Фельетон] // Сав. Бел. 9 сак.; Уласная, беларуская, «цудоўная»: [Фельетон] // Там жа. 20 сак.; Абрэз: [Апавяданне] // Там жа. 4 кастр. / Усе пад псеўд. Я.Пралеска.

1932. Усё ж такі будзе...: [Апавяданне] // Сав. Бел. 15 студз.; Не дамо кулаку разбурыць калгас «Скавародзіна» // Там жа. 10 кастр. / Усе пад псеўд. Я.Пралеска.

1933. Парабкі: [Апавяданне, скароч.] // Хрэстаматыя рэвалюцыйнай літаратуры Заходняй Беларусі. Мн. / Пад псеўд. Я.Пралеска.

2.3.

На беларускай мове. Каханоўскі Г. Даследаванне пра заходнебеларускі тэатр // Полымя. 1971. № 2; Сталевіч А. [Родзевіч А.]. Прадмова // Пралеска Я. Паноў трэба знішчаць гуртам. Мн., 1932.

Т.М.Махнач.

КАПЫЛОВІЧ ІВАН

Капыловіч
Іван Іванавіч
(н. 2.1.1944,
в. Забалацце
Мазырскага р-на
Гомельскай вобл.),
празаік.
Член СП Беларусі
з 1981.

Маці, Марыя Андрэеўна, працавала настаўніцай у вясковай школе. Бацька, Іван Платонавіч, быў калгасным шафёрам. У час Вялікай Айчыннай вайны — партызанскі падрыўнік. Пасля вызвалення разам з часцямі Савецкай Арміі пайшоў на захад, загінуў у Памераніі. У 1962 І.Капыловіч скончыў Рамязоўскую адзінаццацігодку Ельскага р-на і паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага ф-та БДУ. Восенню 1964 быў прызваны на службу ў рады Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі (1966) вярнуўся ва ўніверсітэт, які скончыў ў 1967. У 1967—69 працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». У канцы 1969, знаходзячыся ў службовай камандзіроўцы, трапіў ў аўтамабільную катастрофу і стаў інвалідам (на пенсіі).

Літаратурную работу І.Капыловіч пачаў у 1970. Лепшыя з ранніх апавяданняў празаіка ўвайшлі ў кніжку «Сонца садзіцца ў травы». У яе ўвайшлі 7 апавяданняў, аб'яднаных адной тэмай — любоў да зямлі, на якой жывуць працавітыя і прыгожыя душой людзі. Аўтар добра ведае іх клопаты і трывогі, радасці і засмучэнні. Першая кніжка ўразіла до-

брым веданнем сакрэтаў сюжэта і кампазіцыі, сваёй тэмай і сваім героем, узятым з самога жыцця. Аўтар кніг «Два дні ў лютым», «Асенні гром», «Сны не вяртаюцца» і інш. У час. «Полымя», «Беларусь», «Неман», «Маладосць» у розныя гады друкаваліся апавяданні і аповесці «Хто дасць рады?», «Серафіна», «Абходчык», «Сны не вяртаюцца», «Бяроза на мяжы», «Пісьмы Караліне». У іх ёсць сцвярджэнне жыцця, няма адчаю і песімізму, скаргі на свой складаны і драматычны лёс. Аўтар рамана «Пачынак» (Полымя". 1993. № 4, 5).

Жыве ў Мінску.

В.І.Смыкоўская.

Бібліяграфія

1.2.

Сонца садзіцца ў травы: Апавяданні. Мн., 1978. (Першая кніга празаіка). Рэц.: Бароўскі А. Прыемная сустрэча // Гомел. праўда. 1979. 3 ліп.; Лісіцкі А. Сустрэча адбылася // Чырв. змена. 1980. 23 крас.

Два дні ў лютым: Аповесці і апавяданні. Мн., 1981. Рэц.: Васючэнка П. Гэтае шматаблічнае «Рэтра»... // ЛіМ. 1982. 21 мая.

Асенні гром: Аповесць і апавяданні. Мн., 1985.

Сны не вяртаюцца: Аповесці і апавяданні. Мн., 1988.

Імянны гадзіннік: Апавяданні, аповесці. Мн., 1991.

1.3.

1966. Флаг над рэўкомам // Чырв. змена. 3 вер.; Часцінка неба: Нарыс // Там жа. 1 кастр.

1967. Як загараецца вясёлка? // Чырв. змена. 19 ліст.

1968. Не па-суседску: [Гумарэска] // Вожык. № 18; Палеская ява: Нарыс // Наст. газ. 28 снеж.; След ружовага дзяцінства: Навела // Чырв. змена. 31 снеж.

1969. Палескі чарадзей: Нарыс // Беларусь. № 8; У Маскву, на злёт; У школьным музеі: Нарысы // Бярозка. № 5; Лесной патруль: [Нарыс] // Неман. № 4.

1970. Галасы на золаку: Нарыс // Чырв. змена. 8 лют.

1972. Пучок жытнёвых каласоў: Навела // Чырв. змена. 8 чэрв.

1974. [Рэц. на кн.: Хорсун В. З дарог далёкіх і блізкіх. Мн., 1973] // Звязда. 16 лют.; Палескія пчаляры // Звязда. 17 вер.; Подзвіг разведчыка // Чырв. змена. 17 чэрв.; На Чырвоным возеры: Навела // Там жа. 3 ліст.

1975. Глыбокія карэнні; Буслы дзядзькі Андрэя: Былі // Беларусь. № 7; Млечны шлях: Нарыс // Звязда. 1 чэрв.; Развітанне: Абразок // ЛіМ. 24 студз.; Трывожныя вёрсты // Там жа. 17 кастр.; Сучасны погляд на стыль // Там жа. 19 снеж.

1976. Ісці ўпоравень з часам // Беларусь. № 3; Плённасць вытокаў: [Рэц. на кн.: Мушынскі М. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства. Мн., 1975] // Там жа. № 4; Пятровічаў лес: Апавяданне // Маладосць. № 11; Мировоззрение и творческий процесс // Неман. № 3; Зорка рыбацкая: Нарыс // Звязда. 21, 22 студз.; Самая доўгая вахта: Нарыс // Там жа. 26 чэрв.; Пад старой дзічкай: Апавяданне // ЛіМ. 19 ліст.

1977. Даўнія суседзі: Апавяданне // Беларусь. № 9; На адзін круг вышэй: [Рэц. на кн.: Кандрусевіч А. Кругі на Белай паляне. Мн., 1977] // Полымя. № 12; Порт на Прыпяці: Нарыс // Звязда. 23 крас.; Борец за народное счастье // Сов. Бел. 4 авг.

1978. Дзеля найвышэйшай праўды: [Рэц. на кн.: Жук А. Не забывай меня. Мн., 1978] // Звязда. 13 кастр.; Сыны: Апавяданне // ЛіМ. 7 ліп.

1979. Ліст у адказ: Апавяданне // Маладосць. № 9; Вяртанне ў вогненную маладосць: [Рэц. на кн.: Хомчанка В. Вяртанне ў агонь. Мн., 1978] // Полымя. № 1; Паміж берагамі жыцця: [Рэц. на кн.: Вышынскі М. Крыніца, светлая вадзіца. Мн., 1979] // Там жа. № 10; Каму расказаць: Апавяданне // ЛіМ. 5 кастр.

1980. Гняздо на дубе: Апавяданне // Бярозка. № 10; Унук: Апавяданне // Полымя. № 6; Аб'ект даследавання — культура: [Рэц. на кн.: Головнев А., Мельников А. Сближение национальных культур в процессе коммунистического строительства. Мн., 1979] // Вяч. Мінск. 20 вер.; Востраў у моры: Апавяданне // ЛіМ. 25 ліп.

1981. Пералётныя птушкі: Апавяданне // Беларусь. № 10; Браты: Апавяданне // Полымя. № 2; Строгая дабрата: Нарыс // Звязда. 30 жн.; Права на выбар: [Рэц. на кн.: Міськко П. Градабой. Мн., 1980] // ЛіМ. 19 чэрв.

1982. Позні гром: [Урывак з аповесці «Асенні гром»] // ЛіМ. 3 снеж.

1983. Сувязь пакаленняў: [Рэц. на кн.: Панцюшэнка Ц. Тайны старажытных руін. Мн., 1983] // ЛіМ. 5 жн.; Мацвейкаў стажок: Апавяданне // Там жа. 9 снеж.

1984. Дача: Апавяданне // Маладосць. № 9; Свой хлеб: Нарыс // Там жа. № 10; Чарнабурка: Апавяданне // Полымя. № 7; Абходчык: Апавяданне // Там жа. № 10; Не пагаварылі: Апавяданне // ЛіМ. 17 жн.; Які ён, сучаснік?: [Рэц. на кн.: Далідовіч Г. На новы парог. Мн., 1983] // Наст. газ. 12 снеж.

1985. Хто дасць рады?: Апавяданне // Беларусь. № 7; Сны не вяртаюцца: Аповесць // Маладосць. № 11; Радзіма клікала ў бой: [Рэц. на кн.: Высоцкий В. Битва при Сиверске. Мн., 1985] // Звязда. 21 снеж.

1.5.

На рускую мову. Над Припятью-рекой: Рассказы / Пер. В.Громыко. М., 1985. Рэц.: Суніца А. Кнігапіс // ЛіМ. 1985. 6 снеж.

Внук: [Апавяданне] / Пер. Т.Мартыненко // Неман. 1982. № 2.

На ўкраінскую мову. Сонца сідае у трави: [Апавяданне] / Пер. А.Осипчук // Рідня. К., 1980.

2.3.

На беларускай мове. Дзюбайла П. У пошуках духоўных каштоўнасцей // Полымя. 1981. № 9; Лаўшук С. А майстэрства прыйдзе // ЛіМ. 1978. 27 кастр.; Прыняты ў Саюз пісьменнікаў // ЛіМ. 1981. 24 крас.

В.У.Смольская.

КАПЫЛОВІЧ МІКОЛА

Капыловіч Мікола Фаміч (н. 10.7.1937, в. Астражанка Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.), празаік. Член СП Беларусі з 1968.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Скончыў Астражанскую СШ, працаваў інструктарам Лельчыцкага РК ЛКСМБ (1956—58). У 1958 паступіў на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філфака БДУ. Пасля заканчэння (1963) працаваў настаўнікам Цудзенішскай СШ Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл. З 1964 у Мінску. Рэдактар у выдавецтве «Беларусь» (1964—71; 1981—83), літаратурны сакратар газеты «Звязда» (1971—73), рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура (1973—81). У 1983 з-за перанесенай траўмы выйшаў на пенсію па інваліднасці, пераехаў жыць у Маладзечна.

Літаратурнай працай пачаў займацца яшчэ ў студэнцкія гады. На 1960 прыпадае першая публікацыя М.Капыловіча ў рэспубліканскім друку. Першая кніга апавяданняў «Скрозь жывуць людзі» выйшла ў 1968. Асноўная тэматыка творчасці—сучаснае жыццё вёскі, маральна-этычныя праблемы, мужнасць савецкіх людзей у Вялікай Айчыннай вайне («Засада», «Дні ціхай восені», «Чужы сваяк»). Піша для дзяцей.

Жыве ў Маладзечне.

Л.С.Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Скрозь жывуць людзі: Апавяданні. Мн., 1968. Рэц.: Бечык В. Чым жылі і жывуць аднагодкі // ЛіМ. 1969. 25 сак.; Гусак С. Скрозь людзі // Маладосць. 1969. № 10; Калеснік І. З крыніц жыцця // Чырв. змена. 1969. 12 студз.; Кірвель А. Проза... Выдаткі і прэтэнзіі // Мін. праўда. 1968. 5 снеж.; Марціновіч А. Аб нашых сучасніках // Гомел. праўда. 1969. 28 студз.; Прашковіч М. Усюды добрыя людзі // Полымя. 1969. № 4; Сачанка П., Якімовіч А. // Вяч. Мінск. 1969. 18 лют.

Засада: Аповесці. Мн., 1979. Рэц.: Александровіч І. Пра сапраўдных сяброў // ЛіМ. 1979. 7 снеж.; Астрэйка Н. Паэзія прозы // Наст. газ. 1980. 9 ліп.

Дні ціхай восені: Апавяданні. Мн., 1981. Рэц.: Васючэнка П. Гэтае шматзначнае «Рэтра...» // ЛіМ. 1982. 21 мая.

Чужы сваяк: Аповесці і апавяданні. Мн., 1987.

1.3.

1960. Беларускія салдацкія песні // ЛіМ. 14 мая.

1961. Сыкаюць косы; У акопах растуць баравікі: Эцюды // ЛіМ. 19 снеж.

1962. Перад касьбой; Перагародка; Сланечнік: Апавяданні // Маладосць. № 9; Па чарніцы: Апавяданне // Чырв. змена. 8 жн.

1963. Як дома; Было свята; Раніца; Поўдзень; Вечар: Апавяданні // Маладосць. № 8; Тапаліны пух: Апавяданне // Чырв. змена. 14 ліп.

1964. Не прыедзе: Апавяданне // Маладосць. № 10; ЛіМ. 13 кастр.; Двое на возеры: Апавяданне // Чырв. змена. 19 ліп.

1966. Антонаў вугал: Апавяданне // Вожык. № 2; Пучок чабору: [Апавяданне] // Вясёлка. № 4; У ружовым тумане: Апавяданне // Маладосць. № 8; Паэтычны роздум // Звязда. 21 мая; Гнёзды: Апавяданне // Піянер Бел. 12 ліст; Разбітае акно: Апавяданне // Чырв. змена. 18 снеж.

1967. Сірата; Аборка на чамадане: Апавяданні // Маладосць. № 4; Сірата: Апавяданне // ЛіМ. 7 крас.; Пустальга: Апавяданне // Чырв. змена. 21 снеж.

1968. Пустальга: Апавяданне // Полымя. № 1; Хлеб: Апавяданне // Там жа. № 8.

1969. Трыпціх: Раніца; Поўдзень; Вечар // Чырв. змена. 9 крас.

1970. Жыві: Апавяданне // Полымя. № 1; Каб ціха было: Апавяданне // ЛіМ. 26 чэрв.

1971. Французскі замах: Гумарэска // Маладосць. № 7; Сталасць майстэрства // Звязда. 27 кастр.

1972. Сірата; «Птушыны бацька»: [Апавяданні] // У глыбі жыцця. Мн.; Сяргей, сын Антолін: Апавяданне // Маладосць. № 7; На сваім селішчы: Апавяданне // ЛіМ. 7 студз.

1974. Мар'я з Хатак: Апавяданне // Маладосць. № 9.

1977. Залатая казка; Верка і Валодзя: Апавяданні // Маладосць. № 8; Жаніх: Апавяданне // ЛіМ. 18 ліст..

1978. Шостая зорка: Апавяданне // Беларусь. № 5; Тайна: Аповесць // Бярозка. № 8, 9; Агароднае пудзіла: [Апавяданне] // Вясёлка. № 2; Даўнія сябры; Вераснёўскай раніцай: Апавяданні // Полымя. № 10; Восеньскім днём: Апавяданне // Родная прырода. № 5.

1979. Петрык; Апошні дзень: Апавяданні // Полымя. № 4; Вяртанне: Апавяданне // Вяч. Мінск. 22 студз.

1980. Яго чакалі; Мёртвы вузел: Апавяданні // Беларусь. № 3; Бацькаў ордэн: Апавяданне // Бярозка. № 6; Вяч. Мінск. 12 чэрв.; Газон: Гумарэска // Вожык. № 11; Царэўна: [Апавяданне] // Вясёлка. № 10; Вясною; Анюта; Сонечны лівень: Апавяданні // Маладосць. № 5; Начальнік агню і дыму; Да маці; Скрыпун, або Паганіні з Зарэчча; Бацька і сын: Апавяданні // Полымя. № 9; Навелы аб прыродзе // Родная прырода. № 3; Ластаўкі: Апавяданне // Там жа. № 5; Ніна Перагуд; Пахатуха: Апавяданні // ЛіМ. 29 лют.; Вавёрка; Ліса ў трубе; Каршун і варона: Навелы // Мін. праўда. 4 мая; Сустрэча: Апавяданне // Там жа. 17 мая; Рэмез; Гадзючын гіпноз; Удод: Лясныя замалёўкі // Там жа. 17 жн.

1981. Царэўна: [Апавяданне] // Вясёлка. Мн.; Бяроза на мяжы: Аповесць // Маладосць. № 3.

1984. Мара; Рыбак-рыбака; Бабуля: Гумарэскі // Вожык. № 17; Сыкаюць косы: Навела // Мін. праўда. 16 чэрв.; Бацькаў ордэн: [Апавяданне] // Ніва. 4 ліст.

1985. У ружовым тумане: Апавяданне // Апавяданні пра Вялікую Айчынную. Мн.; Чужы сваяк: Аповесць // Полымя. № 8; Газон: [Гумарэска] // Ніва. 26 мая.

1.4.

1966. Мухамедаў М. Партрэт: Апавяданне / З узб. // Узбекскія апавяданні. Мн.

1967. Клдзіяшвілі С. Асенні дождж: Апавяданне / З груз. // Горны вадаспад. Мн.; Бес Г. Сельскі дэпутат: Апавяданне / З арм. // Полымя. № 11.

1.5.

На латышскую мову. Vejagrabslis / Atdz. T.Rullis // Lit. un Maksla. 1972. 26. Aug.

На літоўскую мову. Paskutine diena: [Apsakymas] / Vert. A.Lapinskiene // Lit. ir menas. 1981. Vas. 6; Bobute: Humoreska / Vert. G.Michailivas // Taryb. zeme (Zar.). 1984. Lapkr. 3.

На рускую мову. Везде живут люди: Рассказы. Мн., 1968. Рэц.: Андреюк С. Люди чуткого сердца // Дружба народов. 1969. № 6.

Сирота; В розовом тумане: [Апавяданні] / Пер. Б.Казанов // Неман. 1968. № 1; Пустельга: [Апавяданне] / Пер. З.Островская // Звезда. 1969. № 1; Хлеб: [Апавяданне] / Пер. Н.Татур // Неман. 1969. № 12; Сирота: [Апавяданне] / Пер. В.Щедрин // ЛГ. 1969. 30 июля; Пустельга: [Апавяданне] / Пер. З.Островская // Белорусские рассказы. М., 1971; За хлебом: [Апавяданне] / Пер. Т.Горбачев // Мы — молодые. М., 1971. Вып. 2; Сергей, сын Антоли: [Апавяданне] / Пер. В.Кудинов // Неман. 1976. № 7; Марья из Хаток: [Апавяданне] / Пер. В.Тарас // Там жа. 1979. № 6.

На эстонскую мову. Leiba toomas: (Jutustus) / Tlk. K.Kokk // Selle punase paikese all. 3. Lugemispalu noukogude rahvaste kirjandusest. Tallinn, 1983.

1.6.

Мужык і агуркі: Бел. нар. казка // Вясёлка. 1978. № 6 / Зап. і апрац.

2.3.

На беларускай мове. Андраюк С. Жыць чалавекам. Мн., 1983. С. 121—122; Яго ж. Куды ідзе апавяданне? // ЛіМ. 1979. 18 мая; Бечык В. Чым жылі і жывуць аднагодкі // Бечык В. Свет жывы і блізкі. Мн., 1974; Каваленка В. Прага духоўнасці. Мн., 1975. С. 118—121, 148—149; Яго ж. У далечы жыццёвых гарызонтаў // Полымя. 1973. № 6; Каршукоў Я. Выбар героя: Палемічныя нататкі // ЛіМ. 1973. 26 студз.; Савік Л. Адчуванне часу. Мн., 1981. С.170—171.

На рускай мове. Бечик В. Молодым идти вперед // Знамя юности. 1969. 9 апр.; Мележ И. Жизненные заботы. М., 1980. С. 99—100; Яго ж. [Пра маладых празаікаў Беларусі] // ЛГ. 1969. 9 апр.; Стрельцов М. Первое знакомство // Неман. 1968. № 1.

Г.І.Рэут.

КАРАБАН СЦЯПАН

Карабан Сцяпан Ігнатавіч [н. 26.12.1901 (8.1.1902), в. Дзехнаўка Мінскага пав. Мінскай губ., цяпер Мінскі р-н — 14.1.1974; Мінск; пахаваны на могілках у Заслаўі], літаратуразнавец. Доктар філілагічных навук (1960), прафесар (1961).

З сялянскай сям'і. З дзяцінства дапамагаў бацькам па гаспадарцы. У канцы 1918 — пачатку 1919 працаваў справаводам Заслаўскага валвыканкома. З сакавіка 1919 у Чырвонай Арміі, пісар чыгуначнага батальёна Лібава-Роменскай чыгункі. Быў паранены. З чэрвеня 1919 па май 1920 лячыўся ў шпіталі ў Мінску, выйшаў адтуль з ампутаванай нагой. У 1920—25 працаваў сакратаром валрэўкомаў, валвыканкомаў, старшынёй райкома сялянскай узаемадапамогі ў розных месцах Мінскай вобл. (м. Заслаўе, в. Станькава, в. Бесяды, м. Койданава). Член КПСС з 1924. У 1928 скончыў Камуністычны універсітэт нацыянальных меньшасцяў у Маскве, у 1931 — БДУ. У 1931—34 вучыўся ў аспірантуры Інстытута філасофіі АН БССР і выкладаў у кансерваторыі. Атрымаўшы ў 1934 ступень кандыдата філасофскіх навук, працаваў у Інстытуце філасофіі АН БССР і выкладаў у кансерваторыі і БДУ (1934—35). У 1936 нейкі час быў дырэктарам Палітасветінстытута ў Магілёве. У 1937—41 дацэнт на кафедры рускай літаратуры Мінскага педінстытута. У час Вялікай Айчыннай вайны пражываў у в. Заляшаны Клецкага р-на і ў Ляхавіцкім р-не, займаўся шавецкай справай. З верасня 1944 — дацэнт, у 1961—71 — прафесар Мінскага педінстытута. З 1971 на пенсіі. Узнагароджаны медалямі.

Як літаратуразнавец пачаў выступаць у 1938. Даследаваў філасофскія, эстэтычныя і літаратурныя погляды рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў В.Бялінскага і Д.Пісарава ў сувязі з распрацоўкай імі тэорыі рэалізму. У 1950-я гады займаўся вывучэннем светапогляду і асноўнай праблематыкі творчасці Я.Купалы, што паслужыла асновай для яго доктарскай дысертацыі, апублікаваў па гэтай тэме шэраг артыкулаў у рэспубліканскім друку. Пэўным укладам у беларускае літаратуразнаўства сталі «Нарысы гісторыі беларускай савецкай крытыкі 20—30-х гадоў», ацэненыя як «першая абагульняльная праца пра складаную і супярэчлівую эпоху станаўлення і развіцця беларускай савецкай крытыкі» (У.Конан). Разам з тым, рэцэнзенты выказалі шэраг прэтэнзій да аўтара ў сувязі з нізкім агульным узроўнем кнігі, пазбаўленай па сутнасці выразнай навуковай канцэпцыі. Яны датычыліся і выказванняў С.Карабана адносна некаторых літаратараў. Так, калі пра Бэндэ ён здолеў сказаць праўду, то ў адносінах да М.Гарэцкага, У.Дубоўкі, С.Некрашэвіча не здолеў вызваліцца ад уплыву вульгарна-сацыялагічных ацэнак. Як выкладчык С.Карабан шмат увагі надаваў методыцы выкладання літаратуры, выхаванню будучых настаўніцкіх кадраў.

І.Э.Багдановіч.

Бібліяграфія

1.2.

В.Г.Белинский: Его философские, эстетические и критические взгляды. Мн., 1936.

Мировоззрение Янки Купалы: Автореф. дисс.... д-ра философ. н. Мн., 1954.

Мировоззрение и основные проблемы творчества Янки Купалы: Автореф. дисс.... д-ра филол. н. Мн., 1955.

Нарысы гісторыі беларускай савецкай крытыкі 20—30-х гадоў. Мн., 1971. Рэц.: Бугаев Д. Зигзаги критической мысли // Вопросы литературы. 1974. № 5; Сачанка І. Шляхамі вострай барацьбы // ЛіМ. 1971. 23 крас.; Цараńкоў Л. З любоўю да роднай літаратуры // Вяч. Мінск. 1971. 24 мая.

Очерки истории белорусской эстетической мысли и литературной критики. Мн., 1971. Рэц.: Разанаў І. Аб вытоках эстэтычнай думкі // Вяч. Мінск. 1972. 12 жн.; Семяновіч А. Даследаванне беларускай крытыкі // Звязда. 1972. 24 сак.; Цараńкоў Л. Цікавае даследаванне // Мін. праўда. 1972. 9 чэрв.

1.3.

1938. Дзімітрый Іванавіч Пісараў // ЛіМ. 16 ліп.

1940. Литературно-критические взгляды Писарева // Уч. зап. Мин. пед. ин-та. Вып. 2.

1945. Вялікі рускі патрыёт // Звязда. 20 ліст.

1946. Геніяльны мысліцель і крытык // ЛіМ. 15 чэрв.

1947. Николай Платонович Огарев: (К 70-летию со дня смерти) // Сов. Бел. 11 июня.

1948. Эстэтычныя і літаратурна-крытычныя погляды В.Р.Бялінскага // ЛіМ. 5 чэрв.; Д.І.Пісараў // Там жа. 17 ліп.; Великий русский драматург // Сов. Бел. 11 апр.; Д.И.Писарев: К 80-летию со дня смерти // Там жа. 16 июля; Великий революционный демократ // Там жа. 24 июля / Сааўт. П.Пратасеня.

1950. Эстэтычныя і крытычныя погляды В.Р.Бялінскага; Драматургія Купалы ("Паўлінка) // Вуч. зап. Мін. пед. ін-та. Філалаг. серыя. Вып. 1; Гордасць рускага народа // Чырв. змена. 21 ліст.

1952. Вялікі патрыёт Радзімы: (Да стагоддзя з дня смерці Н.В.Гогаля) // ЛіМ. 9 лют.; Усеагульнае прызнанне // Там жа. 28 чэрв.

1953. Кніга аб ранняй творчасці Янкі Купалы: [Рэц. на кн.: І в а ш ы н В. Янка Купала: Творчасць перыяду рэвалюцыі 1905—1907 гг. Мн., 1953] // Звязда. 26 снеж.

1954. Драма «Раскіданае гняздо» // Уч. зап. Мин. пед. ин-та. Вып. 3; Аналіз вобразаў драмы «Раскіданае гняздо» (Я.Купалы) // Сав. школа. № 6;

1955. Драматычныя паэмы Янкі Купалы // Уч. зап. Мин. пед. ин-та. Вып. 4; Тэма прыроды ў творчасці Янкі Купалы // Сав. школа. № 6.

1956. Ля вытокаў беларускай дэмакратычнай крытыкі: (1906—1916 гг.) // Полымя. № 10; Паэма Янкі Купалы «Курган» // Сав. школа. № 4; Творчасць Янкі Купалы ў славянскай крытыцы // Уч. зап. БГУ. Серия филолог. Вып. 27; Пытанні маралі ў творчасці Янкі Купалы // Уч.зап. Мин. пед. ин-та. Вып. 6, юбилейный.

1957. К истории газеты «Северо-Западный край» и ее роли в революции 1905 г. // Уч. зап. БГУ. Серия филол. Вып. 39; Да пытання аб вытоках творчасці Я.Купалы // Уч.зап. Мин. пед. ин-та. Вып. 8.

1961. Вялікі мысліцель і барацьбіт // Звязда. 13 чэрв. / Сааўт. І.Лушчыцкі; Свежымі фарбамі: [Рэц. на кн.: В а с и л ё н о к С. Фольклор и литература Белоруссии эпохи феодализма (XIV—XVIII вв.). М., 1961] // Звязда. 2 снеж.

1962. Заснавальнік сучаснай беларускай літаратуры // Гомел. праўда. 3 ліст.; Нязгасна зяе слава песняра // Мін. праўда. 3 ліст.; Наш Янка Купала // Фізкультурнік Бел. 6 ліп.

1964. Живой голос поэта // Сел. газ. 15 окт.

1966. И.С.Тургенев в белорусской печати // Филологический сборник. Мн.

1967. Пошукі творчага метаду: (На матэрыялах беларускай крытыкі 20—30-х гадоў) // Материалы межвузовской научной конференции по проблемам теории и истории белорусской и русской литератур. Минск, 1967, 20—21 окт. (Доклады). Мн.

1971. Глыбокі рэалізм // Звязда. 11 ліст. / Сааўт. І. Разанаў.

1972. Пясняр дум народных // Звязда. 7 ліп.; Пясняр дружбы народаў // Там жа. 18 кастр. / Сааўт. І.Разанаў.

1973. Служыць народу свайму // Вяч. Мінск. 2 кастр. / Сааўт. І.Разанаў; Волат рускай драматургіі // Звязда. 12 крас.; Першапраходца новых шляхоў // Там жа. 13 снеж.

1.6.

П е с н і барацьбы: Зборнік песень, казак і частушак беларускіх партызан. Мн., 1946 / Скл.

2.3.

На беларускай мове. Б у г а ё ў Д. Здабыткі крытычнай думкі і яе зігзагі // Бугаёў Д. Чалавечнасць. Мн., 1985; Б я р о з к і н Г. З аршынам па вершах // ЛіМ. 1956. 29 вер.; К о н а н У. Праблемы беларускай крытыкі і эстэтыкі // Полымя. 1972. № 6; К у д р а ў ц а ў І. «Востракарныя словы...» // ЛіМ. 1958. 25 студз.; П а б я р э ж а ц А. Дарогі даследчыка і педагога // Звязда. 1972. 25 студз.; С ц я п а н Ігнатавіч Карабан: [Некралог] // ЛіМ. 1974. 18 студз.

На рускай мове. П р о т а с е н я П. Против прораболочной критики: Письмо в редакцию // Сов. Бел. 1958. 11 июня.

М.П.Барташэвіч.

КАРАВАЙЧЫК ПАВЕЛ

Каравайчык Павел Гіляравіч (псеўд. П.Каравай, П.Любецкі, Павал Любецкі, Павел Любецкі, Paulus, крыпт.: П.К., П.Л.; 3 (15). 6.1896, м. Любча Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер г.п. Любча Навагрудскага р-на — 21.11.1937, Чэбаксары], крытык, публіцыст, паэт.

З сям'і малазямельных сялян. Пасля заканчэння пачатковай школы паступіў у Вышэйшую пачатковую школу ў Навагрудку, у 1910 перайшоў у Навагрудскую прыватную рэальную школу. У 1911 здаў уступныя экзамены ў Мінскую гімназію і скончыў яе у 1916 з залатым медалём у Маскве, куды

гімназія была эвакуіравана ў час 1-й сусветнай вайны. Вярнуўшыся ў Мінск, браў чынны ўдзел у Таварыстве дапамогі ахвярам вайны, потым паступіў у Ваенна-медыцынскую акадэмію ў Петраградзе. Ад імя петраградскіх студэнтаў вітаў у 1917 з'езд бел. нац. арганізацый ў Мінску. Але праз два гады вымушаны быў перапыніць вучобу па матэрыяльных прычынах. Пераехаў у Маскву, займаўся на 3 курсе медфака Маскоўскага ўніверсітэта. У 1919—21 служыў у Чырвонай Арміі на Заходнім фронце. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся ў Маскву, але аднавіць заняткі не ўдалося. У 1922 пераехаў у Мінск, паступіў на 3 курс медфака БДУ, які скончыў у 1925.

Пасля заканчэння гімназіі П.Каравайчык актыўна ўдзельнічаў у грамадска-палітычным і культурна-асветным руху. У 1917 працаваў у Мінску ў рэдакцыі газеты «Вольная Беларусь», дзе пачаў друкаваць свае творы, у 1918 у Петраградзе быў сакратаром агітацыйна-выдавецкага аддзела Белнацкома (Петраградскае аддзяленне) і супрацоўнічаў у часопісе «Чырвоны шлях». У 1918—19 на працягу года і двух месяцаў быў інфарматарам па беларускіх справах пры Народным камісарыяце нацыянальнасцей. Яго агляды беларускага друку былі своеасаблівым летапісам першых крокаў Беларускай Савецкай Рэспублікі, якія шырока выкарыстоўваюць сучасныя гісторыкі. На пачатку 1919 загадваў выдавецкім аддзелам Белнацкома і рэдагаваў першую савецкую газету на беларускай мове «Дзянніца». Вярнуўшыся з Чырвонай Арміі, працаваў сакратаром Беларускага бюро Наркамасветы РСФСР, цэнтральным бюро Галоўмастацтва. З восені 1922 да канца 1926 загадчык аддзела замежнага друку газеты «Савецкая Беларусь». У красавіку 1924 удзельнічаў у заснаванні медычнай секцыі пры Інстытуце беларускай культуры і заняўся спецыяльнай распрацоўкай беларускай медычнай тэрміналогіі (першы выпуск — слоўнік анатамічных назваў — апублікаваны ў 1926). У 1926—30 працаваў у клініцы нервовых хвароб медфака БДУ. Быў рэпрэсіраваны і 10.4.1931 асуджаны на 5 гадоў высылкі ў Чэбаксары Чувашскай АССР, дзе працаваў урачом-неўрапатолагам. У ссылцы П.Каравайчык працягваў навуковыя доследы ў галіне медыцыны (па фізіялогіі мозга). Перад заканчэннем тэрміну ссылкі (да пяці гадоў яму дадалі яшчэ два) ён паслаў свае даследаванні ў клініку нервовых хвароб г. Горкі і адтуль атрымаў запрашэнне на працу. Аднак у 1937, за дзень да канца высылкі, быў арыштаваны паўторна і прысуджаны да расстрэлу. Рэабілітаваны па абодвух справах у 1957 і 1959.

Творчая спадчына П.Каравайчыка узор абуджэння і ўздыму таленту на хвалі нацыянальна-адраджэнцкага руху. Пачаў ён у 1917 з рэцэнзіі на пастаноўку ў Мінску драмы «Раскіданае гняздо» Я.Купалы. Тады ж яго пачало хваляваць пытанне рэальнага самавызначэння народаў, і ён, як публіцыст, выступаў з артыкуламі на гэтую тэму. Крытычны густ П.Каравайчыка быў досыць абіральны — ён пісаў водгукі на тыя творы, якія станавіліся бясспрэчнай класікай беларускай літаратуры (кнігі «Матчын дар» А.Гаруна, «Спадчына» Я.Купалы, «Творы» М.Багдановіча), прысвячаў свае літаратурныя доследы Ф.Багушэвічу і У.Галубку. Крытычныя развагі П.Каравайчыка грунтаваліся на глыбокім эстэтычным і псіхалагічным аналізе твораў. Ён пазбягаў спрошчаных вульгарызатарскіх трактовак. Так, аналізуючы «Спадчыну» Я.Купалы, П.Каравайчык прыйшоў да вываду, што многія «высокамастацкія творы, змешчаныя ў кніжцы, з'яўляюцца спробаю творчасці ў новым для паэта кірунку», што сама кніга з'яўляецца тэматычным і фармальным паваротам у творчасці Купалы. Гэта было ў час, калі Купалу моцна крытыкавалі за «перапеў адраджэнцкіх матываў». У 1921—23 П.Каравайчык чытаў лекцыі па беларускай літаратуры на настаўніцкіх курсах у Бабруйску і Мінску. Вынікам гэтага чытання з'явіўся падручнік па беларускай народнай творчасці, а таксама «Выпісы з беларускае літаратуры», складзеныя супольна з М.Гарэцкім і У.Дзяржынскім. П.Каравайчык з'яўляецца таксама аўтарам нешматлікіх вершаў, у якіх развіваў матывы адраджэнскага руху беларусаў, будавання новага свету, дзе «не будзе крыўды, зла». Яго вершы — гэта тыповыя на той час спробы шырока адоранай асобы выяўляць свой талент у розных жанрах.

І.Э.Багдановіч, В.У.Скалабан.

Бібліяграфія

1.3.

1917. Беларускі тэатр // Вольная Бел. 7, 26 ліп. / Пад крыпт. П.К. Аўт. спрэчнае; Выбары гласных у Мінскую народную Думу // Там жа. 11 жн.; Лісты з Петраграду // Там жа. 9, 26 кастр. / Пад крыпт. П.К.; Дэмакратычная нарада і беларусы // Там жа. 19 кастр. / Пад крыпт. П. К.

1918. Будучыня Вільні: [Нарыс]; [Рэц. на кн.: Гарун А. Матчын дар. Мн., 1918] // Чырв. шлях. № 5—6 / Пад псеўд. Павел Любецкі; О белорусском литературном языке // Там жа. № 7—8 / Пад псеўд. Павел Любецкий; Аб беларускім клюбе і яго задачах // Дзянніца. 17 снеж. / Пад псеўд. Павал Любецкі; Настрой беларускай шляхты // Там жа. 31 снеж. / Пад псеўд. Павал Любецкі.

1919. Дарэмна, пановя; Аб беларускім універсітэце // Дзянніца. 4 студз. / Пад псеўд. Павал Любецкі; Ламайце згніўшае!: [Верш] // Там жа. 16 студз. / Пад псеўд. П.Каравай; Аб выдзяленні Віцебскае губ.; Вялікая Польшча // Там жа. 8 лют. / Пад псеўд. Павал Любецкі; Беларусь жыла і будзе жыць / Пад псеўд. Павал Любецкі; Выдавецкая праца Беларускага нацыянальнага камісарыята / Пад крыпт. П.Л. // Там жа. 24 лют.

1921. Memento mori: [Верш] // Вольны сцяг. № 3 / Пад псеўд. Paulus; Мы ўсходзім: [Верш] // Сав. Бел. 5 чэрв. / Пад псеўд. Paulus; К пытанню нацыянальна-культурнага адраджэння беларусаў за межамі ССРБ // Там жа. 4 снеж. / Пад псеўд. Павел Любецкі.

1922. Беларуская народная вусная творчасць / Пад псеўд. П.Любецкі; [Рэц. на кн.: Купала Я. Спадчына. Мн., 1922] / Пад псеўд. П.Любецкі; [Рэц. на кн.: Колас Я. Водгулле. Мн., 1922; Ясакар [З.Бядуля]. Пад родным небам. Мн., 1922] / Пад крыпт. П. Л. // Адраджэнне. Сш. 1; Беларуская народная літаратура // Вольны сцяг. № 1 / Пад псеўд. П.Любецкі; Думкі аб паэзіі З.Бядулі (Ясакара) // Сав. Бел. 21 ліп. / Пад псеўд. Павал Любецкі; Тэатральная праца Ул.Галубка: (Думкі і ўражанні) // Там жа. 13 жн. / Пад псеўд. Павал Любецкі; Беларуская вечарына // Там жа. 16 жн. / Пад крыпт. П. Л.; Беларуская выдавецкая праца ў Берліне. V. Зборнік вершаў Ц.Гартнага // Там жа. 13 вер. / Пад псеўд. Павал Любецкі; Беларуская выдавецкая праца ў Берліне. VI. Першы раман у белар. мове // Там жа. 15 вер. / Пад

псеўд. Павал Любецкі; «Страхі жыцця» і «Фанатык»: (Тэатральная праца Галубка) // Там жа. 10 кастр. / Пад крыпт. П.Л.; «Жрэц Тарквіні» // Там жа. 29 кастр. / Пад псеўд. П.Любецкі; К бяздонню // Там жа. 17 ліст. / Пад крыпт. П.Л.; Балетныя вечары ў Беларускім дзяржаўным тэатры // Там жа. 22 ліст. / Пад крыпт. П.Л.; Беларуская культурная праца на Усходзе Беларусі // Там жа. 1, 27 снеж. / Пад псеўд. Павал Любецкі.

1923. Конкурс на лепшага настаўніка: (Настаўнік Бруякін) // Сав. Бел. 9 чэрв. / Пад крыпт. П.Л.; Першыя краёвыя курсы беларусазнаўства // Там жа. 17 жн. / Пад псеўд. П.Любецкі.

1926. Да новага жыцця: Драма ў 2-х актах // Малады араты. № 13—14 / Пад крыпт. Л.П. Аўт. спрэчнае.

1927. На кабана: Апавяданне // Паляўнічы Бел. № 2—3 / Пад крыпт. П.К. Аўт. спрэчнае.

1928. Новае аб Багушэвічу // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.» № 3 / Пад псеўд. П.Любецкі; Звяставанне: [Верш] // За працу. 24 ліст. / Аўт. спрэчнае; Цяжкае становішча беларускіх школ у Заходняй Беларусі // Сав. Бел. 5 студз. / Пад псеўд. Павал Любецкі; Беларускі нацыянальны камісарыят // Там жа. 14 лют. / Пад псеўд. Павал Любецкі; 10 год з дню выхаду «Дзянніцы» // Там жа. 1 сак. / Пад псеўд. П.Любецкі; Леў Мікалаевіч Талстой // Чырв. змена. 12 вер. / Пад крыпт. П.К.

1929. [Рэц. на кн.: Багдановіч М. Творы. Мн., 1928. Т. 2] // Полымя. № 7 / Пад крыпт. Л.П. Аўт. спрэчнае.

1982. Ламайце згніўшае!: Memento mori: [Вершы] // Дзень паэзіі—82. Мн.

1.6.

Выпісы з беларускае літаратуры: 1. Вусная народная творчасць. 2. Старадаўняе пісьменства. М.; Л., 1925 / Скл. з інш. Рэц.: Слуцкі А. // Полымя. 1925. № 7.

2.3.

На беларускай мове. Скалабан В. Будынак новы мы будуем...: (Вершы Паўла Каравайчыка) // Дзень паэзіі—82. Мн., 1982.

З.У.Драздова.

КАРАВАЦКІ ФРАНЦІШАК

Каравацкі Францішак Казіміравіч (псеўд. Кравацкі, Лявон, EFER, Los, Franciszek Kazimierowisz; н. 14.5.1907, фальв. Каладзянка Свянцянскага пав. Віленскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл.), паэт, журналіст

Нарадзіўся ў сям'і парабка. Бацька і маці, беззямельныя сяляне, да 1923 батрачылі ў маёнтках пана Скірмунта. З-за канфлікту з гаспадаром былі выгнаны з працы і жылля, працавалі на «запашках» як арандатары (палавічнікі) у вёсках Янявічы і Воўчын, з 1927 — у фальварку Малінаўка і ў засценку Белашы Кабыльніцкай гміны, з 1931 — у маёнтку Чурлёні Вілейскага пав. Там дачакаліся вызвалення Заходняй Беларусі, атрымалі надзел зямлі і аселі жыць і працаваць як аднаасобныя сяляне. На бацькавай сялібе цяпер пражывае з сям'ёй брат паэта Янка. У сям'і Каравацкіх спакон панавалі рэвалюцыйныя настроі. Францішак у 1925 уступіў у Незалежную сялянскую партыю, якая супрацоўнічала з Беларускай Сялянска-работніцкай грамадой, выконваў абавязкі інструктара па Віленскай акрузе. З гэтага часу стаў карэспандэнтам друкаваных органаў гэтай партыі і блізкіх да яе арганізацый, друкаваў допісы і вершы ў часопісе «Orka» («Ворыва»), газеце «Dziennik popularny» («Папулярная газета»), якія падпісваў псеўданімам EFER. Змяшчаў карыкатуры і шаржы на палітычных дзеячаў у часопісах «Zielony sztandar» («Зялёны сцяг»), «Tydzień robotnika» («Тыдзень рабочага») і інш. У 1926 уступіў у КПЗБ, пад партыйнай клічкай Лявон працаваў у падпольнай арганізацыі мястэчка Кабыльнік. У 1928 абраны членам Пастаўскага падпольнага райкама КПЗБ. Улады буржуазнай Польшчы праследавалі і рэпрэсіравалі Ф.Каравацкага: у турмах Лукішкі, Стэфанаўка, Вронкі, Грудзёндз ён правёў больш да 7 гадоў. Вызвалены ў 1936 па амністыі, да 1938 працаваў у падпольным Краёвым сакратарыяце ЦК КПЗБ у Варшаве. Няраз былі арыштаваны і адбывалі турэмнае пакаранне бацька паэта Казімір Карлавіч і сястра Казіміра; брат Браніслаў у выніку катаванняў на допытах і чатырох гадоў паняверкі ў турме захварэў псіхічна, выпушчаны на волю неўзабаве памёр. У гады Вялікай Айчыннай вайны Ф.Каравацкі супрацоўнічаў з польскім патрыятычным рухам на тэрыторыі СССР. У 1943 быў скінуты на парашуце ў акупіраваную Варшаву, устанавіў сувязь з ЦК КПРП, да 1945 выконваў спецыяльныя заданні ЦК. Пасля вайны па фальшывым абвінавачванні быў арыштаваны і рэпрэсіраваны, 5 гадоў правёў у сібірскіх лагерах зняволення, пасля рэабілітаваны. З 1952 працаваў літработнікам газеты «Czerwony sztandar» («Чырвоны сцяг»), пісаў вершы для дзяцей на польскай мове, падпісваючы іх псеўд. Franciszek Kazimierowicz, перакладаў з літоўскай мовы дзіцячыя вершы для польскага часопіса «Pionier Litwy» («Піянер Літвы»). У 1957 выехаў у Польшчу па выкліку кіраўніцтва ПАРП. Жыве ў Варшаве.

Пісаць вершы пачаў у 10 гадоў на беларускай і польскай мовах. У 1927 напісаў у пастаўскай турме верш «Мы ішлі ў цяжкім змаганні». Сябры па зняволенні пачалі спяваць яго на матыў вядомай песні «Волга-Волга». Пасля выхаду з турмы (1927) неўзабаве зноў быў арыштаваны за напісанне «камуністычнага» верша. Вершы Ф.Каравацкага з'яўля-

юцца творамі палітычнай лірыкі. Удзельнікі рэвалюцыйнага падполля ў Заходняй Беларусі распаўсюджвалі іх у рукапісах, як ананімныя творы, лепшыя з іх чыталіся публічна на вечарынах або спяваліся як песні. У пачатку 1930 гадоў напісаў паэму «Нарач», прысвечаную старэйшаму брату Іосіфу, які ў пошуках працы і хлеба выехаў у Аргенціну і прапаў без вестак. Рукапіс твора быў адасланы ў Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ў Вільні, адкуль праз два гады прышоў адказ, што твор не можа быць надрукаваны, паколькі яго тэкст канфліктуе з законам па друку. Другая паэма, пра Кастрычнік была напісана па-польску ў Грудзёндзкай турме; яе тэкст перапісаў у свой сшытак сябра па камеры і вынес на волю. Потым сшытак захоўваўся ў Варшаўскім музеі рэвалюцыйнага руху. Верш «Навагодні» («Стары год прайшоў, жывём Новы год») Ф.Каравацкі падарыў сваёй сяброўцы А.Каркоз, а яе брат-падпольшчык завучыў тэкст верша на памяць і «занёс» у турму на Лукішкі; там яго пачуў П.Пестрак і выкарыстаў у аповесці «Сустрэнемся на барыкадах» як ананімны твор. Гэты і іншыя творы Ф.Каравацкага запісваліся на Навагрудчыне ў 1950 годы як рэвалюцыйныя песні ад ветэранаў вызваленчага руху былой Заходняй Беларусі (надрукаваны як ананімныя тэксты рэвалюцыйных песень у зборніку «Сцягі і паходні»). Большасць твораў захоўваецца ў выглядзе аўтарскіх рукапісаў. Беларускія і польскія вершы Ф.Каравацкага — пераважна маналогі публіцыста і агітатара — вызначаюцца уменнем дасціпна перадаваць характэрныя рысы грамадска-палітычнай сітуацыі ў краі, дыханне часу. Паэт быў арганічна звязаны з масамі, тонка ўлоўліваў характэрныя рысы масавай свядомасці, ствараючы аб'ёмнае бачанне крызісных грамадскіх падзей, што аказаліся гістарычнымі. Для сённяшняга часу беларускія вершы Ф.Каравацкага маюць гісторыка-літаратурнае значэнне як дакументы і факты грамадска-палітычнага жыцця, як акты творчага мастацка-вобразнага рэагавання на падзеі.

У.А.Калеснік

Бібліяграфія

1.3.

1926. Не заўсёды будзе так!: [Верш] // Сялян. ніва. 7 мая / Пад псеўд. Кравацкі.

1956. Стары год пражыўшы: [Верш] // Полымя. № 9 / Без подп.; Kartki z przeszłości // Czer. Sztandar. Nr 218; 1957. Nr 16.

1965. «Стары год пражыўшы, жывём новы год...»: [Верш] // Сцягі і паходні. Мн. / Без подп.

1975. Памятные годы: [Успаміны] // Люди Нарочанского края. Мн.

1980. Важная пляцоўка: [Успаміны] // Беларускі каляндар: 1980. Беласток.

2.3.

На беларускай мове. Астаневіч М. Песня рвалася з-за кратаў // Звязда. 1967. 10 студз.; Калеснік У. Гняздо паэтаў // Калеснік У. Зорны спеў. Мн., 1975. С. 192—203; Яго ж. Лёсам пазнанае. Мн., 1982. С. 269—283; Саламевіч І. Іскра з вогнішча // ЛіМ. 1966. 9 снеж.

Т.М.Махнач.

КАРАІЧАЎ ЛЕЎ

Караічаў
Леў Сяргеевіч
(псеўд. Л.Сергіевіч
Л.Сяргеевіч;
н. 16.5.1936, Разань, Расія),
драматург, публіцыст.
Член Саюза журналістаў
Беларусі з 1962,
Саюза тэатральных
дзеячаў Беларусі з 1968.
Піша на беларускай
і рускай мовах.

Бацькі Л.Караічава жылі і працавалі на Палессі, у в. Рудакова недалёка ад Хойнікаў. Па сямейных абставінах месцам яго нараджэння стаў г. Разань. Незадоўга да вайны ўся сям'я пераехала ў Мінскі раён, у 1948 — у Мінск. Пасля заканчэння сярэдняй школы № 15 (1953) Л.Караічаў працаваў

тэхнікам-канструктарам у праектным інстытуце «Белдзяржпраект» і адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленні будаўнічага факультэта Беларускага політэхнічнага інстытута (1954—60). З 1958 тэхнік-канструктар, старшы архітэктар, старшы інжынер Інстытута будаўніцтва і архітэктуры АН БССР. З 1962 кіраўнік групы тэхнічнай інфармацыі трэста «Арттэхбуд», затым працаваў у Міністэрстве будаўніцтва БССР. У 1967—76 загадчык рэдакцыі тэхнікі, будаўніцтва і спорту Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Пасля працаваў карэспандэнтам газеты «Звязда» (1976—77), рэдактарам-кінадраматургам сцэнарнай майстэрні кінастудыі «Беларусьфільм» (1977—78), супрацоўнікам часопіса «Нёман» (1980—81), загадчыкам літаратурнай часткі Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача (1983—84), карэспандэнтам газеты «Известия» па Беларускай ССР (1984—86). З 1986 на творчай рабоце.

Літаратурнай дзейнасцю Л.Караічаў займаецца з 1958. Аўтар п'ес «І выхавай сына» (паст. ў Магілёўскім абласным і інш. тэатрах), «Зорныя ночы» (ставілася ў Гродзенскім, Магілёўскім абласных тэатрах), «Цар прыроды», «І на ўсе часы», «Бацька Мінай», «Слова гонару», «Партызанскі праспект» (напісана ў 1988), «Апанаванасць» (апубл. ў 1989), п'есы-інсцэніроўкі аповесці І.Шамякіна «Гандлярка і паэт» (паст. ў Магілёўскім абласным тэатры). П'есы Л.Караічава, як правіла, «маланаселеныя», таму зручныя для выканання на сцэне. Сюжэты іх бяруцца з народнага жыцця, мова індывідуальная, канфлікты выразна акрэсленыя, аўтарская пазіцыя па-грамадзянску вострая. Напісаў некалькі інсцэніровак па празаічных творах, якія ставіліся на беларускім радыё. Аўтар шэрагу кінасцэнарыяў для аб'яднання «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм».

Жыве ў Мінску.

Л.М.Гарэлік.

Бібліяграфія

1.3.

1958. Рассказ о суровых днях // Знамя юности. 27, 28 марта; Третья встреча с героями Шолохова // Там жа. 20 июня; Возвращение Марата Туйска // Там жа. 16 окт.; «Падарожжа за тры моры» // Мін. праўда. 26 крас.; Па дарогах жыцця // Чырв. змена. 6 ліп.; Дарога, якой ідзеш і ты... // Там жа. 22 ліст.; Гімн чалавеку працы // Там жа. 8 снеж.

1959. «Гадзіннік спыніўся апоўначы» // Звязда. 5 сак.; Яна ішла наперадзе // Там жа. 15 мая; Путем проторенным // Знамя юности. 25 нояб.; «Баллада о солдате» // Там жа. 11 дек.

1960. Непатрэбная ўсмешка // Звязда. 8 крас.; Час дзеяння — нашы дні // Там жа. 16 чэрв.; Растет хороший человек // Сов. Бел. 4 авг.

1961. На экране — Куба // Звязда. 24 мая; Знойдзенае і пазычанае // Там жа. 30 чэрв.; На фоне белых начэй // Там жа. 15 кастр.; Баявы васемнаццаты год...; «Справа была ў Пенькаве» // Чырв. змена. 11 студз.; Добрыя сябры ў Генадзя // Там жа. 18 ліп.

1962. Перамога дастаецца настойлівым // Звязда. 4 лют.; Не абышлося без трафарэту // Там жа. 24 чэрв.; Перамога сумлення // Там жа. 6 вер.; Гэта не павінна паўтарыцца // Там жа. 31 кастр.; Прымірымасць і непакорнасць // Там жа. 28 снеж.; Талантамі земля богата // Знамя юности. 12 июля.

1963. Два спектаклі пра сучасніка // Звязда. 12 лют.; Абясцэненыя ацэнкі // Там жа. 16 крас.; Пераможцы агляду — усе // Там жа. 1 чэрв.; Апошні дзюйм надзеі // Там жа. 23 вер.

1964. Рамантыка пошукаў // Звязда. 26 сак.; Такія рассеюць змрок // Там жа. 13 кастр.; Монолог Гамлета и Варюха-Горюха // Знамя юности. 11 февр.; Баллада о солдате, вернувшемся с войны // Там жа. 8 апр.; От замысла — к воплощению // Там жа. 1 окт.

1965. Девочка, море и песни // Знамя юности. 12 февр.

1967. «Французские картинки» // Сов. Бел. 9 дек.

1971. «Беларускі ваказал» // Звязда. 12 мая.

1972. Дабро перамагае // Звязда. 28 вер.

1975. Суд сумлення // Звязда. 20 ліст. / Пад псеўд. Л.Сяргеевіч.

1976. Звяртаючыся да праблем часу // Звязда. 29 ліп.; Пранікненне ў сутнасць першакрыніцы // Там жа. 25 снеж.

1977. Сведка абвінавачвае // Звязда. 23 крас. / Пад псеўд. Л.Сергіевіч; «Зоркі для лейтэнанта» // Там жа. 29 чэрв.

1978. На скрыжаванні // Звязда. 6 студз. / Пад псеўд. Л. Сергіевіч.

1979. Цар прыроды: [Урывак з п'есы] // ЛіМ. 3 жн.

1980. Адданасць тэатру // Звязда. 6 лют.; Дваццацігоддзе народнага // Там жа. 6 чэрв.

1982. Слова гонару: П'еса // Слова гонару. Мн.; Ведаць і помніць вечна // Звязда. 12 чэрв.

1985. И на все времена: Драма в двух частях // Сучасная беларуская п'еса. Мн.

1.5.

На рускую мову. «...И воспитай сына»: Пьеса в 3-х д. / Пер. В.Баскина. М., 1967.

2.3.

На беларускай мове. Гаробчанка Т. Выпрабаванне // Чырв. змена. 1978. 17 кастр.

На рускай мове. Орлова Т. И воспитай сына... // Сов. Бел. 1967. 14 окт.; Петкевич А. Постижение нравственной высоты // Гродн. правда, 1977. 4 нояб.

В.У.Смольская.

КАРАМАЗАЎ ВІКТАР

Карамазаў Віктар Філімонавіч (н. 27.6.1934, Чэрыкаў Магілёўскай вобл.), празаік. Член СП Беларусі з 1969. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя К.Каліноўскага (1990, за кнігу публіцыстыкі «Проста ўспомніў я цябе...»).

Нарадзіўся ў сям'і настаўнікаў. Бацька, Філімон Сяргеевіч, больш за 50 гадоў вучыў дзяцей беларускай і рускай мове і літаратуры. Маці, Ганна Анісімаўна, была выкладчыцай пачатковых класаў. У першыя дні Айчыннай вайны сям'я Карамазавых пайшла ў бежанства на ўсход (бацька па ўзросту ў армію не прызываўся), дабралася да Волгі. Ва Ульянаўскай вобл., у в. Тургенева, бацька загадваў сямігадовай школай, маці настаўнічала, а В.Карамазаў з сястрой вучыліся. Калі Магілёўшчына была вызвалена, сям'я вярнулася ў родныя мясціны, пасялілася ў г. Крычаве. Бацька памёр у 1964, маці — пенсіянерка. У 1953 В.Карамазаў паступіў на аддзяленне журналістыкі БДУ, якое скончыў у 1958. Пасля вучобы працаваў адказным сакратаром у рэдакцыі чэрыкаўскай раённай газеты «Сацыялістычная перамога». У 1959—61 адказны сакратар крычаўскай раённай газеты «Шлях сацыялізма», у 1961—62 загадчык аддзела прамысловасці і транспарту міжраённай газеты «Новае жыццё» (Крычаў). З 1962 уласны карэспандэнт абласной газеты «Магілёўская праўда» па Крычаўскаму, Клімавіцкаму і Мсціслаўскаму раёнах. З 1964 ў рэспубліканскай газеце «Звязда», дзе спачатку быў літсупрацоўнікам, пасля загадчыкам аддзела навукі, ВНУ і школ, аддзела літаратуры і мастацтва. У 1969—71 літсупрацоўнік, загадчык аддзела культуры газеты «Літаратура і мастацтва». У 1971—81 загадваў аддзелам мастацкіх фільмаў, быў членам рэдакцыйна-сцэнарнай калегіі Белдзяржкамітэта па тэлебачанню і радыёвяшчанню. У 1982 загадчык аддзела нарыса часопіса «Полымя», з лістапада таго ж года літкансультант СП БССР. З 1986 на творчай рабоце. Як член дэлегацыі БССР прымаў удзел у рабоце 22-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА. Сябра рады СП Беларусі (з 1990). Узнагароджаны ордэнам «Знак пашаны», Ганаровымі граматамі і Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Першае апавяданне В.Карамазава «Сыны» апублікавана ў 1957 у часопісе «Советская Отчизна». Першы зборнік апавяданняў «Падранак» выйшаў у 1968. У полі зроку В.Карамазава — паўсядзённыя справы і клопаты вясковага чалавека, праблемы неперспектыўных вёсак і адзінокай старасці, міграцыі сельскага насельніцтва і вяртання да вытокаў («Бярозавыя венікі», «Галуба», «Дзяльба кабанчыка», «Дзень Барыса і Глеба» і інш.). Скразным матывам праз яго творы праходзяць праблемы адносін чалавека да прыроды, іх псіхалагічнага, сацыяльнага ўзаемадзеяння. З асаблівай вастрынёй яны пастаўлены ў рамане «Пушча», дзе праз адносіны да навакольнага асяроддзя вымяраецца ідэйна-маральная сутнасць чадавека, яго духоўнасць або бездухоўнасць. Паспяхова працуе ў жанры падарожнага нарыса («Вясёлка сярод зімы», «Глядзіце ў вочы лемуру» і інш.). Аўтар рамана «Бежанцы» («Полымя». 1990. № 6, 7); аповесці «Краскі белага шляху» (Там жа. 1992. № 8, 9). Па сцэнарыю В.Карамазава зняты дакументальны тэлефільм «Ад родных ніў»(1969). У 1993 была экранізавана яго аповесць «Крыж на зямлі і поўня ў небе».

А.С.Гурская.

Бібліяграфія

1.1.

Дома: Аповесці, апавяданні. Мн., 1984. (Б-ка бел. прозы).

Дзяльба кабанчыка: Выбранае. Мн., 1988.

1.2.

Падранак: Апавяданні. Мн., 1968. Рэц.: Блатун С. Вытокі дабраты // Мін. праўда. 1968. 17 жн.; Браілоўскі А. Не пераказваць — маляваць // ЛіМ. 1968. 16 ліп.; Навуменка І. Першыя крокі // Полымя. 1968. № 12; Палтаран В. Свет добрых людзей // Маладосць. 1968. № 9; Цімафееў В. З пахам траў і ветру дарог // Вяч. Мінск. 1968. 19 вер.

Гомель: [Фотаальбом]. Мн., 1971 / Аўт. тэксту на бел. і рус. мове.

Па талым снезе: Аповесць; Апавяданні; Падарожжа па Карэліі. Мн., 1973. Рэц.: Гіль М. Сярод людзей,

сярод прыроды // Полымя. 1974. № 1; Жук А. Чалавек на сваёй зямлі // Маладосць. 1973. № 10; Мартинович А. Память о первом снеге // Дружба народов. 1974. № 6; Сіненка Г. Свет нашага сучасніка // ЛіМ. 1973. 15 чэрв.

Спіраль: Аповесць. Мн., 1974. Рэц.: Кудраўцаў І. З поглядам на сучасніка // Беларусь. 1975. № 11.

Вясёлка сярод зімы: Падарожжы. Мн., 1978. Рэц.: Няхай М. Кардыяграма падарожжа сэрца // Чырв. змена. 1979. 30 кастр.

Пушча: Раман. Мн., 1979. Рэц.: Гарадніцкі Я. Зеляней, пушча! // Звязда. 1980. 2 крас.; Дзюбайла П. Чалавек і прырода // ЛіМ. 1978. 10 ліст.; Дубровін М. Пушча і людзі // Родная прырода. 1980. № 5; Иващенко В. Корни и короеды // Дружба народов. 1980. № 10; Мартинович А. // Лит. обозрение. 1981. № 4; Яго ж. Родная пушча // Беларусь. 1980. № 6; Савік Л. У пошуках гармоніі // ЛіМ. 1980. 26 вер.

1983. Театр Горького // Горький М. Пьесы. Мн.

1984. Повесть о вере в людей и о доверии к ним // Нилин П. Жестокость. Мн.

1.6.

Основные вопросы стиховедения: Учебная программа. Мн., 1971 / Скл.

История литературной критики: Учебная програма. Мн., 1973 / Скл. з Н.Рамашкай.

А.Твардовский и советская поэзия: Учебная программа. Мн., 1977 / Скл. з І.Скарапанавай.

Записка А.В.Луначарского П.Н.Сакулину // Лит. наследство. М., 1970. Т. 82 / Падрыхт. тэкста і камент.

Т.М.Махнач

КАЦОВІЧ ЛАЗАР

Кацовіч Лазар Абрамавіч (псеўд. Л.А.Галаванаў, Эл.Кацо, Л.Мінскі; 5.10.1903, Мінск — 13.8.1953, Мінск, пахаваны на Вайсковых могілках), празаік, кінасцэнарыст. Член СП Беларусі з 1934. Пісаў на яўрэйскай і рускай мовах.

З сям'і служачага. Бацька працаваў прыказчыкам на прыватным складзе. У 1914 бацьку мабілізавалі на фронт. Дванаццацігадовы Л.Кацовіч мусіў служыць хлопчыкам у мануфактурным магазіне, кур'ерам у банку. Вярнуўшыся з вайны ў 1918, бацька працаваў на лесараспрацоўках. Уся сям'я да 1920, як успамінаў пісьменнік, жыла ў глухім лесе. Пры польскай акупацыі сям'я вярнулася ў Мінск. Л.Кацовіч працаваў канторшчыкам у Наркамаце аховы здароўя (1920—21), у гарвыканкаме (1921—22), выступаў як артыст у перасовачных калектывах, займаўся самадзейнай рэжысурай (1922—24). Пасля вучобы у прафтэхвучылішчы друкароў (1924—26) Л.Кацовіч працаваў у друкарні гравёрам-літографам (1926—29). Тады ж пачаў пісаць п'есы. Адна з іх, «У тыя дні», прысвечаная барацьбе камсамольцаў з польскімі жаўнерамі, была пастаўлена ў Мінску і выйшла асобным выданнем (1927). У 1929—30 быў слухачом курсаў кінасцэнарыстаў на кінастудыі «Белдзяржкіно» у Ленінградзе. Потым зноў працаваў у друкарні (1930—31). Член кампартыі з 1931. У 1931—32 — аргсакратар СП БССР. У 1939 скончыў сцэнарны ф-т Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі. За некалькі дзён да Вялікай Айчыннай вайны паехаў з жонкай у Маскву на зацвярджэнне сцэнарыя «Чалавек на скрыжаванні», але вярнуцца ужо не змог: пачалася вайна. Маці і двое яго дзяцей загінулі ў гета. Працаваў на кінастудыях у Мінску, Ташкенце (1941—43), Маскве (1943—46). З 1946 на творчай рабоце. Узнагароджаны медалём.

Творчую працу Л.Кацовіч пачаў у 1920 — спачатку як паэт, потым як празаік і драматург. У 1930-я гады выступаў у жанры сатыры, выдаў кнігі «Гумарэскі» і «Коратка і ясна». У 1937 друкаваў артыкулы, у якіх у духу часу выкрываў «буржуазны нацыяналізм». У яго мастацкіх творах прысутнічаў момант аўтабіяграфізму (першае апавяданне

«Друкары», апублікаванае ў 1931, нарыс «Наборшчык», аповесць «Сям'я»). Яго творы не вылучаліся глыбінёй псіхалагічнага даследавання характараў, распрацаваным сюжэтам, яркімі мастацкімі асаблівасцямі. Крытыка пісала пра яго паслявоенную аповесць «Вяртанне да жыцця», як пра «добрасумленную канстатацыю фактаў», адзначала схематызм у раскрыцці ўнутранага свету герояў і шаблоннасць мовы.

І.Э.Багдановіч.

Бібліяграфія

1.2.

У тыя дні: П'еса ў 3-х дзеях. Мн., 1927 / Яўр.

Гумарэскі. Мн., 1933 / Яўр. Рэц.: Дунец Х. Старыя схемы ламаюцца // Штэрн. 1933. № 12 / Яўр.; ЛіМ. 1934. 16 лют.

Жукі ў калгасе: Аднаактная п'еса. Мн., 1933 / Яўр.

Кіўка-махлярка: Апавяданне. Мн., 1936 / Яўр.

Коратка і ясна: (Гумарыст. апавяданні). Мн., 1936 / Яўр.

Прабачце, сябры мае...: (Пародыі). Мн., 1937 / Яўр.

На новым месцы. М., 1946 / Яўр.

Возвращение к жизни: Повесть. Мн., 1952. Рэц.: Варшавская А. Недоработанная повесть // Сов. Отчизна. 1953. № 3.

Красный факел: Повесть. Мн., 1957.

1.3.

1931. Друкары: [Апавяданне] // Штэрн. № 12 / Яўр.

1932. Наборшчык; У літаграфіі: (Нарысы); «Газы»: (Апавяданне) // Крокі ўдарнікаў. Мн. / Яўр.; Перамога; 4 эпізоды: [П'еса] // Штэрн. № 6 / Яўр.

1933. Мініяцюры: (З кнігі «Гумарэскі») // Штэрн. № 4 / Яўр.; На чыстую ваду: [Нарыс] // Звязда. 9 ліп. / Сааўт. [К.] Крапіва; Тры сястры: [Нарыс] // Там жа. 30 ліст.; Мініяцюры: Адзінюсенькі; Два антракты; Ланцужок // ЛіМ. 27 жн.; Яўрэйскія савецкія пісьменнікі да 1-га з'езда ССПБ // Там жа. 16 кастр.

1934. Апошні: [Апавяданне] // Штэрн. № 2 / Яўр.; Канкрэтна: [Верш] // Там жа. № 4—5 / Яўр.; З-за слова; Ён, яна і ён; Таварышы; Доказы з фактамі: [Апавяданні] // Там жа. № 11 / Яўр.; Як я стаў пісьменнікам // ЛіМ. 16 лют.; Бездапаможныя; «Літаратура і мастацтва»; Скарачэнне: Літ. гумарэскі // Там жа. 31 снеж.

1935. Гумарэскі // Штэрн. № 8 / Яўр.; Пародыі: [Вершы] // Там жа. № 10—11 / Яўр.; Мінулае: Гумарэска // ЛіМ. 31 снеж.

1936. Пародыі: [Вершы] // Штэрн. № 3 / Яўр.; Сатыра і гумар у беларускай літаратуры // ЛіМ. 11 лют.; Будзем больш працаваць над сабой: З прамовы на сходзе пісьменнікаў г. Мінска // Там жа. 7 крас.

1937. Супраць бюракратызма, верхаглядства і ўгодніцтва: З прамовы на сходзе пісьменнікаў // ЛіМ. 3 крас.; Супраць буржуазна-нацыяналістычнай кантрабанды ў літаратуры // Там жа. 11 ліп. / Сааўт. І.Харык.

1939. Дзяўчынка з маленькага горада: Кінасцэнарый // Полымя рэвалюцыі. № 7.

1940. «Сервіс»: Урывак з эксцэнтрычнай кінакамедыі // ЛіМ. 11 мая; Людзі маленькага горада: Урывак са сцэнарыя кінакамедыі // Чырв. змена. 20 крас.

1943. Мост // Раздавім фашысцкую гадзіну. № 113 / Пад псеўд. Л.Мінскі.

1944. Адплата // Раздавім фашысцкую гадзіну. № 119 / Пад псеўд. Л.Мінскі.

1951. Тарфянікі // Мін. праўда. 20 чэр.; Залатыя рукі // Там жа. 1 ліп.

1952. Вдохновение конструкторской мысли: [Нарыс] // Сов. Отчизна. № 3.

1.5.

На беларускую мову. Наша любоў: П'еса ў 1 акце / Пер. І.Плаўнік. Мн., 1936. (Серыя п'ес для калгасных драмгурткоў). Рэц.: Юдэлевіч М. Любоў і самакрытыка // ЛіМ. 21 мая.

Сям'я: Повесць / Пер. М.Клімковіч. Мн., 1946. Рэц.: Новыя кнігі // Сав. селянін. 1946. 21 ліп.; Цітоў К. Нявырашаная тэма // ЛіМ. 1946. 3 жн.

«Газы»; Апошні: (З кнігі «Гумарэскі») / Пер. І.Плаўнік // Полымя рэвалюцыі. 1934. № 5; Ён, яна і ён; На судзе; Цяперашнія тэлефоны; Слова падвяло: Апавяданні / Пер. І.Плаўнік // Там жа. 1935. № 1; Дзіўны выпадак; Нахабства; Зусім лішні: Апавяданні / Пер. І.Плаўнік // Там жа. 1936. № 3; «Наша любоў»: Урывак з п'есы / Пер. І.Плаўнік // ЛіМ. 1936. 8 сак.; Тонкі падыход: Байка / Пер. Г.Кляўко // Вожык. 1968. № 5.

2.3.

На беларускай мове. Блісцінаў М. Мы з ім сустракаліся... // ЛіМ. 1973. 5 кастр.; Вайнгаўз Н. Спектакль «Ін енэ тэч»: Новая пастаноўка яўр. драмгуртка клуба «Кім» // Чырв. змена. 1927. 28 студз.; З чым прыйшлі к з'езду // Палес. праўда. 1934. 29 жн.; Лынькоў М. Зб. тв.: У 8 т. Мн., 1985. Т. 8. С. 85; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Становішча мастацкай літаратуры // Палес. праўда. 1933. 4 крас.; У гэтым месяцы... // Беларусь. 1973. № 10.

3.1.

БДАМЛіМ, ф. 196, воп. 1, спр. 89.

З.У.Драздова.

КАЦЮШЭНКА МІХАСЬ

Кацюшэнка Міхась (Міхаіл Пятровіч, н. 1.3.1947, Мінск), празаік, журналіст. Член СП Беларусі з 1981. Кандыдат філалагічных навук (1987). Піша на беларускай і рускай мовах.

Нарадзіўся ў сям'і служачых. Бацька, Пётр Барысавіч, быў на камсамольскай і журналісцкай рабоце, працаваў старшынёй райвыканкама, першым сакратаром райкама партыі, удзельнік вайны. Маці, Ірына Міхайлаўна, у гады вайны працавала медсястрой у ваенным шпіталі. Пасля заканчэння СШ № 63 М.Кацюшэнка паступіў на вячэрні факультэт журналістыкі БДУ (скончыў у 1971). У 1966—75 працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена» літсупрацоўнікам, намеснікам адказнага сакратара, загадчыкам аддзела. З 1975 інструктар аддзела спартыўнай і абаронна-масавай работы, у 1977—79 — намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК ЛКСМБ. З 1979 рэдактар газеты «Знамя юности». У 1984 скончыў завочнае аддзяленне Мінскай ВПШ, у 1984—87 аспірант Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС. З 1987 першы намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Крыніца». З 1993 галоўны рэдактар газеты «Знамя юности». Член праўлення Беларускага таварыства культурных сувязей з замежнымі краінамі. Узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Першыя мастацкія творы М.Кацюшэнкі — навелы «Чаравік» і «Кніга», апублікаваны ў газеце «Чырвоная змена» ў 1966. Піша пра маладых рабочых, добра адчувае праблемы сучаснага горада ("Дзень як усе астатнія", «Адзін дождж на ўсіх», «Сустрэча пасля развітання»). Многія яго аповесці і апавяданні прысвечаны дзецям, юнацтву ("Першая восень", «Трэці раунд»), галоўныя іх героі — падлеткі, моладзь, камсамольскія работнікі, што робяць першыя самастойныя крокі на жыццёвай дарозе. Героі пісьменніка — звычайныя людзі, якія шукаюць выйсце са складаных сітуацый (раманы «Урок маўчання», «Сітуацыя», 1991). Аўтар раскрывае маральна-этычныя канфлікты ў сучаснай сям'і, рабочым маладзёжным асяроддзі, аналізуе складаныя сітуацыі, задумваецца над такімі з'явамі, як кар'ерызм, прага да нажывы, сацыяльная няроўнасць. Разам з В.Грышановічам напісаў сцэнарый дакументальнага фільма пра П.Клімука «Хроніка знаходжання на зямлі» (1981).

Жыве ў Мінску.

Л.С.Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Первая осень: Повесть и рассказы. Мн., 1972. Рэц.: Жалязоўскі А. Сустрэча з дзяцінствам // Наст. газ. 1973. 17 лют.; Пятроў А. «Першая восень» — першая // Вяч. Мінск. 1973. 6 сак.

Третий раунд; Повесть. Мн., 1977. Рэц.: Цвяткоў В. Бой выйграе сумленнасць // Вяч. Мінск. 1978. 31 кастр.

Адзін дождж на ўсіх: Апавяданні. Мн., 1979. Рэц.: Крупенька Я. Вера ў людзей // Чырв. змена. 1979. 4 снеж.; Марціновіч А. Бачу гэта так... // ЛіМ. 1980. 14 сак.; Міхайлаў П. Пра тых, хто побач // Вяч. Мінск. 1980. 5 вер.; Хорсун С. Каб след пакінуць у душы // Мін. праўда. 1980. 1 кастр.

Дні, як усе іншыя: Аповесці і апавяданні. Мн., 1981. Рэц.: Каваленка В. Дні, якіх многа // Полымя. 1981. № 11; Марціновіч А. «Дзень і ўсё жыццё» // Вяч. Мінск. 1981. 20 ліп.; Парахневіч М. Знітавана жыццёвай праўдай // Мін. праўда. 1981. 21 жн.

Сустрэча пасля развітання: Аповесць і апавяданні. Мн., 1984. Рэц.: Гніламёдаў У. Ідэал — дзеянне // Полымя. 1985. № 1.

Урок маўчання: Раман, апвяданні. Мн., 1988.

Прызнанне левага крайняга: Раман, аповесць. Мн., 1990.

1.3.

1966. Как я стал стрелком: [Гумарэска] // Физкультурник Бел. 12 июня / Сааўт. В.Глод; Навелы: Чаравік; Кніга // Чырв. змена. 20 студз.

1967. Па праектах студэнтаў // Голас Радзімы. № 8 / Сааўт. В.Добкін; Чаму я не стаў гумарыстам: Гумарэска // Чырв. змена. 1 лют.; Сага аб мужнасці // Там жа. 12 сак.

1968. Толькі адзін рэйс: Апавяданне // Чырв. змена. 7 студз.; Таварыш інжынер // Там жа. 8 кастр.

1969. Ёще один гол Пеле: [Апавяданне] // Юность. № 1; Стары, старая і воля: Апавяданне // Вяч. Мінск. 19 ліст.; Придется заняться спортом: [Гумарэска] // Физкультурник Бел. 2 февр.; Генка з нашага двара: Апавяданне // Чырв. змена. 12 лют.; «Калі б зноў пачаць...» // Там жа. 6 мая; Забойцы ў піжамах: [Рэц. на кн.: Зайковский В., Шейман Г. Пилоты в пижамах. М., 1969] // Там жа. 17 ліп.; Да запатрабавання: Апавяданне // Там жа. 14 вер.; Дураў, унук Дурава // Там жа. 30 ліст.; Знаёмыя: Гумарыстычнае апавяданне // Там жа. 14 снеж.

1970. Дикари и Монах: [Апавяданне] // Знамя юности. 8 окт.; Зараднасць: Гумарыст. апавяданне // Чырв. змена. 15 студз.; Усё, што засталося...: Апавяданне // Там жа. 10 вер.; Хлеб вайны: Апавяданне // Там жа. 1 ліст.

1971. На скрыжаваннях планеты // Звязда. 17 студз.; Прафесія особого свойства // Знамя юности. 5 окт.; Рэўнасць: [Гумарэска] // Чырв. змена. 14 сак.

1972. Струна: [Апавяданне] // Юность. № 9; Чужы: [Урывак з аповесці «Першая восень»] // Вяч. Мінск. 13 ліп.; Кахаць і быць каханым... // Чырв. змена. 16 сак.; Традыцыйны вечар: Апавяданне // Там жа. 2 крас.; Тры мары генерала Марусічэнкі // Там жа. 9 мая; «Залатыя» пальчаткі Беразюка // Там жа. 20 чэрв.; Джэк: Апавяданне // Там жа. 16 ліп.; Сокал з пашахонскай стараны // Там жа. 5 ліст.; Крэда форварда // Там жа. 14 ліст.; Імгненне з жыцця Яўгена Новікава // Там жа. 5 снеж.; Родам з дзяцінства // Там жа. 21 снеж.

1973. Капітаны вядуць наперад // Бярозка. № 9; В городе Бобруйске — перед началом спектакля // Юность. № 2; Суров ли Кныш? // Там жа. № 3; Двое: [Апавяданне] // Знамя юности. 9 мая; Стойкость // Сов. Бел. 23 окт.; Я еду да цябе...: [Гумарэска] // Чырв. змена. 8 сак.; Усё тыя ж перашкоды // Там жа. 9 кастр.; Зорка першай велічыні // Там жа. 20 ліст.; Старт пачынаўся пад Брэстам: [Дакум. аповесць] // Там жа. 20, 22, 23, 25, 27, 29, 31 снеж.

1974. Як я быў рэкардсменам: Гумарэска // Вожык. № 20; Трэці раўнд: Аповесць // Маладосць. № 4, 5. Рэц.: Мартинович А. Третий раунд выдержан // Физкультурник Бел. 3 июля; Никифорович В. Трудные раунды // Сов. спорт. 6 сент.; Мина для гауляйтера: [Нарыс] // Юность. № 12 / Сааўт. М.Зяньковіч; Книга о следопытах: [Рэц. на кн.: Зяньковіч М. Літары на корціку. Мн., 1973] // Во славу Родины. 6 янв.; Мужнасць // Чырв. змена. 26 лют.; Не ў рэкордзе шчасце...: Гумарэска // Там жа. 14 сак.; Трэці раунд: Урывак з аповесці // Там жа. 24 сак.; «Новы быт» глядзіць у будучыню // Там жа. 17 чэрв.; Турпаход: Гумарэска // Там жа. 25 чэрв.

1975. Вина: Рассказ // Знамя юности. 13 авг.; Сям'я: Замалёўка // ЛіМ. 6 чэрв.; Непрыдуманыя расказы пра цырк: Тыгр Пурш і іншыя; Сонечны клоун // Піянер Бел. 9 студз.; Сустрэча: [Гумарэска] // Чырв. змена. 1 крас.; У паходзе: Гумарэска // Там жа. 29 чэрв.; Адзін дождж на ўсіх: Урывак з аповесці // Там жа. 13 жн.; Шлях да перамогі // Там жа. 27 жн.; На буравой: Апавяданне // Там жа. 26 кастр.; Фактары поспеху // Там жа. 12 ліст.; Зусім не ціхае лета...: [Рэц. на кн.: Міськo П. Калянае лісце. Мн., 1974] // Там жа. 17 снеж.; Семінар: карысць узаемная // Там жа. 21 снеж.

1976. Рабочая дынастыя: [Нарыс] // На галоўных рубяжах. Мн.; У паходзе: Гумарэска // Вожык. № 14; Поединок: Отрывок из повести «Третий раунд» // Знамя юности. 5 окт.; Урал и другие; Самый смешной: Невыдуманные рассказы о цирке // Зорька. 6 авг.

1977. Судьба «бегуна на длинные дистанции»: [Рэц. на кн.: Машков В. Соскучился по дождику. Мн., 1976] // Знамя юности. 24 февр.; Революционный держим шаг // Там жа. 12 июня / Сааўт. І.Саракавік; Перед лицом времени // Там жа. 30 июля; Слово делом красно: Заботы райкома на жатве // Там жа. 7 авг. / Сааўт. І.Саракавік; Элеватор // Там жа. 12 авг. / Сааўт. І.Саракавік; Утверждение доброты: [Рэц. на кн.: Васілевіч А. Мыс Добрай Надзеі. Мн., 1977] // Там жа. 1 сент.; Путешествие по знакомому переулку: [Апавяданне] // Там жа. 21 сент.; Время разрешает взлет // Там жа. 29 сент. / Сааўт. І.Саракавік; Точка опоры // Там жа. 18 окт. / Сааўт. І.Саракавік; Сталасць майстра: [Рэц. на кн.: Марціновіч А. Сцюжа. Мн., 1976] // Чырв. змена. 27 лют.; Ішла жанчына на вайне // Там жа. 8 сак.; Таварыш камсорг // Там жа. 31 сак.; Старонкі з жыцця Серафіма Котава // Там жа. 7 мая; Юнацтва Буды, Пешта і Обуда // Там жа. 29 мая; Незабыўныя сустрэчы // Там жа. 30 чэрв.; Слова пра камсамол // Там жа. 28 ліп.

1978. Дні, як усе іншыя: Аповесць // Маладосць. № 8; Чынгіз: Апавяданне // Вяч. Мінск. 12 студз.; «Отлетаем в очередную командировку...»: [Рэц. на кн.: Клімук П. Зоры — побач. Мн., 1977] // Знамя юности. 31 янв.; «Свободный мир»: Контроль над мыслями // Там жа. 26 февр.; Традиционный вечер: Рассказ // Там жа. 25 окт.; Двое ў гасцініцы: Апавяданне // Чырв. змена. 26 сак.; Адкрыццё Віктара Праснакова // Там жа. 20, 22, 23 крас.; Ветранай восенню: Апавяданне // Там жа. 5 жн.; Аднойчы летам: Апавяданне // Там жа. 4, 12 кастр.; Салон прыгажосці: Апавяданне // Там жа. 29, 30 ліст.

1979. Бельгия без кружев: [Нарыс] // Знамя юности. 5 марта; Все, что осталось: [Апавяданне] // Там жа. 29 апр.; Аб каханні // Чырв. змена. 14 студз.; Сюжэт: Апавяданне // Там жа. 20 сак.; Развітанне: Апавяданне // Там жа. 13 мая; Жанчына ў акне: [Апавяданне] // Там жа. 15 ліп.; Настасся: Апавяданне // Там жа. 19 жн.; Дыялог: Урывак з аповесці // Там жа. 27 вер.

1980. Адкрыццё Віктара Праснакова; Старонкі з жыцця Серафіма Котава: [Нарысы] // Камсамол Беларусі ў дзесятай пяцігодцы. Мн., На адны суткі: Аповесць // Маладосць. № 12; Рекорды и фальстарты Лейк-Плэсида // Знамя юности. 11—14 марта; Размова: [Урывак з рамана «На самым пачатку»] // Чырв. змена. 29 ліп.; Халодным дажджлівым летам: Апавяданне // Там жа. 14 снеж.

1982. Жанчына ў акне: Апавяданне // ЛіМ. 17 снеж.; Скачкі апоўначы: Апавяданне // Чырв. змена. 30 вер.

1983. Сустрэча пасля развітання: Апавяданне // ЛіМ. 15 ліп.; Прывітанне, я ваш тата: Апавяданне // Чырв. змена. 30 студз.; Вечар паэзіі: Апавяданне // Там жа. 30 крас.; Прыезджы чалавек: Апавяданне // Там жа. 25 жн.; Чалавек у сядле: Апавяданне // Там жа. 24 ліст.

1984. Першае паляванне: Апавяданне // Беларусь. № 2; Маналог пасля развітання: Аповесць // Маладосць. № 2; Урок маўчання: [Урыўкі з рамана] // Чырв. змена. 28, 31 ліп., 1 жн.; Калі ты спазнішся: Апавяданне // Там жа. 15 ліст.

1985. Адна паездка: Урывак з рамана «Урок маўчання» // ЛіМ. 1 сак.; Незнаёмая: [Апавяданне] // Чырв. змена. 11, 12 чэрв.; Голас памяці: Апавяданне // Там жа. 3, 5 снеж.

1.5.

На рускую мову. Один дождь на всех: Повесть и рассказы / Пер. В.Щедрина. М., 1985.

Интервью у передовика // Юность. 1973. № 10; Тенгиз: Рассказ / Пер. В.Гришанович // Лит. учеба. 1979. № 4; Все, что осталось: Рассказ // Знамя юности. 1979. 29 апр.; Из книги «Один дождь на всех»: [Апавяданні] / Пер. В.Ходанович // Неман. 1983. № 2; Холодным дожливым летом: Новелла / Пер. авт. // Знамя юности. 1984. 15 нояб.; Встреча после прощания: Повесть // Неман. 1985. № 8; Здравствуйте, я ваш папа: Рассказ // Знамя юности. 1985. 26, 27 мая.

1.6.

Камсамол Беларусі ў дзесятай пяцігодцы: [Зб. артыкулаў]. Мн., 1980 / Скл.

Гайдар Ц. «Мой самы галоўны дзень» // Чырв. змена. 1975. 16 лют. / Зап.; «Мы ў бітвах гартавалі свой радок...» // Там жа. 1975. 25 лют. / Зап. з

А.Мясніковым; Н а ш ы агульныя задачы // Там жа. 1975. 20 мая / Зап.; С м і р н о ў С. Мая галоўная тэма — подзвіг народа // Там жа. 1975. 4 чэрв. / Зап. 2.3.

На беларускай мове. А ў д з е е ў І. Зямныя крокі касманаўта // Чырв. змена. 1981. 17 чэрв.

На рускай мове. Г н и л о м е д о в В. Ощущение жизни // Катюшенко М. Один дождь на всех. М., 1985.

М.П.Барташэвіч.

КАШТАНАЎ АРНОЛЬД



Каштанаў (сапр. Э п ш т э й н) Арнольд Львовіч (н. 21.12.1938, г. Валгаград), празаік. Член СП Беларусі з 1975. Піша на рускай мове.

Нарадзіўся ў сям'і рабочага. У час вайны сям'я эвакуіравалася ў г. Чалябінск, потым у Маскву. У 1949 пераехала на пастаяннае жыхарства ў Мінск. Бацька, Леў Самойлавіч, працаваў майстрам на Мінскім трактарным заводзе, маці — у Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У.І.Леніна. У 1956 А.Каштанаў скончыў сярэднюю школу, у 1961 — Маскоўскі аўтамеханічны інстытут. З 1961 працаваў інжынерам-ліцейшчыкам, з 1965 старшы інжынер на Мінскім трактарным заводзе. З 1976 на творчай рабоце.

Першая аповесць А.Каштанава «Чаго ты хочаш, хлопец?» апублікавана ў 1966. Друкуецца на старонках часопісаў «Неман», «Новый мир». У літаратуру прыйшоў з даволі багатым жыццёвым вопытам, веданнем рабочага асяроддзя і праблем вытворчасці. У творах паказвае побыт і працу рабочага класа ("Заводскі раён", «Начны вартаўнік», «Карабейнікі»). Піша таксама сцэнарыі мастацкіх фільмаў ("Час яе сыноў", паст. ў 1975), тэлефільмаў ("Інжынер Антаніна Брагіна", паст. ў 1978).

У 1991 выехаў у Ізраіль.

Л.С.Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Заводской район: Повесть. Мн., 1976.

Мой дождь: Повесть и рассказы. Мн., 1982. Рэц.: М а р ц і н о в і ч А. Гэты знаёмы... заводскі раён // ЛіМ. 1982. 26 ліст.

Коробейники: Повести. М., 1985.

Эпидемия счастья: Повести и рассказы. Мн., 1986.

Лучшие годы: Повести, рассказы. Мн., 1988.

1.3.

1966. Чего ты хочешь, парень?: (Повесть) // Неман. № 1, 2.

1973. Заводской район: Повесть // Новый мир. № 7, 8.

1974. Белые дома Толочи: [Апавяданне] // Новый мир. № 5.

1979. Ночной сторож: Четыре рассказа о Шубиных // Неман. № 7.

1981. Человек производства и литература: (Читательская конференция на МТЗ) // Неман. № 4.

1984. Другой человек: (Повесть) // Новый мир. № 11.

1985. Петр и Лиза: (Повесть) // Неман. № 1.

1.5.

На балгарскую мову. Заешка душа: [Апавяданне] / Прев. С.Чотоклиев // Погляд. 1974. 21 окт.

На беларускую мову. Бедны Назар: Гумарэска. / Пер. І.Аношкін // Маг. праўда. 1974. 2 крас.

На нямецкую мову. Ein ganz normales Leben / Übers. O.Kolinko. Berlin, 1976.

Hausierer: Roman / Übers. I.Kolinko. Berlin, 1984.

Piotr und Lisa; Ein anderer Mennsch: Novellen / Übers. I.Schröder. Berlin, 1987.

На эстонскую мову. Vaene Nazar / Tlk. A.Leosk // Edasi. 1974. 5. Juuni; Onnetu metsavaht / Tlk. T.Kall // Sirp ja Vasar. 1974. 22. Veebr.

2.3.

На беларускай мове. Д з ю б а й л а П. Вобраз нашага сучасніка ў беларускай прозе. Мн., 1978. С. 112—

113; Егарэнкава Г. Быць чалавекам // ЛіМ. 1977. 4 сак.; Навуменка І. Героя працы — у поўны рост // Там жа. 1974. 11 кастр.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Ялугін Э. Эпахальнага не было. Аднак... // ЛіМ. 1976. 16 крас.

На нямецкай мове. Lehmke H. Ein einfacher Mensch // Freie Welt. 1976. Nr. 33.

М.П.Барташэвіч.

КЕЙЗАРАЎ АЛЯКСЕЙ

Кейзараў
(сапр. Кейзераў)
Аляксей Сцяпанавіч
(псеўд. А.Бронніцкі, С.Аляксееў;
н. 4.10.1928, в. Бронніца
Буда-Кашалёўскага р-на
Гомельскай вобл).,
празаік, нарысіст.
Член СП Беларусі
з 1982.
Піша на рускай і
беларускай мовах.

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацька, Сцяпан Ануфрыевіч, і маці, Елізавета Ягораўна, калгаснікі. У 1941 А.Кейзараў скончыў сямігодку. У час нямецка-фашысцкай акупацыі памагаў маці па гаспадарцы. З красавіка 1944 працаваў на аднаўленні электрастанцыі ў г. Унеча. Потым вучань токара Жлобінскага дэпо (ст. Унеча, 1944), студэнт Гомельскага тэхнікума чыгуначнага транспарту, які скончыў у 1948. Працаваў аператарам, манеўровым дыспетчарам на ст. Казань (1948—49), старшым памочнікам начальніка станцыі ў Калінкавічах (1950). У сувязі з пагаршэннем здароўя пайшоў на пенсію, прыехаў да бацькоў у вёску. Працаваў у школе бібліятэкарам (1950—51), настаўнікам рускай мовы і літаратуры (1951—67). У 1955 скончыў Гомельскі настаўніцкі інстытут. Быў літсупрацоўнікам, раз'язным карэспандэнтам рэспубліканскай «Сельской газеты» (1962—63), рэдактарам Беларускага радыё (1967—74). Працаваў у часопісе «Беларусь» (1974). З 1974 літсупрацоўнік часопіса «Неман». З 1989 на творчай рабоце.

На фарміраванне А.Кейзарава як пісьменніка паўплываў яго дзядзька Сцяпан Кузменка. Пад яго ўплывам пачаў пісаць нарысы, замалёўкі, рэцэнзіі, якія друкаваліся ў раённай і абласной газетах. Першы мастацкі твор — верш «Узнагарода» апублікаваны ў газеце «Сталинская молодежь», першае апавяданне (“З Паўкам“) у газеце «Зорька» ў 1954. Першую кніжку «Нас было сямёра» склалі аповесці пра людзей вёскі, пра беларусаў-цалінікаў. Піша для дзяцей і юнацтва (аповесць «Першы разведузвод»). У яго літаратурным запісе выйшлі кнігі ўспамінаў Героя Савецкага Саюза партызана Э.Лаўрыновіча «Вогненныя рэйкі», былога сакратара Рагачоўскага падпольнага райкама партыі І.Зуевіча «Райком у падполлі», былога сакратара Гарадзішчанскага падпольнага РК КПБ, камісара партызанскага атрада С.Ляснічага «Далёка за фронтам», вучонага-педагога, Героя Сацыялістычнай працы М.Дзмітрыева «Ля ціхай Серабранкі», партызанскага разведчыка М.Фядотава «Разведка вядзе пошук», сведкі трагедыі вёскі Дальва Н.Гірыловіча «Дальва — сястра Хатыні» і інш. Аўтар дакументальнай аповесці «Рэха на Палессі» пра Героя Савецкага Саюза, былога сакратара Мінскага падпольнага абкома партыі Р.Мачульскага.

Жыве ў Мінску.

Л.С.Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Нас было семеро: Повести. Мн., 1963. Рэц.: Говор В. Покидают ли гнезда аисты? // Знамя юности. 1963. 18 дек.

Не знающий покоя: [Нарыс]. Мн., 1963. (Рассказы о коммунистах). Рэц.: Полуничев Н. Не знающий покоя // Неман. 1964. № 2.

Хитрый гвоздик: [Апавяданні]. Мн., 1966. Рэц.:

Даніленка М. Герої апавяданняў — дзеці // Гомел. праўда. 1967. 21 студз.

Первый разведвзод: Повесть. Мн., 1969. Рэц.: Даніленка М. Аповесць пра шчодрасць // Чырв. змена. 1970. 6 студз.; Пятроў М. Аповесць пра шчодрыя сэрцы // Гомел. праўда. 1969. 14 чэрв.; Фомчанка А. Чалавек — што зорка... // Вяч. Мінск. 1969. 28 ліп.

У нас в Тополевке: Повесть. Мн., 1976. Рэц.: Саенка В. Боль і радасць маленства // ЛіМ. 1977. 14 студз. Яго ж. Водгулле трывожнага маленства // Гомел. праўда. 1976. 5 ліст.

Эхо на Палесье. М., 1979. (Герои Советской Родины). Рэц.: Хацкевіч А. Чалавек высокага абавязку // Вяч. Мінск. 1979. 5 чэрв.

Возвратятся журавли: Повести. Мн., 1988.

1.3.

1.5.9. Саставіцель Іван Перажогін: Нарыс // Бальш. Пал. 9 вер.

1952. «Стэпавае сонца»: [Рэц. на кн.: Павленко П. Степное солнце. М., 1952] // Гомел. праўда. 14 вер.

1953. Кніга аб вучоным-вынаходніку: [Рэц. на кн.: Крылов В. А.В.Можайский. М., 1952] // Гомел. праўда. 14 вер.; Награда учителю: [Верш] // Сталин. молодежь. 25 нояб. / Пад скажоным прозв. А.Кайзераў.

1954. Кніга аб школе // Гомел. праўда. 25 чэрв.; «На сажалках» // Там жа. 16 ліст.: [Рэц. на кн.: Чарнышэвіч А. На сажалках. Мн., 1954] // Там жа. 16 ліст.; С Павкой: [Апавяданне] // Зорька. 19 сак.

1956. Чалавек становіцца ў строй: [Рэц. на кн.: Кузменко С. Снова в строю. М., 1955] // Маладосць. № 1; Воспоминания о верном друге // Сталин. молодежь. 15 янв.

1957. Чаго яны плакалі: Апавяданне // Вясёлка. № 3; Моя дочурка: (Маленькие рассказы) // Отчизна. № 3; Праз сорак год: Нарыс // Гомел. праўда. 27 кастр.; Награда: [Верш] // Зорька. 28 сент.; Луковица: [Апавяданне] // Там жа. 13 окт.; Галя: [Нарыс] // Там жа. 23 нояб.; Вера: Очерк // Сов. Бел. 21 дек.

1958. Негаўка: Нарыс // Беларусь. № 7; На палянцы: Апавяданне // Вясёлка. № 5; Сустрэча з землякамі: Нарыс // За вярт. на Радзіму. № 57; Мария Ткачева, доярка: [Нарыс] // Сов. вестник (Венгрия). № 12; Каваль: Нарыс // Калг. праўда. 4 кастр.

1959. Свінка: Апавяданне // Вясёлка. № 2; Половодье больших чувств // Знамя юности. 10 апр.; Праводье больших чувств // Знамя юности. 10 апр.; Праводье больших чувств // Знамя юности. 10 апр.; Правод

зап.

Мазаник Е. Возмездие: Докум. повесть. Мн., 1981 / Літ. зап.; 2 изд., доп. и перераб. Мн., 1988.

Соленик М. Хозяйство приусадебное — польза общая. Мн., 1985 / Літ. зап.

Усов Н. В семье партизанской. Мн., 1988 / Літ. зап.

Федотов М. Разведка продолжает поиск. Мн., 1988 / Літ. зап.

Лавринович Э. Огненные рельсы // Неман. 1967. № 5 / Літ. зап.; Гірыловіч М. Дальва — сястра Хатыні // Звязда. 1976. 14 студз. / Літ. зап.; Мазаник Е. Возмездие // Неман. 1978. № 5, 6 / Літ. зап.; Винокуров М. Село наше Дроздино // Неман. 1978. № 11 / Літ. зап.; Мазаник Е. Возмездие // Голас Радзімы. 1982. 13, 20, 27 мая, 3 чэрв. / Літ. зап.; Плотников Н. У Сожа, Прони и Днепра // Неман. 1984. № 2 / Літ. зап.; Догуро К. С корабля — на бал целинный... // Неман. 1984. № 10 / Літ. зап.

2.3.

На беларускай мове. Барушка А. Тым, хто ўступае ў жыццё // Звязда. 1967. 21 вер.; Даніленка М. У літаратараў Гомельшчыны // Маладосць. 1956. № 9; Ягож. І радком, і ўрокам // Наст. газ. 1964. 16 мая; Кажамякін Ц. Вышэй літаратурнае майстэрства // Гомел. праўда. 1954. 11 жн.; Ягож. Коратка аб кнігах пісьменнікаў Гомельшчыны // Літарататурны Гомель. Гомель, 1958; Шамякін І. Час — абавязвае, чытач — чакае // ЛіМ. 1978. 3 сак.; Шараметаў А. Першы альманах // Сталин. молодежь. 1959. 28 янв.

На рускай мове. Перестенко А. Когда отступают от истины // Красная Звезда. 1984. 2 февр.; Посвящается целинникам // ЛГ. 1961. 3 марта.

М.П.Барташэвіч.

КЕНЬКА МІХАСЬ

Кенька Міхась (Міхаіл Паўлавіч; н. 8.2.1947, в.Верацеі Пастаўскага р-на Віцебскай вобл.), літаратуразнавец. Кандыдат філалагічных навук (1983). Член СП Беларусі з 1988.

Нарадзіўся ў сям'і чыгуначніка. У 1965 паступіў на філалагічны факультэт Магілёўскага педінстытута, які скончыў у 1969. Працаваў журналістам, настаўнікам, камсамольскім работнікам (1969—73). Вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце літаратуры імя Я.Купалы АН БССР (1973—76), працаваў малодшым, старшым навуковым супрацоўнікам гэтага Інстытута. З 1983 намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Юнацтва». З 1988 дацэнт кафедры беларускай літаратуры БДУ.

У 1974 выступіў у друку з артыкуламі і рэцэнзіямі па праблемах беларускай савецкай прозы і паэзіі, тэорыі і практыкі мастацкага перакладу. Аўтар кніг «Майстэрства Аркадзя Куляшова — перакладчыка», «Міхась Лынькоў: Летапіс жыцця і творчасці». Займаўся тэксталогіяй (падрыхтаваў да выдання 3-і том Збору твораў М. Лынькова, 1-ы том Збору твораў М.Гарэцкага), пераклаў з рускай і польскай моў апавяданні для анталогіі «Дзіцячая літаратура народаў СССР», штогодніка «Ветразь», урыўкі з дакументальнай аповесці У.Кавалёнка «Радзіма крылы дала» (для часопіса «Маладосць»).

Жыве ў Мінску.

Л.С.Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Аркадий Кулешов — переводчик: Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1978.

Майстэрства Аркадзя Куляшова — перакладчыка. Мн., 1983. Рэц.: Рагойша В. Что есть перевод? // Неман. 1985. № 4.

Міхась Лынькоў: Летапіс жыцця і творчасці. Мн., 1987.

1.3.

1974. За права малога жанру // ЛіМ. 1 лют.; «Пачуцці светлыя паэзія кране...» // Чырв. змена. 6 чэрв.; Подых грозных вятроў: [Рэц. на кн.:

П а ў л а ў У. Ад агню і мяча. Мн., 1973] // Там жа. 21 ліп.; На шляху сталення: [Рэц. на кн.: Д з я т л а ў А. Росы на поплаве. Мн., 1974] // Там жа. 26 снеж.

1975. Да пытання аб аўтарстве ананімных паэм // ЛіМ. 13 чэрв.; «А ў радках тых — песня...» // Чырв. змена. 2 кастр.

1976. Паэма А.С.Пушкіна «Цыганы» ў перакладзе А.Куляшова // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Мн. Вып. 4; Паэзія Сяргея Ясеніна ў перакладах Аркадзя Куляшова // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. № 1; Творы Тараса Шаўчэнкі ў перакладах Аркадзя Куляшова // Там жа. № 6; Пусть откликается сердце...: [Рэц. на кн.: С л у х а й ц е — Хатынь!.. Слушайте — Хатынь!.. Мн., 1975] // Неман. № 2; Человеку нужен поиск...: [Рэц. на кн.: Г р я д о в к и н В. Сквозь годы. Мн., 1976] // Там жа. № 11; Высокі ўзлёт // ЛіМ. 27 жн.

1977. Звонкая песня паэта: [Рэц. на кн.: Я с е н і н С. Выбранае. Мн., 1976] // Полымя. № 5; Слова сагрэтае пачуццём: [Рэц. на кн.: Б а р а д у л і н Р. Суровая вымова. Мн., 1976] // Там жа. № 12; Творчая акрыленасць: [Рэц. на кн.: К у л я ш о ў А. Зб. тв.: У 5 т. Мн., 1974—77] // Звязда. 20 снеж.; Новы рахунак вайне: [Рэц. на кн.: К а р п а ў У. Прызнанне ў нянавісці і любві. Мн., 1976] // ЛіМ. 4 лют.; Далягляды: [Рэц. на кн.: Д а л я г л я д ы. Мн., 1976] // Там жа. 27 мая; Ад вёскі да горада... і далей: [Рэц. на кн.: Г і г е в і ч В. Спелыя яблыкі. Мн., 1976] // Чырв. змена. 20 ліст.

1978. Ленін думаў пра нас // Звязда. 7 мая; Памяці рускага Праметэя // ЛіМ. 7 ліп.; Рамкі строгія актавы...: [Рэц. на кн.: Г і л е в і ч Н. Актавы. Мн., 1976] // Там жа. 17 ліст.

1979. Мастацкі пераклад і жанравае ўзбагачэнне беларускай літаратуры // Асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу ў Беларусі на сучасным этапе. Мн.; Спасціжэнне пазіі: [Рэц. на кн.: Ц і х а н а ў М. Спасціжэнне. Мн., 1978] // Полымя. № 4; Цеплыня чалавечнасці // Звязда. 30 ліст.; Праца нялёгкая, ды ўдзячная // ЛіМ. 7 вер.; У творчай садружнасці // Там жа. 28 снеж. / Сааўт. У.Гніламёдаў.

1980. Першы з дзесяці // Звязда. 14 чэрв.; Далягляды «Даляглядаў» // ЛіМ. 11 студз.; «Парушыўшы законы прыцягнення...» // Там жа. 11 крас.; Зброяй сатыры і гумару: [Рэц. на кн.: Г і л е в і ч Н. Начлег на буслянцы. Мн., 1980]; Школьнікам пра Міхася Лынькова: [Рэц. на кн.: К у л я ш о ў Ф. Міхась Лынькоў. Мн., 1979] / Пад псеўд. М.Альхевіч // ЛіМ. 3 кастр.

1981. Перакладныя выданні ў Беларусі і іх крытыка // Книга в Белоруссии: Книговедение, источники. Мн., 1981; «Даляглядам» — глядзець далей // ЛіМ. 1 мая / Сааўт. Л.Казыра; Абсягі яго душы: [Рэц. на кн.: П е р к і н Н. Абсягі думкі. Мн., 1980] // Там жа. 5 чэрв.

1982. З лабараторыі майстра: [Уступнае слова] // Братэрства. Мн.; Пейзажы Уладзіслава Галубка // Звязда. 2 ліп.

1983. Яго перакладчыкі // Братэрства. Мн.; «Укладзецца ў душу беларускую...» // Полымя. № 2.

1984. Космас пачынаецца з зямлі: [Рэц. на кн.: Г і л ь М. Ёсць на зямлі крыніца. Мн., 1984] // Маладосць. № 8; Юным чытачам // Нар. асвета. № 2; Не вчитываясь в строку: [Рэц. на кн.: П ы с и н А. Есть на свете мой олень. М., 1983] // Неман. № 11; «Чалавек з адкрытым сэрцам» // Звязда. 30 ліст.; Маленькие герои лесной крепости // Знамя юности. 17 окт.; Талент дабрыні: [Рэц. на кн.: Ч а р н я ў с к а я Л. Апавяданні. Мн., 1983] // ЛіМ. 11 мая; След застанецца: [Рэц. на кн.: Р а л ь к о І. Святло зары вячэрняй. Мн., 1983] // Там жа. 13 ліп.

1985. Пераклаў Максім Гарэцкі // Братэрства, 85. Мн.; Летапіс жыцця і творчасці // Лынькоў М. Зб. тв.: У 8 т. Мн., 1985. Т. 8; «Юнацтва» — дзецям // Нар. асвета. № 2; Плынь супраць плыні // ЛіМ. 14 чэрв.; Каб заўтра зноў дарыць сябе... // Там жа. 6 снеж.

1.4.

1984. В а л а н ч у е М. Міке-манюка; Бойкі Вяпцэ; К р э в е В. Бабульчыны клопаты; Песня пра Арла; Б а л т р у н а с А. Медны якарок: [Апавяданні] / З літ. // Бурштынавыя пацеркі. Мн.

1985. П ш ы м а н о ў с к і Я. Атака на смерць: Урывак з аповесці «Чатыры танкісты і сабака» / З пол. Ветразь. Мн.

1.5.

На ўкраінскую мову. Аркадій Кулешов і украінська література // Рад. літ.-знавство. 1977. № 6.

1.6.

Л ы н ь к о ў М. Зб. тв.: У 8 т. Т. 3. Аповесці і раманы. Мн., 1983 / Падрыхт. тэкстаў і камент.

Г а р э ц к і М. Зб. тв.: У 4 т. Т. 1. Апавяданні. 1913—1930. Мн., 1984 / Падрыхт. тэкстаў і камент.

М.П.Барташэвіч.

КІРКОР АДАМ

Кіркор Адам Ганоры Карлавіч [псеўд. Ян са Слівіна, Ян Валігурскі, Сабары, Jacek ze Śliwina, Jan ze Śliwina, Tułacz Sobarri, Sobarri і інш.; 21.1.1818 (па іншых звестках 1819), в. Слівіна Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Манастыршчынскі р-н Смаленскай вобл. — 23.11.1886, Кракаў], этнограф, гісторык, археолаг, публіцыст, выдавец, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч ліберальнага кірунку. Член-карэспандэнт імператарскага археалагічнага т-ва ў Пецярбургу (1856), Акадэміі ведаў у Кракаве (1873).

Належаў да небагатага беларускага шляхецкага роду татарскага паходжання. Бацькі яго (Караль Мікалаевіч і Тэкля Маркаўна з Валадковічаў), паводле архіўных звестак, у 1830—40-я гады валодалі невялікім фальваркам Грынеўшчына (Кіркораўшчына) у Клімавіцкім пав. У 1832—34 А.Кіркор вучыўся ў Магілёўскай гімназіі, потым у 2-й Віленскай гімназіі (Віленскі дваранскі інстытут), якую скончыў экстэрнам у 1838. Яшчэ ў гімназічныя часы зацікавіўся фальклорам і этнаграфіяй і надрукаваў у зборніку лепшых сачыненняў выхаванцаў Беларускай навучальнай акругі (1839) свой першы артыкул «Рэшткі язычніцкіх звычаяў на Беларусі». Вельмі рана пад уплывам былога выкладчыка Віленскага універсітэта, знаўца старажытнасцей доктара М.Гамаліцкага зацікавіўся археалогіяй і гісторыяй роднага краю. Паступіўшы на службу ў Віленскую казённую палату (1838—64), ён не кідаў і літаратурна-навуковых заняткаў, пісаў тэатральныя рэцэнзіі, выдаваў альманахі «Radegast» («Радэгаст», 1843) і «Pamiętnik umysłowy» («Разумовы дзённік», 1845—46). Спачатку віленскае асяроддзе не да канца задавальняла яго, ён рабіў спробы перанесці сваю журналісцка-выдавецкую дзейнасць у Адэсу, Кракаў (1845) і нават Пецярбург (1846). У 1846, у сувязі з вострымі сацыяльнымі канфліктамі ў Галіцыі, улады даручылі яму сакрэтную місію — разведаць настрой насельніцтва ў Заходняй Беларусі, і ён напісаў па гэтых пытаннях цікавую дакладную запіску, адзначыўшы глыбокую варожасць мясцовых сялян да памешчыкаў. Да гэтага ж часу адносіцца яго нешчаслівы шлюб з артысткай Аленай Маеўскай (1828—1900), які прынёс яму ў будучым вялікія расчараванні (у 1857 жонка пакінула яго і паехала ў Польшчу, дзе прыняла актыўны ўдзел у падзеях 1863). У 1849 А.Кіркор стаў членам Віленскага статыстычнага камітэта. Як сакратар камітэта (да 1854) ён па сутнасці кіраваў усімі яго справамі. Рэдагуючы губернскія «Памятные книжки» (1850—54), ён пашырыў у іх неафіцыйны аддзел, змясціў багатыя матэрыялы па гісторыі і статыстыцы Віленшчыны, у тым ліку па яе беларускіх паветах. Ён вёў шматлікія археалагічныя раскопкі ў Літве і на Беларусі, раскапаў (часткова сумесна з археолагам Я.Тышкевічам) каля 1000 курганоў. Актыўны ўдзел ён прыняў у арганізацыі Музея старажытнасцей у Вільні (1855), стаў яго хавальнікам і сакратаром Археалагічнай камісіі. Выдатны знаўца гісторыі і этнаграфіі Беларусі і Літвы, ён падрыхтаваў некалькі папулярных даведнікаў па Вільні і яе ваколіцах, друкаваў шматлікія навуковыя матэрыялы ў рускай і польскай перыёдыцы. Асабліва каштоўнай для беларускай навукі была яго праца «Этнаграфічны погляд на Віленскую губернію» (1857—58), складзеная па праграме Рускага геаграфічнага т-ва. У ёй выказана вялікая павага да духоўнага жыцця працоўнага народа, прыведзены больш за 100 беларускіх песень, 200 прыказак, слоўнік беларускай мовы. У 1857—58 А.Кіркор выдаваў неперыядычны зборнік «Teka Wileńska» («Віленскі зборнік»), забаронены за змяшчэнне пісьма вядомага гісторыка (у той час палітычнага эмігранта) І.Лялевеля. Своеасаблівым працягам «Тэкі...» былі зборнікі «Pismo zbiorowe Wileńskie» («Віленскі альманах», 1859, 1862). У 1859 А.Кіркор заснаваў у Вільні ўласную друкарню (спачатку ў суполцы, потым перайшла ў яго поўную ўласнасць) і выдаў у ёй шэраг навуковых і мастацкіх кніг, у тым ліку творы Ю.Крашэўскага, У.Сыракомлі, Ю.Ляскоўскага. З 1860 выдаваў і рэдагаваў галоўную газету літоўска-беларускага рэгіёна «Кур'ер віленскі» (на польскай і рускай мовах), зрабіўшы яе больш змястоўнай і папулярнай. У 1850-я гады вакол Кіркора ўтварыўся гурток мясцовых (беларускіх, польскіх, літоўскіх) літаратараў і культурных дзеячаў. Да яго належалі або падтрымлівалі з ім сувязі пісьменнікі У.Сыракомля, В.Каратынскі, В.Дунін-Марцінкевіч, А.Вярыга-Дарэўскі, М.Акялайціс, А.Адынец, І.Ходзька, гісторыкі М.Маліноўскі і Я.Тышкевіч, журналіст В.Пшыбыльскі, кампазітар С.Манюшка. Многія з удзельнікаў гуртка былі звязаны з беларускай літаратурай, у сувязі

з чым гурток А.Кіркора часам называюць першым беларускім літаратурным гуртком, падкрэсліваючы тым самым яго значэнне для станаўлення новай беларускай літаратуры. Паводле няпэўных звестак (Багдановіч М. Тв. Мн., 1968. Т. 2. С. 226), сам А.Кіркор «пісаў для народа папулярныя беларускія брашуркі», але сёння навука нічога пра іх не ведае. Затое добра вядома яго сардэчная прывязанасць да беларуска-літоўскага краю, які традыцыйна ў тыя часы называўся «Літвой». «Я літвін, — пісаў А.Кіркор, — ніколі не знішчыць ува мне гэтага пачуцця» [Революционная Россия и революционная Польша (вторая половина XIX в.). М., 1967. С. 18]. У іншых выпадках ён называў сябе «не прыродным палякам, а беларусам» (Полымя. 1929. № 2. С. 132). У 1858 Кіркор разам са сваімі аднадумцамі ўдзельнічаў у т. зв. «Віленскім альбоме», выдадзеным у гонар прыезду ў Вільню цара Аляксандра II. Гэты ўчынак быў расцэнены многімі як адыход ад традыцый вызваленчага руху і выклікаў крытыку ў розных пластах польскага грамадства, асабліва ў эміграцыі. Ліберальная лінія А.Кіркора, накіраваная на супрацоўніцтва з царскімі ўладамі, не раз выклікала крытыку і ў далейшым. Цяжкія выпрабаванні выпалі на яго долю ў перыяд паўстання 1863, калі Мураўёў-вешальнік ператварыў газету А.Кіркора ў афіцыйны орган генерал-губернатарскага ўпраўлення. Прыхільнікаў паўстання абурыла дачыненне А.Кіркора да выпрацоўкі вернападданніцкага адраса мясцовага дваранства цару. Разам з тым А.Кіркор быў прыцягнуты да следства ў сувязі з удзелам у паўстанні сваёй жонкі А.Маеўскай, у варшаўскай кватэры якой доўгі час хаваўся кіраўнік паўстанцкага ўрада Р.Траўгут. І хоць следства не знайшло яго віны, тым не менш улады, бачачы ў ім праціўніка сваёй русіфікатарскай палітыкі, яму не давяралі, і, страціўшы магчымасць працаваць у Вільні, ён быў вымушаны перабрацца ў Пецярбург, дзе разам з М.Юматавым выдаваў у 1868—71 газету «Новое время», якая праводзіла курс на збліжэнне рускага і польскага грамадства і таксама была на падазрэнні ва ўлад. Апрача таго А.Кіркор апынуўся ў вельмі цяжкім фінансавым становішчы, яму пагражала даўгавая турма. Усё гэта прымусіла яго пакінуць Расію і ўжо ў немалады узросце асталявацца ў Кракаве (тады Аўстрыйская імперыя). Тут ён працягваў займацца навуковай і журналісцкай дзейнасцю, у розныя часы рабіў няўдалыя спробы выдаваць літаратурна-навуковыя альманахі «Na dziś» ("На сёння", 1872), «Teka Krakowska» ("Кракаўскі зборнік", 1884), з поспехам як супрацоўнік Кракаўскай акадэміі вёў раскопкі ў Галіцыі, чытаў публічныя лекцыі па літаратуры і археалогіі. З прац гэтага перыяду асаблівую цікавасць маюць «Нарысы сучаснай рускай літаратуры» (1873), дзе А.Кіркор падкрэсліваў яе дэмакратычныя традыцыі, ролю у ёй В.Бялінскага і М.Чарнышэўскага, «Літоўскія абразкі» (1874) і іншыя віленскія ўспаміны, «Пра літаратуру братніх славянскіх народаў» (1874) з асобным нарысам гісторыі беларускай літаратуры, «Літва і Русь у гістарычных, геаграфічных, статыстычных і археалагічных адносінах» (1875), нарысы гісторыі і культуры Беларусі ў 3-м томе «Живописной России» (1882). Апошнія гады А.Кіркор цяжка хварэў і жыў у вялікай беднасці. З настальгічным пачуццём ён пісаў на радзіму незадоўга да смерці: «Дактары вырашылі, што ў мяне невылечная хвароба сэрца і што кожную хвіліну я магу памерці. Аднак смерць мяне не палохае: я досыць жыў. Што было ў маіх сілах і сродках, я зрабіў і магу з чыстым сумленнем прызнацца, што маё жыццё для Літвы [Літва і Беларусь] не прайшло марна» (Древности. М., 1888, Т. 12. С. 105). У апошні шлях на Ракавіцкія могілкі ў Кракаве яго праводзіла невялікая група мясцовых літаратараў і супрацоўнікаў Акадэміі.

А.Кіркор не меў спецыяльнай адукацыі, працаваў у неспрыяльных умовах, але паспеў зрабіць нямала ў розных галінах навукі і культуры. Як даследчык духоўнай культуры беларускага народа і літаратуразнавец, збіральнік літаратурна-культурных сіл ён адыграў прыкметную ролю ў станаўленні новай беларускай літаратуры. Свае зборы і рукапісы ён завяшчаў кракаўскаму Нацыянальнаму музею. Зараз яго архіў захоўваецца ў Ягелонскай бібліятэцы ў Кракаве, частка архіва (пісьмы да А.Кіркора розных карэспандэнтаў) зберагаецца ў ДГА Літвы ў Вільнюсе.

Г.В.Кісялёў.

Бібліяграфія

1.2.

Языческие обычаи на Белой Руси. Вильна, 1839.

Историческо-статистические очерки Виленской губернии. Вильна, 1852—1853. Т. 1—2 / Ананімна.

Apolinary Kątski: (Na pamiątkę pobytu jego w Wilnie). Wilno, 1852.

Черты из истории и жизни литовского народа. Вильна, 1854.

Przechadzki po Wilnie i jego okolicach. Wilno, 1856; 2 wyd. Wilno, 1859; 3 wyd. Wilno, 1865.

Перечневый каталог предметов в Виленском музеуме древностей. Вильна, 1858.

Wilno i koleje żelazne z Wilna do Petersburga i Rygi oraz do granic na Kowno i Warszawę: Przewodnik z planem, widokami Wilna i mapą kolei żelaznych. Wilno, 1863.

Zarysy współczesnej literatury rosyjskiej. Poznań, 1873.

O literaturze pobratymczych narodów słowiańskich. Kraków, 1874 / Пад псеўд. Tułacz Sobarri.

Obrazki litewskie: Ze wspomnień tułacza Sobarri. Poznań, 1874.

Litwa i Ruś pod względem historycznym, geograficznym, statystycznym i archeologicznym. Warszawa, 1875.

Skarbiec katedry wileńskiej. Wilno, 1876.

Słowianie nadbałtyccy: Zarysy etnologiczno-mitologiczne. Lwów, 1876.

O znaczeniu i ważności zabytków pierwotnych oraz umiejętnym ich poszukiwaniu: (Dwa odczyty publiczne w Muzeum Techniczno-Przemysłowym w Krakowie). Kraków, 1878; Kraków, 1882.

Живописная Россия. Спб., 1882. Т. 3. Ч. 1: Литовское Полесье. Ч. 2. Белорусское Полесье / У сааўт. Рэц.: Г-кий М. [Шолкович С.]. Библиографическая заметка по поводу III тома «Живописной России» // Ист. вестник. 1884. № 5; Krajowiec. Nowa etnografja «białoruska» // Kraj. 1884. Nr 27; S. Książka rosyjska o Litwe i Białorusi // Czas. 1883. Nr 13, 14.

Groby wielkoksiążęce i królewskie w Wilnie. Warszawa, 1882.

Bazylika litewska. Kraków, 1886.

Przewodnik po Wilnie i jego okolicach... Wilno, 1889.

1.3.

1839. Прут: Историческое происшествие; Смерть поэта; Остатки языческих обыкновений в Белоруссии // Опыты в русской словесности воспитанников гимназий Белорусского учебного округа. Вильно.

1842. Nowiny z Wilna // Tyg. Petersb. 15 listop.
1844. Shakekspeare na wileńskiej scenie: list do wydawcy // Tyg. Petersb. 8 listop. / Пад псеўд. Jacek ze Sliwina.
1845. Wiktor Każyński // Athenaeum. T. 6 / Пад псеўд. Jan ze Sliwina.
1846. Wrażenia Petersburga: Listy do redaktora «Athenaeum» // Athenaeum. T. 4 / Пад псеўд. Jan ze Sliwina.
1851. Очерк городов Виленской губернии // Памятная книга Виленской губ. на 1851 г. Ч. 2.
1855. Wycieczka archeologiczna po gubernii Wileńskiej // Bibl. Warsz. T. 2—4 / Пад псеўд. Jan ze Śliwina.
1857. Этнографический взгляд на Виленскую губернию // Вестник РГО. Ч. 20, 21; Julian-Albin Moszyński: Rzecz czytana na posiedzeniu Wileńskiej archeologicznej komissyi dnia 11 października 1857 r. // Teka Wil. Nr 2.
1858. Этнографический взгляд на Виленскую губернию // Этнографический сборник, издаваемый РГО. Спб. Вып. 3; Ludność miasta Wilna // Teka Wil. Nr 3; Od redakcyi «Teki Wileńskiej» // Teka Wil. T. 5 / Пад псеўд. Jan ze Śliwina.
1862. Od redakcji // Kur. Wil. 5. 12, 19 czerw.; S.p. Ludwik Kondratowicz // Kur. Wil. 11 wrzes.; Od redakcji // Kur. Wil. 14 grud.
1863. Краткое обозрение ученой деятельности по части статистики в Литовском крае и в особенности в Виленской губернии // Сборник историко-статистических материалов по Виленской губ. Вильно. Ч. 1; Виленский вестник // Мин. губ. вед. 22 нояб.
1868. Граф К.П.Тышкевич // Новое время. № 137 / Пад крыпт. А.К.
1875. O pierwotnej Słowiańszczyźnie // Niwa. T. 7; Zarys gubernji północno-wschodnich i południowo-zachodnich // Opiekun dom. Nr 1—25, 31—33, 35—36, 43—48 / Пад псеўд. Jan ze Śliwina.
1879. Zabytki bałwochwalcze w Galicyi // Kłosy. Nr 722, 724.
1884. Wspomnienia z lat 1860—1863 //, Dz. Poznański. Nr 1; 1885. Nr 11—13; Ze wspomnień wileńskich // Kraj. Nr 3; Jeszcze słówko o zwłokach Króla Stanisława Leszczyńskiego // Kraj. Nr 22; Korespondencye: Domejko, jego przeżyte dni, miejsce urodzenia. Towarzystwo filaretów i filomatów w Wilnie... // Kraj. Nr 32.
1885. Zjazd archeologiczny we Lwowie // Kraj. Nr 40, 41 / Пад псеўд. Jan ze Śliwina.
1912. Среди белорусской природы и быта: Природа Белоруссии // Бел. вестн. 17, 24 июня.
1978. Умственные силы и средства образования // Александровіч С., Александровіч В. Беларуская літаратура XIX — пачатку XX ст.: Хрэстаматыя крытычных матэрыялаў. Мн.

1.5.

На беларускую мову. [Запіс у Альбоме А.Вярыгі-Дарэўскага] / З пол. // Пачынальнікі. Мн., 1977.

На літоўскую мову. Adomas Honoris Kirkoras Pasivaiksciojimai po Vilniu ir jo apylinkes / Vert. K. Uscia. Vilnius. 1991.

На чэшскую мову. Hroby a mohyly predhistoricke v Polsce, na Litve a Rusi. Praha, 1881.

2.2.

На беларускай мове. Зямкевіч Р. Адам-Ганоры Кіркор: (Біяграфічна-бібліяграфічны нарыс у 25-летнюю гадавіну смерці). Вільня, 1911 / Кірыліца і лацінка.

На польскай мове. Brenstejn M. Adam Honory Kirkor, wydawca, redaktor i właściciel drukarni w Wilnie: Od r. 1834 do 1867. Wilno, 1930.

Kirkor S. Przeszłość umiera dwa razy. Kraków, 1978.

Kirkorowie litewscy: Materiały do monografii rodziny kresowej. Londyn, 1969.

Konarski Sz. Kirkorowie. Londyn, 1963.

Stolzman M. Czasopisma wileńskie Adama Honorego Kirkora. Kraków, 1973. Рэц.: Lechnicki Cz. // Zeszyty Prasoznawcze. 1975. Nr 2.

На рускай мове. Янчук Н. А.К.Киркор: Краткий очерк жизни и деятельности. М., 1888.

Янчук Н. А.К.Киркор, ученый исследователь Литвы и Белоруссии: Некролог. Читано в заседании Моск. археол. о-ва. Киев, 1887 / Адб. з «Киевской страницы». 1887. № 6—7.

2.3.

На беларускай мове. Алякцееў Л. Выдатны археолаг і краязнаўца // Полымя. 1979. № 9; Бандарчык В. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. Мн., 1964. С. 34—38; Гарэцкі М. Адам Кіркор // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1920; 2 выд. Вільня, 1921; 3 выд. Вільня, 1924; Гілевіч Н. З клопатам пра песні народа. Мн., 1970. С. 30—31; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1969. Т. 2. С. 43; Зямкевіч Р. Адам Гоноры Кіркор: (Біяграфічна-бібліяграфічны нарыс у 25-летнюю гадаўшчыну смерці) // Н.н. 1911. 8 снеж.; Карскі Я. Арцём Дарэўскі-Вярыга // Рунь. 1920. № 9—10; Каханоўскі Г. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI—XIX ст. Мн., 1984. С. 56—61; Яго ж. Адчыніся, таямніца часу. Мн., 1984. С. 19—22, 38—41, 44—45; Яго ж. З часоў Кастуся Каліноўскага // ЛіМ. 1975. 22 жн.; Яго ж. Львоўскае рэха // Полымя. 1971. № 11; Кісялёў Г. Сейбіты вечнага. Мн., 1963. С. 126—132; Яго ж. Ці добрая была памяць у Кіркора? // Кісялёў Г. Загадка беларускай «Энеіды». Мн., 1971; Лойка А. Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд. Мн., 1977. Ч. 1. С. 115—118; Мальдзіс А. Творчае пабрацімства. Мн., 1966. С. 70—73, 127—128; Мархель У. З эпісталярнай спадчыны Вінцэся Каратынскага // Весці АН БССР. Сер. грамад. н. 1981. № 4; Яго ж. «Кур'ер віленьскі» як крыніца для вывучэння гісторыі культуры Беларусі: (1860—1862 гг.) // Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белоруссии. Мн., 1972. Вып. 2; Ф.Д. [Дамінікоўскі Ф.] Першы беларускі краязнаўца // Беларусь. 1946. № 4.

На літоўскай мове. Fainhauzas D. Slaptas caro valdzios dokumentas apie 1846 m. Lietuvoje i Baltarusijoje (Adomo Kirkoro «Keliones dienorastis») // Vilniaus valst. V. Kapsuko v. universiteto mokslo darbai: Istorijos-filologijos mokslu serija. 1958. 5 t.; Uztupas V. Adomo Honorio Kirkoro leidybine spaustuvine veikla // Knygotyra. 1985. T. 12 (19).

На польскай мове. Antoniewicz W. Adam Honory Kirkor // Ziemia. 1913; Ilgowski J. Archeologia w Wilnie // Kraj. 1892. Nr 27; J.S. Kilka szczegółów, odnoszących się do stanu wychowania i literatury na Litwie w ostatnich czasach // Dz. Lit. 1863. 24, 27 list.; J.S. Pamiętniki umysłowe (wydane przez Jana ze Śliwina) // Bibl. Warsz. 1847. T. 2; Jaroszewicz-Kleindienst B. W kręgu bohemistycznych zainteresowań A.H.Kirkora // Pamięt. Słowiański. 1975. T. 25; Jelski A. Adam Honory Kirkor: (Wspomnienie pośmiertne) // Prz. Lit.: Dodatek do «Kraju». 1886. Nr 51; Jelski A. Kronika naukowa, literacka i artystyczna: Słówko sprostowania o Kirkorze // Prz. Lit.: Dodatek do «Kraju». 1887. Nr 23; Kirkor S. «Korespondencje» petersburskie J.I.Kraszewskiego // Zeszyty Historyczne (Paryż). 1970. Z. 17; Kirkor S. Od Heleny do Marii: (Przyczynki do biografii A.H.Kirkora) // Wiadomości (Londyn). 1973. Nr 50; Marchel U. Nieznane listy Syrokomli // Gaz. Poznańska. 1972. Nr 287; Pług A. Adam Honory Kirkor // Kłosy. 1886. T. 43; Sas Berlicz. Odkrycia A.H.Kirkora, w Kwaczale w 1873 roku // Kłosy. 1874. T. 19. Nr 476, 477; Stolzman M. Wydawnictwo drukarni obywatelskiej w Wilnie (1859—1867) // Roczniki biblioteczne. 1973. Z. 1—2; Stolzman M. Z działalności wydawniczej Adama Honorego Kirkora: Pismo zbiorowe «Na dziś» // Rocz. Historii Czasopiśmiennictwa polskiego. 1968. Z. 1.

Паходзіў са шляхецкага роду Кмітаў, аселага ў Кіеўскім ваяводстве. Ф.Кміта-Чарнабыльскі быў сынам беларускага шляхціца Сямёна Кміты і яго першай жонкі Тацяны Крошынскай. У 1562 арандаваў замак Асцёр каля Кіева (цяпер ў Чарнігаўскай вобл.), удзельнічаў у войнах супраць Маскоўскай дзяржавы. Узначальваючы невялікі атрад коннікаў, разбіў адзін з буйных варожых атрадаў, узяў штурмам Чарнігаў. Правёў шэраг іншых ваенных аперацый на руска-беларускім пагранiччы. У студзені 1564 са сваім двухтысячным атрадам прыкрываў наступленне галоўных сіл Вялікага Княства Літоўскага супраць групы рускіх войск, сканцэнтраваных у Полацку пад камандай князя І.Шуйскага, не дапусціў злучэння гэтай групы з арміяй князя Сярэбранага Абаленскага, якая рухалася з Вязьмы да Оршы. Потым, выкарыстаўшы перавагу князя Радзівіла над Шуйскім у бітве на Іванаўскім полі, паспяхова здзейсніў акцыю, у выніку якой маскоўская армія адступіла на Смаленск. Летам 1565 Ф.Кміта-Чарнабыльскі напаў на Севершчыну, здабыў г. Почап і вярнуўся ў Асцёр. За ваенныя заслугі кароль Жыгімонт II Аўгуст паводле прывілея ад 26.3.1566 падараваў яму ў вечнае карыстанне Чарнабыльскае ўладанне ў Кіеўскім ваяводстве. Ад назвы замка Чарнобыль і паходзіць яго другое прозвішча — Чарнабыльскі. У 1566 ён атрымаў Аршанскае староства. Як староста абараняў межы дзяржавы, адначасова праводзіў ваенную разведку, інфармаваў Вільню пра ўнутраныя справы і палітычныя планы Івана Грознага, вёў дыпламатычныя перагаворы. У 1568 правёў на Смаленшчыне шэраг наступальных аперацый. У прыватнасці, выманіў у поле і разбіў частку смаленскага гарнізона, спустошыў землі аж да Вязьмы. Прымаў удзел і ў вайне з Масквой (1579—82). У 1579, у час паходу на Полацк, прыкрываў галоўныя сілы з боку Смаленска. У тым жа годзе прызначаны смаленскім ваяводам. Смаленск тады знаходзіўся ў складзе Вялікага Княства Маскоўскага. У час вялікалуцкай кампаніі 1580 Ф.Кміта-Чарнабыльскі ўварваўся з атрадам у 9000 коннікаў на тэрыторыю Смаленшчыны, аднак атрымаў паражэнне і вымушаны быў адступіць да Оршы. Кароль Рэчы Паспалітай Стэфан Баторый у верасні 1580 прызначыў яго камендантам крэпасці Вялікія Лукі. У 1580—81 працягваў ваенныя дзеянні на пагранiччы з Маскоўскай дзяржавай. У лютым-сакавіку 1581 правёў глыбокі рэйд, спусташаючы ваколіцы Вялікага Ноўгарада. У жніўні таго ж года ён атрымаў загад Стафана Баторыя пра аб'яднанне з атрадам Крыштофа Радзівіла і правядзенне ваенных дзеянняў у раёне мяркуемай канцэнтрацыі маскоўскага войска. Той паход сучаснікі назвалі «Яздою ў Маскву» (пад такой назвай апісаў у сваёй паэме гэты наезд Ян Каханоўскі). Пасля атрады, што знаходзіліся пад камандай аршанскага старосты, вярнуліся абараняць прыдняпроўскія землі.

Ф. Кміта-Чарнабыльскі — аўтар цікавага помніка беларускай эпісталярнай літаратуры, т.зв. водпісаў. Усяго збераглося 30 лістоў, якія ён дасылаў з Оршы ў Вільню членам дзяржаўнай рады Вялікага Княства Літоўскага. Першы з іх датаваны 1573, астатнія 1574. Яны ўяўляюць сабой службовыя данясенні пра ваенна-палітычную сітуацыю на ўсходніх межах краіны, становішча ў Маскоўскай дзяржаве, намеры Івана Грознага, руска-татарскія адносіны і інш. У некаторых лістах Ф. Кміта-Чарнабыльскі характарызуе ўнутрыпалітычнае жыццё Рэчы Паспалітай свайго часу, закранае вострыя сацыяльныя праблемы, крытыкуе пануючы клас. Вылучаюцца лісты да троцкага кашталяна Я.Валовіча, у якіх выразна паўстае асоба аўтара, яго індывідуальны стыль і характар, яго перажыванні і адносіны да гістарычных падзей і навакольнай рэчаіснасці. Яны напісаны добрай беларускай мовай, жыва і публіцыстычна, з выкарыстаннем прыказак і прымавак, народных сродкаў гумару і сатыры. Гэтыя лісты — прыкметная з'ява ў гісторыі беларускай літаратуры старажытнай пары.

А.Ф.Коршунаў, В.А.Чамярыцкі.

1.3.
1923. З «Одпісаў»: [Урыўкі] // Гарэцкі М. Хрэстаматыя беларускае літаратуры. Вільня.
1925. Одпісы // Выпісы з беларускай літаратуры. М.: Л. Ч. 1.
1975. Лісты // Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. Мн.
2.2.
Круталевич М. Именное слообразование в белорусском языке XVI в.: (На материале «Отписов» Ф.С.Кмиты-Чернобыльского): Автореф. дис.... канд. филол. н. Мн., 1987.
2.3.
На беларускай мове. Вольскі В. Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры эпохі феадалізма. Мн., 1952. С. 110—111; Гарэцкі М. Філон Кміта // Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1920. С. 28—29; 2 выд. Вільня, 1921. С. 28—29; 3 выд. Вільня, 1924. С. 28—29; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1968. Т. 1. С. 246—254; Карскі Я. Аршанскі староста Філон Сымонавіч Кміта-Чарнабыльскі // Беларусь. 1919. 21 кастр.; Коршунаў А. «Лісты» Ф.С.Кміты-Чарнабыльскага і «Баркулабаўская хроніка»: Жывыя сведкі гісторыі // Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. Мн., 1975; Круталевіч М. Вытворчыя асабовыя назоўнікі ў «Допісах» Ф.Кміты-Чарнабыльскага // Веснік БДУ. Сер. 4. 1981. № 2; Яго ж. Вытворныя з суфіксамі —- ни (е), ени (е) у старабеларускай мове (на матэрыяле «Допісаў» Ф.С.Кміты-Чарнабыльскага) // Веснік БДУ. Сер. 4. 1982. № 3; Ларчанка М. Філон Кміта і яго «Отпісы» // Ахрыменка П., Ларчанка М. Старажытная беларуская літаратура. Мн., 1968; Майхровіч С. Нарыс гісторыі старажытнай беларускай літаратуры XVI—XVIII ст. Мн., 1980. С. 183—186; Яршоў І «Пісана ў Оршы...» // Віцеб. рабочы. 1985. 6 ліп.
На рускай мове. История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977. С. 202—205; Карский Е. Белорусы. Пг., 1921. Т. 3. Вып. 2. С. 110—113; Чемерицкий В. Белорусская литература // История всемирной литературы: В 9 т. М., 1985. Т. 3. С. 499—500.
3.1.
ЦНБ АН Беларусі, аддз. рукап, ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, с. 169.

Т.М.Махнач.

КОБЕЦ РЫГОР



Кобец Рыгор Якаўлевіч [сапр. Сандыга Міхаіл Мусіевіч; псеўд. Грыша Лахматы, Грышка Лахматы, Рыгор Лахматы; 12(24).7.1898, г. Елісаветград — 9.9.1990, Мінск; пахаваны на Паўночных могілка], драматург, празаік. Член СП Беларусі з 1935. Член Саюза кінематаграфістаў Беларусі з 1967. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1935).

З сям'і рабочага. Бацька, Мусій Іванавіч Сандыга, беларус, паходзіў з беззямельных сялян, працаваў у прыватнай пякарні. Маці, Мотра Юхімаўна Драч, украінка, служыла кухаркай у паноў, пасля — у саматужнай пякарні. Р.Кобец нарадзіўся, калі Мотра Юхімаўна яшчэ не была замужам, таму звалі яго Міхайла Драч, з 1918 — Міхаіл Мусіевіч Сандыга. Дзяцінства Р.Кобеца прайшло ў Елісаветградзе. З 8 гадоў яго аддалі ў царкоўна-прыходскую школу, адкуль ён, дзякуючы добрай вучобе, перавёўся ў народнае рамесніцкае вучылішча, потым у Елісаветградскае рэальнае вучылішча. «У 1913 — як сцвярджае сам пісьменнік, — бацькі збяднелі, і зноў прыйшлі мае непрыемнасці: не было чым плаціць за навучанне, за што купіць форму, вярнуліся кпіны і здзекі». На пачатку імперыялістычнай вайны ён ўцёк на Аўстрыйскі фронт, ваяваў у Галіцыі (1914—16), паранены вярнуўся дамоў. Пасля шпіталю здаў экстэрнам зкзамены за чатыры класы рэальнага вучылішча. Працаваў токарам у Елісаветградзе, рабочым на Херсонскім заводзе сельгасмашын кампаніі «Эльворці», маркіроўшчыкам на станцыі Елісаветград—Таварная Паўночна-Заходняй чыгункі (1916—18). Нейкі час быў звязаны з анархістамі, выконваў іх заданні. У сувязі з гэтым у 1928 мусіў памяняць прозвішча, імя і імя па бацьку

на Кобец Рыгор Якаўлевіч. Потым ужо ў Мінску, ён напісаў пакаяльную заяву на імя старшыні СНК БССР М.Галадзеда, які наклаў рэзалюцыю «Неадкладна перадаць у органы НКУС». Пастановай НКУС СССР быў амнісціраваны. У гады грамадзянскай вайны служыў у чырвонаармейскім Брацкім палку, які фарміраваўся ў Елісаветградзе. Пасля ўступіў у рады Чырвонай гвардыі (першы інтэрнацыянальны батальён Рэўваенсавета Паўднёвага фронту). Прымаў удзел у ліквідацыі банд. У 1919 ваяваў у асобным кавалерыйскім дывізіёне Першай Коннай арміі С.Будзённага. Пад Варшавай быў цяжка паранены. З 1921, пасля дэмабілізацыі, жыў на Беларусі. Працаваў качагарам на мінскім дражджавым заводзе «Пралетарый» (1922—28). Адначасова вучыўся ў вячэрнім рабочым тэхнікуме. З 1927 член КПСС. У 1928—29 працаваў качагарам на піўзаводзе «Беларусь». 27 мая 1928 на ст. Негарэлае ад імя рабочага класа Беларусі вітаў сваёй прамовай М.Горкага. Як актыўны рабкор накіраваны ў газету «Рабочий», дзе загадваў сельгасаддзелам (1929—30). У 1929 разам з М.Галадзедам і В.Чарвяковым удзельнічаў у калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Друкавацца Р.Кобец пачаў у 1918 у елісаветградскіх газетах «Наша жизнь» і «Друг народа» (першыя публікацыі не выяўлены). Падпісваўся «Рабочий М.Сандыга». Адна з першых публікацый — па-літычны верш-фельетон «Лавачка» (газ. «Друг народа», 1918), дзе высмеяны П.Скарападскі, якога немцы пасадзілі на гетманскі трон. У беларускім друку творы Р.Кобеца з'явіліся ў 1923 (часопіс «Прафрух»). Пісаў пераважна на рабочую тэму. Яго вершы, апавяданні, фельетоны змяшчаліся ў газетах «Рабочий», «Чырвоная змена», «Звязда», «Савецкая Беларусь», часопісах «Маладняк», «Чырвоная Беларусь», «Напагатове», «Полымя рэвалюцыі», у маскоўскіх газетах «Гудок» і «Рабочая газета». У 1925 уступіў у рускую секцыю «Маладняка» — «Звенья», у 1929 — у «Маладняк». Быў членам Бел РАППа. Напісаны ў 1925 верш «Паравоз» пакладзены на музыку, стаў папулярнай камсамольскай песняй. У 1929 ён напісаў першую п'есу аб рабочым класе Беларусі «Гута» (паст. у 1930 БДТ-1, тады ж паказана на 1-й усесаюзнай алімпіядзе мастацтваў у Маскве). Перакладзеная на іншыя мовы, п'еса ішла ў многіх тэатрах СССР, а таксама ў Чэхаславакіі (1931). З 1931 да 1937 Р.Кобец працаваў кансультантам, загадчыкам сцэнарнага аддзела на кінафабрыцы «Савецкая Беларусь», у Ленінградзе. Стварыў сцэнарыі дакументальных і мастацкіх фільмаў ("Ураган", сцэнарый разам з Б.Брадзянскім, «Двойчы народжаны»). Напісаў музычную камедыю «Шчаслівы бераг», якая ставілася ў Ленінградскім тэатры музкамедыі. У 1933 Р.Кобец паехаў у творчую камандзіроўку ў Біробіджан пісаць сцэнарый сатырычнай кінакамедыі «Шукальнікі шчасця». Знаёміўся з побытам яўрэяў-перасяленцаў, разам з імі працаваў старацелем на залатых капальных, паляваў у тайзе, лавіў рыбу на Амуры, адначасова супрацоўнічаў у газетах «Биробиджанская звезда» і «Тихоокеанская звезда». Кінафільмы «Двойчы народжаны» (1933) і «Шукальнікі шчасця» (1936), створаныя па яго сцэнарыях, з вялікім поспехам ішлі па ўсёй краіне і за рубяжом, увайшлі ў «залаты фонд» савецкай кінематаграфіі. У 1935 і 1937 ён зноў ездзіў ў творчыя камандзіроўкі на Далёкі Усход, каб прадоўжыць працу над сцэнарыем 2-й серыі фільма «Шукальнікі шчасця». Урыўкі з яго друкаваліся ў газеце «На рубеже», «Тихоокеанская звезда» і «Тихоокеанский комсомолец». У 1935 Р.Кобец разам з І.Барашкам напісаў сцэнарый фільма «Дняпро ў агні» пра забастоўку палескіх плытагонаў напярэдадні рэвалюцыі 1905 (экр. 1937). У 1938 Р.Кобец незаконна быў арыштаваны у Біробіджане, без падстаў абвінавачаны ў шпіянажы на карысць Японіі, Англіі і Польшчы. У 1939 апраўданы і ў 1939—41 жыў у Хабараўску. Працаваў у газеце «Тихоокеанская правда», дзе змяшчаў свае нарысы, вершы і байкі; друкаваўся ў часопісе «На рубеже», газеце «Тихоокеанский комсомолец». Там жа напісаў п'есу «Мігрэнь» і (разам з паэтам С.Бытавым) камедыю «Сонечны бераг», якая ставілася на сцэне Хабараўскага тэатра камедыі. У 1941 рэдактар Хабараўскай студыі кінахронікі, на пачатку вайны разам з Д.Нагішкіным зрабіў некалькі сатырычных плакатаў, якія друкаваліся ў Маскве. Па даносу таго ж Д. Нагішкіна быў зноў арыштаваны і ў 1942 Асобай нарадай без суда і следства сасланы на 10 гадоў у сібірскія лагеры «за непачцівыя адносіны да асобы Сталіна». Будаваў чыгункі Тайшэт—Лена, ад станцыі Наушка да Улан-Батара. Пасля знаходзіўся ў лагерах на беразе Ангары, адбываў тэрмін у Заярску. З 1951 на пажыццёвым пасяленні ў кіргізскіх стэпах (с. Кара-Балты Фрунзенскай вобл.) без права пражывання ў сталічных і абласных гарадах. Амаль 9 гадоў працаваў у саўгасе «Чалдавар» (Чуйская даліна), сторажам на вінаградніках, памочнікам пчаляра (у гарах Цянь-Шаня), загадчыкам хаты-чытальні, клуба, гаспадаркі ў школе, быў кіраўніком мастацкай самадзейнасці. Праводзіў у саўгасе культурна-асветніцкую работу, быў радактарам саўгаснай насценгазеты, друкаваў нарысы і фельетоны ў рэспубліканскім друку Кіргізіі. У 1958 вярнуўся ў Мінск. У 1960 поўнасцю рэабілітаваны «за адсутнасцю ў яго дзеяннях складу злачынства». Бацька пісьменніцы А.Кобец-Філімонавай.

У 1967 па просьбе Кіраваградскага абласнога гісторыка-краязнаўчага музея Р.Кобец напісаў «Аўтабіяграфію» (у Беларусі друкавалася ў 1973 са скарачэннямі). Гэта шчырая споведзь чалавека вельмі цяжкага і складанага лёсу. У 1964 стварыў аповесць «Ноеў каўчэг», дзе расказаў аб пакутах і мужнасці рэпрэсіраваных у сібірскіх лагерах (урывак з яе надрукаваны ў 1988 у газеце «ЛіМ»). Лепшыя творы Р.Кобеца з'яўляюцца этапнымі ў развіцці беларускай савецкай драматургіі і кінематаграфіі. У іх адлюстравана супярэчлівае станаўленне савецкай улады на Беларусі і ва ўсёй краіне. Ён дажыў да 50-гадовага юбілею свайго твора «Шукальнікі шчасця», які пасля рэстаўрацыі (1987) зноў дэманстраваўся на экранах. Кінасцэнарый «Шукальнікі шчасця» праз паўстагоддзе надрукаваны на яўрэйскай, рускай, англійскай і французскай мовах.

Рукапісная спадчына Р.Кобеца захоўваецца ў яго асабістым архіве, а таксама ў РДАЛМ, БДАМЛіМ, Кіраваградскім абласным гісторыка-краязнаўчым музеі, Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, Літаратурным музеі Я.Купалы.

Л.С.Савік.

1.2.

Гута: Сучасная п'еса. Мн., 1932.

На заставе: Комедия в 5 картинах. М., 1934.

На заставе: Камедыя. Мн., 1936. Рэц.: Бранштэйн Я. Без скідкі // ЛіМ. 1936. 10 вер.

Герои Балтики: Киноповесть. Хабаровск, 1939.

Мигрень: Одноактная пьеса. Хабаровск, 1940.

Трофим Бутан: Киноповесть. Хабаровск, 1940.

Піражкі з чырвонцамі: Аднаактовая п'еса. Мн., 1966. (У рэпертуар маст. самадзейнасці).

Гута: П'еса ў 3 дзеях. Мн., 1970. (Б-ка бел. драматургіі).

1.3.

1923. Песня летчиков: [Верш] // Звезда. 25 июля.

1924. Вождь: [Верш] // Звезда. 27 янв.; Море: [Верш] // Там жа. 1 мая.

1925. Всякое бывает: [Апавяданне] // Звязда. 14 чэрв. / Пад псеўд. Г.Лохматый; Паравоз: [Верш] // Красная смена. 21 февр. / Пад псеўд. Грыша Лахматы.

1926. Паравоз; Начеку; Уличный: [Вершы] // Звенья. Мн., 1926 / Пад псеўд. Гриша Лохматый.

1927. Гута: Драма ў трох актах // Маладняк. № 8—10.

1930. Штурм богов: [Нарыс] // Рабочий. 7 февр. / Пад псеўд. Гриша Лохматый; Любители сладенького: [Фельетон] // Там жа. 18 апр. / Пад псеўд. Гриша Лохматый.

1931. Дважды рожденный: Отрывок из киносценария // Рабочий. 25 июля.

1932. А ўсё ж заспяваю: Камедыя-жарт // Напагатове. № 2; Ратуй, божа!: Сатырыч. камедыя // Чырв. Бел. № 11, 12, 14, 16, 17 / Сааўт. А.Вольны; Таварыш Кралевіцкі: Апавяданне // Там жа. № 20—21 / У сааўт.; Адным фронтам // ЛіМ. 28 сак. / У сааўт.; Урывак з гукавога сцэнарыя «Двойчы народжаны»; Некалькі слоў пра кінакадры // Там жа. 11 крас.; Урывак з камедыі «Ратуй, божа!» // Там жа. 15 чэрв. / Сааўт. А. Вольны; «Чаму нам ня пець?»: Урывак з камедыі // Палес. праўда. 2 кастр.; Предотвратить несчастье // Рабочий. 20 окт. / Пад псеўд. Лохматый; Няскончаны жыццёпіс: [Нарыс] // Сав. Бел. 20 жн. / Сааўт. А.Вольны; Як я працаваў над гукавой кінадрамай «Двойчы народжаны» // Там жа. 27 ліст.; Вынаходцы: Нарыс // Чырвонаарм. праўда. 5 вер. / Сааўт. А. Вольны.

1933. Як пісаць нарыс // Заклік. № 1; Адзін з лепшых: Нарыс // Іскры Ільіча. № 5—6 / Сааўт. М.Багун; Факты гавораць // Сав. Бел. 13 люг. / Сааўт. М.Багун.

1935. На заставе: Камедыя ў 5 карцінах // Полымя рэвалюцыі. № 12; Гэта натхняе і радуе // ЛіМ. 11 сак.; Адкрыты ліст пісьменнікам БССР // Там жа. 11 мая / У сааўт.; «Дняпро ў агні»: Урывак з кінасцэнарыя // Там жа. 11 вер. / Сааўт. І.Барашка.

1936. Праз 20 год // Звязда. 20 чэрв. / Сааўт. А.Вольны; Паўстанне гневу: Урывак са сцэнарыя // ЛіМ. 17 мая / Сааўт. А.Вольны; Памёр Горкі... // Там жа. 20 чэрв. / У сааўт.

1961. Цяжкі выпадак: П'еса аднаактовая // А гармонік грае, грае. № 4; Простая біяграфія: Нарыс // Полымя. № 10.

1962. Нішто сабе жарты: [Аднаактовая камедыя] // Нішто сабе жарты. Мн.; Беларусь. № 4; Дзяўчаты нашага саўгаса: Нарыс // Беларусь. № 2; Сорак пяты падмурак: Нарыс // Там жа. № 7; Сэрца маці: Нарыс // Там жа. № 10; Катавасія брата Гервасія: П'еса // Полымя. № 8 / Сааўт. А.Астрэйка.

1963. Заслужаная слава: Нарыс // Беларусь. № 3.

1964. Слова да землякоў; І стаў Моня чалавекам: [Урывак з аповесці «Ноеў Каўчэг»] // Голас Радзімы. № 25—26; Круглянскія птушкаводы: Нарыс // Беларусь. № 8.

1965. Піражкі з чырвонцамі: П'еса // Беларусь. № 6; Святая тайна: П'еса // Полымя. № 10. Рэц.: Оскоцкий В. Из пьесы слова не выкинешь // ЛГ. 1965, 11 нояб.

1968. Ажыццёўленая мара // Максім Горкі і Беларусь. Мн.; Салавей: Фрагмент з кінасцэнарыя // Беларусь. № 8; Раздумье: [Урывак з паэмы] // Голас Радзімы. № 30; На ўсё жыццё: [Успаміны] // Полымя. № 3.

1971. Прыгадаем мы свае гады...: [Верш] // Полымя. № 7.

1973. Аўтабіяграфія // Вытокі песні. Мн.

1975. Гута: [П'еса]. Дзея першая, 2-я карціна // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі: У 2 т. Мн. Т. 2.

1988. На ўмацаванне: Успаміны // Мастацтва Бел. № 6; Ноеў каўчэг: Старонкі з аповесці // ЛіМ. 22 ліп.

1989. Ноев ковчег: Повесть // Неман. № 3.

1.5.

На беларускую мову. Палесціна: Урывак з паэмы / Пер. С.Грахоўскі // Полымя рэвалюцыі. 1935. № 6.

На рускую мову. Гута (Завод): Пьеса / Пер. И.Пикулев. М., 1931.

Гута: Картина 3-я из пьесы «Гута» / Пер. С.Зн(аёмы) // Рабочий. 1930. 7 мая / Пад псеўд. Гриша Лохматый.

На яўрэйскую мову Гута: П'еса ў 3 дзеях / Пер. Д.Маршак. Мн., 1933.

Шукальнікі шчасця: Сцэнарый кінафільма / З рус. // Сов. Геймланд. 1986. № 6 / Сааўт. І.Зельцар.

2.1.

На беларускай мове. Ватацы Н. Кобец Р. // Беларуская савецкая драматургія: Бібліяграфія. Мн., 1966.

2.3.

На беларускай мове. Азгур З. Гнеў і любоў // ЛіМ. 1969. 13 мая; Аршанскі А. Сустрэчы, якія не забываюцца // Там жа. 1969. 30 вер.; Асьмоў Я. У вагоне Горкага // Там жа. 1968. 27 сак.; Барашка І. Двойчы народжаны // Там жа. 1933. 26 ліст.; Яго ж. Дняпро ў агні // Там жа. 1936. 7 мая; Яго ж. На кінастужцы — эпоха // Маладосць. 1967. № 1; Бобрык Я. Кадры Белдзяржкіно // ЛіМ. 1935. 11 вер.; Бур Л. Урокі справы Баршай // Палес. праўда. 1931. 16 люг.; Бэндэ Л. Творчыя задачы пралетарскай літаратуры // Маладняк. 1931. № 9; Галкін А. Два юбілеі // ЛіМ. 1935. 28 люг.; Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. Мн., 1985. Т. 2. С. 188—190, 272—276, 285—286; Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1965. Т. 1. С. 75, 590; Гольдберг М. Вышэй слоў // ЛіМ. 1968. 27 сак.; Гольдрынг І. Дняпро ў агні // Там жа. 1936. 30 кастр.; Губарэвіч К. Двойчы народжаны // Там жа. 1934. 26 студз.; Яго ж. Шукальнікі шчасця // Там жа. 1936. 27 мая; Жыткевіч З. Спектакль патрэбны пралетарскаму гледачу // Віцеб. пралетарый. 1931. 2 люг.; Зельцар І. Мая работа ў кіно // Звязда. 1935. 11 сак.; К. Паўстанне гневу // ЛіМ. 1936. 1 мая; Каліноўскі У. Беларуская п'еса на пражскай сцэне // Там жа. 1973. 16 люг.; Лаўшук С. Станаўленне беларускай савецкай драматургіі (20-я — пач. 30-х гг.). Мн., 1984. С. 150—151; Лявонны Ю. На лініі агню // Звязда. 1930. 21 снеж.; Яго ж. Новая перамога БДТ-1: Чаму мы вітаем «Гуту» // Там жа. 1930. 16 ліп.; Яго ж. Усесаюзная алімпіяда мастацтва народаў СССР: Буйны поспех БДТ-1 на алімпіядзе // Там жа. 1930. 15 ліп.; Над чым працуюць пісьменнікі // ЛіМ. 1932. 27 чэрв.; Некрашэвіч А. БДТ-1. Мн., 1930. С. 31, 35—36, 53—54; О. Сцэнарый пра Кастрычнік // ЛіМ. 1932. 11 крас.; Першы гукавы фільм на беларускай мове // Звязда. 1932. 19 ліст.; Піваварaў З. Шукальнікі шчасця // Чырв. змена. 1936. 21 мая; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Пятровіч С. Еўсцігней Міровіч: Крытыка-бібліягр. нарыс. 2-е выд. Мн., 1978. С. 128—135; Рамановіч Я. Няўрымслівая натура // ЛіМ. 1978. 21 ліп.; Рутштэйн К. Рэжысёрскія заўвагі да

пастаноўкі Р.Кобеца «На заставе» // На заставе. Мн., 1935; Рыгору Кобецу — 75 // ЛіМ. 1973. 27 ліп.; Рыгору Кобецу — 80 // Там жа. 1978. 21 ліп.; Рыгору Кобецу — 85 // Там жа. 1983. 8 ліп.; Рымэрман Я. Да пастаноўкі «Гуты» ў БДТ-1 // Палес. праўда. 1931. 18 сак.; Сабалеўскі А. Новыя аўтары — новыя тэмы // Сабалеўскі А. Беларуская савецкая драма. Мн., 1969. Кн. 1. С. 68—71; Яго ж. Рыгор Кобец // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі: У 2 т. Мн., 1975. Т. 2; Семяновіч А. Ад вытокаў да сталасці. Мн., 1978. С. 34—36; Яго ж. Беларуская савецкая драматургія: 1917—1932. Мн., 1968. С. 129—140; Спатканне тав. Горкага ў Негарэлым // Сав. Бел. 1928. 29 мая; Фін Я. «Гута» — п'еса нашых дзён: Вялікі пералом // Палес. праўда. 1931. 27 сак.; Чарняк С., Разоўская П., Шарупіч Б. «Гута» // Камуніст. 1931. 12 жн.; Шамшур П. Друг маладосці: Рыгору Кобецу — 70 гадоў // ЛіМ. 1968. 23 ліп.; Шукальнікі шчасця // Там жа. 1936. 16 мая; Палес. праўда. 1936. 17 вер.; Шынклер Х. «Гута» // Камуніст. 1931. 10 жн.; Эль У. «Гута» ў тэатральнай крытыцы // Звязда. 1931. 7 кастр.

На польскай мове. Rymaszewski Z. «Huta»: Występy Polskiego proletariackiego Teatru Ukrainy // Orka. 1931. 22 lipca.

На рускай мове. А.У. Искатели счастья // Постройка (М.). 1936. 11 окт.; А.Я. Искатели счастья // Сов. Сибирь (Новосибирск). 1936. 27 окт.; Александрович М. Снять с экрана политически вредный фильм // Рабочий. 1937. 26 июня; Барсов И. Искатели счастья // Красный воин. 1936. 30 сент.;Бачелис И. Искатели счастья // Комс. правда. 1936. 10 окт.; Бондарева Е. Кинолента длиною в жизнь. Мн., 1980. С. 55—60; Бродянский Б. Крушение короля подтяжек // Ленинград. правда. 1936. 6 сент.; Бутаков А. О пьесе и спектакле БДТ-1 «Гута» // Бутаков А. Искусство жизненной правды: Театр им. Я.Купалы в 20—30-х годах. Мн., 1957; Вырвич А. Дважды рожденный // Известия. 1934. 21 мая; Глебов А. На фронте драматургии // Сов. театр. 1930. № 13—16; Гольдринг И. Искатели счастья: (Новости кино) // Рабочий. 1936. 4 марта; Готовчиц И. Об актерском искусстве В.Крыловича: (Спектакль «Гута» в купаловском театре) // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1985. Вып. 4. Дукор И. Литстудия клуба «Красный Профинтерн» // Трибуна искусства. 1925. № 5; Дунец Х. Драматургия и театры советской Белоруссии // Театр и драматургия. 1934. № 11—12; Е.С. После всесоюзной олимпиады искусств: Постановка «Гуты» в Минске // Рабочий. 1930. 14 июля; З.Д. «Гута»: Новая пьеса Григория Лохматого (Кобеца) в постановке БДТ-1 // Там жа. 1930. 27 мая; Яго ж. Ураган // Там жа. 1931. 29 июля; Иванов А. «Используйте мои силы полностью» // Смена (Л.). 1936. 8 сент.; Искатели счастья // Кино. 1938. 11 марта; История белорусского кино. Мн., 1969. С. 78, 148—157, 170—173, 197—198, 221—223; История советского драматического театра: В 6 т. М., 1967. Т. 3. С. 247—250, 252, 578; История советского кино: В 4 т. М., 1973. Т. 2. С. 396, 404, 405, 406, 407, 408; К.Л. Искатели счастья // Рабочий. 1936. 2 сент.; Кон Ф. О Белорусском театре // Там жа. 1930. 1 июня; Корш В., Зельцер И. Искатели счастья // Кино. 1936. 22 мая; Лядов Н. Дважды рожденный // Веч. Москва. 1934. 10 мая; Миронов А. Раздумье // Голас Радзімы. 1968. № 30; Москвич. «Гута» и «Межбурье» на олимпиаде искусств: Анкета «Рабочего» // Рабочий. 1930. 4 июля; На ленинградской фабрике Белгоскино // Там жа. 1931. 22 нояб.; На театральной олимпиаде // Там жа. 1930. 29 июня; Нефед В. Становление белорусского советского театра: 1917—1941. Мн., 1965. С. 196—200; Осипов Н. Дважды рожденный // Экономическая жизнь (М.). 1934. 27 мая; С-кий Е. [Садоўскі Я.]. За новые творческие успехи // Рабочий. 1936. 11 марта; Садовский Е. Вечер московских пролетарских поэтов // Трибуна искусства. 1925. № 11; Селях В. Белорусский театр // Сов. театр. 1930. № 7; Театральная экциклопедия. М., 1964. Т 3. С. 94; Театр, идущий в авангарде // Рабочий и искусство. 1930. 5 июля; Урбан М. Искатели счастья // Смена. 1936. 9 сент.; Фельдман К. Искатели счастья // Рабочая Москва. 1936. 27 мая; Юренев Р. Звуковая кинокомедия тридцатых годов // Юренев Р. Советская кинокомедия. М., 1964. С. 309—311.

На ўкраінскай мове. Кравчук П. Сторінка історії українсько-білоруських театральних зв'язків // Театральна культура. К., 1980; Охріменко П. Шляхами братання (Про українсько-білоруські театрально-драматургічні зв'язки). К., 1968. С. 101—102; Стельмах В. Шляхі білоруського театру. К., 1964. С. 32—33.

2.4.

Вольны А. Рыгор Кобец: [Верш] // ЛіМ. 1935. 30 чэрв.; Шушкевіч С. Рэдка з кім так можа стацца: [Верш] // Там жа. 1935. 6 снеж.

3.1.

БДАМЛіМ, ф. 28, воп. 1, ф. 55, воп. 1; ф. 129, воп. 1, спр. 223; РДАЛМ, ф. 2450.

В.У.Смольская.

КОБЕЦ-ФІЛІМОНАВА АЛЕНА

Кобец—Філімонава Алена Рыгораўна [сапр. Кобец; н. 13.10.1932, г.п. Круглае Магілёўскай вобл. (па пашпарту ў Мінску)], празаік. Член СП Беларусі з 1965.

Дачка пісьменніка Р.Кобеца. Маці, Соф'я Аляксееўна Рыкоўская (1909—82), паходзіла з беднай сялянскай сям'і мяст. Круглае на Магілёўшчыне, да Айчыннай вайны працавала гукамантажніцай на кінастудыі «Беларусьфільм». А.Кобец-Філімонава жыла ў Мінску, але да дашкольнага ўзросту больш знаходзілася ў сваякоў у г.п. Круглае і Бялынічы. У 1939 пайшла ў школу, але вучобе перашкодзіла вайна. Пасля вызвалення Беларусі жыла ў Мінску, вучылася тут у школе. У 1947 паравялася ў музычную школу-дзесяцігодку імя Л.Александроўскай, якую скончыла ў 1952. З 1953 працавала выкладчыцай музыкі дзіцячага фартэп'яннага гуртка пры гарнізонным Доме афіцэраў (пас. Сцяпянка Мінскага р-на). У 1954—55 займалася ў музычным вучылішчы пры кансерваторыі імя Рымскага-Корсакава (Ленінград). У 1955 спрабавала паступіць у Ленінградскую кансерваторыю, але яе не прынялі як дачку «ворага народа». Каля паўгода жыла ў Выбаргу Ленінградскай вобл., была выкладчыцай музычнай школы, потым у Краявым Доме настаўніка, дзіцячай музычнай школе ў Стаўрапалі (1956—57). Вярнуўшыся ў Мінск, выкладала музыку ў Цэнтральнай дзіцячай музычнай школе (1958—64). У 1964—66 у сувязі з камандзіроўкай мужа жыла ў Грэцыі. У 1969 скончыла аддзяленне Беларускай дзяржкансерваторыі імя Луначарскага па класу фартэп'яна, у 1971 — Вышэйшыя літаратурныя курсы пры Літаратурным інстытуце імя М.Горкага. Працавала рэдактарам кінастудыі «Беларусьфільм» (1971—72), рэдактарам выдавецтва «Юнацтва» (1981—83). Цяпер на творчай працы.

Друкавацца пачала з 1959 (казка «Песня больш не хлусіць», часопіс «Вясёлка» № 11). У 1973 у Маскве выйшла першая аповесць А.Кобец-Філімонавай «Жаваранкі над Хатынню», пабудаваная на дакументальнай аснове. У тым жа 1973 разам з будаўнічым атрадам ПТВ чыгуначнікаў паехала на камсамольскую будоўлю ў адзін з саўгасаў краіны. У выніку з'явілася аповесць «Блакітны экспрэс». У 1978 ездзіла ў творчую камандзіроўку ў Забайкалле і напісала мастацкі твор пра будаўнікоў БАМа (працяг аповесці «Блакітны экспрэс»). У 1987 абодва творы выйшлі пад адной вокладкай, як раман «Агні за перавалам», у якім узняты праблемы выхавання, маральнага і духоўнага станаўлення маладых рабочых, іх супрацьстаяння несправядлівасці і несумленнасці, выказана трывога за лёс прыроды. Напісала А.Кобец-Філімонава і шмат казак, якія вучаць любві да Радзімы, дабрыні, сціпласці, працавітасці. Па сцэнарыю А.Кобец-Філімонавай у 1973 пастаўлены мультфільм «Вася Буслік і яго сябры» («Беларусьфільм»). Яна аўтар драматургічных твораў (п'есу« Блакітны экспрэс» паставіў Мінскі тэатр юнага гледача), складальнік (у сааўтарстве) паэтычнага зборніка «Земля с лазурными очами», нарысаў пра Грэцыю («У каралеўстве... але не казачным»), мастацкіх перакладаў з грэчаскай паэзіі («Макронісас» Я.Рыцаса), вершаў і баек, адрасаваных пераважна для моладзі і дзяцей. Спачатку пісала на беларускай і рускай мовах, пасля толькі на беларускай. Творы А.Кобец-Філімонавай перакладаліся на замежныя мовы.

Жыве ў Мінску.

Л.С.Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Казка пра месяц. Вершы. Мн., 1963.

Читайка и Гуляйка: Сказки. Мн., 1963. Рэц.: Каваль М. Тысячы радасцей // ЛіМ. 1963. 3 снеж.

Семь художников: Сказки. Мн., 1965. Рэц.: Гіль М. Казкі і казачкі // ЛіМ. 1965. 13 крас.; Прочитай эти книги // Зорька. 1965. 20 февр.

В королевстве... но не сказочном: Очерки о Греции. Мн., 1968. Рэц.: Грахоўскі С. Пакуты і мужнасць Элады // Звязда. 1969. 23 крас.; Юревич В. «Почему я пишу о Греции?» // Неман. 1969. № 12.

Сказки старого Яниса. Мн., 1969.

Залаты ручнік. Мн., 1972.

Жаваранкі над Хатынню: Аповесць. Мн. Рэц.: Яфімава М. Перад стартам у жыццё // ЛіМ. 1978. 24 сак.

Блакітны экспрэс: Аповесць. Мн., 1981.

Агні за перавалам: Аповесць. Мн., 1985. Рэц.: Кунцэвіч А. // ЛіМ. 1985. 7 чэрв.; Левин В. БАМ, который построили мы // Знамя юности. 1985. 12 сент.; Марціновіч А. Святло рамантыкі // Чырв. змена. 1985. 27 ліст.

Вянок дзівосаў: Казкі. Мн., 1986.

Агні за перавалам: Раман. Мн., 1987.

1.3.

1959. Пеця больш не хлусіць: Казка // Вясёлка. № 11 / Пад прозв. А.Кобец.

1960. Смех і плач: Казка // Вясёлка. № 6 / Пад прозв. А.Кобец; Дапытка і Цікаўка: Казка // Там жа: № 10.

1961. Лясны стыляга: Байка // Вожык. № 17; Фальшывая нота: Казка // Вясёлка. № 3; Булька: Казка // Там жа. № 8; Фальшывая нота; Зязюльчыны слёзы: [Казкі] // ЛіМ. 21 ліп.; Лясны барабан: [Верш] // Піянер Бел. 8 вер.; Калі ласка, зіма: [Верш] // Там жа. 1 снеж.

1962. Незабудкі; Плача Ясік; Казка пра месяц: [Вершы] // Беларусь. № 3; Працавітае сонца: [Верш] // Там жа. № 9; Слуп: Байка // Вожык. № 7; Марозневідзімка: Казка // Вясёлка. № 1; Памыліўся; Здагадаўся; Сняжынка; Свавольнік; Белыя мядзведзі; Дудка-чараўніца: [Вершы] // Там жа. № 2; Таня і вецер: Казка // Там жа. № 6; Ніва. 12 жн.; Шпак і верабей: Байка // Маладосць. № 3; Няверка: Казка // Работніца і сялянка. № 1; Шэсць колераў: [Вершы] // Там жа. № 5; З мамай не страшна; Аб'ява: [Вершы] // Там жа. № 12.

1963. Лясны стыляга; Слуп; Шпак і верабей; Свяціла: [Байкі] // Працяг знаёмства. Мн.; Калыханка: [Верш] // Беларусь. № 3; Браты: Апавяданне // Бярозка. № 12; Свяціла: Байка // Вожык. № 7; Ніва. 19 мая; Песня о мире: Сказка // Огонек. № 10; Як Міхаська суп еў: [Верш] // Работніца і сялянка. № 4; Ніва. 26 мая; Любімыя ноты; Пунсовыя макі: Навелы // ЛіМ. 11 чэрв.; Белыя мядзведзі: [Верш] // Ніва. 3 сак.; Пеця больш не хлусіць: Казка // Там жа. 14 крас.; Поэтично и темпераментно // Сов. Бел. 3 нояб.

1964. Чаму цыбуля горкая: Казка // Вясёлка. № 5; Чарвячок-Дажджавічок: Казка // Там жа. № 8; Любімыя ноты: Казка // Голас Радзімы. № 33—34; Мароз Красный нос: Сказка // Огонек. № 1; Калыханка: [Верш] // Работніца і сялянка. № 10; Серая птичка: Сказка // Сов. женщина. № 12; Браты: Апавяданне // Ніва. 29 ліст.

1965. Кропелька: Казка // Беларусь. № 8; Голас Радзімы. № 21; Чых-невідзімка: Казка // Вясёлка. № 3; Сямёра мастакоў: Казка // Там жа. № 8; Мы — таварышы // ЛіМ. 5 ліст.; Чаму цыбуля горкая: Казка // Ніва. 11 крас.

1966. Дзімкава зорачка: Апавяданне // Вясёлка. № 4; Стамаціс і Грыгорыс: Казка // Там жа. № 7; Такова жизнь // Голас Радзімы. № 29; «Горш, чым ёсць, быць не можа»: Нарыс // Там жа. № 45; Эгейскія балады: Дарогай Ламбракіса; Агеньчык // Полымя. № 4; Хрысула — залатая дзяўчынка: Казка // Работніца і сялянка. № 6.

1967. Волшебная сосулька: Сказка // Книжка-малышка. М.; Абаронцы Элады: З грэчаскага блакнота // Голас Радзімы. № 8; Наш дом: Нарыс // Там жа. № 12; Казачная краіна Дзімкі // Там жа. № 50; ЛіМ. 7 ліст.; У каралеўстве... але не казачным: Нарысы // Полымя. № 6, 7; «И меч один мы с ним ковали» // Знамя юности. 9 июня; Тут палымнеў сцяг Глезаса: Раздзел з кнігі «У каралеўстве... але не казачным» // ЛіМ. 30 крас.; Ты будзеш свабоднай, Элада... // Там жа. 12 мая.

1968. Дорогой Ламбракиса // Октябрь. № 4.

1969. Музыка: Гром; Страх; Цень; Адгадай: [Вершы] // Работніца і сялянка. № 11.

1971. На рыбаковым возеры: Нарыс // Беларусь. № 10.

1972. Верталёт: [Верш] // Вясёлка. № 4.

1973. Юныя вынаходцы // Беларусь. № 6; Хатынь: [Верш] // Вясёлка. № 2; Вперед, «Голубой экспресс!»: Очерк // Знамя юности. 10 авг.

1974. Песня маці // Вяч. Мінск. 7 сак.

1975. В деревне Снов: Глава из повести «Голубой экспресс» // Рабочая смена. № 3; Дзень «Блакітнага экспрэса»: [Урывак з аповесці «Блакітны экспрэс»] // Вяч. Мінск. 8 кастр.; Пераможны край // ЛіМ. 4 крас.; Баец Аня: Урывак з аповесці // Там жа. 13 чэрв.; Плач Юлькі: [Верш] // Там жа. 14 ліст.

1978. «Я твой, Родина!» // Знамя юности. 5 сент.; И днем, и ночью // Сов. Бел. 1978. 31 окт.

1979. Бамаўцы: Нарысы // Вясёлка. № 3; БАМ: пасёлак Кічэра: Нарыс // Маладосць. № 7; Урок і ўсё жыццё // Вяч. Мінск. 2 лют.; Когда отступает холод: Путевые заметки // Зорька. 2 марта.

1980. На беразе Кічары: Урывак з аповесці // ЛіМ. 7 ліст.

1982. З такімі не страшна: Урывак з будучай кнігі «Агні за перавалам» // Бярозка. № 10; Однажды летом в поселке: Рассказ автора повести «Голубой экспресс» / Зап. Т.Шарова // Знамя юности. 9 июля.

1983. Кропелька; Зязюльчыны слёзы: [Казкі] // Вяснянка. Мн.; Сем масткоў: [Казка] // Казкі беларускіх пісьменнікаў. Мн.; Агні за перавалам: Аповесць // Маладосць. № 11, 12; Стажок; Музыка // Верасок. Мн.

1985. Дзімкава зорачка: Апавяданне // Буслы над хатай. Мн.

1.4.

Рыцас Я. Макронісас: [Вершы] / З навагрэч. Мн., 1973. Рэц.: Вішнеўскі І. Гордае сэрца Элады // ЛіМ. 1974. 1 мая.

1967. Канду Н. Як Афрадыта і Адоніс; Жыццё; Чаканне; Ніка Самафракійская: [Вершы] / З навагрэч. // Полымя. № 7.

1968. Канду Н. Жыву з любоўю; Дажджавая зорка; Што шукаць? Што мне?: [Вершы] / З навагрэч. // Маладосць. № 8; Рыцас Я. Вершы з-за калючага дроту: Дзік; А.В.Г. / З навагрэч. // Полымя. № 9; Яго ж. Голас з ночы: [Вершы] / З навагрэч. // ЛіМ. 30 крас.; Яго ж. Дзяды нашы: [Верш] / З навагрэч. // Там жа. 15 кастр.

1969. Канду Н. Жыву...; Ты скінула адзенне: [Вершы] / З навагрэч. // Дзень паэзіі-69. Мн.; Рыцас Я. Світанне: [Верш] / З навагрэч. // Звязда. 1 жн.; Яго ж. Сёння: [Верш] / З навагрэч. // ЛіМ. 7 ліст.

1970. Рыцас Я. Дзядзька Міцас: [Верш] / З навагрэч. // Звязда. 18 студз.; Няміровіч І. Законная скарга: [Верш] / З укр. // ЛіМ. 6 ліст.

1971. Рыцас Я. Абавязак; Алексіс: [Вершы] / З навагрэч. // Маладосць. № 3; Яго ж. Гатовы; Алексіс; Знаёмства: [Вершы] / З навагрэч. // ЛіМ. 22 студз.

1973. Рыцас Я. Яны ведаюць, што такое барацьба: Нашы дзеці; Карэнне свету; Падзеі: [Вершы] / З навагрэч. // ЛіМ. 16 сак.

1975. Бумі-Папа Р. Калі я выйду пагуляць з маімі мёртвымі сяброўскамі; Марыя Б.; Эрыфілі: [Вершы] / З навагрэч. // ЛіМ. 5 снеж.

1.5.

На кіргізскую мову. Хатынь кыштагынын торгойлору: [Аповесць] / Котор. Б.Берубаев, У.Токтомамбетов. Фрунзе, 1976.

На літоўскую мову. Skaitikas ir Lakstikas: Pasakos /Vert. P. Velicka. Vilnius. 1966.

Septyni dailininkai: Pasaka // Liet. piopnierius. 1966. Saus. 1.

На рускую мову. Лесной барабан: Стихи / Пер. В.Болдырева. М., 1970.

Жаворонки над Хатынью: Повесть / Пер. авт. М., 1973. Рэц.: Агнящвет Э. Зноў гаворыць памяць // Вяч. Мінск. 1975. 3 сак.; Быков В. Строки из преди-

словий // Лит. обозрение, 1974. № 7; Иваницкий В. Подвигу посвящается // Дет. лит. 1980. № 5; Лейбсон В. // Там жа. 1974. № 12; Оробейко И. Жаваронки над Хатынью // Заря. 1975. 10 июня; Тимофеев И. Жаворонок — птица из огня... // ЛГ. 1974. 8 мая.

Стой, машинист!: Повесть / Пер. авт. Мн., 1976. Рэц.: Власенко А. Геронка созидания. М., 1978. С. 837—840.

Жаворонки над Хатынью: Повести / Пер. авт. Мн., 1982.

Почему лук горький: Сказки // Сел. газ. 1964. 21 июня; Жаворонки над Хатынью: Отрывок из повести // Зорька. 1975. 28 марта; Хатынский звон; Адрес / Пер. Г.Чиж; Белая тишина / Пер. В.Болдырева: [Вершы] // Земля с лазурными очами. М., 1979.

На татарскую мову. Хатынь тургайлары: [Аповесць] / В.Ихсанова тэрж. Казан, 1979. Рэц.: Сомаў З. Кнігапіс // ЛіМ. 1980. 7 сак.

Хатынь тургайлары / В.Ихсанова тэрж. // Яшь ленинчы. 1978. 1, 2—9, 16 сент.

На ўкраінскую мову. Лісовий стиляга: Байка // Комс. прапор. 1961. 6 жовт.; Ходить ранок: [Вершы] / Пер. О.Орач // Малятко. 1971. № 9; Всі пускаються в танок: [Вершы] / Пер. О.Орач // Там жа. 1971. № 11; Світило: Байка / Пер. І.Немирович // Клумба і тумба. К., 1975.
1.6.

Земля с лазурными очами: Стихи бел. поэтов. М., 1979 / Скл. з І.Мазаніным. Рэц.: Левин В. Земля с лазурными очами // Знамя юности. 1980. 29 февр.; Мартинович А. // Дет. лит. 1981. № 2; Саенка В. Анталогія паэзіі для дзяцей // ЛіМ. 1980. № 5. 2.3.

На беларускай мове. Алене Кобец-Філімонавай — 50 // ЛіМ. 1982. 8 кастр.; Багушэвіч Ю. На пачатку дарогі // Там жа. 1961. 21 ліп.; Беларуская дзіцячая літаратура. 2 выд. Мн., 1980. С. 104—105; Беларуская літаратура: Дзень сённяшні. Мн., 1980. С. 244—245; Дзецям — новую казку // ЛіМ. 1962. 6 лют.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981.

На навагрэчаскай мове. А.П. Дзве кнігі аб Грэцыі // Нэас Дромас (Тошкент). 1969. 19 снеж.

На рускай мове. Бейкос Г. Предисловие // Кобец-Филимонова Е. В королевстве... но не сказочном. Мн., 1968; Быков В. Мы не можем этого забыть // Кобец-Филимонова Е. Жаворонки над Хатынью. М., 1973; Ягож. Что всего важнее // Кобец-Филимонова Е. Жаворонки над Хатынь. Мн., 1982; Геллер М. Зовут пути-дороги // Зорька. 1982. 15 окт.; Гуревич Э. Детская литература Белоруссии. Мн., 1982. С. 171—172; Кодзиас К. Продолжение традиции // Кобец-Филимонова Е. В королевстве... но не сказочном. Мн., 1968; От издательства // Кобец-Филимонова Е. Стой, машинист! М., 1976.

В.У.Смольская.

КОЗЕЛ ІВАН

Козел
Іван Васілевіч
(21.5.1928, в. Канчаны
Маладзечанскага р-на
Мінскай вобл. —
30.1.1970, Мінск;
пахаваны на Чыжоўскіх
могілках), драматург.
Член СП Беларусі
з 1961.

З сялянскай сям'і. Пасля сканчэння Красненскай сярэдняй школы (1949) І.Козел працягваў вучобу на завочным аддзяленні філалагічнага факультэта БДУ. Працаваў настаўнікам у Віткаўскай пачатковай школе на Маладзечаншчыне, у Ермакоўскай сямігадовай (1959—60), Красненскай сярэдняй школе (1960—63). Быў навуковым супрацоўнікам інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР (1963—64), рэдактарам Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў (1964—66), старшым рэдактарам Камітэта па друку пры Савеце Міністраў БССР (1966—68). У 1968—69 вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве пры Літаратурным інстытуце імя М.Горкага.

Як драматург выступіў у 1957. Урывак з яго п'есы «Папараць-кветка» ўпершыню быў апублікаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва». Спектакль па гэтай п есе, пастаўлены Тэатрам юнага гледача, на Усесаюзным фестывалі тэатраў ў Маскве ў 1958 адзначаны як лепшы з нацыянальных, яму прысуджаны дыплом 1-й ступені. Амаль 10 гадоў ён не

сыходзіў са сцэны, меў нязменны поспех гледачоў, а сама п'еса стала хрэстаматыйнай. Апрача Мінска яна ставілася ў Брэсцкім аблдрамтэатры, Краснапольскім і Целяханскім народных тэатрах. Другой п'есай, якая прынесла поспех драматургу, з'явілася п'еса «Канчане — суседзі мае» (1961); вядома пад сцэнічнай назвай «Над хвалямі Серабранкі». Водкукі крытыкі на драматургію І.Козела ў час пастановак п'ес і пазней, калі яны ўжо сталі гісторыяй тэатра, вельмі прыхільныя. На думку такога крытыка, як Б.Бур'ян, поспех п'ес І.Козела ў тым, што яны «мелі жыццёвы грунт і напісаны былі сакавітай мовай». Знамянальным быў той факт, што Тэатр юнага гледача на працягу многіх гадоў заўсёды адкрываў тэатральны сезон і гастролі спектаклямі па п'есах «свайго драматурга» — І.Козела. Пісьменнік пераклаў з рускай мовы на беларускую п'есу М.Астроўскага «Свае людзі — памяркуемся», якая ставілася ў тэатрах Мінска. У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва захоўваюцца машынапіс гэтага перакладу, а таксама аўтографы яго п'ес «Краіне фарбаў», «Свежы вецер», «Любоў не за грошы», «Цяжар кахання».

І.Э.Багдановіч.

Бібліяграфія

1.2.

Папараць-кветка: Драма ў 3 актах, 5 карцінах з пралогам. Мн., 1959.

Над хвалямі Серабранкі: Драма ў 3 дзеях. Мн., 1963.

Папараць-кветка: Драма ў 3 актах, 5 карцінах з пралогам. Мн., 1970. (Б-ка бел. драматургіі).

1.3.

1957. Папараць-кветка: Урывак з п'есы «Папараць-кветка» // ЛіМ. 19 кастр.

1958. Папараць-кветка: Драма // Маладосць. № 4.

1961. Канчане — суседзі мае: П'еса // Маладосць. № 9. Рэц.: Санников О. Обличение собственничества // Неман. 1962. № 1; Над хвалямі Серабранкі: Трэці акт п'есы ў скарочаным выглядзе // ЛіМ. 30 чэрв.

1973. Над хвалямі Серабранкі: (Драма ў 3-х дзеях) // П'есы. Мн.

1975. Папараць-кветка: [П'еса]. Акт трэці, карціна чацвёртая // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі. Мн. Т. 2.

1.5.

На рускую мову. Цветок счастья: Драма в 3 д. 5 карт. с прологом / Пер. Н.Татур. Л.; М., 1960; М., 1960.

Цветок счастья: [Драма ў трох актах] / Пер. М.Татур // Сов. Отчизна. 1958. № 5;

2.3.

На беларускай мове. Арлова Т., Палякоў С. Другая сустрэча з драматургам // ЛіМ. 1961. 24 кастр.; Бур'ян Б. «Вы — наш пісьменнік...» // Там жа. 1978. 2 чэрв.; Высакародная рызыка // Наст. газ. 1965. 14 ліп.; Гісторыя беларускай савецкай літаратуры: У 2 т. Мн., 1966. Т. 2. С. 171—172, 175—176; Голяш А. На сцэне — калгаснае жыццё // Маг. праўда. 1964. 19 студз. Гурыч С. «Папараць-кветка»: Юбілейны спектакль Тэатра юнага гледача // Мін. праўда. 1957. 14 снеж.; Гутковіч А. Добры, патрэбны спектакль // Чырв. змена. 1959. 12 лют.; Яго ж. У драматургію прыйшоў настаўнік // Наст. газ. 1958. 22 жн.; Даніленка М. Над хвалямі Серабранкі // Гомел. праўда. 1979. 6 чэрв.; Дзягцярык М. «Папараць-кветка» // Звязда. 1968. 21 снеж.; Іван Козел: [Некралог] // ЛіМ. 1970. 3 лют.; Ізмайлаў Ф. Папараць-кветка // Чырв. змена. 1957. 1 снеж.; Іскрык У. Традыцыі народнай творчасці і сучасны тэатр: Метад. дапаможнік. Мн., 1981. С. 45—58; Каліноўская Л. «Папараць-кветка» // Маг. праўда. 1960. 28 мая; Лаўшук С. Сучасная беларуская драматургія. Мн., 1977. С. 70—71; Міско Я. «Папараць-кветка» // Міско Я. Маё маўклівае сэрца. Мн., 1983. С. 292—295; Міхайлава І. Свой шлях // Гродзен. праўда. 1962. 22 вер.; Налівайка А., Бурэйка Т. Беларуская літаратура. Мн., 1971. С. 323—324, 326—328; Няфёд У. «Папараць-кветка» // Звязда. 1957. 7 снеж.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981; Сабалеўскі А. Беларуская савецкая драма. Мн., 1972. Кн. 2. С. 32, 73—74; 191—202; Яго ж. Жанр твора — драма // Полымя. 1960. № 3; Яго ж. Іван Козел // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі. Мн., 1975. Т. 2; Яго ж. Мовай паэзіі // Чырв. змена. 1957. 21 снеж.; Яго ж. Рампай асветленае. Мн., 1962. С. 159—162; Стральцоў Б. Келіх шчасця // Звязда. 1961. 8 кастр.; Хазанскі У. Папараць-кветка, кветка шчасця // Віцеб. рабочы. 1964. 20 вер.; Эльянаў В. «Канчане — суседзі мае» // Чырв. змена. 1961. 12 кастр.; Ярош М. Праўда канфліктаў — у праўдзе жыцця // Літаратура нашых дзён. Мн., 1963.

На рускай мове. Дункер О. Искусство братского народа // Ригас Балсс (Голос Риги). 1960. 7 июля; История белорусской советской литературы. Мн., 1977. С. 238—239, 241—242; Колас Г. Разговор с человеком // Сов. Бел. 1961. 28 нояб.; Сегеди И. Аплодируют москвичи // Там жа. 1958. 14 февр.; Шавня А. Цветок счастья // Учител. газ. 1958. 28 янв.; Шрубок Л. «Папараць-кветка» // Сел. газ. 1967. 31 марта.

3.1.

БДАМЛіМ, ф. 195, воп. 1, с. 1—25.

В.М.Грышкевіч.

КОЛАС ГЕОРГІЙ

Колас Георгій Данілавіч (н. 26.2.1929, в. Куцень Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл.), літаратурны і тэатральны крытык, публіцыст, кінадраматург. Член СП Беларусі з 1964.

З сялянскай сям'і, якая ў канцы 1929 была «раскулачана» і выселена ў Комі-Пярмяцкую нацыянальную акругу. Там Г.Колас скончыў Кудымкарскі настаўніцкі інстытут (1947), потым Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (1951). Здаў кандыдацкі мінімум у аспірантуры Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР. Працаваў артыстам міманса Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета (1947—49), акцёрам Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра імя Горкага (1950—53), літсупрацоўнікам аддзела культуры рэдакцыі газеты «Сталинская молодежь» (1953—54), галоўным рэдактарам па рэпертуару Упраўлення па справах мастацтваў Міністэрства культуры БССР (1955—60), старшым інструктарам метадычнага кабінета Белсаўпрофа (1960—61), раз'язным карэспандэнтам рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» (1961—64). Некаторы час быў на творчай рабоце (1964—67). У 1967—71 рэдактар аддзела крытыкі і мастацтва часопіса «Неман», няштатны аўтар Беларускага тэлебачання (1971—74). З 1974 зноў на творчай рабоце. Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Рэцэнзіі, артыкулы аб тэатральным мастацтве пачаў пісаць з 1953. Яны друкаваліся на старонках рэспубліканскага друку і ў саюзных выданнях («Советская культура», «Огонек», «Театр», «Труд»), гучалі ў перадачах саюзнага радыё. Ён аўтар зборнікаў, артыкулаў, рэцэнзій, брашур, кніг аб тэатральным жыцці Беларусі, пытаннях драматургіі («Сучаснік у грыме і без грыма», «Дыялог праз рампу»), шматлікіх сцэнарыяў дакументальных кіна- і тэлефільмаў, нарысаў («Беларуская сюіта», «Купалаўцы», «Ёсць такая рэспубліка», «Жыць у вяках», «Паклон мой народу за песні», «Янка Купала», «Ларыса Аляксандроўская» і інш.). Усяго па сцэнарыях Г.Коласа пастаўлена больш за 20 дакументальных фільмаў пра жыццё рабочага класа, культуру, навуку Беларусі.

Жыве ў Мінску.

Л.С.Савік.

Бібліяграфія

1.2.

Тэатры Беларускай ССР у другой Прыбалтыйскай тэатральнай вясне. Мн., 1957 / Тэкст парал. на бел. і рус. мовах.

Спектаклі юбілейнага сезона: Тэатры Беларускай ССР у Трэцяй Прыбалтыйскай тэатральнай вясне. Мн., 1958 / Тэкст парал. на бел. і рус. мовах.

Современники в гриме и без грима: Очерки и публицистика. Мн., 1963. Рэц.: Барысаў Б. Сучаснік без грыма і ў грыме // Беларусь. 1964. № 2; Волгин Г. Полезная, нужная книга // Сов. культура. 1964. 22 февр.; Губарэвіч К. Сучаснік ў жыцці і на сцэне // Звязда. 1964. 3 студз.; Усікаў Я. Пра сучасніка ў жыцці і на сцэне // Полымя. 1964. № 11; Ягож. Сучаснік у жыцці і на сцэне // Маг. праўда. 1964. 16 жн.

Диалог через рампу. Мн., 1967. Рэц.: Бур'ян Б. «Пяцёрка», але... з мінусам" // ЛіМ. 1968. 21 чэрв.; ВерасА.Зацікаўлены маналог // Звязда. 1968. 30 мая.

Аўтографы Андрэя Макаёнка. Мн., 1992.

1.3.

1953. «Ангел-хранитель из Небраски» // Сов. Бел. 9 дек.

1954. Выкрываўчы спектакль: Крадзёж Дж.Лондана ў Маск. цэнтр. тэатры транспарту // Звязда. 26 жн.; Советский водевиль на самодеятельной сцене // Сов. Бел. 16 апр.; «Годы странствий»: Спектакль театра им. Ленинского комсомола Белоруссии // Там жа. 21 июля; Спектакль о судьбах русской интеллигенции // Там жа. 31 авг.; Повысить роль комсомольцев в культурно-массовой работе на селе // Сталин. молодежь. 10 февр.; Сатира, слабо обличающая // Там жа. 11 мая; «Стрекоза» // Там жа. 17 июня; Народ — герой спектакля // Там жа. 15 авг.; Заметки о водевиле // Там жа. 14 нояб.

1955. «Гісторыя аднаго кахання» // Звязда. 9 сак.; «Дачка Фельдмаршала» // Там жа. 28 жн.; Творчы падыход да п'есы // Там жа. 23 кастр.; Конфликт и его воплощение: [Рэц. на спектакль: «История одной любви» К.Симонова в Гродн. обл. драм. театре] // Сов. Бел. 25 марта; «Назар Стодоля» // Там жа. 21 мая; «К новому берегу» // Там жа. 5 нояб.; Радостный доброжелательный смех // Сталин. молодежь. 26 янв.; Серьезный успех // Там жа. 12 апр.; О молодых строителях больших дорог // Там жа. 25 мая; Неглубокое прочтение Островского // Там жа. 30 июня.

1956. Ролі і вобразы: Заметкі аб спектаклі «У добры час!» // Звязда. 13 студз.; Новая сустрэча: (Да гастролей Малага тэатра ў Мінску) // Там жа. 5 лют.; Аповесць, інсцэніроўка, спектакль // Там жа. 15 крас.; «Цудоўны сплаў» // Там жа. 29 чэрв.; Хто вінаваты? // Там жа. 28 ліп.; П'еса і тэатр // Там жа. 31 жн.; Творчае пераасэнсаванне п'есы // Там жа. 11 кастр. Любители по-своему прочли пьесу Арбузова // Знамя юности. 29 июня; Второе рождение: «Соловей» З.Бядули в театре им. Я.Купалы // Там жа. 28 дек.; Судьба спектакля // Сталин. молодежь. 25 янв.; Гнев и пафос // Там жа. 29 февр.; Спектакль о советских пограничниках // Сов. Бел. 16 авг.; В репертуаре самодеятельности // Там жа. 25 нояб.

1957. Новы атрад беларускіх артыстаў // Маладосць. № 9; Былое і думы // Звязда. 19 мая; Творческая удача: Спектакль «Униженные и оскорбленные» в театре им. Я.Коласа // Сов. Бел. 19 мая.

1958. Артисты на полевом стане // Огонек. № 52; Прыкметны рост // Звязда. 7 чэрв.; Победы и поражения: К итогам сезона в театре имени М.Горького // Знамя юности. 19 авг.; Новыя спектаклі // Калг. праўда. 5 чэрв.

1959. «Дні нашага нараджэння» // Звязда. 24 лют.; Шчасце ў змаганні за праўду // Там жа. 11 ліп.; Бітва з перамогай // Там жа. 19 ліп.; «Улада цемры» // Там жа. 24 ліп.; Хвалюючы спектакль // Там жа. 15 ліст.; В историю — с сердцем современника // Знамя юности. 16 окт.; Сіла вялікіх традыцый // ЛіМ. 5 снеж.; «Замак Броудзі» // Маг. праўда. 28 сак.; О людях, плавящих металл // Сов. Бел. 31 марта; Родина зовет // Там жа. 2 дек.; Судьбы человеческие — судьбы народные // Сов. культура. 3 янв.

1960. В Белорусской Алазании: [Нарыс] // Неман. № 5; Экзамен пачаўся // Звязда. 2 лют.; У двух тэатрах // ЛіМ. 21 чэрв.; Цікавая канферэнцыя чытачоў // Там жа. 2 вер.; Святло і цемра: Прэм'ера «Улады цемры» Л.Талстога ў Тэатры імя Горкага // Там жа. 22 ліст.; На сцэне чыгуначнікаў // Маг. праўда. 1 чэрв.; В краю белорусской Алазании... // Сов. культура. 16 авг.; Не блеском металла, а щедростью сердца // Там жа. 13 сент.

1961. Кровь земли: [Нарыс] // Неман. № 3; Канфлікт ці непаразуменне // ЛіМ. 31 кастр.; Без пазалочанай рамы: Нарыс // Там жа. 7 ліст.; Самастойна, па-мастацку: «Крыніцы» І.Шамякіна на сцэне тэатра імя Я.Коласа // Там жа. 24 ліст.; Мацней за крыўду: «Справа яе жыцця» А.Гутковіча і Ф.Казоўскай у тэатры імя Я.Коласа // Там жа. 8 снеж.; Полной мерой // Сов. Бел. 14 июня; Сцена и жизнь: Пьеса Н.Погодина «Цветы живые» на сцене Гомельского театра // Там жа. 18 авг.; Разговор с человеком // Там жа. 28 нояб.

1962. Без позолоченной рамы: [Нарыс] // Неман. № 3; Промні «Маяка» // ЛіМ. 23 студз.; Ля роднай хаты: Урывак з «Салігорскага дзённіка» // Там жа. 30 сак.; Усмешка Хафра і пасаг Ураніі // Там жа. 22 мая; Надзеі і расчараванні: Да гастроляў маскоўскага тэатра імя Ленінскага камсамола // Там жа. 29 чэрв.; Суд памяці і сумлення // Там жа. 13 ліп.; І ў пекле песню не спаліць // Там жа. 7 жн.; Густ у гумары патрэбны // Там жа. 28 вер.; Пра што яшчэ не расказвалі афішы // Там жа. 5 кастр.; Для юных, цікаўных // Там жа. 12 кастр.; Мінск — Магілёў // Там жа. 13 ліст.; Каб іншых навучыць // Там жа. 7 снеж.; Горняцкая совесть // Сов. Бел. 6 июня; По разлинеенному или поперек? // Там жа. 30 июня; Башни Кремля: [Верш] // Там жа. 16 авг.; Лунатики и люди солнца // Сов. культура. 24 июля; Нет у театра крыши // Труд. 8 февр.

1963. Как начертить интонацию вздоха: [Рэц. на кн.: Бурьян Б., Лисневский И. На высоком взлете. Мн., 1962] // Неман. № 1; Театр. № 4; Месяц с театром, час с Охлопковым // Театр. жизнь. № 22; Талент змагара і гуманіста // Звязда. 6 жн.; Праз тры гады // ЛіМ. 24 мая; Сэрца з праўдаю разам // Там жа. 21 чэрв.; Сокалы і крумкачы // Там жа. 12 ліп.; Кветкі на струнах // Там жа. 23 ліп.; Месяц з тэатрам імя Маякоўскага і адна гадзіна з Ахлопкавым // Там жа. 6 жн.; У пошуках шасцярэнькі // Там жа. 27 жн. / Сааўт. І.Кудраўцаў; Салют Вам, мастак і чалавек // Там жа. 18 кастр.; Да новых спраў і песень // Там жа. 3 снеж.; Пасля шаснаццаці аншлагаў // Там жа. 17 снеж.; Казырны туз і простая шасцёрка // Мін. праўда. 29 снеж.; «Открытие» Америки // Сов. Бел. 5 мая; Гражданин, художник, гуманист // Сов. культура. 31 янв. / Соавт. Т. Бушко.

1964. Уладар пачуццяў і думак // Голас Радзімы. № 51; Герои Гремячего — в Минске // Неман. № 6; На глебе плённай і ўрадлівай // Звязда. 21 лют.; «Галоўная стаўка» // Там жа. 14 ліст.; Сэрца твора — сэрца паэта // ЛіМ. 4 лют.; Ён прыйшоў да нас у сёння // Там жа. 14 лют.; Сустрэчы над Бугам // Там жа. 31 сак.; Іронія і праўда: На спектаклях генуэзскага тэатра // Там жа. 5 мая; Інтэрв'ю з піратэхнікам // Там жа. 29 мая; Спектакль — змагар // Там жа. 9 чэрв.; Кніга — будзе! // Там жа. 26 чэрв.; Натхненне і шчасце // Там жа. 28 ліп.; Права выбару // Там жа. 11 жн.; Ноты фальшу ў песні шчырай // Там жа. 24 ліст.; Яго дзед Шчукар // Мін. праўда. 5 чэрв.; Антон Шэлестаў... абвінавачвае // Там жа. 21 жн.; Уходящие: На моральныя темы // Сов. Бел. 26 июля; Победа Проктора // Там жа. 19 авг.; Путь великанов / Там жа. 22 сент.; Душа образа // Сов. культура. 6 июня.

1965. У ролі — Віктар Тарасаў // Голас Радзімы. № 7; «Купец Япішкін» на завадской сцэне // Там жа. № 10; Дзевяць сезонаў — дванаццаць прэм'ер // Там жа. № 21; Грані таленту // Там жа. № 26; И наше достояние: [Рэц. на кн.: Борисова Т. Шекспир на белорусской сцене. Мн., 1964] // Неман. № 4; Назад, да «Канстанціна Заслонава» // Полымя. № 1; Ісціна і факты: [Рэц. на кн.: Нефед В. Становление белорусского советского театра. Мн., 1965] // Там жа. № 9; Актрыса // Работніца і сялянка. № 9; 104 старонкі супраць скепсісу // Звязда. 21 мая; Што ведаў Атэла // Там жа. 15 чэрв.; На гродзенскіх прэм'ерах // ЛіМ. 5, 8 студз.; Гарызонты пошукаў // Там жа. 13 крас.; Час сённяшні і час мінулы // Там жа. 6 ліп.; І гэта — пра каханне?.. // Там жа. 13 ліп.; У фас і профіль // Там жа. 27 ліп.; Што ёсць, чаго няма // Там жа. 12 кастр.; Чатыры варыянты «чатырох крыжоў» // Там жа. 24 снеж.; Успех успеху рознь // Сов. Бел. 12 марта; Время и люди // Там жа. 21 июня; С бурей в лад // Там жа. 21 нояб.

1966. Это — не умрет // Неман. № 1; Ясность взгляда // Там жа. № 9; Инга будет жить // Театр. жизнь. № 8; Человек с лучистыми глазами // Там жа. № 12; Чудо, ставшее нормой бытия // Знамя юности. 6 нояб.; З адзінай вязкі // ЛіМ. 21 студз.; Трэці неабходны // Там жа. 4 лют.; Пачатак жыцця // Там жа. 22 лют.; Пераконваюць — перакананыя // Там жа. 29 сак.; Дом на сонечнай, яго гаспадары і госці // Там жа. 15 ліст.; Артыст — заўжды артыст // Там жа. 27 снеж.; «Гавайская легенда» // Сов. Бел. 30 янв.; «По тонкому льду» // Там жа. 5 окт.

1967. У Могилевской Мельпомены // Неман. № 3; Тринадцатый сезон // Там жа. № 10; Где «центр земли?» // Театр. № 11; Второе дыхание // Театр. жизнь. № 19; Уздыблены эпас // Звязда. 10 жн.; У вобразах і дакументах: Нататкі пра тэлеспектакль «Крах» // ЛіМ. 6 студз.; Ідыёцтва... з добрымі намерамі // Там жа. 27 студз.; Выпрабаванне жанрам: Спектакль «Шчыт і меч» па п'есе В.Кажэўнікава і В.Токарава ў Беларускім Дзяржаўным тэатры імя Я. Коласа // Там жа. 28 сак.; Што ні персанаж, то непаўторны характар // Там жа. 14 крас.; Канстанцін Заслонаў, наша слава... // Там жа. 25 крас.; Як мож-

на сапсаваць свята: Рэпліка // Там жа. 28 ліп.; Другое нараджэнне «Бацькаўшчыны» // Наст. газ. 16 вер.; На грані двух эпох // Сов. Бел. 28 дек.

1968. Убачыўшы цудоўнае // Беларусь. № 1; Чтоб слово стало и весомей и дороже // Неман. № 4; Запомним их имена: [Рэц. на кн.: Крывёю серца. Мн., 1967] // Там жа. № 7; «Ого-го-о! Могу-у!»: [Рэц. на кн.: Варно В. Сквозь тучи. Мн., 1968] // Там жа. № 8; Если зал полон... // Там жа. № 9; [Рэц. на кн.: Чурко Ю. Белорусский балет. Мн., 1966] // Театр. № 2; Чые гэта слёзы?; На тэмы маралі // Вяч. Мінск. 22 сак.; Казка, ды не толькі для маленькіх // ЛіМ. 6 лют.; З палемічным пафасам // Там жа. 15 ліст.

1969. Не звание, а сущность // Неман. № 2; «Количественно более богата»: [Рэц. на кн.: Семяновіч А. Беларуская савецкая драматургія. Мн., 1968] // Там жа. № 3; «Учить людей, изображая нравы...» // Там жа. № 4; На стыке двух эпох // Там жа. № 5; Лишь об одном спектакле // Там жа. № 9; Эх, Лявониха...: [Рэц. на кн.: Чурко Ю. Белорусский сценический танец. Мн., 1969] // Там жа. № 11.

1970. Пролетарская песнь // Неман. № 4; «Плюс — минус»: [Рэц. на кн.: Сабалеўскі А. Беларуская савецкая драма. Мн., 1969] // Там жа. № 6; Праздник идей // Там жа. № 11; Ничего, кроме правды // Сов. Бел. 27 июня.

1971. На зямлі рудабельскай: [Нарыс] // Беларусь. № 11; Компетентное начало: [Рэц. на кн.: Кузняцоў К. Ірына Ждановіч. Мн., 1970] // Неман. № 6; В поисках положительного идеала // Театр. № 10; Аб'ект даследавання — духоўная свядомасць: «Зацюканы апостал»; «Трыбунал» А.Макаёнка ў тэатры імя Я.Купалы // ЛіМ. 14, 21 мая.

1972. Рысы таленту // Беларусь. № 4 Вот такая карусель // Театр. № 12; «Трыбунал» у рэспубліцы Мустая // ЛіМ. 28 крас.; Поруч з аўтарам // Там жа. 14 ліп.; Добразычліва, без паблажлівасці // Там жа. 4 жн.; Диспут на сцене — диспут в зале: [Рэц. на кн.: Макаёнак А. Трибунал; Затюканый апостол. Мн., 1971] // ЛГ. 17 мая; Критика: субьективность и субьективизм // Сов. культура. 26 февр.; Его герои живут с нами // Там жа. 6 июля.

1973. Пошукі і спрэчкі // Полымя. № 3; Поиски и споры // Театр. № 8.

1974. Яе імя // Работніца і сялянка. № 6; Прызнанне ў любві // Звязда. 27 чэрв.; «Прымаць ці не прымаць..,» // ЛіМ. 25 студз.; Атакующая муза // Сов. Бел. 10 февр.; Откровение // Там жа. 1 июня.

1975. [Рэц. на кн.: Симуров А. Сказание о болгарском брате. Мн., 1974] // Неман. № 5; Была бы правда // Там жа. № 12; Радостный дебют // Сов. Бел. 29 мая.

1976. Была бы правда: [Рэц. на кн.: Адамович А., Брыль Я., Колесник В. Я из огненной деревни. Мн., 1975] // Звезда Востока. № 12; Один из первых: [Рэц. на кн.: Грамыка М. Каля тэрасы. Мн., 1975] // Неман. № 3; Гармония и алгебра // Там жа. № 12; С регламентом и без... // Театр. № 11; Варыянты // ЛіМ. 9 крас.; Поиск и открытия // Сов. Бел. 21 июля; «Архитектура мирозданья» // Там жа. 2 сент.; «И явь, и сон» // Сов. культура. 7 сент.

1978. Іосіф Матусевіч; Расціслаў Янкоўскі // Майстры беларускай сцэны. Мн. Кн. 3.

1979. Ці тая Марыя...: Нарысы // Полымя. № 2.

1981. На тонких гранях чувств: [Рэц. на кн.: Новожилов О. Агатовый ручей. Мн., 1981] // Неман. № 11; Балючае рэха вайны // Полымя. № 7.

1983. Пальму первенства присвоит время // Театр. жизнь. № 8.

1984. Загадкі Віктара Тарасава // Маладосць. № 1; «К зорам агністым, к прыволлю нябеснаму» // ЛіМ. 2 ліст.; На отчей земле // Сов. Бел. 21 дек.

1985. «Праблемы Сафі Ларэн» // ЛіМ. 15 ліст.; Са знакам Быкава: На спектаклі Дзяржаўнага рускага тэатра БССР імя М.Горкага // Там жа. 20 снеж.; Поиски сути // Сов. Бел. 20 июля; Как это помнится // Там жа. 22 авг.

1.4.

1954. Гаврусев С. На родных дорогах / С бел. // Сталин. молодежь. 8 авг.

1966. Сергейчик Т. Перед выходом на сцену / С бел. // Неман. № 7.

1.5.

На англійскую мову. A Great Byelorussian Actor / Transl. H.Perham // Soviet Literature. 1962. № 8.

На украінскую мову. Збагачуватися думкою / З біл. // Рад. Укр. 1972. 4 берез.

1.6.

Макаёнак А. Мастак і час // Маг. праўда. 1975. 23 студз. / Зап.

2.3.

На беларускай мове. Аўдзееў І. Нарадзіўся паэт на Купалле... // Чырв. змена. 1982. 1 ліп.; Георгію Коласу — 50 // ЛіМ. 1979. 23 лют.; Губарэвіч К. Пра ўяўныя недахопы // Там жа. 1966. 13 снеж.; Нячай В. Дзякуй народу за песні // Вяч. Мінск. 1982. 1 ліп.; Пісьменнікі Савецкай Беларусі: Кароткі даведнік. Мн., 1981.

На рускай мове. Белорусская сюита // Знамя юности. 1967. 22 марта; Ерохин Р. Люди раннего утра // Сов. Бел. 1973. 30 авг.; Резник И. Поэзия в наследство // Сел. газ. 1982. 13 июля; Шепелев Н. Камера глядит на сцену // Знамя юности. 1969. 31 июля.

В.М.Грышкевіч.

КОЛАС ЯКУБ

Колас Якуб [сапр. Міцкевіч Канстанцін Міхайлавіч; інш. псеўд.: Агарак, К.Адзінокі, К.Альбуцкі, Андрэй «сацыяліст», К.Белорус, Т.Булава, Тамаш Булава, Ганна Груд, Т.Гушча, Тар. Гушча, Тарас Гушча, Дземяноў Гуз, Пятрусь Дзягель, Дзядзька Карусь, Дзяцька Карусь, Дубовы Ліст, Я.Колас, Як.Колас, Я.Колос, Ганна Крум, Кудесник, Карусь Лапаць, Левы, Лесавік, Марцін, Марцін з-за рэчкі, Мікалаевец, М.Міцкевіч, Наднеманец, К.Наднёманец, Народный учитель, Свой чалавек, Стары шут, Иван Торба; крыпт.: Т.Г., К., Я.К-с., К.М., К.П-ій і інш.; 22.10 (3.11).1882, засценак Акінчыцы Мінскага пав. (з 1971 у межах г. Стоўбцы Мінскай вобл.) — 13.8.1956, Мінск, пахаваны на Вайсковых могілках], паэт, празаік, драматург, крытык, публіцыст, перакладчык, вучоны, педагог, адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры і беларускай мовы, грамадскі дзеяч. Член СП Беларусі з 1934. Двойчы лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР — за зборнік вершаў (1946) і паэму «Рыбакова хата» (1949). Народны паэт Беларусі (1926). Акадэмік АН Беларусі (1928), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1944).

Нарадзіўся Я.Колас у сям'і лесніка. Праваслаўны, ахрышчаны ў Стаўбцоўскай царкве. Бацька, Міхаіл Казіміравіч Міцкевіч, служыў лесніком у князя Радзівіла. Маці, Ганна Юр'еўна (дзяв. прозвішча Лёсік), была хатняй гаспадыняй. Браты Уладзімір (1879—1954), Алесь (1880—1940), Іосіф (1895—1980), Міхал (1897—1991), сёстры Міхаліна (1887—1977), Юзэфа (1891—1964), Марыя (1900). Дзіцячыя гады будучага пісьменніка прайшлі ў лесніковых сядзібах Ласток (Сухошчына), Альбуць, што недалёка ад в. Мікалаеўшчына, адкуль бацькі былі родам. У 1892—94 Я.Колас вучыўся ў Мікалаеўшчынскім народным вучылішчы. У дзяцінстве захапляўся байкамі І.Крылова, вершамі А.Пушкіна, М.Лермантава, В.Жукоўскага, апавяданнямі М.Гогаля, казкамі і апавяданнямі Л.Талстога, вершамі на беларускай мове Янкі Лучыны (у рукапісе). Любоў да кніг прывіў яму дзядзька Антось. У 1898 паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, якую скончыў у 1902. У час вучобы шмат чытаў, прагна засвойваў здабыткі класікаў рускай, украінскай, замежнай літаратур. У ліку любімых пісьменнікаў былі М.Кальцоў, М.Някрасаў, У.Хемніцер, У.Дзмітрыеў, Т.Шаўчэнка, І.Франко, А.Міцкевіч і інш. У юнацкія гады напісаў паэмы «У кастра» і «Страх», тэксты якіх не захаваліся. Рабіў запісы вуснай народнай творчасці. Вялікі ўплыў на будучага паэта аказаў выкладчык семінарыі А.Кудрынскі, які ўхваліў яго першыя вершы. Пасля сканчэння вучобы Я.Колас працаваў настаўнікам Люсінскага народнага вучылішча Пінскага пав. Мінскай губ. (цяпер Ганцавіцкі р-н Брэсцкай вобл.). «Першыя гады настаўніцтва прайшлі на Палессі ў Люсіне і Пінкавічах. Тут я першы раз пазнаёміўся з нелегальнай літаратурай», — успамінаў Я.Колас. З 1903 ён настаўнічаў у в. Пінкавічы Пінскага пав. (цяпер Пінскі р-н), вёў рэвалюцыйную работу сярод сялян. За ўдзел у рэвалюцыйнай прапагандзе (1906) «у парадку пакарання» пераведзены з Пінкавіцкага ў Верхменскае народнае вучылішча Ігуменскага пав. Мінскай губ. (цяпер Смалявіцкі р-н Мінскай вобл.). У ліпені 1906 у в. Мікалаеўшчына адбыўся нелегальны настаўніцкі з'езд. За актыўны ўдзел у ім і наогул за рэвалюцыйную работу Я.Колас быў пазбаўлены права працаваць настаўнікам. Пачалося следства. Зіму (1906—07) жыў у леснічоўцы Смалярня, дзе нелегальна адкрыў прыватную школу. Пачаў складаць вучэбны дапаможнік «Другое чытанне для дзяцей беларусаў». 1 верасня 1906 у газеце «Наша ніва» быў надрукаваны першы верш Я.Коласа «Наш родны край». На працягу шасці тыдняў 1907 ён быў загад-

чыкам літаратурнага аддзела газеты «Наша ніва», але паводле загада паліцыі пакінуў Вільню. Восенню 1907 зноў прыязджаў у Вільню, а ў снежні таго ж года зрабіў падарожжа ў Пецярбург, каб наладзіць асабістыя сувязі з пісьменнікамі і культурнымі дзеячамі Расіі. З пачатку 1908 Я.Колас настаўнік беларускай прыватнай школы ў в. Сані Абчугскай вол. Сенненскага пав. (цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл.). Хутка быў асуджаны мясцовымі ўладамі да трох гадоў турэмнага зняволення. Пакаранне адбываў у Мінскім астрозе. У 1909 у выдавецтве «Загляне сонца і ў наша ваконца» (Пецярбург) выйшла першая яго кніга «Другое чытанне для дзяцей беларусаў», а ў 1910 — першы зборнік вершаў «Песні жальбы». Высокую ацэнку творчасці Я.Коласа даў М.Горкі. У 1911 Я.Колас пачаў пісаць паэму «Новая зямля». Тады ж нарадзілася і задума паэмы «Сымон-музыка». Пасля выхаду з турмы ў верасні 1911 пісьменнік жыў у мяст. Лунінец Пінскага пав. Мінскай губ. (цяпер г. Лунінец Брэсцкай вобл.) у свайго таварыша В.Філіповіча, займаўся з яго вучнямі, дзяцьмі чыгуначнікаў. У 1912 атрымаў пасведчанне аб дабранадзейнасці і быў прызначаны настаўнікам — спачатку ў в. Купяцічы (12 вёрст ад Пінска), пасля — ў трэцяе прыходскае вучылішча г. Пінска. У жніўні 1912 на хутары Смольня, каля в. Мікалаеўшчына, адбылася першая сустрэча Я.Коласа і Я. Купалы. Шчырае іх сяброўства захавалася на ўсё жыццё. У чэрвені 1913 Я.Колас ажаніўся з настаўніцай пінскай чыгуначнай школы Марыяй Дзмітрыеўнай Каменскай, якая нарадзілася ў сям'і свяшчэнніка. Павянчаліся ў царкве г. Пінска. У пачатку першай сусветнай вайны (1914) ён разам з сям'ёй эвакуіраваўся ў Маскоўскую губ. Настаўнічаў у с. Старыкава Дзмітраўскага пав. Восенню 1915 мабілізаваны ў армію, знаходзіўся ў Маскве. Пасля сканчэння Аляксандраўскага ваеннага вучылішча ў званні прапаршчыка служыў у запасным палку ў г. Пярмі, дзе ў пачатку 1917 атрымаў чын падпаручніка. Летам 1917 накіраваны на Румынскі фронт. Кастрычніцкую рэвалюцыю сустрэў у г. Абаяні Курскай губ., дзе знаходзілася яго жонка Марыя Дзмітрыеўна. Паводле дэкрэта Савецкай улады ў 1918 Я.Колас як настаўнік вызвалены ад вайсковай службы. Педагагічную дзейнасць працягваў у в. Малыя Крукі, недалёка ад Абаяні Курскай губ., у в. Ліпавец Вышне-Рэутчанскай вол. У 1920 пераехаў у Абаянь, дзе быў школьным інспектарам. У 1921 паводле выкліку ўрада БССР Я.Колас вярнуўся ў Мінск, працаваў у Навукова-тэрміналагічнай камісіі Народнага камісарыята асветы (НКА), а з 1922 — у літаратурнай камісіі па збіранні вуснай народнай творчасці Інстытута беларускай культуры. Выкладаў у Беларускім педагагічным тэхнікуме. Па даручэнні Наркамата асветы БССР чытаў лекцыі па граматыцы і методыцы выкладання беларускай мовы на настаўніцкіх педагагічных курсах у Слуцку (1923). У тым жа годзе зацверджаны выкладчыкам беларускай мовы БДУ. Нягледзячы на такое прызнанне, у 1925 у яго быў праведзены вобыск, а затым і допыт у сувязі з т.зв. «лістападаўскай справай» на Случчыне. У 1927 Я.Колас абраны правадзейным членам Таварыства аматараў расійскай славеснасці пры Маскоўскім універсітэце. У студзені 1929 ён стаў членам Прэзідыума і віцэ-прэзідэнтам АН БССР, створанай на базе Інстытута беларускай культуры. Прымаў удзел у рабоце Першага Усебеларускага з'езда савецкіх пісьменнікаў і Першага з'езда савецкіх пісьменнікаў, дзе яго абралі ў кіруючыя органы СП БССР і СССР не без супраціўлення ўлад (для таго, каб Я.Колас быў выбраны дэлегатам, а затым і членам прэзідыума 1-га з'езда СП СССР спатрэбілася заступніцтва М.Горкага і рэдактара «Известий» І.Гронскага). Як грамадскі дзеяч у складзе дэлегацыі СССР выязджаў у 1935 у Парыж на Сусветны кангрэс абароны культуры, дзе выступіў з прамовай. У 30-я гады вульгарызатарская крытыка беспадстаўна абвінаваціла Я.Коласа ў нацдэмаўшчыне, у прапагандзе ідэй бяскласавасці беларускай нацыі, знаходзіла ў яго творах ідэалізацыю кулацтва, хутарской гаспадаркі, апяванне месіянскай ролі інтэлігенцыі. Сваякі паэта — Язэп Лёсік, дзядзька па матчынай лініі, Аляксандр Дзмітравіч, родны брат Марыі Дзмітраўны, — былі арыштаваны і рэпрэсіраваны. На Я.Коласа і Я.Купалу, першых у спісе дзеячаў літаратуры і мастацтва, таксама былі заведзены справы на арышт ў 1937. Іх выклікалі на допыты. 6 лютага 1938 у доме Я.Коласа шукалі зброю, пісьменніка прымусілі ўзняць рукі і стаць тварам да сцяны. Пагражаў арышт. Але пасля сустрэчы першага сакратара ЦК КП(б)Б П.Панамарэнкі і І.Сталіна пытанне аб арышце было знята. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны Я.Колас пераехаў з Мінска ў Клязьму, а ў жніўні 1941 — у Ташкент. У ліпені 1941 быў надрукаваны зварот Я.Купалы і Я.Коласа «Беларускаму народу», у якім прагучаў заклік да змагання супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У час вайны Я.Колас займаўся творчай, навуковай і грамадскай працай: удзельнічаў у рабоце АН БССР, Усеславянскага антыфашысцкага камітэта (Масква), сустракаўся з воінамі Савецкай арміі, партызанамі, выступаў з публіцыстычнымі артыкуламі ў перыядычным друку, па радыё. Пасля вайны ён вярнуўся ў Мінск, вёў вялікую грамадскую і навукова-арганізацыйную работу.

Творчасць Я.Коласа ўзрастала на лепшых традыцыях нацыянальнай літаратуры, на багатай спадчыне вуснай народнай творчасці і адначасова пад уплывам прагрэсіўных прадстаўнікоў рускай, украінскай і сусветнай літаратур. У яго творах знайшлі глыбокае мастацкае адлюстраванне жыццё беларускага народа на пераломных этапах гісторыі, барацьба народных мас за сацыяльнае разняволенне і нацыянальную роўнасць. Я.Колас — класік нацыянальнай літаратуры, стваральнік неўміручых паэтычных шэдэўраў «Новая зямля» і «Сымон-музыка», адзін з заснавальнікаў беларускай мастацкай прозы, беларускага рамана, аўтарытэтны настаўнік некалькіх пакаленняў творчай моладзі, выдатны педагог, вучоны, арганізатар навукі, дзяржаўны і культурны дзеяч. Яго заслуга ў тым, што ён расказаў свету пра беларускі край, пра мужны, свабодалюбівы, гераічны народ, выявіў у мастацкім слове яго сацыяльныя і нацыянальныя памкненні, невычэрпныя духоўныя магчымасці. Пісьменнік прыйшоў у літаратуру на хвалі рэвалюцыйна-вызваленчай барацьбы народных мас супраць прыгнёту і эксплуатацыі. Жыццё і побыт працоўнага селяніна, яго мара аб лепшай будучыні, сацыяльны і нацыянальны ўціск, барацьба сялянства за свае правы — вось галоўны змест твораў Я.Коласа як пісьменніка-рэаліста, прадстаўніка рэвалюцыйна-дэмакратыч-

нага кірунку ў беларускай дакастрычніцкай літаратуры, паслядоўнага абаронцы інтарэсаў працоўнага сялянства. Ад імя прыціснутага галечай, абрабаванага селяніна паэт «на грозных межах часаў пераходных» смела звяртаўся да прыгнятальнікаў: «Чыімі рукамі вы дабро збіралі? На чые вы слёзы дабрабыт куплялі?». Выяўленая ў дакастрычніцкай творчасці Я.Коласа канцэпцыя народа сцвярджала погляд на чалавека працы не толькі як на ахвяру несправядлівага ладу, але і як на магутную сілу гістарычнага працэсу, стваральніка матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей на зямлі, творцу будучыні. Гэта было сапраўдным наватарствам у беларускай літаратуры. Падобны погляд узбройваў мастакоў слова гістарычным аптымізмам, адкрываў перад імі шырокія магчымасці ў адлюстраванні народнага жыцця. Творы Я.Коласа адыгралі вялікую грамадска-выхаваўчую ролю ў перыяд першай рускай рэвалюцыі і ў гады панавання рэакцыі. Напоўненыя пачуццём гневу і нянавісці, яны клікалі працоўных да згуртаванасці, сцвярджалі непазбежнасць перамогі над прыгнятальнікамі (“Ворагам“, «Наша возьме», «Будзь цвёрды»). Створаны пісьменнікам вобраз героя, перакананага змагара за народную справу, — значнае дасягненне беларускай дарэвалюцыйнай літаратуры. У вершах 1914—16 («Думкі салдата», «Ворагам») паэт асуджаў імперыялістычную вайну, выкрываў яе захопніцкі характар, антынародную скіраванасць, праўдзіва маляваў селяніна, удзельніка вайны, яго псіхалогію. Вядучае месца ў творчасці Я.Коласа займае тэма мастака і мастацтва («Не пытайце, не прасеце...», «Пясняр», «Родныя песні», «Песняру...»). Яна вырашана ў традыцыях перадавой, рэвалюцыйна-дэмакратычнай літаратуры — як тэма самаадданага служэння мастака народу. Як пісьменнік-наватар Я.Колас прыкметна пашырыў ідэйна-тэматычныя, жанравастылявыя межы беларускай нацыянальнай літаратуры, узбагаціў яе новымі ідэямі, матывамі, вобразамі, моўна-выяўленчымі сродкамі, даў яскравыя ўзоры грамадзянскай, інтымнай лірыкі, гумарыстычнага, сатырычнага верша, вершаванага фельетона, байкі, вершаванага апавядання. Бытавое, сацыяльна-псіхалагічнае апавяданне пісьменніка («Соцкі падвёў», «Бунт», «Нёманаў дар», «Малады дубок») — класічны ўзор ў жанры «малой прозы». Тут выразна акрэсленыя вобразы, намаляваны тыповыя характары беларускага селяніна-працаўніка. Яго апавяданні характарызуюцца шырынёй ахопу жыццёвых з'яў, тэматычнай разнастайнасцю, мастацкай дасканаласцю. Напісаныя сакавітай народнай мовай, яны вызначаюцца непаўторным нацыянальным каларытам, першароднай свежасцю. Напоўненыя глыбокім жыццёвым і сацыяльна-філасофскім зместам алегарычныя апавяданні Я.Коласа (цыкл «Казкі жыцця») з'явіліся значным мастацкім адкрыццём у беларускай літаратуры, пашырылі яе ідэйна-тэматычныя і жанрава-стылёвыя гарызонты. Яны прасякнуты роздумам мастака-грамадзяніна, патрыёта, гуманіста аб чалавеку і яго жыццёвым прызначэнні, сэнсе чалавечага існавання. Пісьменнік сцвярджае ідэю вечнасці жыцця, бясконцасць форм яго праяўлення, імкненне чалавека да пазнання таямніц быцця, тайн прыроды («Жывая вада», «Супраць вады», «Даль» і інш.).

Выдатным дасягненнем беларускай паэзіі з'яўляецца пейзажная лірыка Я.Коласа. Яна прасякнута пачуццямі шчырай замілаванасці прыгажосцю роднага краю. Многія вершы аб прыродзе — «На полі вясною», «Усход сонца», «Ноч», «Адлёт жураўлёў», «Белыя валокны», «Лес» — сталі хрэстаматыйнымі, увайшлі ў залаты фонд нацыянальнай літаратуры. Паэт па-майстэрску стварыў пластычныя, аб'ёмныя, зрокава адчувальныя малюнкі беларускай прыроды.

Я.Колас творча прадоўжыў рэалістычныя традыцыі нацыянальнай літаратуры, узбагаціў метад крытычнага рэалізму вопытам рэвалюцыйнай барацьбы шырокіх мас за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Глыбокае і змястоўнае напаўненне атрымала катэгорыя народнасці ў паэзіі і прозе Я.Коласа. Пісьменнік узняў беларускае слова на ўзровень сталага мастацтва, паставіўшы яго побач з развітымі літаратурамі свету, і ў гэтым яго вялікая заслуга.

Гады рэвалюцыі — адзін з найбольш складаных, трагічных перыядаў у жыцці і творчасці Я.Коласа. Жахлівыя разбурэнні, незлічоныя людскія ахвяры, якімі суправаджалася Кастрычніцкая рэвалюцыя і якія паэт бачыў на ўласныя вочы, выклікалі яго рашучае асуджэнне і пратэст. Мастак-гуманіст не мог прыняць рэвалюцыю, якая дзеля гіпатэтычнай светлай будучыні знішчала найвялікшую каштоўнасць — чалавека. У «крывавым віры» гінулі маральныя набыткі, выпрацаваныя чалавецтвам за многія стагоддзі існавання. Паэма «Сымон-музыка» (1911—18) з асаблівай яскравасцю выявіла псіхалагічны стан паэта, які ўсведамляў і асабістую адказнасць за трагічныя падзеі, выкліканыя рэвалюцыяй, бо і яго паэтычнае слова рыхтавала рэвалюцыйны выбух. але аказалася, што галоўным героем часу стаў не разняволены рэвалюцыяй свабодны чалавек, міласэрны і спагадлівы да чужога болю і пакутаў, а «чалавек з ружжом», якому зброя замяніла закон і маральныя нормы, а класавая нянавісць, прага помсты сталі вызначальнымі матывамі дзейнасці. Ачышчальная бура-навальніца, якую клікаў пясняр народнай долі («Грымні ж ты, бура, ды грымні дужэй» — верш «Будзе навальніца», 1912), вылівалася ў акт рабаўніцтва і гвалту. Не жадаючы даць маральнае апраўданне жорсткай, крывавай, несправядлівай рэвалюцыі, Я.Колас пакідае свайго героя-музыку на могілках, дзе пахавана яго дзяўчына Ганна — сімвал дабрыні і прыгажосці, жывое ўвасабленне маці-Беларусі, увасабленне няспраўджаных ідэалаў мастака. Сымон-музыка, які марыў пра ўсясветнае брацтва, пра ўсталяванне чалавечай дабрыні, міру і згоды, у знак пратэсту супраць жорсткасці, прымусу, беззаконня і пагарды да чалавечай асобы выключаецца з жыцця, засынае сімвалічным сном («Ты ачнешся ў жыцці новым песні-думкі дапяваць») побач з Ганнай.

Нешматлікасць твораў пісьменніка перыяду 1917—18 яскрава адлюстроўвала сутнасць яго грамадзянскай мастакоўскай пазіцыі, ягонага стаўлення да сацыялістычнай рэвалюцыі. У вершах 1919—21 (“На чужыне“, «Крыж», «Цені-страх», «Звон шыбаў»), у аповесці «Пад Новы год» (1922) паэт праўдзіва раскрываў разбуральныя вынікі ўздзеяння рэвалюцыі на чалавека, перадаваў яго разгубленасці і пачуццё страху. Трывожны звон шыбаў успрымаецца героем аднайменнага верша то як выява

жалобы, гневу, то як знак, «што згубілі мы дарогу» — да святла, праўды і ісціны.

Пасля звароту на Беларусь (май 1921) пачынаецца новы, вельмі плённы перыяд літаратурна-мастацкай і грамадска-культурнай дзейнасці Я.Коласа. Але пералом у светаадчуванні песняра адбыўся не адразу. Тэматыка напісаных і апублікаваных ім у 1921—23 гг. твораў у аснове сваёй скіравана да мінулага: было створана дванаццаць новых раздзелаў паэмы «Новая зямля», аповесць «У палескай глушы», падрыхтаваны і выданы зборнікі «Казкі жыцця» і «Водгулле». Я.Колас устрымліваўся ад аператыўнага водгуку на падзеі новага часу, не падзяляў пазіцыю тых пісьменнікаў, хто бяздумна ўслаўляў новую ўладу.

Паэма «Новая зямля» (1911—23), ідэйная і жанравая задума якой была істотна пераасэнсавана і паглыблена, стала этапнай з'явай у творчасці Я.Коласа і ўсёй беларускай літаратуры. Тут з вялікай сілай мастацкага абагульнення адлюстраваны карэнныя сацыяльныя супярэчнасці канца 19 ст., намалявана шырокая эпічная панарама народнага жыцця, створаны тыповыя, непаўторныя характары, раскрыта духоўная веліч, маральная прыгажосць чалавека працы, яго спрадвечная мара аб вольным шчаслівым жыцці, выяўлена імкненне стаць гаспадаром на ўласнай зямлі. Паэтызацыя працы, эстэтызацыя сялянскага побыту, услаўленне чалавека-працаўніка, носьбіта лепшых рыс народнага, нацыянальнага характару — наватарская рыса паэмы. У 30-я і пазнейшыя гады, калі пераважная большасць савецкіх пісьменнікаў выкрывала т.зв. дробнаўласніцкія інстынкты селяніна, індывідуалістычную мараль, развенчвала яго кулацкія памкненні, Я.Колас паэмай «Новая зямля» з гонарам бараніў аўтарытэт прыгожага пісьменства, годнасць мастака як выразніка інтарэсаў працоўнага сялянства. «Новая зямля» ўвайшла ў свядомасць чытача як найвыдатнейшы твор нацыянальнай літаратуры, з'ява нацыянальнай культуры, як паэтычная энцыклапедыя жыцця беларускага народа на новым этапе яго гістарычнага развіцця. Яна адыграла велізарную ролю ў сцвярджэнні прынцыпаў рэалізму, народнасці, у станаўленні ліра-эпічнай паэмы і празаічнага рамана. У 1923—24 Я.Колас істотна перапрацаваў паэму «Сымон-музыка» (тэкст не захаваўся; рукапіс украдзены ў час вяртання паэта з Кіславодска ўлетку 1924). У 1924—25 была створана трэцяя, канчатковая рэдакцыя, па сутнасці новы твор. З разгортваннем працэсу беларусізацыі аўтар «Сымона-музыкі» абуджае героя ад сну, дае яму магчымасць чароўным граннем вярнуць да жыцця Ганну і накіроўвае іх у шырокі свет да людзей. На пэўны час Я.Колас паверыў у магчымасць адраджэння роднага краю, нацыянальнай культуры, у магчымасць пабудовы суверэннай, незалежнай Беларусі. Паэма прысвечана беларускай моладзі, якой гісторыяй прызначана было будаваць новае жыццё, свабодную краіну. Вера пісьменніка-грамадзяніна, мастака-гуманіста ў шчаслівую будучыню Беларусі і дапамагла нараджэнню канчатковай рэдакцыі паэмы — твора паліфанічнага гучання, дзе драматычныя, трагічныя матывы перапляліся з жыццесцвярджальнымі, аптымістычнымі. Зацятая барацьба бальшавіцкай партыі с рэлігіяй перашкодзіла Я.Коласу выкарыстаць шэраг тэм і матываў першай рэдакцыі, у прыватнасці, тэму маштака як прарока, як носьбіта боскай сілы. Але гэты і іншыя матывы, напрыклад, думка аб неабходнасці ўсеагульнай згоды, ідэя дабрыні, міласэрнасці, чалавекалюбства як арганічнай якасці сапраўднага мастацтва, знайшлі сваё ўскоснае, апасродкаванае выяўленне ў апошняй рэдакцыі. Тое, што Сымон здолеў сілай свайго кахання ўдыхнуць жыццё ў безнадзейна хворую Ганну, сведчыла пра бязмежныя магчымасці мастацтва, калі яно сваімі каранямі звязана з народным жыццём, прасякнута ідэяй абароны чалавека. У лірыка-філасофскіх, алегарычных уступах да адпаведных раздзелаў новай рэдакцыі паэт іншасказальна выказаў шэраг глыбокіх думак, якія былі ў рэдакцыі 1911—18. Так, у алегорыі пра змаганне марозу і вады праводзіцца ідэя неабходнасці «згоды, змірэння», стваральнай працы як асновы будаўніцтва суверэннай дзяржавы. Паэма «Сымон-музыка» сведчыць аб шырыні творчага дыяпазону Я.Коласа, аб арыгінальнасці, адметнасці яго таленту і вялікіх творчых магчымасцях як паэта-лірыка. Яна ўражвае рознастайнасцю вобразна-выяўленчых сродкаў, гармоніяй зместу і формы, багаццем рытмікі, дасканалай інструментоўкай паэтычнага радка, мілагучнасцю, напеўнасцю верша, удалым выкарыстаннем фальклорнай паэтыкі. Паэма аказала вялікі ўплыў на развіццё беларускай лірыкі і ліра-эпічнай паэмы, раскрыла вялікія магчымасці рамантычных форм і сродкаў адлюстравання рэчаіснасці.

Жыццё беларускага народа напярэдадні і ў гады першай буржуазнай рэвалюцыі, пошукі перадавой інтэлігенцыяй шляхоў да народа, яе роля ў фарміраванні сацыяльна-палітычных поглядаў сялянства знайшлі сваё глыбокае мастацкае ўвасабленне ў першых двух кнігах «Палескіх аповесцей», якія пазней увайшлі ў трылогію «На ростанях» (1921—54). Аповесці — найбольш значныя творы беларускай мастацкай прозы. У іх яскрава выявіліся сталасць мастацкай думкі пісьменніка, глыбокае разуменне ім ролі народных мас і інтэлігенцыі ў рэвалюцыйным працэсе. «Палескія аповесці» вызначаюцца высокім узроўнем псіхалагічнага майстэрства, здольнасцю аўтара раскрываць дыялектыку пачуццяў герояў, паказваць чалавека ў адзінстве яго грамадскай дзейнасці і асабістага жыцця. Для твораў характэрна шчырасць, даверлівасць аўтарскай інтанацыі. Аповесці маюць выразны біяграфічны характар. Лёс многіх герояў, іх памкненні былі блізкімі і зразумелымі аўтару. Я.Колас сцвердзіў плённасць арыентацыі на актуальную сацыяльную праблематыку, на гістарычна праўдзівае, рэалістычна канкрэтнае, аналітычна заглыбленае адлюстраванне жыцця народа, канкрэтнай чалавечай асобы.

Да значных мастацкіх здабыткаў беларускай літаратуры пачатку і сярэдзіны 20-х г. адносяцца і апавяданні «Крывавы вір», «Пракурор», «Адукацыя», «Туды, на Нёман», «У «калектыве» пана Тарбецкага», «Хатка над балоткам», «На святой зямлі», алегарычна-філасофскія творы з цыкла «Казкі жыцця». Гэтыя творы працягвалі лепшыя традыцыі дакастрычніцкай «малай прозы», яны ўзбагацілі нацыянальнае мастацтва новымі эстэтычнымі адкрыццямі.

Але творча-актыўны, аптымістычны стан Я.Коласа працягваўся нядоўга. Яго ілюзіі адносна светлай будучыні, росквіту нацыянальнай культуры і адраджэння бацькаўшчыны пачалі хутка развей-

вацца. Жорская рэчаіснасць, канкрэтная практыка сацыялістычнага будаўніцтва рашуча ацвярэжвалі песняра. Менавіта з канца 20-х — пач. 30-х г. Я.Колас трапляе ў безвыхаднае становішча, цалкам залежнае ад ідэалагічных установак камуністычнай партыі і грамадска-дзяржаўных структур таталітарнай сістэмы. Жахі прымусовай калектывізацыі, расслаіванне сялянства разбурэнне традыцыйнага ўкладу вёскі, татальны кантроль над усімі сродкамі грамадска-палітычнага, духоўнага жыцця, фактычная забарона свабоды слова і волевыяўлення, масавыя рэпрэсіі супраць нацыянальнай інтэлігенцыі — усё гэта негатыўна паўплывала на Я.Коласа як творцу. Ёе аказаўся сапраўдным заложнікам антыгуманнай сістэмы, міжвольным прапагандыстам сацыялістычнага рэалізму, які быў зводам палітычных патрабаванняў, але выдаваўся за эстэтычную катэгорыю. Асабліва вялікія творчыя страты Коласмастак панёс у вершаваных формах. Вершы «Калгаснае», «Краіне Саветаў», «На верту», «Будзьце чуйны», «Памяці С.М.Кірава», «Калгасу «Слабада», «Шчаслівая хвіліна», «Раскуты Праметэй», «Пераможны май», «Радасць», «Да выбараў», «Май», «Майскае свята» ідэалізуюць тагачасную рэчаіснасць, малююць яе ў ружовых, светлых фарбах. Гэта — тыповы ўзор гімнічнай паэзіі, далёкай ад праўды жыцця і праўды мастацтва. Шмат у творах паэта дэкларатыўнасці, рыторыкі, схематызму. Рэальныя супярэчнасці падменены тут імітацыяй канфлікту.

Праўда, у некаторых творах, пераважна буйной сюжэтнай формы, пры ўважлівым чытанні можна адчуць праявы ўнутранага супраціўлення мастака таталітарнаму рэжыму. Ідэалагічна вытрыманыя заклікі, вершы ў гонар кастрычніцкіх гадавін давалі паэту магчымасць ускосна, праз падтэкст выказать сваю асабістую пазіцыю. Адзін з такіх эфектыўных сродкаў — даць магчымасць выказацца антыподам станоўчых герояў. Гэты прыём пісьменнік паспяхова выкарыстаў у аповесці «Адшчапенец», у паэме «На шляхах волі».

У гады Айчыннай вайны змест і танальнасць твораў Я.Коласа прыкметна змянілася. На першым плане ў іх гераізм і патрыятызм народа, услаўленне мужнасці воіна-чырвонаармейца («Народу-барацьбіту», «Душою і сэрцам мы з вамі, героі»), партызанская барацьба на часова захопленай ворагам зямлі («Над магілай партызана», «Бацьку Мінаю»), выкрыццё фашызму і іх прыслужнікаў. Аднак тэма мужнасці, гераізму не атрымала глыбокага адлюстравання у творчасці паэта. Многім яго вершам шкодзіць зададзенасць, афіцыйная трактоўка гераікі. Павярхоўнасць, схематызм вобразаў асабліва ўласцівы паэмам «Суд у лесе», «Адплата», апавяданням. Высокімі мастацкімі якасцямі вызначаюцца некаторыя вершы, прысвечаныя непасрэдна Беларусі, у прыватнасці пейзажная лірыка. Глыбіня паэтычнай думкі арганічна спалучаецца тут з высокай эмацыянальнай напружанасцю і гранічнай шчырасцю выяўлення аўтарскіх пачуццяў любві да роднай зямлі, нянавісці да ворага, веры ў непазбежнасць перамогі («Голас зямлі»). Як значнае творчае дасягненне беларускай паэзіі неабходна разглядаць таксама інтымную лірыку паэта гэтых гадоў. У многіх вершах пачуцці асабістага характару, роздум аб жыцці і смерці пераплятаюцца з грамадзянскімі, патрыятычнымі пачуццямі («Мае мары»).

У пасляваенныя гады Я.Колас закончыў паэму «Рыбакова хата» (1939, 1946—47), працаваў над трэцяй кнігай трылогіі, пісаў новыя апавяданні з цыкла «Казкі жыцця», вершамі і публіцыстычнымі артыкуламі адгукаўся на падзеі грамадска-палітычнага, міжнароднага жыцця («Роднаму краю і народу», «Закон Трумэна і Ко»), прымаў актыўны ўдзел у рэдагаванні перакладу «Новай зямлі» і «Сымона-музыкі» на рускую мову. Як крытык Я.Колас уздымаў надзённыя пытанні сувязі мастака з рэчаіснасцю, дзейснасці мастацкага слова, ролі і значэння крытыкі ў літаратурным працэсе, выкладання літаратуры ў школе, эстэтычнага выхавання маладога пакалення. Я.Колас аўтар шматлікіх твораў для дзяцей («У старых дубах», «Міхасёвы прыгоды», «Раніца жыцця», і інш.). Творчасць Я.Коласа была цесна звязана з развіццём беларускай педагагічнай думкі. Пісьменнік лічыў, што родная мова, літаратура, гісторыя — дзейсныя сродкі фарміравання маральных, патрыятычных пачуццяў школьнікаў, выхавання ў іх любві да «роднага слова — першай крыніцы, праз якую мы пазнаем акаляючы нас свет». Я.Колас шырока вядомы і як перакладчык на беларускую мову твораў А.Пушкіна, М.Лермантава, Т.Шаўчэнкі, Р.Тагора, А.Міцкевіча, П.Тычыны. Ён быў рэдактарам шматлікіх выданняў, анталогій. Яго творы таксама перакладзены на многія замежныя мовы.

Драматычныя творы Я.Коласа маюць даволі багатае сцэнічнае жыццё. П'есы паводле яго апавяданняў, аповесцей, трылогіі былі пастаўлены на сцэнах шматлікіх тэатраў. Жыццё і творчасць Я.Коласа пакладзены ў аснову дакументальных і мастацкіх фільмаў: «Народны паэт» (сцэнарый Ю.Тарыча, М.Лужаніна. Беларусьфільм, 1952), «Якуб Колас» (сцэнарый А.Звонака. Беларусьфільм, 1962), «Дзядзька Якуб» (сцэнарый В.Адамчыка, А.Вялюгіна. Беларусьфільм, 1982), «Песня вясны» — экранізацыя аповесці «На прасторах жыцця» (сцэнарый В.Гардзіна і Л.Ляжневіча, пастаноўка В.Гардзіна, 1929) і інш. На словы Я.Коласа напісана шмат музычных твораў, якія выходзілі асобнымі зборнікамі. Опера «Новая зямля» па аднайменнай паэме Я.Коласа напісана Ю.Семянякам, «У пушчах Палесся» (паводле аповесці «Дрыгва») — А.Багатыровым. Коласаўскую паэзію для напісання песень выкарыстоўвалі кампазітары М.Чуркін («Краска», «Вясна», рамансы «Маёй каханцы», «Гусі...»), А.Туранкоў (рамансы «Усход сонца», «Дудка», песні «Радасць»), Я.Цікоцкі (рамансы «Каманіну, Малакову, Сляпнёву», «Пераможны май») і інш. Вобраз пісьменніка ўвасобілі ў творах выяўленчага мастацтва Л.Асядоўскі, І.Ахрэмчык, М.Будавей, Ю.Герасіменка, Т.Ігнаценка, Я.Кулік, М.Купава, Я.Раманоўскі, І.Рэй, У.Стальмашонак, В.Шаранговіч, Л.Шчамялёў, А.Яр-Краўчанка і інш.

Я.Колас быў вядомым грамадскім дзеячам: ён выбіраўся членам ЦК на XX—XXII з'ездах КПБ. Кандыдат у члены ЦВК БССР у 1927—29, член ЦВК у 1929—31, 1935—38. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1946—56, Вярхоўнага Савета БССР у 1938—56, член усесаюзнага Камітэта па Дзяржаўных прэміях у галіне літаратуры і мастацтва. Абіраўся віцэ-старшынёй Усеславянскага камітэта, старшынёй Беларускага і членам Савецкага камітэта абароны міру. Узнагароджаны пяццю ордэнамі Леніна, ордэнамі Чырвонага сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Імя народнага песняра з любоўю ўшаноўвае беларускі народ. У 1959—65 прысуджалася літаратурная, а з 1971 раз у два гады прысуджаецца Дзяржаўная прэмія імя Я.Коласа за лепшыя празаічныя

творы і літаратуразнаўчыя працы. Яго імя прысвоена Мінскаму паліграфічнаму камбінату, цеплаходу Дунайскага параходства, Інстытуту мовазнаўства АН Беларусі, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы АН Беларусі, Віцебскаму драматычнаму тэатру, СШ № 44 Мінска, Мікалаеўшчынскай СШ Стаўбцоўскага р-на, школам-інтэрнатам Брэста, Нясвіжа Мінскай вобл., Сянкевіцкай СШ Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл., Цэнтральнай гарадской бібліятэцы Слоніма Гродзенскай вобл., бібліятэцы № 7 Мінска, калгасам, плошчам і вуліцам рэспублікі. Помнікі пісьменніку пастаўлены на плошчы Мінска, якая носіць яго імя, на радзіме ў в. Мікалаеўшчына, а таксама ў г. Навагрудку Гродзенскай вобл., в. Плоскае Талачынскага р-на Віцебскай вобл. Устаноўлены мемарыяльныя дошкі на будынках, у якіх ён жыў ці працаваў. У Мінску існуе Літаратурны музей Я.Коласа, у Акінчыцах, Смольні і Альбуці — яго філіялы. Грамадскія Літаратурныя музеі створаны ў Люсінскай СШ Ганцавіцкага р-на, Пінкавіцкай СШ Пінскага р-на Брэсцкай вобл., Бараўлянскай СШ Мінскага р-на, Верхменскай СШ Смалявіцкага р-на, Мікалаеўшчынскай СШ Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. У пакоі, дзе Я.Колас працаваў як віцэ-прэзідэнт АН БССР, адноўлены мемарыяльны кабінет. Партрэт пісьменніка змяшчаўся на прысвечаных яму паштовых марках і паштоўках, на манеце, выпушчанай да 110-годдзя з дня яго нараджэння.

М.Д.Мацюх, М.І.Мушынскі.

Бібліяграфія

1.1.

Зб. тв.: У 2 т. Т. 1. Вып. 1. Вершы 1904—22 гг. Мн., 1928. Рэц.: Барычэўскі А. // Полымя. 1928. № 10. Т. 1. Вып. 2. Вершы 1907—27 гг. Мн., 1928. Рэц.: А. // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел.». 1928. № 20; Плашчынскі Я. // Узвышша. 1929. № 1. Т. 2. Апавяданні вершам 1907—1927 гг. Мн., 1929. Рэц.: Аляхновіч М. // Маладняк. 1930. № 1; Сярэдні Ф. // Чырв. Бел. 1930. № 2.

Зб. тв.: У 7 т. Мн., 1952—54. Т. 1. Вершы. Апавяданні вершам: (1904—17). Мн., 1952. Т. 2. Вершы. Апавяданні вершам: (1917—52). Мн., 1952. Т. 3. Апавяданні. Мн., 1952. Т. 4. Новая зямля; Сымон-музыка. Мн., 1952. Т. 5. У палескай глушы; У глыбі Палесся; На ростанях: Трылогія. Мн., 1954. Рэц.: Барсток М. Повесть о судьбах народа и его интеллигенции // Сов. Бел. 1954. 3 нояб.; Пшыркоў Ю. Разам з народам // ЛіМ. 1954. 6 ліст.; Цікоцкі М. Яскравыя старонкі народнага жыцця: Аповесць Якуба Коласа «На ростанях» // Мін. праўда. 1954. 8 снеж.; Шаблінскі П. Трэцяя частка трылогіі Якуба Коласа // Віцеб. рабочы. 1954. 27 кастр. Т. 6. На прасторах жыцця; Адшчапенец; Дрыгва: Аповесці. Мн., 1952. Т. 7. Рыбакова хата; Суд у лесе; Адплата: (Паэмы). Мн., 1952. Рэц.: Бурносаў В. Выдатны ўклад у скарбніцу савецкай літаратуры: Да выхаду сямітомніка Зб. твораў Якуба Коласа // ЛіМ. 1953. 1 студз.; Пшыркоў Ю. Сямітомнік Якуба Коласа // Беларусь. 1953. № 3.

Зб. тв.: У 12 т. Мн., 1961—64. Т. 1. Вершы: 1898—17. Мн., 1961. Т. 2. Вершы: 1917—56. Мн., 1962. Т. 3. Апавяданні вершам, вершы, вершаваныя казкі і паэмы для дзяцей. Мн., 1961. Т. 4. Апавяданні: 1906—17. Мн., 1962. Т. 5. Апавяданні паслякастрычніцкага перыяду, «Казкі жыцця», народныя казкі ў апрацоўцы Я.Коласа. Мн., 1962. Т. 6. Новая зямля; Сымон-музыка: Паэмы. Мн., 1962. Т. 7. На прасторах жыцця; Адшчапенец; Дрыгва: Аповесці. Мн., 1963. Т. 8. Рыбакова хата; Суд у лесе; Адплата: Паэмы. Мн., 1963. Т. 9. Трылогія «На ростанях». Мн., 1963. Т. 10. П'есы; На шляхах волі: Паэма. Мн., 1964. Т. 11. Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы: 1906—56. Мн., 1964. Т. 12. Пісьмы; Дзённікі; Летапіс жыцця і творчасці. Мн., 1964. Рэц.: Базарэвіч М. Спадчына песняра // Беларусь. 1965. № 8; Броўка П., Барысенка В., Пшыркоў Ю. Спадчына паэта — багацце народа: Да выхаду ў свет Зб. твораў Я.Коласа ў 12-ці тамах // ЛіМ. 1965. 19 лют.; Жигоцкий Н. Двенадцать томов Якуба Коласа // Неман. 1965. № 4; Яго ж. Непрочитанная поэма // Знамя юности. 1962. 23 окт.; Яго ж. Нерушимое единство // Радуга. 1965. № 7; Яго ж. Щирий друг України // Рад. Волинь. 1965. 11 лип.; Яго ж. Малавядомая паэма // Калг. праўда. 1962. 25 мая; Яго ж. Недапісаная паэма // Чырв. змена. 1965. 4 ліп.; Яго ж. Спадчына народнага паэта // Голас Радзімы. 1965. № 31; Наст. газ. 1965. 17 ліст.; Хромчанка К. Першае навуковае выданне: Да выхаду Зб. твораў Я.Коласа ў 12-ці тамах // ЛіМ. 1965. 12 сак.

Зб. тв.: У 14 т. Мн., 1972—78. Т. 1. Вершы: 1898—1917. Мн., 1972. Т. 2. Вершы: 1917—56. Мн., 1972. Т. 3. Апавяданні вершам, вершы, вершаваныя казкі, паэмы для дзяцей і народныя казкі ў апрацоўцы Я.Коласа. Мн., 1973. Т. 4. Апавяданні: 1906—17. Мн., 1973. Т. 5. Апавяданні паслякастрычніцкага перыяду і «Казкі жыцця». Мн., 1973. Т. 6. Новая зямля; Сымон-музыка: Паэмы. Мн., 1974. Т. 7. Рыбакова хата; Суд у лесе; Адплата: Паэмы. Мн., 1974. Т. 8. На прасторах жыцця; Адшчапенец; Дрыгва: Аповесці. Мн., 1975. Т. 9. Трылогія «На ростанях». Мн., 1975. Т. 10. Забастоўшчыкі; У пушчах Палесся; Вайна вайне: П'есы; На шляхах волі: Паэма; Пераклады. Мн., 1976. Т. 11. Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы: 1917—46. Мн., 1976. Т. 12. Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы: 1947—56. Мн., 1976. Т. 13. Пісьмы: 1908—49. Мн., 1977. Т. 14. Пісьмы: 1950—56. Мн., 1978. Рэц.: Жигоцкий Н. Новое издание Коласа // Неман. 1978. № 11; Яго ж. Новое издание наследия поэта // Вопр. лит. 1979. № 3; Яго ж. Выданне спадчыны паэта // Беларусь. 1978. № 4; Яго ж. ...І застаецца назаўсёды // Наст. газ. 1979. 6 студз.; Яго ж. Спадчына паэта // Чырв. змена. 1978. 11 чэрв.

Выбр. апавяданні. Мн., 1926. (Сялянская б-ка) / Пад. псеўд. Т.Гушча.

Выбр. тв.: Угодкавае выданне. Вільня, 1927. Рэц.: Аршэнік М. // Полымя. 1928. № 2.

Выбр. тв.: Аповесць і апавяданні. Мн., 1935. (Школьная серыя).

Выбр. тв.: Вершы і паэмы. Мн., 1936.

Выбр. апавяданні. Мн., 1937.

Выбр. тв.: Вершы. Мн., 1938.

Выбр. тв. Т. 3. Аповесці і апавяданні. Мн., 1939.

Выбр. вершы. Мн., 1948. (Б-ка школьніка).

З майго летапісу: Выбр. вершы. Мн., 1967.

Вершы. Мн., 1971. (Б-ка бел. паэзіі).

Выбр. вершы. Мн., 1980.

Дрыгва: Аповесць і апавяданні. Мн., 1981. (Б-чка бел. прозы).

Выбранае. Мн., 1982. Рэц.: Міхалевіч Д. // ЛіМ. 1983. 11 ліст.

1.2.

Другое чытанне для дзяцей беларусаў. Напісаў Якуб Колас. Перагледзеў і прадмову прыпісаў Л.Сеўрук. Пб., 1909 / У сааўт. з інш.

Песні-жальбы. Вільня, 1910. Рэц.: Бульба. Песні жальбы... // Н.н. 1910. 30 вер.; Гай П. // Рада. 1910. 21 жовт.; Гермайзе О. Якуб Колас: Песьні жальбы // Укр. хата. 1911. № 1; Евшан М. [Федюшка М.] Якуб Колас: Песні жальбы // Літ.-наук. вістник (Львоў). 1911. № 1; Свобода (Нью-Йорк). 1911. 26 січ.; Щурат В. // Неділя. 1911. 1 січ. Факс. выд. Мн., 1982.

Апавяданні. Вільня, 1912 / Пад псеўд. Т.Гушча. Рэц.: І.М. Мае ўвагі // Н.н. 1912. 9 жн.

Batrak: Apawiadańnie z žyćcia palešukoŭ. Pb., 1913.

Нёманаў дар. Пб., 1913 / Пад псеўд. Т.Гушча.

Прапаў чалавек; Паслушная жонка; Грушы-сапяжанкі. Пб., 1913.

Тоўстае палена. Пб., 1913.

Родныя з'явы. Вільня, 1914 / Пад псеўд. Т.Гушча. Рэц.: Власт // Н.н. 1914. 16 кастр.

Чарка ўсё на свеце робіць: 1-ы акт п'есы «Антось Лата». Б.м., 1916.

Сцэнічныя творы. Мн., 1917 / Пад псеўд. Т.Гушча. Рэц.: Лёсік Я. «Антось Лата»: «Сцэнічныя творы» Тараса Гушчы // Вольная Беларусь. 1917. 8 снеж.

Сымон Музыка: Паэма. Мн., 1918.

Казкі жыцця: 1907—21 г. Коўна, 1921 / Пад псеўд. Т.Гушча. Рэц.: Кнігапіс // Бел. вед. 1921. 23 кастр.

Водгулле: Вершы. Мн., 1922. Рэц.: П.Л. // Адраджэнне. 1922. Сш. 1; Т.Г. [Грыб Т.] // Перавясла. 1924. № 2.

Новая зямля: Паэма. Мн., 1923. Рэц.: Байкоў М. Новая беларуская паэма: Якуб Колас. «Новая зямля» // Полымя. 1923. № 5—6; 2 выд. Мн., 1927. Рэц.: Fr.Hr. [Грышкевіч Ф.] // Slovanský přehled. 1930. T. 22; 3 выд. Мн., 1934. Рэц.: Ларчанка М. Аб новым выданні «Новай зямлі» Коласа і прадмове паэта // Крытыка-бібліягр. бюлетэнь. 1934. № 7; 4 выд. Мн., 1941; 5 выд. Мн., 1958. Рэц.: Бурносаў В. Пісьменнік і мастак // Полымя. 1959. № 6.

У палескай глушы: Аповесць. Вільня. 1923 / Пад псеўд. Т.Гушча. Рэц.: Г...к. // Новае жыццё. 1923. 14 мая; Крывіч. 1923. № 4; 2 выд. Мн., 1927; 3 выд. Мн., 1928.

Крок за крокам: Апавяданні. Мн., 1925 / Пад псеўд. Т.Гушча. Рэц.: С.П. // Полымя. 1925. № 3; 2 выд. Мн., 1928.

На рубяжы: Апавяданні. Мн., 1925 / Пад псеўд. Т.Гушча; 2 выд. Мн., 1928.

Першыя крокі: Апавяданні. Мн., 1925 [1924] / Пад псеўд. Т.Гушча.

Сымон-Музыка: Паэма. Мн., 1925. Рэц.: Бабарэка А. Паэма «Сымон Музыка» Якуба Коласа // Узвышша. 1927. № 3; Р. [Ракуцька(?)] // Сав. Бел. 1925. 25 кастр.; Улідзе [Дзяржынскі У] // Полымя. 1925. № 6; Tichý F. // Slovanský přehled. 1926. T. 18; 2 выд. Мн., 1928.

У ціхай вадзе: Зб. апавяданняў. Мн., 1925 / Пад псеўд. Т.Гушча; 2 выд. Мн., 1927; 3 выд. Мн., 1928.

Казкі жыцця: Апавяданні. Мн., 1926. Рэц.: П.Б. // Полымя. 1926. № 5; 2 выд. Мн., 1928. Рэц.: Цвяткоў Л. // Сав. Бел. 1929. 17 лют.

Методыка роднае мовы. Мн., 1926 / Пад прозв. К.Міцкевіч. Рэц.: Асвета. 1926. № 4; Цвяткоў Л. // Полымя. 1926. № 5.

На прасторах жыцця: Аповесць і апавяданні. Мн., 1926 / Пад псеўд. Т.Гушча. Рэц.: Камарук Я. // Полымя. 1927. № 1; Яр // Узвышша. 1927. № 1; 2 выд. Мн., 1928. Рэц.: Замбржыцкі С. «На прасторах жыцця» Тараса Гушчы (Я.Коласа) // Маладняк. 1928. № 8; Чырв. змена. 1929. 22 сак.

Казкі жыцця: 1907—21. Вільня. 1927 / Пад псеўд. Т.Гушча. Рэц.: Sédivý I. // Dom in Svet (Ljubljana). 1928. Let. 41.

Prapaŭ caławiek; Niomanaŭ dar; Toŭsta palena. Wilnia, 1927.

У глыбі Палесся: Аповесць. Мн., 1927 / Пад псеўд. Т.Гушча. Рэц.: Адамовіч А. Што чытаць // Чырв. сейбіт. 1928. № 2; І.В. // Маладняк. 1928. № 4; Улідзе [Дзяржынскі У.] // Полымя. 1928. № 1; 2 выд. Мн., 1930.

Нёманаў дар і іншыя расказы. Вільня, 1928 / Пад псеўд. Т.Гушча.

Новая зямля: Паэма. Кн. 1—3. Вільня, 1928—29. Кн. 1. Вільня, 1928. Кн. 2. Вільня, 1928. Кн. 3. Вільня, 1929.

Сымон-музыка: Паэма. Вільня, 1928.

Методыка роднай мовы. Мн., 1930 / Пад прозв. К.Міцкевіч; сааўт. В.Тэпін.

На прасторы жыцця: Аповесць. Мн., 1930. (Мастацкае слова — масам) / Пад псеўд. Т.Гушча.

Новая зямля: Паэма. Вільня, 1931.

У глыбі Палесся: Аповесць. Вільня, 1931 / Пад псеўд. Т.Гушча.

Адшчапенец: Аповесць. Мн., 1932. 2 выд. Мн., 1950. Рэц.: Кніжная паліца // Калг. праўда. 1951. 25 сак.; Кришталь В. Произведение о великом переломе // Гродн. правда. 1952. 13 июня.

У старых дубох; Дзеравеншчына; Злучыліся: Апавяданні для дзяцей. Вільня, 1933 / Пад псеўд. Т.Гушча.

Дрыгва: Аповесць. Мн., 1934; 2 выд. Мн., 1935. Рэц.: Даміленка В. Выдатны твор // Камуніст. 1936. 30 кастр.; Замотин И. Высокий образец художественного реализма: (О повести «Дрыгва») // Рабочий. 1936. 10 февр.; Яго ж. «Дрыгва» // ЛіМ. 1936. 11 кастр.; Кніга аб незабыўных днях // Віцеб. пралетарый. 1936. 15 кастр.; Кучар А. // Лит. учеба. 1935. № 11; Літаратурны мінімум // Чырв. змена. 1935. 23 сак.; 3 выд. Мн., 1936. Рэц.: Мукасей Ю. Пабольш такіх кніг // ЛіМ. 1936. 10 лют.; 4 выд. Мн., 1937; 5 выд. Мн., 1940. Рэц.: Новые книги // Сов. Бел. 1941. 15 мая; 6 выд. Мн., 1946. Рэц.: Кудраўцаў І. Аповесць Якуба Коласа «Дрыгва» // Сав. школа. 1948. № 3; 7 выд. Мн., 1952. (Школьная б-ка); 8 выд. Мн., 1959. Рэц.: Новыя кнігі // Віцеб. рабочы. 1959. 18 сак.

Міхасёвы прыгоды: Паэма для дзяцей. Мн., 1935. Рэц.: Куніцкі С. // Полымя рэвалюцыі. 1936. № 6; Новыя кніжкі для дзяцей // Камуніст. 1936. 1 крас.; Песня аб прыродзе // Піянер Бел. 1936. 3 студз.; Шушкевіч С. «Міхасёвы прыгоды» // ЛіМ. 1935. 28 снеж.; 2 выд. Мн., 1937; 3 выд. Мн., 1947.

Вялікаму Сталіну: Пісьмо народаў Савецкай Беларусі. Мн., 1936 / У сааўт. з інш.

Дванаццаць песень пра нашу непераможную Чырвоную армію, пра яе тварца і натхняцеля вялікага Сталіна, пра яе палкаводца Клімента Варашылава... Мн., 1936 / У сааўт. з інш.

Пісьмо народаў Савецкай Беларусі правадыру працоўных Вялікаму Сталіну. Мн., 1936 / У сааўт. з інш.

Савось-распуснік: Кніжка-верш для дзяцей малодшага ўзросту. Мн., 1936.

Anton Łata: Sceničny twor u 2 aktach; Na darozie žyćcia: Sceničny abrazok u 1 akcie. Wilnia, 1937 / Пад псеўд. Т.Гушча.

Вялікаму Сталіну ад беларускага народа. Мн., 1937 / У сааўт. з інш.

Нашы дні: 1922—36: Вершы. Мн., 1937. Рэц.: Ушакоў А. «Нашы дні» Якуба Коласа // ЛіМ. 1938. 10 жн.

Сцэнічныя творы. Вільня, 1937. (Беларуская тэатральная кніжніца) / Пад. псеўд. Т.Гушча.

Вайна вайне: Драма ў 4-х актах. Мн., 1938.

Радзіме і правадыру: Вершы і песні аб Сталінскай канстытуцыі. Мн., 1938 / У сааўт. з інш.

Рак-вусач: Вершаваная казка для дзяцей. Мн., 1938. 2 выд. Мн., 1956.

Дзед і мядзведзь: Вершы. Мн., 1939. Рэц.: Шарапов А. Макулатурное издание // Сталин. молодежь. 1940. 14 янв.

Каля заставы: Апавяданне. Мн., 1939.

Апавяданні. Мн., 1940. (Масавая б-ка).

Вершы. Мн., 1940. (Школьная б-ка).

Дванаццаць песень... Мн., 1940 / У сааўт. з інш.

Пад Сталінскім сонцам: Вершы 1937—39 гг. Гомель, 1940.

На рэчцы зімой: Верш. Мн., 1941.

Начаткі: [Урывак з паэмы «Новая зямля»]. Мн., 1941.

У старых дубах: Апавяданні. Мн., 1941. Рэц.: Малышаў І. «У старых дубах» // Піянер Бел. 1941. 10 крас.; Новые книги для детей // Сов. Бел. 1941. 4 марта; Фигловская Л. Сборник хороших рассказов // Там жа. 1941. 11 марта; Фінкевіч А. «У старых дубах» // Чырв. звязда. 1941. 29 крас.

Адпомсцім: Вершы. Б.м., 1942.

Да зброі, беларускі народ! Б.м., 1942.

Рыцар Шыкльгрубер: Верш. Б.м., 1942.

Сымон Музыка. Прага, 1942.

Голас зямлі: Вершы. М., 1943.

Суд у лесе: Паэма. М., 1943.

Вершы для дзяцей. Мн., 1945.

Адплата: Паэма. Мн., 1946.

Вершы. Т. 1. Мн., 1946.

Мой дом: (Вершы). Мн., 1946. Рэц.: Новая книга стихов Якуба Коласа «Мой дом» // Сов. Бел. 1947. 13 февр.

Звесткі пра А.Крапачова вельмі скупыя. Быў вайскоўцам у Гомелі і Рагачове. Уваходзіў у Літаратурную арганізацыю Чырвонай Арміі і Флоту (ЛЧАФ). Аўтар нешматлікіх нарысаў, апавяданняў і аповесцей на армейскія тэмы, надрукаваных у альманахах «Літаратурны Гомель» і «Атака», а таксама ў часопісе «Полымя рэвалюцыі» і газеце «Літаратура і мастацтва», для якіх А.Крапачоў, магчыма, сам перакладаў свае творы на беларускую мову. Рэдагаваў альманах «Літаратурны Гомель». Крытыка 30-х гадоў прыхільна пісала пра яго творчасць, адзначала плённасць і сур'ёзнасць працы над абароннай тэматыкай, добрае веданне мінулага і сучаснага становішча Чырвонай Арміі. Найбольш папулярным у той час яго творам было апавяданне «Шахімарданская мячэць», прысвечанае барацьбе Чырвонай Арміі супраць басмачоў. А.Крапачоў паказваў чырвонаармейцаў як мужных і смелых людзей, але яго героям не хапала індывідуалізацыі. Крытыка заўважала кампазіцыйныя вартасці твора, жывасць апісання падзей, тое, што апавяданне «літаральна захоплівае чытача». Па ўсёй верагоднасці, А.Крапачоў быў рэпрэсаваны ў другой палавіне 30-х г.

І.Э.Багдановіч.

1.3.
1934. Шахимарданская мечеть: [Апавяданне] // Літаратурны Гомель. Гомель: Полымя рэвалюцыі. № 5; На пераломе: Урывак з аповесці // ЛіМ. 8 чэрв.
1935. Песок горит: (Очерк) // Атака. Мн. Альманах 4.
1936. Янгі — юль: Апавяданне // Полымя рэвалюцыі. № 9.
1.6.
Літаратурны Гомель // Гомель. 1934 / Рэд. з М.Бугровым, М.Хведаровічам.
2.3.
На беларускай мове. Клімковіч М. Літаратурны Гомель // Палес. праўда. 1934. 12 мая; Я.Ш. «Полымя рэвалюцыі». Кніга пятая. 1934 г. // ЛіМ. 1934. 24 кастр. *Т.М.Махнач.*

КРАПІВА КАНДРАТ

Крапіва Кандрат (сапр. Атраховіч Кандрат Кандратавіч; інш. псеўд. Астапчук, М. Доўгі; 22.2(5.3).1896, в. Нізок Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. — 7.1.1991, Мінск; пахаваны на Усходніх могілках), драматург, паэт, празаік, вучоны, грамадскі дзеяч. Народны пісьменнік Беларусі (1956). Акадэмік АН Беларусі (1950, член-карэспандэнт, 1940), доктар філалагічных навук (1953). Герой Сацыялістычнай Працы (1975). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1978). Член СП Беларусі з 1934. Лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР (за п'есы: «Хто смяецца апошнім», 1941; «Пяюць жаваранкі», 1951; за комплекс работ па беларускай лінгвагеаграфіі, 1971). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я.Купалы (1974, за камедыю «Брама неўміручасці»).

Нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Бацькі, Кандрат Міхайлавіч і Пелагея Данілаўна (дзявочае прозвішча Нікановіч) мелі 6 дзесяцін зямлі, нажытых цяжкай працай, хацелі, каб яны засталіся адзінаму сыну Кандрату. Вучыўся К.Крапіва ў царкоўнапрыходскай школе ў в. Нізок, Уздзенскім народным вучылішчы, Стаўбцоўскім і Койданаўскім чатырохкласных гарадскіх вучылішчах. Восенню 1913 экстэрнам здаў у Мінску экзамен на званне народнага настаўніка. Зімой 1914 разам з бацькам працаваў на пабочных заработках, вясной і летам — рознарабочым на цагельні. Восенню 1914 атрымаў месца настаўніка ў земскім народным вучылішчы ў в. Мнішана Пяршайскай вол. Мінскага пав. У жніўні 1915 прызваны ў царскую армію і праз некаторы час накіраваны ў Гатчынскую школу прапаршчыкаў, якую скончыў у сакавіку 1916. Вясну і лета 1916 праслужыў у запасным батальёне ў г. Асташкаве Цвярской губ. (цяпер Калінінская вобл.) у якасці ўзводнага афіцэра. Восенню таго ж года накіраваны з маршавай ротай на Заходні фронт, а потым разам з вайсковай часцю на Румынскі фронт, дзе і атрымаў баявое хрышчэнне. Там жа сустрэў і Кастрычніцкую рэвалюцыю. У пачатку студзеня 1918 як настаўнік быў дэмабілізаваны і ў лютым вярнуўся ў родную в. Нізок. Вясной і летам 1918 працаваў на бацькавай гаспадарцы, з лістапада — настаўнікам пачатковай школы ў в. Каменка Уздзенскай вол. У 1919 ажаніўся з Аленай Канстанцінаўнай Махнач, родам з в. Нізок. Са жніўня 1920 да 1923 служыў у Чырвонай Арміі, камандзір узвода. Восенню 1923 дэмабілізаваўся, год жыў у роднай вёсцы, працаваў на бацькавай гаспадарцы, затым пераехаў з сям'ёй у в. Астравок, куды быў прызначаны настаўнікам пачатковай школы. У маі 1925 пераехаў у Мінск, працаваў інструктарам Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інстытуце беларускай культуры. У 1926 паступіў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ, якое скончыў у 1930. Працаваў загадчыкам аддзела рэдакцыі часопіса «Полымя рэвалюцыі» (1932—36). Удзельнічаў ва ўз'яднанні Заходняй Беларусі з

БССР (верасень 1939), у савецка-фінляндскай вайне (1939—40). На пачатку Вялікай Айчыннай вайны К.Крапіва працаваў у рэдакцыі газеты «Красноармейская правда», затым у рэдакцыі франтавой газеты Заходняга фронта «За Савецкую Беларусь». У 1941 уступіў у КПСС. З сакавіка 1943 і да канца вайны быў адказным рэдактарам ілюстраванай сатырычнай газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». Адразу пасля вайны прызначаны адказным рэдактарам сатырычнага часопіса «Вожык» (1945—47). У 1947—51 загадчык сектара мовазнаўства Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР, з 1952 дырэктар Інстытута мовазнаўства АН БССР, з 1956 віцэ-прэзідэнт АН БССР. У 1982—89 вядучы навуковы супрацоўнік-кансультант Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа АН БССР. З мая 1989 на пенсіі.

Свой творчы шлях К.Крапіва пачынаў як паэт-сатырык. Яго першы друкаваны твор — вершаваны фельетон «Жылі-былі», змешчаны ў газеце «Красноармейская правда» у 1922. У час службы ў Чырвонай Арміі ў гэтай газеце надрукавана некалькі яго вершаваных фельетонаў на рускай мове. Асноўнай іх тэмай былі міжнародныя падзеі, жыццё воінаў. 23 мая 1922 у газеце «Савецкая Беларусь» надрукаваны першы твор К.Крапівы на беларускай мове — сатырычны верш «Сваты». З гэтага часу пачынаецца яго сталая літаратурная праца. У сярэдзіне 20-х г. выходзяць яго першыя зборнікі «Асцё» і «Крапіва». К.Крапіва быў членам літаратурных аб'яднанняў «Маладняк» (1924—26), «Узвышша» (1926—31). Сатыра і гумар сталі вызначальнымі рысамі яго творчасці. Асноўным жанрам паэзіі на першым этапе творчасці былі байка і сатырычна-гумарыстычны верш. Пісьменнік выкрываў класавых ворагаў, фальшывых людзей, бічаваў бюракратызм, кар'ерызм, шкурніцтва, падхалімства, расхрадальнікаў дзяржаўнай маёмасці, хабарніцтва, валакіту, мяшчанскую пошласць, пляткарства, пустазвонства, п'янства, высмейваў невуцтва, рэлігійныя забабоны, старыя звычкі, прыватна-ўласніцкую псіхалогію, заклікаў вясковых жыхароў будаваць новы быт. Шмат увагі аддаваў тэме грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі, абароне сваёй айчыны. Выкрываў імперыялістаў, фашыстаў і іх памагатых. Нямала твораў прысвяціў тэме літаратурнага жыцця таго часу, у якіх выступаў супраць нізкапробных твораў, фармалізму, бязглуздага мадзнічання, беспрынцыпнай крытыкі. У 1931 выйшаў адзін з буйнейшых яго сатырычных твораў — паэма «Хвядос — чырвоны нос». Нягледзячы на казачна-фантастычны сюжэт, твор сваім зместам быў накіраваны ў рэчаіснасць 20 — пачатку 30-х г. У ім асуджаліся адмоўныя з'явы ў грамадскім жыцці і побыце і адначасова сцвярджалася ўсё новае, што павінен быў несці сацыялістычны лад.

У ранні перыяд сваёй літаратурнай дзейнасці К.Крапіва паспяхова працаваў і ў галіне мастацкай прозы, асноўным жанрам якой было сатырычнае апавяданне. Паводле ідэйна-тэматычнага зместу гэтыя апавяданні блізка стаялі да твораў яго сатырычнай паэзіі: у іх аўтар бічаваў заганы ў жыцці і побыце людзей («Людзі-суседзі», «Аднае раніцы», «На алкагольным фронце»), высмейваў мяшчанства («Смерць»), рэлігійныя забабоны («Як ён стаў бязбожнікам», «Споведзь»), абываценяў і плеткароў («Вайна»), палітычных прыстасаванцаў («Мой сусед»). Апавяданні пісьменніка, як і яго сатырычная паэзія, насычаны вострым і дасціпным, падчас грубаватым народным гумарам, з'едлівай іроніяй, знішчальным сарказмам. Яны былі сведчаннем развіцця рэалістычна-сатырычнай лініі ў беларускай прозе 20-х г. У 1932 асобным выданнем выйшаў яго раман «Мядзведзічы», прысвечаны жыццю беларускай вёскі канца 20-х г. У ім пісьменнік імкнуўся асэнсаваць тыповыя для тагачаснай беларускай вёскі сацыяльныя з'явы, тыя працэсы, якія адбываліся ў ёй напярэдадні калектывізацыі. Раман застаўся незавершаным.

У пачатку 1930-х г. К.Крапіва звярнуўся да драматургіі. Яго п'есы — значная з'ява не толькі ў беларускай, але і ва ўсёй шматнацыянальнай драматургіі былой савецкай краіны. Яны ўзнімалі актуальныя пытанні сучаснасці, хвалюючыя тэмы і праблемы, адлюстроўвалі найбольш істотныя бакі тагачаснай рэчаіснасці. Першым драматычным творам пісьменніка была псіхалагічная драма «Канец дружбы» (пастаўлена ў 1934 БДТ-1), у якой узнімаліся складаныя маральна-этычныя праблемы. Да 20-годдзя Кастрычніка К.Крапіва напісаў народна-гераічную драму «Партызаны» (пастаўлена ў 1938 БДТ-1), у якой паказаў героіку барацьбы беларускага народа ў перыяд грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі. П'еса была паказана на Дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве (1940), ставілася ў многіх рэспубліканскіх тэатрах, а таксама ў розных гарадах Расіі і Украіны. У канцы 30-х г. пісьменнік звярнуўся да жанру сатырычнай камедыі, напісаў класічную п'есу «Хто смяецца апошнім» (пастаўлена ў 1939 БДТ-1), у якой талент Крапівы-сатырыка раскрыўся з выключнай сілай. Знішчальны смех гэтай п'есы выкрываў кар'ерыстаў, двурушнікаў, авантурыстаў, шантажыстаў, падхалімаў, паклёпнікаў. Імёны яе камедыйна-сатырычных персанажаў Гарлахвацкага, Зёлкіна, Тулягі ператварыліся ў назоўныя. Камедыя пастаўлена больш як у 120 тэатрах краіны і ў шмат якіх тэатрах за мяжой, экранізавана кінастудыяй «Беларусьфільм» (1954).

У час Вялікай Айчыннай вайны К.Крапіва зноў звярнуўся да аператыўнага баявога жанру — сатырычнага верша. Пісаў байкі, памфлеты, вершаваныя фельетоны (зборнік «Смех і гнеў»). У гэты ж час ім напісана п'еса «Проба агнём» (пастаўлена ў 1943 Беларускім тэатрам імя Я.Коласа), прысвечаная змаганню нашага народа з фашысцкай навалай. У ёй драматург адлюстраваў, як выпрабоўваліся характары і пачуцці людзей у дні вайны, як выяўляў сваё душэўнае харство, мужнеў, маральна і духоўна загартоўваўся чалавек. У сатырычнай камедыі «Мілы чалавек» (пастаўлена ў 1945 Беларускім тэатрам імя Я.Купалы) стварыў запамінальныя вобразы фальшывых, паразітычных людзей, раскрыў і паказаў сутнасць іх філасофіі, якая была асабліва шкоднай у цяжкія для нашага народа ваенныя гады. Тэма вайны хвалявала К.Крапіву і ў пасляваенны час, пра што сведчаць яго драмы «З народам» (пастаўлена ў 1948 Беларускім тэатрам імя Я.Купалы) і «Людзі і д'яблы» (пастаўлена ў 1958 Беларускім тэатрам імя Я.Купалы і імя Я.Коласа). У адрозненне ад п'есы «Проба агнём», дзе паказаны першы перыяд вайны, у гэтых драмах дзеянне адбываецца на тэрыторыі, акупаванай фашысцкімі захопнікамі. Пісьменнік сутыкае тут сумленных людзей, патрыётаў-падпольшчыкаў з выродкамі, якія здрадзілі Радзіме і народу, аналізуе сацыяльныя і маральныя вытокі здрадніцтва. У пасляваенны перыяд К.Крапіва стварыў п'есы: «Пяюць жаваранкі» (пастаўлена ў 1950 тэатрам імя Я.Купалы і Я.Коласа), «Зацікаўленая асоба» (пастаўле-

на ў 1953 тэатрам імя Я.Купалы), «Брама неўміручасці» (пастаўлена ў 1974 тэатрам імя Я.Купалы), «На вастрыі» (пад назвай «Блытаныя сцежкі» пастаўлена ў 1983 тэатрам імя Я.Коласа). Першыя дзве з іх прысвечаны стваральнай працы савецкіх людзей. Поспехам карысталася лірычная камедыя пра жыццё калгаснай вёскі «Пяюць жаваранкі», якая вызначаецца самабытнасцю характараў, іскрыстым народным гумарам, багатым падтэкстам дыялогаў, вобразнай сакавітай мовай, глыбокім лірызмам. П'еса ставілася многімі тэатральнымі калектывамі краіны, экранізавана на кінастудыі «Беларусьфільм» (1953). «Зацікаўленая асоба» — першая спроба драматурга ў паказе жыцця рабочага класа і тэхнічнай інтэлігенцыі. Вялікім дасягненнем Крапівы-драматурга з'явілася сатырычная камедыя «Брама неўміручасці», якая вырашае маральна-этычныя праблемы. Выведзеныя ў ёй персанажы працягваюць галерэю сатырычных тыпаў з ранейшых п'ес драматурга. П'еса ішла на сцэнах многіх тэатраў Беларусі і іншых рэспублік. П'еса «На вастрыі» таксама закранае маральна-этычную праблематыку, узаемаадносіны розных па характару і жыццёвых прынцыпах людзей, выкрывае праявы бездухоўнасці ў жыцці.

Сатырычныя творы К.Крапівы — вялікая школа мастацкага майстэрства. Дабратворны ўплыў яго адчуваецца ў творчасці беларускіх пісьменнікаў-байкапісцаў У.Корбана, Э.Валасевіча, М.Скрыпкі, драматургаў А.Макаёнка, М.Матукоўскага, А.Петрашкевіча, А.Дударава. З імем К.Крапівы звязаны шырокі выхад нашай нацыянальнай драматургіі на еўрапейскую арэну.

К.Крапіва — аўтар навуковых прац па літаратуразнаўству і мовазнаўству, крытычных артыкулаў па беларускай літаратуры і мове. Ён рэдагаваў «Беларуска-рускі слоўнік», «Руска-беларускі слоўнік» (з Я. Коласам, П. Глебкам), ажыццяўляў агульнае рэдагаванне «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» у 5 т. Пісаў таксама нарысы («Міхаіл Сільніцкі», «Лондан», «Над ракой Арэсай»). Перакладаў на беларускую мову працы К.Маркса, Ф.Энгельса, У.Леніна, мастацкія творы Д.Фанвізіна. І.Крылова, А.Пушкіна. М.Гогаля, А.Астроўскага, А.Чэхава, У.Маякоўскага, А.Твардоўскага. Т.Шаўчэнкі, А.Міцкевіча, Я.Гашака, В.Шэкспіра і інш. Творы К.Крапівы перакладзены на многія замежныя мовы, у т.л. у Балгарыі, Германіі, Кітаі, Польшчы, Румыніі, Францыі, Чэхаславакіі. Пра К.Крапіву створаны дакументальны фільм «Кандрат Крапіва» (1983, «Беларусьфільм»). Імя К.Крапівы прысвоена Інстытуту мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, Уздзенскай СШ № 2.

Узнагароджаны 4 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, ордэнам Чырвонага Сцяга, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, ордэнам Дружбы народаў, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі, Ганаровымі Граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947—90. У 1946 у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце 1-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у Лондане, ва Усеславянскім кангрэсе ў Чэхаславакіі, у 1963 — у Міжнародным кангрэсе славітаў у Балгарыі.

А.А.Семяновіч.

Бібліяграфія

1.1.

Зб. тв.: У 3 т. Мн., 1956. Т. 1. Байкі і вершы. Паэмы. Т. 2. Проза. Т. 3. П'есы. Рэц.: Бурносаў В. Творы народнага пісьменніка // Камуніст Бел. 1957. № 3; Казека Я. Народны пісьменнік // Полымя. 1957. № 2; Макарэвіч А. Любоў і прызнанне народа // Маг. праўда. 1956. 9 снеж.; Марціновіч А. Творы вялікай жыццёвай праўды // Калг. праўда. 1956. 21 ліст.; Михолап Я., Охрименко П. Большой вклад в сокровищницу белорусской культуры // Сов. Бел. 1956. 21 дек.; Орлов Д. Сатирические комедии К.Крапивы // Там жа. 1957. 13 февр.; Палітыка Д. Аб тым, што нас хвалюе // ЛіМ. 1956. 9 вер.; Пшыркоў Ю. Творы Кандрата Крапівы // Беларусь. 1957. № 1; Собрание сочинений К.Крапивы // Сов. Отчизна. 1956. № 1; Усікаў Я. Важная падзея ў культурным жыцці рэспублікі: Да выхаду ў свет Збору твораў Кандрата Крапівы // Звязда. 1956. 20 кастр.

Зб. тв.: У 4 т. Мн., 1963. Т. 1. Байкі і вершы. Паэмы. Рэц.: Першы том Збору твораў Крапівы // ЛіМ. 1963. 24 вер.; Т. 2. Проза. Т. 3. П'есы. Т. 4. П'есы. Артыкулы.

Збор твораў: У 5 т. Мн., 1974—1976. Т. 1. Вершы, байкі, эпіграмы, паэмы. Мн., 1974. Т. 2. П'есы. Мн., 1974. Т. 3. П'есы. Мн., 1975. Т. 4. Апавяданні, фельетоны, памфлеты, раман. Мн., 1975. Т. 5. Нарысы, артыкулы, пераклады. Мн., 1976.

Выбраныя байкі. Мн., 1932.

Калючы строй: Вершы. Мн., 1932. (Б-ка для малапісьменных). Рэц. // Родны край. 1933. № 24.

Творы. Мн., 1934. Т. 1.

Выбраныя вершы. Мн., 1935. (Школьная серыя).

Выбраная сатыра: Вершы. Мн., 1938.

Выбр. тв. Мн., 1941. (Школьная б-ка). Рэц.: А.Е. «Выбраныя творы» К.Крапівы // ЛіМ. 1941. 10 мая; Новые книги для детей // Сов. Бел. 1941. 4 марта.

Смех і гнеў: (Выбранае). Мн., 1946. Рэц.: Новыя кнігі // Сав. селянін. 1946. 28 ліп.

Выбр. тв. Мн., 1947. (Выбраныя творы бел. сав. л-ры. 1917—1947). Рэц.: Карпачоў М. Выбраныя творы К.Крапівы // Гомел. праўда. 1947. 21 снеж.

Выбр. тв. Мн., 1948. (Б-ка школьніка).

Байкі; Вершы. Мн., 1971. (Б-ка бел. паэзіі).

Выбр. тв.: У 2 т. Мн., 1986. Т. 1. Вершы, байкі, эпіграмы, паэмы, апавяданні, фельетоны, памфлеты, аўтабіяграфія. Т. 2. П'есы.

1.2.

Апавяданні. Мн., 1925. (К-ца «Маладняк»).

Асцё: Вершы. Мн., 1925. (К-ца «Маладняк»). Рэц.: Жук Я. // Малады араты. 1925. № 14.

Крапіва: Вершы. Мн., 1925. Рэц.: А.Б. [Бабарэка А.] // Сав. Бел. 1925. 15 ліст.; Ок-с З. // Чырв. сцяг. 1925. № 7; 2 выд. падноўленае. Мн., 1928. 3 выд. Мн., 1930; 4 выд., перапр. і дап. Мн., 1932.

Біблія: Кніга быцця. (Вольны пераклад): Сатырычная паэма. Мн., 1926. 2 выд. Мн., 1928; 3 выд. Мн., 1959. (Б-чка атэіста).

Байкі. Мн., 1927. Рэц.: Гайдук Ю. // Арш. малад. 1928. № 7; 2 выд. Мн., 1928.

Людзі-суседзі: Апавяданні. Мн., 1928.

Жывыя праявы: Гумарыстычныя апавяданні. Мн., 1930. (Мастацкае слова масам). Рэц.: Бур Л. За дзейную пралетарскую сатыру! // Палес. праўда. 1931. 11 сак.

Пра нашых шкоднікаў, папоў ды ўгоднікаў: Вершы. Мн., 1930. (Мастацкае слова — масам).

Ухабы на дарозе: Сатырычныя вершы і прыпеўкі. Мн., 1930. (Мастацкае слова — масам). Рэц.: Бур Л. За дзейную пралетарскую сатыру! // Палес. праўда. 1931. 11 сак.

Хвядос — чырвоны нос: Вершаваная казка. Мн.,

1931.

Мядзведзічы: Раман. Кн. 1. Мн., 1932. Рэц.: Горскі Э. «Мядзведзічы» К.Крапівы // ЛіМ. 1933. 15 ліп.; Крытыка-бібл. зб. Мн. 1934. С. 54; 2 выд. Мн., 1935.

Канец дружбы: П'еса. Мн., 1934. Рэц.: Вольскі В. Каштоўны ўклад у беларускую драматургію // Крытыка-бібл. бюл. 1934. № 7.

Партызаны: П'еса. Мн., 1938.

Радзіме і правадыру: Вершы і песні аб Сталінскай канстытуцыі. Мн., 1938 / У сааўт.

Герой Савецкага Саюза Міхаіл Сільніцкі: Нарыс. М., 1943.

П'есы. Мн., 1946. Рэц.: Карпаў У. Беларуская літаратура перыяду Айчыннай вайны і першых дзён аднаўлення // Наст. газ. 1946. 24 жн.; Новыя кнігі // Сав. селянін. 1946. 21 ліп.

З народам: Драма ў 7 карцінах. Мн., 1948.

Драматычныя творы. Мн., 1951. Рэц.: Семяновіч А. П'есы Кандрата Крапівы // Калг. праўда. 1953. 25 лют.

Працы І.В.Сталіна ў галіне мовазнаўства і задачы беларускай савецкай літаратуры. Мн., 1951. Рэц.: Новыя кнігі // Калг. праўда. 1951. 28 жн.

Пяюць жаваранкі: П'еса ў 4-х актах, 6-ці карц. Мн., 1951. Рэц.: Кніжная паліца // Калг. праўда. 1951. 25 сак.; Кучар А. П'еса Кндрата Крапівы «Пяюць жаваранкі» // Наст. газ. 1951. 29 сак.

Зацікаўленая асоба: П'еса ў чатырох актах, дзевяці карцінах. Мн., 1953. Рэц.: Новыя кнігі // Наст. газ. 1954. 4 сак.; Царанков Л. // Заря. 1953. 17 нояб.; Шаблинский П. Новая пьеса К.Крапивы // Сов. Бел. 1953. 24 июня; Шатаў П. П'еса аб аўтазаводцах // Сцяг камунізма. 1953. 10 чэрв.

П'есы. Мн., 1953. (Школьная б-ка). Рэц.: Новыя кнігі // Наст. газ. 1954. 4 сак.; Семяновіч А. П'есы Кандрата Крапівы // Калг. праўда. 1953. 25 лют.

Сатыра і гумар. Мн., 1954. (Школьная б-ка).

Жаба ў каляіне: (Байкі і фельетоны). Мн., 1957. (Б-ка «Вожыка»).

Людзі і д'яблы: Драма ў 3-х актах, 10-ці карц. Мн., 1958.

Байкі, вершы, п'есы. Мн., 1960. (Школьная б-ка).

Дзве п'есы. Мн., 1966. (Школьная б-ка).

Сорак баек. Мн., 1966.

Вершы і байкі. Мн., 1967. (Школьная б-ка). 2 выд. Мн., 1978. (Школьная б-ка).

Хто смяецца апошнім: Камедыя ў 3-х актах. Мн., 1969. (Б-чка бел. драматургіі).

Пучок жыгучкі: Байкі. Мн., 1973.

Хто смяецца апошнім; Проба агнём; Брама неўміручасці: П'есы. Мн., 1983. (Школьная б-ка).

Загадкі дзеда Кандрата. Мн., 1986.

Вершы. Байкі. Эпіграмы. Паэмы. Мн., 1991. (Школьная б-ка).

1.3.

1922. Самагоначка: [Верш] // Бел. деревня. 12 июня / Пад. сваім прозв.; Жили-были: [Верш] // Красноарм. правда. 13 апр.; Сваты: [Верш] // Сав. Бел. 23 мая; На менскім «скверы»: [Верш] // Там жа. 16 жн.; Што я бачыў на «Трэку»: [Верш] // Там жа. 19 жн.; Плеткары: [Верш] // Там жа. 23 жн.; Прадналог: [Верш] // Там жа. 26 жн.; Эпіграмы // Там жа. 8 кастр.; Дай ды дай...: [Байка] // Там жа. 3 ліст.; Шчыраму лаціністу: [Верш] // Там жа. 12 ліст.; Ратуйце!: [Верш] // Там жа. 14 ліст.; Рашыў памерці: [Верш] // Там жа. 22 ліст.; Ігрышча: [Верш] // Там жа. 24 ліст.; Класавыя ворагі: [Верш] // Там жа. 29 ліст.; Гульня ў жмуркі: [Верш] // Там жа. 7 снеж.; Крапіва: [Верш] // Там жа. 28 снеж.; Новая прасіцельная экценія: [Верш] // Там жа. 30 снеж.; Навагоднія пажаданні: Антанце; Нямеччыне; Польшчы; Дэлегатам на Лазанскай канферэнцыі; У.І.Леніну; Царкве; Газеце «Савецкая Беларусь» // Там жа. 31 снеж.

1923. Камсамольскія частушкі; Царкоўная «расколіна»: [Вершы] // Комс. село. № 2; Лявоніха: [Верш] // Малады араты. № 2; Гані мешалкай: [Верш] // Сав. Бел. 19 студз.; На вечары «Полымя»: [Верш] // Там жа. 24 студз.; На крэсах Усходніх: [Верш] // Там жа. 2 лют.; Малітвы па-беларуску: Маленькі фельетон // Там жа. 4 лют.; Чыстка: [Верш] // Там жа. 6 лют.; Вось такія дактары вымуць душу без пары: [Верш] // Там жа. 7 лют.; Год Сцяпана Лайдака: [Вершы] // Там жа. 16 лют.; Нібы сатыра на «Нібы паэму — Гвалт над формай»: [Верш] // Там жа. 20 лют.; Чырвоная мятла добра мяла: [Верш] // Там жа. 23 лют.; Некралог: [Верш] // Там жа. 3 сак.; Няхай ён моліцца...: [Верш] // Там жа. 4 сак.; Хто за намі?: [Верш] // Там жа. 7 сак.; Годзе слухаць байкі!: [Верш] // Там жа. 3 крас.; Святкуюць: [Верш] // Там жа. 7 крас.; Кармлю усе словам божым... (Вялікодная гутарка папоў): [Верш] // Там жа. 11 крас.; Вясковым дзеткам вясною: [Верш] // Там жа. 12 крас.; Дзве куклы: [Верш] // Там жа. 15 крас.; Прагулка на Парнас: [Верш] // Там жа. 18 крас.; Каханне планет: [Верш] // Там жа. 6 мая; К сабачаму раўнапраўю: [Верш] // Там жа. 16 чэрв.; Частушкі // Там жа. 11 ліп.; Здарэнне на вуліцы: [Верш] // Там жа. 12 жн.; Рубель і марка: [Верш] // Там жа. 14 жн.; Савецкі грамадзянін; Нэпман; Поп: [Вершы] // Там жа. 22 жн.; «Пралетары» і «буржуй»: [Верш] // Там жа. 25 жн.; Кулак: [Верш] // Там жа. 4 вер.; Дзве выстаўкі: [Верш] // Там жа. 5 вер.; Аб «буры» і «націску»: [Верш] // Там жа. 6 вер.; Хаджу па рынку: (Песня селяніна) // Там жа. 10 вер.; Здаў «акзамінт»: Апавяданне // Там жа. 13 вер.; Ганульчына гора: [Верш] // Там жа. 22 вер.; Польскаму пану ў дзень стварэння Беларускай дывізіі: [Верш] // Там жа. 23 вер.; Каровін мужык: Апавяданне // Там жа 27 вер.; Сповець: замест фельетону // Там жа. 4 кастр.; Пакі, пакі: [Верш] // Там жа. 6 кастр.; Не кісні, а цісні: [Байка] // Там жа. 10 кастр.; Кулак; Бядняк; Выпівака: [Вершы] // Там жа. 12 кастр.; З падарожжа: [Верш] // Там жа. 27 кастр.; У сушні: [Верш] // Там жа. 1 ліст.; Будуйце лазні!: [Верш] // Там жа. 27 ліст.; Ціт заводзіць новы быт: [Верш] // Там жа. 19 снеж.; Калядная размова: [Верш] // Там жа. 26 снеж.; Жизнь рабочих: Трущобой пахнет // Соха и молот. 30 сент. / Пад псеўд. Крапіва / Аўт. спрэчнае.

1924. Год Сцяпана Лайдака (1. Восень; 2. Зіма; 3. Вясна; 4. Лета); Плеткары; Дзве кумы: (Байка); Вось такія дактары вымуць душу без пары; Нэп і я: (Прыпеўкі); Частушка-чыстушка; Рашыў памерці; Кармлю усё словам божым; Чырвоная мятла добра мяла; «Продналог» // Беларускі фальклор. Мн.; Цёткам навука: [Верш] // Бел. вёска. 10 мая; Калі церці, дык да смерці: [Верш] // Там жа. 17 мая; У малочную арцель запішыся: [Верш] // Там жа. 13 снеж.; Рагуліна прамова да свайго гаспадара: [Верш] // Там жа. 17 снеж.; Ціт заводзіць новы быт; Будуйце лазні: [Байкі] // Малады араты. 28 сак.; З тысячным нумаром: [Верш] // Сав. Бел. 5 студз.; Як ён стаў бязбожнікам: Апавяданне // Там жа. 3 лют.; Вяліканоснае: [Верш] // Там жа. 25 крас.; Не да «бжуху» страва: [Байка] // Там жа. 20 снеж.

1925. Год Сцяпана Лайдака: [Вершы] // Беларускі Гаспадарскі Каляндар на 1926 год. Вільня; Не будзь горшай!: [Верш] // Арш. малад. № 1; Кляса: Апавяданне; Лягчэй на паваротах!: [Верш] // Маладняк. № 8; Мандат: Байка; Ну й людзі, ну й суседзі: Гумарэска // Там жа. № 9; Зарабатак: Апавяданне // Малады араты. № 1; Лявоніха: [Верш] // Там жа. № 2; Кавалі: [Верш] // Там жа. № 6; Свет у кут — № 8; Споведзь; Як ён менш пакут: [Верш] // Там жа. № 8; Споведзь; Як ён стаў бязбожнікам: Апавяданні // Там жа. № 17—18; Каровін мужык: (Апавяданне) // Сав. вёска. № 15; Ты ня лайся, дзядзя, пры савецкай уладзе: [Байка] // Бел. вёска. 7 студз.; Ці няможна прасцей: [Байка] // Там жа. 23 студз.; Рабіў сам — дык раю й вам: [Байка] // Там жа. 4 лют.; Тварам да вёскі: [Верш] // Там жа. 6 сак.; Ня плач, а сябе перайначː [Верш] // Там жа. 17 сак.; Кармлю ўсё словам божым: [Байка] // Там жа. 10 крас.; Дзядзька Хвядос і «малакака»: [Байка] // Там жа. 17 крас.; Частушкі пра пасос»: [Верш] // Там жа. 2 чэрв.; Цяпер — самая пазыку: [Верш] // Там жа. 9 чэрв.; Вось падумайце: [Верш] // Там жа. 11 чэрв.; Пратры, брат, вочы!:

[Верш] // Там жа. 23 чэрв.; На пасёлкі: [Апавяданне] // Там жа. 10 ліп.; Устарэла тэхніка: [Верш] // Там жа. 17 ліп.; Абраза: Байка // Там жа. 21 ліп.; Калі ў краме ёсць нястача...: [Верш] // Там жа. 11 жн.; Баба з калёс, дык каня як чорт панёс: [Байка] // Там жа. 29 вер.; Ціт заводзіць новы быт: [Верш] // Там жа. 7 кастр.; Маг. селянін. 26 сак.; Чырвоная мятла добра мяла: [Верш] // Бел. вёска. 6 ліст.; Народ уваскрос!: [Верш] // Маг. селянін. 23 крас.; Дзяльба сенакосу: [Верш] // Там жа. 4 чэрв.; Вось падумайце: [Верш] // Там жа. 2 ліп.; Далей: [Верш] // Наш працаўнік. 15 мая; Лявоніха; Калі ў краме ёсць нястача...: [Верш] // Там жа. 8 кастр.; Ці то — здольны пясняр, ці то модны пляткар?: [Верш] // Сав. Бел. 28 студз.; Хто пець варт — судзіце самі!: [Байка] // Там жа. 9 крас.; «Мікроба»: [Байка] // Там жа. 27 мая; Кормны і падворны: Байка // Там жа. 16 чэрв.; Старшыня: Байка // Там жа. 19 чэрв.; Казёл: Байка // Там жа. 4 ліп.; І многа гутаркі было...: Байка // Там жа. 10 ліп.; Балет: [Верш] // Там жа. 22 вер.; Ну, як не выпіць?: [Байка] // Там жа. 27 кастр.; Еш, дурань, бо то з макам: Байка // Там жа. 1 ліст.; Как он стал вором: Из жизни одной деревенской ячейки: [Апавяданне] // Чырв. змена. 10 мая / Пад псеўд. Крапіва Аўт. спрэчнае.

1926. Ну й людзі! Ну й суседзі!: [Апавяданне] // Беларускі народны каляндар на 1927 год. Вільня; Ціт заводзіць новы быт: [Верш]; Лявоніха: [Байка] // Ураджайнае свята. Мн.; Цёткам навука: [Верш] // Бел. работніца і сялянка. № 17; Пад грукат кол: Апавяданне; Чырвонец: Байка // Маладняк. № 1; Стварэнне свету: (Адрывак з Біблії) // Там жа. № 2; Ліха яго разбярэ: Апавяданне // Там жа. № 3; «Мода»; «Каршун і Цецярук»: Байкі // Там жа. № 4; Мачыха; «Хто спіць, той не грэшыць»: Байкі // Там жа. № 6; Будуйце лазні: [Верш] // Маладняк Калініншчыны. № 3—4; Першая пара, першы грэх і першая кара: Урывак з «Біблії» // Малады араты. № 7; «Госці»: [Верш] // Маланка. № 1 / Пад крыпт. К.А.; Аўт. спрэчнае; На «Крэсах Усходніх»; Ігрышча: [Байкі] // Там жа. № 5—6; Ліга Нацыяў (Да паседжання 8-га сакавіка с.г.); Будуйце лазні: [Байкі] // Там жа. № 7; Рагуліна прамова да свайго гаспадара: [Байка] // Там жа. № 8; Ціт заводзіць новы быт; Як «Антэк» стрэў «Вельканоц»: [Байкі] // Там жа. № 9; Цёткам навука; Дзве кумы: [Байкі]; Вясковым дзеткам вясною: [Верш] // Там жа. № 10; Самагоначка: [Верш]; Воўк і ягнюк: (Па-новаму): [Байка] // Там жа. № 11; На віленскім скверы; Каго мне ўзяць за кума?: [Вершы] // Там жа. № 12; Дзяльба сенакосу: [Верш]; Вол і авадзень: [Байка] // Там жа. № 13; У вагоне: [Верш] // Там жа. № 14; У сушні; Каб церці, дык да смерці (з лячэбнай практыкі на вёсцы): [Байкі] // Там жа. № 15; Плеткары: [Верш] // Там жа. № 16; Калядная размова; Муза падвяла: [Вершы] // Там жа. № 17; Шчыры поп: Байка // Чырв. сейбіт. № 1; Пра цыгана і кабылу: [Байка] // Там жа. № 2; Каштан: Байка // Там жа. № 3; Падарожнае: [Апавяданне]; Стары й малады: Байка // Там жа. № 5; «Далікатныя» парасяты: Байка // Бел. вёска. 5 лют.; «Апаска»: [Верш] // Там жа. 9 лют.; Я шаную: [Верш] // Там жа. 21 сак.; Біблія (вольны пераклад) // Там жа. 6, 9, 11, 13, 16, 18, 21, 23, 27 крас.; 1, 9 мая; Здаў «акзамінт»: (Апавяданне) // Камуніст. 21 сак.; Як ён стаў бязбожнікам // Там жа. 31 сак.; Цёткам навука: З велікодных здарэнняў // Там жа. 1 мая; Кляса: [Апавяданне] // Там жа. 14 мая; Рагуліна прамова да свайго гаспадара: [Верш] // Там жа. 22 вер.; Чырв. змена. 16 вер.; Споведзь: [Апавяданне] // Камуніст. 26 вер.; Вараны: Байка // Сав. Бел. 28 сак.; Маца: [Верш] // Сав. Бел. 4 крас.; На пасёлкі: [Апавяданне] // Чырв. змена. 13, 17, 18 чэрв.; Польскаму пану: [Верш] // Там жа. 11 ліп.; Лявоніха: [Верш] // Там жа. 9 вер.

1927. Як трэба жыць — каб здаровым быць: [Верш] // Бел. піянер. № 17; Бел. вёска. 14 жн.; Бацька і сын; Нянька; Стары і малады: Байкі // Бел. піянер. № 22; Ці то здольны пясняр, Ці то — модны пляткар?: [Верш] // Маланка. № 2, 3; Ратуйце!: [Верш] // Там жа. № 7; Валакіта: (З кааператыўнай практыкі ў адным польскім банку): [Байка] // Там жа. № 8; Дзядзька Хвядос і малакасос: [Байка] // Там жа. № 9; Маланцы: [Верш]; Ганарысты парсюк: [Байка] // Там жа. № 10; Ганарысты парсюк; Сарамлівы; Сава, асёл ды сонца: [Байкі] // Узвышша. № 11; Мой сусед; Аднае раніцы; Спет ідзе: [Апавяданні] // Там жа. № 2; Вайна; Пальчык: Апавяданні; Чорт; Самадзейны конь: Байкі // Там жа. № 3; Ідэі: [Апавяданне]; Фіга на телерцы: [Верш] // Там жа. № 4; Доўг; Певень: [Апавяданні]; Жаба ў каляіне; Зубы: Байкі; Не губі сябе, дзеўчына: [Верш] // Там жа. № 5; Беларускія прыказкі / Пад сваім прозв.; Сваяўство: [Верш] // Там жа. № 6; Смерць: [Апавяданне] // Чырв. сейбіт. № 6—7; Чырвоная мятла добра мяла // Бел. вёска. 20 ліст.; «Стральба» ў кааператыве і на лядніку: [Нарыс] // Сав. Бел. 20 ліп.; Бывайце здаровы: (Адрывак з Біблії) // Чырв. змена. 1 студз.; Рагуліна прамова да гаспадара: [Байка] // Там жа. 9 сак.; Дабяромся і да неба; Гані мешалкай: [Вершы] // Там жа. 28 снеж.

1928. Чырвоная мятла добра мяла; Самагоначка; Дабяромся і да неба; Кармлю ўсё словам божым; На пераўыбарах у Цёмнай; Сава, асёл ды сонца; Сялянскія; Мандат; Мачаха; Вось такія дактары; Стары і малады; Мы не паклонімся богу; Гімн бязбожніка: [Вершы]; Ты ня лайся дзядзя; Кулак; Буду спекулянтам; Сука ў збане; Рак; Плеткары; Тварам да вёскі; Валакіта; Дзяльба сенакосу; Малітвы па-беларуску; Рашыў памерці; Дзве кумы; Рагуліна прамова да гаспадара; Шчыры поп; Будуйце лазні: [Вершы, байкі] // Дэкламатар. Мн.; Рагуліна прамова да свайго гаспадара: [Верш] // Бел. работніца і сялянка. № 10; Пальчык: Апавяданне // Бел. піянер. № 12; Сава, асёл ды сонца: Байка // Там жа. № 23; Маланка. № 7; Жаба ў каляіне: [Байка] // Бел. піянер. № 24; Трэба заглянуць // За калектыў. № 6—7; Нэпія (З радавога быту): [Байка] // Маланка. № 5; Аб «буры і націску». (К сучасным спрэчкам): [Верш] //Там жа. № 6; Класавыя ворагі: [Верш] // Там жа. № 8; Дыпламаваны баран: [Байка] // Там жа. № 13; Хвост: Апвяданне // Узвышша. № 1; Шкірута; Вершаваная навела; Махальнік Іваноў: Байка; «Спыталіся ў мяне аднойчы юнакі...»; «Чаго так гучна б'юць літаўры»: Эпіграмы // Там жа. № 2; Вось тут і пішы!: Апавяданне; Дэкрэт: [Верш]; Думкі пра сатыру // Там жа. № 3; На алкагольным фронце: Гумарэска; У папа ды быў сабака...: [Верш] // Там жа. № 4; Вясковы фельетон: Барыш // Бел. вёска. 3 лют.; Крапівіна біблія: [Апавяданні]; У бога трывога: [Верш] // Там жа. 5 крас.; Царкоўная расколіна: [Верш] // Пякучая маланка. 22 кастр.

1929. Дзядзька Хвядос і малакасос: [Байка] // Моладзь — за новы быт. Мн.; Саманадзейны конь: [Верш] // Бел. піянер. № 2; Кувада; Рахітык; Свядомасць: [Байкі]; Слова — чытачу // Узвышша. № 1; Пажар: Байка; Курортны верш // Там жа. № 7; «Наш»: [Верш] // Там жа. № 9—10.

1930. Як трэба жыць — каб здаровым быць: [Верш] // Настольны каляндар. Мн.; Ці я над яслямі сумую... (Конская элегія); Вагон табакі; Так жыла між імі згода; Два каханкі: [Вершы] // Там жа. № 1; Плач абывацеля: [Верш] // Там жа. № 2; Хвядос — чырвоны нос: Паэма—казка // Там жа. № 6—10; Здань мінулага ня ўстане: [Верш] // Бел. вёска. 1 мая; Кляса: [Апавяданне] // Наша доля. 26 студз.

1931. Хто там рухаецца?: [Верш] // Другая бальшавіцкая. Мн.; Бел. вёска. 21 лют.; Калгаснік Бел. 21 лют.; «Узвышша» на новым шляху // Узвышша. № 1; Захара-дырэктар: [Верш] // Там жа. № 5; Дзе ж яна, галоўная самая?: [Верш] // Звязда. 19 мая; Дарогу сустрэчнаму плану! // Там жа. 28 чэрв.

1932. Ты не лайся, дзядзя, пры Савецкай ўладзе; Цёткам навука; Дзве кумы: [Вершы] // Партыя, слухай. Мн.; З фашыстоўскай падваротні: [Верш] // Барацьба (Берлін). № 3; Звязда. 28 ліст.; «Як Антэк стрэў «Вельканоц» // Іскры Ільіча. № 6; Што рабіць, каб здаровым быць: [Верш] // Там жа. № 9; Калядная размова; Цёткам навука: [Вершы] // Там жа. № 23; Мядзведзічы: Раман // Полымя рэвалюцыі. № 1—4; 1933. № 1—3; Ціт заводзіць новы быт: [Верш] // Бел.

звон. 5 лют.; Цяп!: [Байка] // Звязда. 21 ліст.; Пакутнікі-сумяшчальнікі: [Верш] // Там жа. 9 снеж.; Стварыць вялікасны вобраз рэвалюцыі // ЛіМ. 11 крас.; Пастанова ЦК дае ўпэўненасць // Там жа. 15 мая; Памагаты: [Байка]; З раману «Мядзведзічы» // Там жа. 5 чэрв.; Урывак з рамана «Мядзведзічы» // Там жа. 6 ліст.

1933. Эпіграмы // Заклік. № 1; Слова да малодшых // Там жа. № 2; Каб кнігам ды ногі! // Звязда. 18 лют.; Майстры крывавага джаз-банду: [Верш] // Там жа. 23 лют.; На калгасных палёх лепельшчыны: [Нарыс] // Там жа. 10 чэрв. / Сааўт. З.Бядуля; На чыстую ваду // Там жа. 9 ліп. / Сааўт. Л.Кацовіч; Пісьменнікі і крытыкі ў 1933 г. // ЛіМ. 18 студз.; Што мне рупіць // Там жа. 10 лют.; Канец дружбы: Урывак з п'есы // Там жа. 26 ліст.

1934. Парваная пупавіна: [Апавяданне] // Бальшавіцкая моладзь. Мн.; Хто там рухаецца?: [Верш] // Вясна пераможная. Мн.; Канец дружбы: П'еса // Полымя рэвалюцыі. № 1; Пра перабудову і «недабудову»: Даклад на пленуме праўлення Саюза Савецкіх Пісьменнікаў БССР // Там жа. № 9; Жадаю далейшых поспехаў // ЛіМ. 1 чэрв.

1935. Канец дружбы: (Урывак з п'есы) // Атака. Мн. Альм. 2; Ну й людзі! ну й суседзі!: [Апавяданне] // Беларускі народна-гаспадарскі каляндар на 1935 год. Вільня; Сава, асёл ды сонца: Байка // Іскры Ілыча. № 5; Кім мы сталі сёння: [Верш] // Віцеб. пралетарый. 11 ліп.; Шэпча бабка, шэпча...: [Верш] // Звязда. 18 чэрв.; Пачатак шчасця: [Верш] // Там жа. 16 снеж.; Тата-нягоднік: Фельетон // Там жа. 27 снеж.; Твары і шчаслівым будзь: Прывітанне Я.Купалу // ЛіМ. 28 мая; Інтэрв'ю Якуба Коласа: Эпіграма // Там жа. 16 вер.; За юбіляра!: [Верш] // Там жа. 11 снеж.; Тата-заяц: Байка // Там жа. 31 снеж.

1936. Ліст працоўных Савецкай Беларусі вялікаму Сталіну // Полымя рэвалюцыі. № 3 / У сааўт; З новым шчасцем!: [Нарыс] // Звязда. 1 студз.; Яфімаў — чалавек культурны: (Фельетон) // Там жа. 9 студз.; Пашахонцы: (Фельетон) // Там жа. 11 студз.; Дзяніс Сырамаха: (Нарыс // Там жа. 27 студз.; Калгасны дзед: [Верш] // Там жа. 28 студз.; Прыгожы сон адміністратара: (Фельетон) // Там жа. 20 лют.; Хоць бы ў фурмана запыталіся: (Фельетон) // Там жа. 28 лют.; Барацьба за... непісьменнасць: (Фельетон) // Там жа. 29 лют.; «Не законнорожденный»: (Маленькі фельетон) // Там жа. 17 сак.; Як камсамолка Ратнікава праўды шукала: (Маленькі фельетон) // Там жа. 22 сак.; Гэта той самы Булава...: (Фельетон) // Там жа. 3 крас.; Каб весела было...: (Фельетон) // Там жа. 5 крас.; Не для іх законы пісаны: (Фельетон) // Там жа. 18 крас.; Аб вучоных мядзведзях і недавучаных крытыках: (Фельетон) // Там жа. 20 крас.; Цвёрдасць без розуму: (Фельетон) // Там жа. 9 мая; Шануйце бланкі наркомасветы: (Фельетон) // Там жа. 17 ліп.; Самадур: (Фельетон) // Там жа. 2 вер.; Жывыя і мёртвыя: (Маленькі фельетон) // Там жа. 9 снеж.; За здаровую, прынцыповую крытыку: Прамова на сходзе пісьменнікаў г. Мінска // ЛіМ. 31 сак.; Чорныя гады: [Верш] // Там жа. 3 вер.; Прывітанне Коласу Я. з выпадку 30-годдзя яго літаратурнай дзейнасці // Там жа. 11 кастр.

1937. Партызаны: Драма // Полымя рэвалюцыі. № 7; Корань зла — у барадзе: Маленькі фельетон // Звязда. 9 студз.; Сляпыя крыважэрныя гады: Слова пісьменніка // ЛіМ. 28 студз.; Арганізаваць поспех на ўсіх участках работы: З прамовы на сходзе пісьменнікаў // Там жа. 14 крас.; У лесе: Урывак з п'есы «Партызаны» // Там жа. 11 ліп.; Варожыя планы разбіты // Там жа. 12 жн.; Жалезны маршал: [Верш] // Там жа. 31 кастр.; Развітанне: [Верш]; Янка Купала // Там жа. 6—7 ліст.; Пра Кліма легендарнага (Чырвонаармейская песня) // Там жа. 26 ліст.

1938. Радзіме і правадыру: [Верш] // Полымя рэвалюцыі. № 6; Бальш. Пал. 14 мая; Віцеб. рабочы. 18 мая; Звязда. 12 мая; ЛіМ. 17 мая; Чырв. змена. 12, 14 мая / У сааўт.; Байка // ЛіМ. 6 лют.; У дружнай рабоце з тэатрамі // Там жа. 1 мая; Лібрэта оперы «Міхась Падгорны» П.Броўкі: Урывак з даклада // Там жа. 30 мая; Мне шмат гадоў: [Верш] // Чырв. змена. 12 мая.

1939. Таварышу Сталіну: [Верш] // Полымя рэвалюцыі. № 5—6; Бальш. Пал. 28 крас.; Віцеб. рабочы. 28 крас.; Звязда. 26 крас.; ЛіМ. 1 мая / У сааўт.; Хто смяецца апошнім: Камедыя // Полымя рэвалюцыі. № 9; Вялікая культурная сіла: (Калгасна-саўгасныя тэатры) // Звязда. 3 чэрв.; Вялікі гонар, вялікая адказнасць // ЛіМ. 9 лют.; Блізкі друг, выдатны пісьменнік: Слова-развітанне з Э.Самуйлёнкам // Там жа. 15 лют.; «Хто смяецца апошнім»: Урывак з п'есы // Там жа. 23 крас.; Дух захватвае ад радасці: Урывак з пісьма // Там жа. 3 кастр.; Ворану вышай арла не лятаць; Падзяка Сталіну: [Вершы] // Чырв. змена. 20 жн.

1940. Падзяка Сталіну: [Верш] // Полымя рэвалюцыі. № 5; Шчаслівы і радасны наш шлях у будучыню! // ЛіМ. 23 мая; Шмат год здароўя і плённай працы! // Там жа. 5 кастр.; Вялікая адказнасць // Там жа. 19 кастр.; Заметки о белорусской драматургии // Сов. искусство. 4 июня; Вялікае шчасце служыць свайму народу // Чырв. змена. 22 чэрв.

1941. Лісі хвост і воўчы клык: [Байка] // За Сав. Бел. 17 ліп.; Развітанне сына: [Верш] // Там жа. 19 ліп.; Нам памятны дваццаты год: [Верш] // Там жа. 25 ліп.; Зброю к бою!: [Верш] // Там жа. 29 ліп.; Герман Думмер можа памірацъ спакойна...: Маленькі фельетон // Там жа. 6 жн.; На чым спаткнуўся «фюрэр»: Маленькі фельетон // Там жа. 22 жн.; Перамога будзе за намі // Там жа. 5 снеж.; Апраўдаю высокае давер'е // Звязда. 18 сак.; Палес. праўда. 21 сак.; Чырв. змена. 19 сак.; Наша кроўная справа: Слова пісьменніка // ЛіМ. 7 мая; Могучий стимул творчества // Сов. Бел. 18 марта; О концертах симфонической музыки: Письмо в редакцию // Там жа. 28 марта / У сааўт.; Приложу все силы, чтобы оправдать высокое доверие // Сталин. молодежь. 20 марта.

1942. Апошняя стаўка Гітлера; Сніўся вароне арліны палёт: [Вершы]; Лез немец да нас на гару; Парад крыжаносцаў // Раздавім фашысцкую гадзіну. № 31; Фрыцавы трафеі: [Верш] // Там жа. № 32; Сав. Бел. 12 февр.; Мы аддзякуем: [Верш] // Раздавім фашысцкую гадзіну. № 41; Гімлер, А.Розенберг, Герынг, Гебельс: [Вершы] // Там жа. № 46; Гісторыя з фон Драпэ-гадам і яго загадам // Там жа. № 50; Зразумела?: [Верш] // Там жа. № 59; Набліжаецца зіма: [Верш]; Загад выканан // Там жа. № 64; Малая партызанская энцыклапедыя // Там жа. № 71—72 / У сааўт.; Мы аддзякуем: [Верш] // Віцеб. рабочы. 11 чэрв.; За сваб. Бел. 13 мая; Сав. Бел. 23 февр.; «... Як ворану вышэй арла не лятаць...»: [Урывак з верша] // За сваб. Бел. 9 крас.; Змітрок Бядуля // Лит. и искусство. № 2 / У сааўт.; «Мне сняцца сны аб Беларусі» // Там жа. 4 июля / У сааўт. з М.Лыньковым.

1943. Проба агнём: [Драма] // Беларусь: Альманах першы. М.; Янка Купала и его поэзия // Купала Я. Избранные произведения. М., 1943 / У сааўт.; Міхаіл Сільніцкі: [Апавяданне]; Развітанне сына: [Верш] // Моладзь Беларусі ў баях за Радзіму. М.; Прамова пісьменніка Кандрата Крапівы // Памяці Янкі Купалы. (1882—1942). М.; Не будзем спрачацца // Партыз. дубінка. № 2; Гебельс брэша, вецер носіць // Там жа. № 3; Апошняя пасылка / Пад псеўд. Астапчук; Разлюлі-люлі, маліна: Песня беларускіх партызан // Там жа. № 12; Чаго ж яна «рада»? / Пад псеўд. Астапчук; Янка і Карла: [Верш] // Раздавім фашысцкую гадзіну. № 75; Як нарадзілася «вутка»? // Там жа. № 95 / Пад псеўд. Астапчук; Гітлер і скульптар // Там жа. № 105; Ух, Ух — мы удвух // Там жа. № 107 / Пад псеўд. Астапчук; Надышоў дзень расплаты // Гомел. праўда. 29 кастр.

1944. Янка і Карла: Байка // Беларусь. № 1; «Кацёл» // Раздавім фашысцкую гадзіну. № 121; На бабруйскай шашы: [Верш] // Звязда. 8 жн.; Проба агнём: (Урывак з п'есы) // Там жа. 23 жн.; «Я быў у Трасцянцы» // Там жа. 6 вер.; Пад знакам перамогі // Сав. Бел. 1 студз.

1945. Валодзеў гальштук: П'еса // Альманах. 2. Мн.; П'есы для гурткоў мастацкай самадзейнасці. Мн.; Янка і Карла: (Байка для дзяцей); Развітанне сына: [Верш] // За шчасце Беларусі. М.; Л.; Мілы чалавек:

Урывак з п'есы // Беларусь. № 10; Міхаіл Сільніцкі: Нарыс // Бярозка. № 4; Ці была ў яго галава?: Апавяданне // Вожык. № 5; Мілы чалавек: П'еса // Полымя. № 9. Рэц.: Вольскі В. Буйныя памылкі некаторых твораў беларускай драматургіі // ЛіМ. 1947. 22 лют.; Задионченко С. О недостатках в работе белорусской парторганизации // Парт. жизнь. 1947. № 2; Што яны сабе думаюць; Крыг без бліца, або... як мы білі фрыца // Раздавім фашысцкую гадзіну. № 138; Беларускія пісьменнікі перад сваім пленумам // Звязда. 26 снеж.; Мілы чалавек: Урывак з камедыі // ЛіМ. 22 ліп.; Свята перамогі: [Верш] // Піянер Бел. 10 мая; Гневное слово // Сов. Бел. 12 дек.

1946. Замест прадмовы // Брыль Я. Апавяданні. Мн.; Янка Купала // Купала Я. Выбр. тв. Мн. / Сааўт. Ц.Гарбуноў, М.Лынькоў; Кат у нямілосці; Балабонь да пары, балабоны!; З фашыстоўскай падваротні; Праметэй: [Вершы] // Семнаццатага верасня. Мн.; Расціце — не аглядайцеся: [Гумарэска] // Вожык. № 11 / Пад псеўд. М.Доўгі; Мая прынцыповасць: [Гумарэска] // Там жа. № 13—14 / Пад псеўд. М.Доўгі; Ёсць на свеце дабрадзеі: [Гумарэска] // Там жа. № 15; Чалавек — перш за ўсё // Звязда. 18 чэрв.; П'есы і вобразы: З прамовы на Пленуме ССПБ // ЛіМ. 10 студз.; Лондан: (Першыя ўражанні) // Там жа. 16 сак.; Песня пра Сталіна // Піянер Бел. 4 снеж.; [Даклад на Пленуме Саюза пісьменнікаў БССР] // Сав. селянін. 3 студз.; Агляд за тыдзень // Там жа. 24 студз.; Дзве кумы: [Байка] // Там жа. 24 чэрв.; Любимец народа // Сов. Бел. 3 нояб.

1947. Фрыцавы трафеі; Чырвоная мятла добра мяла: [Байкі] // Роднай Маскве. Мн.; Мандат; Заява; Мода; Дзед і баба; Янка і Карла; Разлюлі-люлі маліна; На Бабруйскай шашы: [Байкі] // Эстрада. Мн.; Выданне біяграфіі І.В.Сталіна на беларускай мове // Бальш. Бел. № 12 / Сааўт. І.Саладкоў, З.Гурэвіч; Падзяка Сталіну: [Верш] // Бярозка. № 11; Лясная казка: [Верш] // Вожык. № 3—4; Выхад знойдзен: [Гумарэска] // Там жа. № 5 / Пад псеўд. М.Доўгі; Разлюлі-люлі маліна: Песня беларускіх партызан // Там жа. № 20; Жаба ў каляіне; Сава, асёл ды сонца; Сука ў збане; Янка і Карла: [Байкі]; Праметэй: [Верш] // Грод. правда. 23 нояб.; Пачэсная задача // Наст. газ. 2 кастр.; Перад вамі вялікі жыццёвы шлях // Піянер Бел. 1 студз.

1948. Партызаны: (П'еса) // Беларуская савецкая проза і драматургія. Мн.; З народам: П'еса // Полымя. № 6. Рэц.: Верас С. // Гродзен. праўда. 1948. 4 лют.; Ільін М. // Палес. праўда. 1949. 4 снеж.; Кавалёў Н. // Бальш. Пал. 1948. 4 снеж.; Нявёд У. // Звязда. 1949. 2 лют.; Усікаў Я. Патрыятычная п'еса // За Радзіму. 1949. 26 ліп.; Беларуская савецкая драматургія за 1947 год: Даклад на рэспубліканскім сходзе пісьменнікаў // ЛіМ. 6 сак.; Свято сохраним принципы, разработанные А.А.Ждановым // Сов. Бел. 1 сент.

1949. Сава, асёл ды сонца; Жаба ў каляіне; Вол і авадзень; Сука ў збане; Дзед і баба; Кувада; Махальнік Іваноў; Угоднікі-маўчальнікі; Разлюлі-люлі маліна; Янка і Карла: [Байкі] // Беларуская савецкая паэзія. Мн.; Аб характары беларуса // Беларусь. № 1; Поп і папугай: Байка // Вожык. № 12; Жукі па плану Маршала: [Верш] // Там жа. № 18; Ад усяго сэрца: [Верш] // Там жа. № 1 / У сааўт.; Падзяка Сталіну: [Верш] // Гродзен. праўда. 23 снеж.; Шкодная блытаніна ў пытаннях мовы // Звязда. 15 сак.; Наст. газ. 17 сак.; Над ракой Арэсай // Звязда. 24, 30 крас.; Лётчык і блыха: (Байка) // Там жа. 29 мая; Литература Советской Белоруссии: К декаде белорусской литературы в Москве // Культура и жизнь. 21 янв. / Сааўт. П.Броўка; Партыя пераўтваральнікаў жыцця // ЛіМ. 14 лют.; Мір належыць простым людзям // Там жа. 7 мая; Поп і папугай: Байка // Там жа. 18 чэрв.; Прамова на другім з'ездзе ССП БССР // Там жа. 9 ліп.; Пісьменнік-бальшавік: Слова пра таварыша па пяру // Там жа. 26 ліст.; Твой светлы геній бачу я ва ўсім: [Верш] // Там жа. 21 снеж.; Белорусы: [Нарыс] // Правда. 9 янв.; Фронт міру непераможны // Сав. селянін. 2 кастр.; Вялікае свята беларускага народа // Там жа. 3 ліст.; Белорусская советская драматургия перед II съездом писателей БССР // Сов. Бел. 10 июня; Пятнадцать плодотворных лет // Сов. искусство. 6 авг.

1950. Сава, асёл ды сонца; Жаба ў каляіне: Байкі // На варце міру. Мн.; Дзіця, вожык і змяя: Байка // Вожык. № 23; Пяюць жаваранкі: П'еса // Полымя. № 8. Рэц.: Карпаў У. Адчуванне новага // ЛіМ. 1950. 21 кастр.; Савецкім людзям патрэбны мір // Звязда. 15 кастр.; Войне не быть! // Известия. 15 ноябр.; Нескарыстаныя магчымасці // ЛіМ. 11 сак.; Пяюць жаваранкі: Заключная карціна з п'есы // Там жа. 9 вер.

1951. О работе Ин-та языка, литературы и искусства Акад. наук БССР по изучению и пропаганде трудов И.В.Сталина по языкознанию: Выступление // Сессия отделений общественных наук Академии СССР, посвященная годовщине опубликования гениального произведения И.В.Сталина «Марксизм и вопросы языкознания». М. / Пад сваім прозв.; Сталинское учение о языке и белорусская лингвистика // Весник АН БССР. № 6 / Пад сваім прозв.; Задачи белоруской литературы в свете трудов И.В.Сталина по языкознанию // Знамя. № 9; Труды товарища Сталина в области языкознания и задачи белорусской советской литературы // Известия АН БССР. № 5; Працы І.В.Сталіна ў галіне мовазнаўства і задачы беларускай савецкай літаратуры // Полымя. № 6; ЛіМ. 14 крас.; Прамова дэпутата К.К.Атраховіча (Крапівы) пры адкрыцці сесіі Вярхоўнага Савета БССР // Звязда. 4 крас.; Калг. праўда. 4 крас.; Сов. Бел. 4 апр.; Могучая сила // Известия. 16 сент.; Свята беларускай сацыялістычнай культуры // ЛіМ. 27 кастр.

1952. Ад усяго сэрца / У сааўт.; Падзяка Сталіну: [Вершы] // Ад шчырага сэрца. Мн.; Дзіця, вожык і змяя; Сава, асёл ды сонца; Жаба ў каляіне: [Байкі] // Мастацкае слова. Мн.; Вопросы белорусского правописания в свете учения И.В.Сталина о языке // Изв. АН БССР. № 2; Аб прынцыпах удакладнення беларускага правапісу // ЛіМ. 9 лют.; Трэцяя асоба: (Урывак з новай п'есы) // Там жа. 20 вер.; Слаўны шлях // Там жа. 15 ліст.; Пытанні беларускага правапісу ў святле вучэння І.В.Сталіна аб мове // Наст. газ. 7 лют.; Благотворное влияние могучего таланта // Сов. Бел. 4 марта.

1953. Жыццё і творчасць народнага паэта Беларусі Якуба Коласа // Полымя. № 1; Зацікаўленая асоба: П'еса // Там жа. № 2; [Выступленне на сесіі Вярхоўнага Савета БССР] // Звязда. 21 жн.; Сов. Бел. 21 янв. / Пад сваім прозв.; Пясняр камунізма // ЛіМ. 18 ліп.; Аб сатырычнай камедыі // Там жа. 31 кастр.

1954. Поп і папугай; Дзіця, вожык і змяя: [Байкі]; Мая прынцыповасць; Расцеце — не аглядайцеся; Сабачане; Ёсць на свеце дабрадзеі: [Апавяданні] // Размова па шчырасці. Мн.; Угоднікі-маўчальнікі: [Байка]; Непатрэбна нам царква — вучаць кнігі Леніна: Частушкі // Гродзен. праўда. 24 вер.; Заўсёды разам // Звязда. 17 студз.; Канфлікт — аснова п'есы // ЛіМ. 11 снеж.; З «барышом»: [Верш] // Чырв. змена. 22 жн.

1955. [Прамова на III з'ездзе пісьменнікаў БССР] // Трэці з'езд савецкіх пісьменнікаў БССР. Мн.; Мы хочам дабра чалавецтву // ЛіМ. 19 сак.

1956. Дзіця, вожык і змяя: [Байка]; Расціце — не аглядайцеся: [Гумарэска] // Мастацкае слова. Мн.; Он заслужил любовь народа // ЛГ. 16 авг.; Жаба ў каляіне: [Байка] // Ніва. 25 сак.; Язычок: [Верш] // Там жа. 11 ліст.; Сава, асёд ды сонца: (Байка) // Піянер. Бел. 23 сак.

1957. Чым вялікі Маякоўскі? // Маякоўскі ў Беларусі. Мн.; Сава, асёл ды сонца; Жаба ў каляіне; Кувада: (Байкі) // Пад сцягам Кастрычніка. Мн.; Прамова на трэцім Пленуме праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі // ЛіМ. 20 сак.; Жаба ў каляіне: Байка // Мін. праўда. 20 ліп.; Калі ў краме ёсць нястача: [Байка] // Ніва. 20 студз.; Дзед і баба: [Байка] // Там жа. 12 мая; Рак: [Байка] // Там жа. 2 чэрв.; Дыпламаваны баран: [Байка] // Там жа. 16 чэрв.; Вось такія дактары вымуць душу без пары // Там жа. 4 жн.; Еще раз в защиту памятников культуры: Письмо в редакцию // Сов. Бел. 11 июля / У сааўт.; Заявле-

ние группы ученых БССР по вопросу о запрещении применения и использования ядерного оружия // Там жа. 15 авг. / У сааўт.

1958. Адбіў хлеб у Іуды // За вярт. на Радзіму. № 94; Быць будаўнікамі камунізма // Маладосць. № 10; Людзі і д'яблы: П'еса // Полымя. № 4; Шлях да шчасця // Звязда. 31 снеж.; Людзі і д'яблы: Урывак з п'есы // Калг. праўда. 12 чэрв.; Героіка партызанскай барацьбы // Там жа. 12 чэрв.; Утро моего народа // Правда. 31 дек.

1959. Устарела техника; Калядная размова; Цёткам навука: [Вершы] // Антырэлігійныя вершы беларускіх паэтаў. Мн.; Жыццё і творчасць народнага паэта Беларусі Якуба Коласа // Вялікі пясняр беларускага народа. Мн.; Мы не паклонімся богу; Вось такія дактары вымуць душу без пары; Тварам да вёскі; Цёткам навука (З велікодных здарэнняў): [Вершы]; Чорт: Байка; Як ён стаў бязбожнікам: Апавяданне // З цемры да святла. Мн.; Выдатны пісьменнік і чалавек // Кузьма Чорны. Мн.; Автобиография // Советские писатели: Автобиографии: В 2 т. М., Т. 1; Лучезарное завтра: (Новогодние размышления) // Дружба народов. № 1; Шлях да шчасця // За вярт. на Радзіму. № 4; З фашыстоўскай падваротні: [Верш] // Там жа. № 7; [Прамова на ўрачыстым адкрыцці літаратурнага музея Якуба Коласа] // Там жа. № 92; У народнага пісьменніка: [Інтэрв'ю] // Маладосць. № 5; Прамова К.Крапівы: [На IV з'ездзе пісьменнікаў Беларусі] // Полымя. № 3; ЛіМ. 13 лют.; Прамова дэпутата К.К.Атраховіча (Крапівы) // Віцеб. рабочы. 8 крас.; Звязда. 8 крас.; ЛіМ. 8 крас.; Сов. Бел. 8 апр.

1960. Сука ў збане: Байка // А гармонік грае, грае. № 1; Чаго ж яна «рада?» // Голас Радзімы. № 45; Эпіграмы // Полымя. № 3; Прамова на з'ездзе настаўнікаў Беларускай ССР // ЛіМ. 16 жн.; Віншую таленавіты калектыў // Там жа. 23 снеж.; Прывітанне братам па працы! // Наст. газ. 10 жн.; [Выступленне] // Там жа. 14 жн.

Пасля заканчэння вучобы ў Пецярубргу (1913) Я.Купала вярнуўся ў Вільню і пачаў працаваць сакратаром ў «Беларускім выдавецкім таварыстве», затым перайшоў у рэдакцыю газеты «Наша ніва». З сакавіка 1914 газета пачала выходзіць за подпісам Янкі Купалы, як адказнага рэдактара (фактычна абавязкі рэдактара ён пачаў выконваць значна раней). У студзені 1915 камітэт па справах друку ў Вільні ўзбудзіў супраць яго, як рэдактара «Нашай нівы», судовую справу за надрукаванне артыкула «Думкі». У сувязі з набліжэннем лініі фронта Першай сусветнай вайны 8 жніўня 1915 Я.Купала эвакуіраваўся з Вільні. Ён наведаў у Акопах маці, па запрашэнні свайго знаёмага С.Жывапісцава выехаў ў Арол, а потым у Маскву, дзе паступіў ў народны універсітэт імя А.Шаняўскага на гісторыка-філасофскі факультэт. 23 студзеня 1916 у Маскве Я.Купала ажаніўся з Уладзіславай Францаўнай Станкевіч. Неўзабаве яго прызвалі ў армію: некалькі месяцаў служыў у Мінску старшым рабочым у дарожна-будаўнічым атрадзе Варшаўскай акругі шляхоў зносін, а затым у Полацку і Смаленску. З ліпеня 1918 Купала працаваў агентам па забеспячэнні харчамі Заходняй вобласці, часта выязджаў у камандзіроўкі ў Смаленскую і Курскую губерніі. Разам з М.Гарэцкім паэт быў слухачом факультэта гісторыі мастацтваў Смаленскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута. У Смаленску ён сустракаўся з Ц.Гартным, Ф.Туруком, А.Чарвяковым, Я.Дылам і інш. Шмат часу прысвячаў вывучэнню славянскай міфалогіі дзеля працы над перакладам «Слова аб паходзе Ігаравым».

У 1919, пасля абвяшчэння БССР, Я.Купала пераехаў на сталае жыхарства ў Мінск. Тут ён працаваў загадчыкам бібліятэкі пры Беларускай хатцы, рэдагаваў часопісы «Рунь» (1920) і «Вольны сцяг» (1920—22). У гэты час 1920—22 цяжка хварэў, аднак, акрыяўшы, зноў вярнуўся да актыўнай грамадскай і літаратурнай дзейнасці. З пачатку 1921 Я. Купала працаваў намеснікам загадчыка літаратурна-выдавецкага аддзела Народнага камісарыята асветы БССР, уваходзіў у склад Акадэмічнай камісіі Акадэмічнага цэнтра Наркамасветы БССР па ўкладанню і апрацоўцы беларускай тэрміналогіі. З'яўляўся членам навукова-літаратурнай (а пасля навукова-рэдакцыйнай) калегіі Наркамасветы БССР, якая разглядала прадстаўленыя да друку творы (пазней яна стала называцца камісіяй, а яе старшынёй быў прызначаны Я.Купала). У 1921 адбыўся інцыдэнт з уладамі: на паэта быў накладзены хатні арышт і канфіскаваны рукапісы. Я.Купала быў сярод ініцыятараў стварэння Беларускага драматычнага тэатра (1920), Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1921), Інстытута беларускай культуры (1922, абраны яго правадзейным членам). Прымаў удзел у Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі (1926). Разам з Я.Коласам, Ц.Гартным, А.Гурло, М.Чаротам і іншымі пісьменнікамі быў адным з ініцыятараў стварэння літаратурнага аб'яднання беларускіх пісьменнікаў «Полымя», актыўна удзельнічаў у рабоце гэтага аб'яднання (1927—32).

Аднак ужо набліжаліся злавесныя 30-я гады, калі ўсё нацыянальна значнае ў мастацтве абвяшчалася класава варожым і шкодным. Творы Я.Купалы (зборнікі «Жалейка», «Гусляр») падвяргаліся значнай цэнзурнай праўцы. Летам 1930 у друку з'явіўся артыкул Л.Бэндэ «Шлях паэта», у якім паэт абвяшчаўся «ідэолагам буржуазнага нацыянал-адраджанізму». У 1930 у Акопах былі раскулачаны маці і сястра паэта і прызначаны да высылкі ў Котлас. Актывізацыя сталінскага тэрору, барацьба з так званай «нацдэмаўшчынай» прывяла ўлетку 1930 да шматлікіх арыштаў сярод пісьменнікаў, дзеячаў навукі, асветы, культуры. Я.Купалы тады не трапіў за краты, але яго рэгулярна выклікалі на допыты ў ДПУ, дзе патрабавалі паказанняў аб «контррэвалюцыйнай» арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі», лідэрам якой ён нібыта быў. Узвесці такі паклёп на сябе і на іншых паэт не мог, на допытах праяўляў мужнасць і высакароднасць, што было адзначана і ягонымі следчымі. 27 лістапада 1930 Я.Купала зрабіў спробу самагубства. Аднак яго жыццё ўдалося выратаваць. У снежні 1930 у «Звяздзе» быў апублікаваны так званы «пакаянны» ліст Я.Купалы, напісаны фактычна пад дыктоўку Л.Бэндэ, у якім паэт вымушаны быў прызнавацца ў «памылках» і «шкодных поглядах», абяцаў парваць з «кулацкім нацыяналістычным адраджанізмам» і «аддаць усе свае сілы сацыялістычнаму будаўніцтву». Вонкава стварылася ўражанне, нібыта Купала сапраўды быў у гушчы літаратурнага і грамадскага жыцця: ён удзельнічаў у розных камітэтах і камісіях па ўшанаванні памяці і правядзенні юбілеяў класікаў рускай і нацыянальных літаратур, быў дэлегатам тагачасных урачыстых літаратурных форумаў і з'ездаў. Аднак гэта ўсё было пампезным камуфляжам нечуванай палітыкі духоўнага і фізічнага тэрору, якую праводзіў сталінскі апарат. У 1934 Я.Купала, дзякуючы спецыяльным загадам М.Горкага і рэдактара «Известий» І.Гронскага, якія ратавалі яго ад рэпрэсій, ўдзельнічаў у рабоце 1-га з'езда Савецкіх пісьменнікаў БССР, выбраны членам Праўлення і дэлегатам на 1-ы з'езд ССП СССР з правам раша-

ючага голасу.

У 1937 Я.Купала зноў аказаўся ў спісе чарговых ахвяраў рэпрэсій сярод тых нешматлікіх пісьменнікаў, хто яшчэ заставаўся на свабодзе. Аднак расправу над паэтам удалося адцягнуць яшчэ на пяць гадоў. Ён быў нават выбраны ў склад новага бюро секцыі паэзіі ССП БССР (1937), у склад прэзідыума Праўлення ССП СССР (1939), дэпутатам Мінскага гарадскога Савета. У 1939 разам з брыгадай беларускіх пісьменнікаў удзельнічаў у рабоце Народнага сходу Заходняй Беларусі, які прыняў Дэкларацыю аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад БССР.

Вялікая Айчынная вайна заспела паэта ў Каўнасе, дзе ён знаходзіўся па запрашэнні літоўскіх пісьменнікаў. У першыя ж дні вайны у Мінску ад варожых бомбаў згарэла хата паэта з яго вялікім архівам і бібліятэкай. У ліпені агнём нямецкай артылерыі знішчана дача паэта ў Ляўках. 30 чэрвеня Купала выехаў з Ляўкоў у Маскву. З лістапада 1941 да сярэдзіны чэрвеня 1942 жыў каля Казані — у пасёлку Пячышчы Верхнеўслонскага р-на.

З самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны паэт сваім словам уключыўся ў барацьбу з фашысцкімі захопнікамі: быў абраны членам прэзідыума Усеславянскага антыфашысцкага камітэта, выступаў на антыфашысцкім мітынгу, разам з А.Талстым, А.Карнейчуком, В.Васілеўскай, З.Неедлым і іншымі ўдзельнікамі мітынгу падпісаў адозву да братоўславян з заклікам узняцца на вызваленчую барацьбу супраць фашызму. Удзельнічаў у 1-м Усеславянскім мітынгу і ў навуковай сесіі АН БССР (у Казані), дзе выступіў з дакладам «Айчынная вайна і беларуская інтэлігенцыя».

18 чэрвеня 1942 Я.Купала прыехаў у Маскву, а 28 чэрвеня у гасцініцы «Масква» ён трагічна загінуў — упаў у лесвічны пралёт з 10-га паверха. Існуюць тры версіі гібелі паэта: няшчасны выпадак, самагубства, забойства. Афіцыйна доўгі час падтрымлівалася першая версія. У эмігранцкім беларускім друку смерць паэта звязвалася з самагубствам. Публікацыі канца 80-х г. (Б.Сачанка, Г.Колас і інш.), у якіх супастаўляюцца факты, аналізуюцца сведчанні відавочцаў і меркаванні блізкіх людзей, даюць падставу лічыць, што Я. Купала быў забіты агентамі дзяржбяспекі. Матэрыялы камісіі, якая займалася высвятленнем абставін яго гібелі, да гэтага часу засакрэчаныя, таму дакументальнага пацверджання пакуль што ніводная з версій не мае. 1 ліпеня 1942 пасля крэмацыі Я.Купала быў пахаваны ў Маскве. У 1962 урна з прахам Купалы перавезена ў Мінск і пахавана на Вайсковых могілках. Выбіраўся кандыдатам у члены ЦВК БССР у 1927—29, членам ЦВК БССР у 1929—31, 1935—38. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР з 1940. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалём, ганаровымі граматамі Вярхоўных Саветаў Беларускай ССР і Грузінскай ССР.

Свой першы літаратурны твор Я.Купала напісаў у 1903 у в. Селішчы: гэта быў верш, прысвечаны сястры Леакадзіі ў дзень яе нараджэння. Пачынаў пісаць па-польску (некалькі вершаў былі надрукаваны ў польскім часопісе «Ziarno» («Зерне»). Па сведчанні паэта, «Дудка беларуская» Ф.Багушэвіча і «Гапон» В.Дуніна-Марцінкевіча канчаткова пераканалі яго, што менавіта родным словам, а не рускай або польскай мовай, ён зможа выказаць у вершах душу і запаветныя думкі беларускага народа. Да таго ж на самым пачатку творчай дзейнасці будучы паэт пазнаёміўся і вельмі зблізіўся ў Карпілаўцы з беларускім пісьменнікам Ядвігіным Ш. (Антонам Лявіцкім), які заахвочваў яго пісаць па-беларуску. На станаўленне Я.Купалы як паэта паўплываў таксама беларускі публіцыст і літаратурны крытык У.Самойла (адзін з рэдактараў газеты «Минский курьер»). Першы беларускі верш «Мужык» быў апублікаваны ў мінскай газеце «Северо-Западный край» 15 мая 1905. З 1907 вершы паэта сістэматычна друкаваліся ў газеце «Наша ніва». Іх тэматыка — прыпечанае бяспраўнае жыццё беларускага селяніна, краса роднага краю, прыгажосць стваральнай працы чалавека. Аднак нацыянальны ўціск і рэчаіснасць, поўная сацыяльных супярэчнасцей, залежнасць ад абставін і жорсткіх законаў, а часцей беззаконня, ствараліі мастацкую калізію паміж высокімі ідэаламі, памкненнямі творцы і тым рэальным жыццём, у якім яму даводзілася змагацца за сваё існаванне і, у рэшце рэшт, гінуць. Ужо ў ранніх творах Купалы акрэсліваецца ідэя свабоды — нацыянальнага, сацыяльнага і духоўнага разняволвання чалавека — як вызначальная ідэя ўсей яго творчасці. У 1908 у Пецярбургу выйшла першая кніга паэзіі Я.Купалы «Жалейка», якая двойчы канфіскоўвалася: першы раз па распараджэнні Пецярбургскага камітэта па справах друку, другі — па прадпісанні віленскай адміністрацыі. Разумеючы вялікае значэнне выхаду першай купалаўскай кнігі для беларускай культуры, У.Самойла ў сваім крытычным водгуку пад назвай «Вялікае свята» так пісаў аб «Жалейцы» і яе аўтары: «Сонца жывой, сапраўднай паэзіі заглянула ў ваконца цёмнай, беднай, але вялікай хаты беларускага народа! Няхай ён будзе для беларусаў тым, чым быў Шаўчэнка для Украіны!.. Прыдуць лепшыя часы, і за подзвіг яго родны народ заплаціць яму лепшай сваёй удзячнасцю — бессмяроццем!...». Другі зборнік вершаў Я.Купалы «Гусляр» выдадзены лацінкай (Пецярбург, 1910). У адрозненне ад «Жалейкі» з яе элегічнасцю, плачам над адвечнай нядоляй селяніна, у «Гусляры» выразна праяўляецца рамантычнае светаадчуванне аўтара, акрэсліваецца філасофская, экспрэсіянісцкая плынь яго лірыкі. Са шматлікіх вершаў «Гусляра» паўстае рамантычны вобраз паэта як «сына міра», прарока, што сам спазнаў таямніцы свету і жадае адчыніць іх людзям. Моцным акордам гучыць эсхаталагічная тэма, матыў самотнасці і разгубленасці лірычнага героя, які гатовы праклясці ўвесь свет і забыцца ў вечным сне. Менавіта ў «Гусляры» — выданні часоў, калі грамадства перажывала перыяд рэакцыі, найбольш выразна адбілася рамантычнае раздваенне душы лірычнага героя, у якой суіснуюць адчуванні далучанасці да Сусвету, пачуццё абранасці і высокай наканаванасці чалавека, а з другога боку, бяссілле і адчай пры сутыкненні з чужой і варожай рэчаіснасцю. Гэтыя матывы гучалі не толькі ў філасофскай медытацыйнай лірыцы, але і ў творах баладнага жанру («Памяці С.Палуяна»), драматычнай паэме «Адвечная песня».

Творча плённым, узлётным для Я.Купалы быў перыяд 1910—13, калі ён вучыўся ў Пецярбургу, а ўлетку жыў у Акопах, дзе напісаны буйнейшыя творы гэтай пары. Трэці паэтычны зборнік Я.Купалы «Шляхам жыцця» (1913) быў фактычна вяршынным дасягненнем тагачаснай беларускай літаратуры, а яго аўтар стаў бясспрэчным яе лідэрам. У вершах гэтага зборніка выразна адбіўся патрыятызм і глыбінны гістарызм паэта, найбольш яскрава ўвасобілася ідэя свабоды і абуджэння нацыянальнай свядомасці беларускага народа. Купала імкнуўся

абудзіць у чытача пачуццё гордасці і ўдзячнасці да продкаў, якія былі здольныя захоўваць сваю дзяржаўнасць і незалежнасць, бараніць зямлю ад ворагаў, развіваць адметную культуру («Над Нёманам», «На куццю», «На дзяды» і інш.): многія з твораў, дзе развіваліся такія матывы, былі ў пазнейшы час забароненымі, не ўваходзілі ў зборы твораў і не перадрукоўваліся да канца 80-х гадоў. Адраджэнцкі, нацыянальны характар творчасці Я.Купалы праяўляўся і ў вершах рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку, у якіх паэт апяваў набліжэнне светлых перамен у жыцці, услаўляў будучыню, прадвесцем якой для яго быў створаны паэтычным уяўленнем вобраз Маладой Беларусі, абуджанай да гістарычнага самасцвярджэння. У вобразе Прарока (Званара, Гусляра), які прымаў аблічча Падарожнага, Незнаёмага, паэт прадракаў Вялікі Сход, дзе будзе вырашаны нацыянальны лёс народаў і сацыяльны лёс працоўных. У паэмах «Курган», «Бандароўна», «Магіла льва», драматычнай паэме «Сон на кургане», паэме-ідыліі «Яна і я» Купала выявіў сябе буйнейшым прадстаўніком нацыянальнага рамантызму. У сімвалічных вобразах і карцінах ён стварыў шырокае палатно нацыянальнага быцця ў яго сацыяльным зрэзе, паказаў арганічнасць выспявання ў ім рэвалюцыйнай ідэі. У 1914—15 з'яўляецца цыкл яго вершаў «Песні вайны», шэдэўры любоўнай лірыкі («Таей даўгажданай», «Сыйду», «На вуліцы», «Мусіць трэба было», «А яна...»). На працягу трох наступных гадоў Купала, перажываючы разам з народам цяжкі перыяд нацыянальнай гісторыі, вершаў не пісаў, зноў пачаў тварыць у канцы 1918. Яго вершы той пары «Званы», «Бураломе», «Спадчына», «Рунь», «Першы снег», «Паязжане» і інш. — гэта роздум аб гістарычных шляхах Бацькаўшчыны, вынашаны ў трохгадовым маўчанні, прасякнуты ўласцівай паэту філасофскай глыбінёй. Гэтыя вершы ўвайшлі ў чацвертую паэтычную кнігу Купалы «Спадчына» (1922). Зборнік выклікаў пэўнае расчараванне тагачаснай крытыкі, якая чакала ад паэта новых тэм і матываў — услаўлення Кастрычніка і прынесеных ім жыццёвых перамен. Купала ж заставаўся песняром Бацькаўшчыны, палітычнае становішча якой у гэты перыяд было вельмі складаным. Мастацкі позірк паэта імкнуўся вылучыць сутнасць падзей, іх суаднесенасць з каштоўнасцю кожнага асобнага чалавека. Ён бачыў і адчуваў, як у рэвалюцыйнай віхуры нішчацца і руйнуюцца лёсы, як родныя людзі становяцца па розныя бакі барыкад, як пошукі выйсця абарочваюцца бездарожжам. Таму ў яго лірыцы па-ранейшаму гучалі драматычныя і трагічныя ноты, жаданым заставаўся ідэал свабоднай Бацькаўшчыны. Другую паслярэвалюцыйную кнігу Я.Купалы «Безназоўнае» (1925) склалі вершы, пераважна створаныя ў 1919 і 1921, а таксама аднайменная паэма, напісаная ў 1924. Многім даследчыкам у кнізе бачылася адлюстраванне ранейшых нацыянальна-адраджэнцкіх поглядаў аўтара і тлумачылася як негатыўная з'ява. Для Купалы ж вершы ў кнізе і паэма «Безназоўнае» былі арганічным, паслядоўным выяўленнем яго творчага «я». Паэт не адступаў ад сваёй канцэпцыі чалавека, апірышчам духоўнасці для якога і ў перайначаным пралетарскай рэвалюцыяй свеце заставаліся «сны аб Беларусі».

У 30-я гады, калі творчае самавыяўленне станавілася немагчымым, Купала ўсё ж імкнуўся асэнсаваць плынь жыцця, каб стварыць адэкватны мастацкі вобраз. Аднак дыктат рэчаіснасці над воляй мастака непазбежна прыводзіў да таго, што шлях творчай эвалюцыі Купалы ў гэтыя гады — гэта шлях ад адраджэнцкага рамантызму з яго культам духоўна разняволенай асобы і нацыянальнай незалежнасці да твораў рэпартажнага характару, мастацкі ракурс якіх быў прадвызначаны пануючай ідэалогіяй (паэма «Над ракой Арэсай»). Хаця ў некаторых яго вершах Ляўкоўскага цыклу («Алеся», «Лён») творчае самавыяўленне аўтара дасягнула пэўнай вышыні. У 1940 выйшла кніга паэзіі «Ад сэрца», куды былі ўключаны вершы 1937—39 і паэма «Тарасова доля».

Я.Купала стаў таксама прызнаным нацыянальным драматургам. Яго камедыя «Паўлінка» (напісана ў 1912, пастаўлена Беларускім музычна-драматычным гуртком у Вільні ў 1913) як твор класічнай беларускай драматургіі не сыходзіць са сцэны да гэтага часу і з'яўляецца візітнай карткай Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я.Купалы ў Мінску. Ён аўтар драмы «Раскіданае гняздо» (напісана ў 1913, пастаўлена Першым таварыствам беларускай драмы і камедыі ў Мінску ў 1917), сцэнічнага жарту «Прымакі (напісаны ў 1913, пастаўлены БДТ—2 у 1936 у Бабруйску), сатарычнай камедыі «Тутэйшыя» (напісана ў 1922, пастаўлена БДТ—1 у 1926). Як і ў лірыцы, у персанажах сваёй драматургіі (Паўлінка і Якім Сарока, Сымон Зяблік, Алена Гарошка і Янка Здольнік) Я.Купала ўвасобіў высокія духоўныя памкненні чалавека, далучанага да перадавых ідэй свайго часу, яго высокія маральныя якасці, яго права кіравацца ў сваіх учынках уласным выбарам, жаданне знайсці справядлівасць. Ім створаны каларытныя, драматургічна насычаныя тыпажы камічнага і сатырычнага плану (Адольф Быкоўскі, Крыніцкія і Пустарэвічы ў «Паўлінцы», Мікіта Зносак у «Тутэйшых»), якія давалі прастору для іх рэжысёрскага прачытання і акцёрскага ўвасаблення. Сатырычная камедыя «Тутэйшыя», у якой гучала ідэя нацыянальнай незалежнасці Беларусі як ад Захаду, так і Усходу, доўгі час была ў ліку забароненых твораў. Цэнтральным персанажам гэтага твора, па сутнасці, з'яўляецца сама Беларусь — як адзіная непадзельная каштоўнасць, якой усёй душой імкнуцца служыць Аленка і Янка Здольнік, якую гатовы выгадна прадаць Мікіта Зносак і якую імкнуцца падзяліць ці падпарадкаваць сабе кожныя новыя ўладары ў пераломны час. Купалаўскія п'есы складаюць залаты фонд беларускай драматургіі.

Я.Купала стаяў таксама ля вытокаў нацыянальнай публіцыстыкі і журналістыкі як самастойнай галіны літаратурнай дзейнасці. Яго дарэвалюцыйныя публіцыстычныя творы заклікалі да паляпшэння сацыяльнага становішча шырокіх народных мас Беларусі («Думкі з пабыцця ў Фінляндыі на Іматры», «З гуты Залессе»), закраналі праблемы нацыянальнай самасвядомасці («Ці маем мы права вымагацца роднай мовы», «Святкаванне Купалы ў Вільні», «Вера і нацыянальнасць» і інш.). У 1913 пад псеўданімам Адзін з «парнаснікаў» Купала артыкулам «Чаму плача песня наша» прыняў удзел у вядомай дыскусіі з В.Ластоўскім (Юркам Верашчакам), у ходзе якой фактычна выпрацоўваліся і сцвярджаліся эстэтычныя прынцыпы тагачаснай беларускай літаратуры (не толькі ўстаноўка яе на народнасць і дэмакратызм, але і арыентацыя на высокі мастацкі ўзровень еўрапейскай літаратуры). У публіцыстыцы перыяду рэвалюцыі і грамадзянскай вайны паэт пісаў аб шляхах беларускага народа да нацыянальнага самавызначэння, закранаў праблемы нацыянальнай палітыкі Савецкай улады пасля

Кастрычніцкай рэвалюцыі. Як прадстаўнік нацыянальнай гуманістычна настроенай інтэлігенцыі, ён прапаведваў ідэал нацыянальнай рэвалюцыі, якая дазволіла б кожнаму народу стаць гаспадаром свайго лёсу, і супрацьпастаўляў яе рэвалюцыі сацыяльнай (пралетарскай) з яе дыктатурай, тэрорам і жаданнем падпарадкаваць сваім ідэям увесь свет («Справа незалежнасці Беларусі за мінулы год»). Погляды Купалы вызначаліся дэмакратызмам, адмаўленнем насілля, сцвярджэннем прыярытэту агульначалавечых духоўных каштоўнасцей над класавымі. У гады Вялікай Айчыннай вайны публіцыстычным словам Купала заклікаў да змагання супраць фашызму. Артыкулы з яго подпісам змяшчаліся ў газетах «Правда», «Известия», «Красная звезда» і інш.

Шмат і плённа, на працягу ўсёй творчай дзейнасці, Я.Купала займаўся перакладам. Ён перакладаў творы А.Кальцова, М.Някрасава, А.Міцкевіча, М.Канапніцкай, У.Сыракомлі, драму «Эрас і Псіха» Е.Жулаўскага. Ён зрабіў мастацкі пераклад «Слова аб палку Ігаравым» (празаічны ў 1919, паэтычны ў 1920), пераклаў «Інтэрнацыянал» Э.Пацье (1921). Шмат часу аддаваў мастацкаму перакладу ў 30-я гады (паэма «Медны коннік» А.Пушкіна, творы Т.Шаўчэнкі). Творы Купалы (пераважна паэтычных жанраў) перакладзены на многія мовы свету.

Творчасць Я.Купалы — невычэрпная крыніца эстэтычнага натхнення, мастацкай дасканаласці, якая жывіць сучасны літаратурна-мастацкі працэс. Традыцыі пісьменніка ўплывалі на беларускіх паэтаў розных пакаленняў. Асаблівае значэнне спадчына Купалы набыла ў канцы 80-х гадоў, калі былі надрукаваны шматлікія раней забароненыя яго творы. Імя Я.Купалы стала ў гэты час сімвалам новай хвалі нацыянальнага адраджэння і духоўным арыенцірам для маладога пакалення беларускіх літаратараў. Янка Купала — класік беларускай літаратуры, вялікі славянскі паэт і гуманіст. Яго творчасць заслужыла сусветнае прызнанне: у 1982 на Беларусі і, па рашэнні ЮНЕСКО, ва ўсім свеце урачыста святкавалася 100-годдзе з дня нараджэння народнага песняра.

Памяць пра Янку Купалу свята ўшаноўваецца беларускім народам. Яго імя прысвоена Беларускаму Дзяржаўнаму акадэмічнаму тэатру ў Мінску, Інстытуту літаратуры АН Беларусі, Гродзенскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту. У Мінску створаны Літаратурны музей Янкі Купалы, арганізатарам і першым дырэктарам якога была ўдава паэта У.Ф.Луцэвіч (1891—1960). На радзіме Я.Купалы, у Вязынцы, адкрыты філіял Літаратурнага музея, створаны Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка», дзе штогод у 1-ю дэкаду ліпеня праводзяцца купалаўскія святы паэзіі. Ва ўрочышчы Ляўкі Аршанскага р-на Віцебскай вобл. адбудавана спаленая ў час вайны дача паэта, у будынку былой канторы Копыскага лясніцтва адкрыты філіял Літаратурнага музея Янкі Купалы, створаны Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Ляўкі». Мемарыялам увекавечана памяць паэта ў Акопах. Яго музей-кватэра адкрыта ў сяле Пячышчы Верхнеўслонскага р-на Татарстана (у 13 км ад Казані).

Помнікі Янку Купалу ўзвышаюцца ў Мінску — у парку імя Янкі Купалы (скульптары А.Анікейчык, Л.Гумілеўскі, А.Заспіцкі, Дзяржаўная прэмія БССР 1974) і на Вайсковых могілках на магіле паэта (скульптары А.Анікейчык, Л.Заспіцкі); у Купалаўскім мемарыяльным запаведніку «Ляўкі» (скульптар А.Анікейчык, створаны на аснове кампазіцыі «Восень паэта»). Помнікі-бюсты ўстаноўлены ў Купалаўскім мемарыяльным запаведніку «Вязынка» у Радашковічах (скульптар А.Глебаў), у Араў-парку ў ЗША (скульптар А.Анікейчык). Устаноўлены мемарыяльныя дошкі на дамах, дзе ў розныя часы жыў Я.Купала: У Вязынцы, Ляўках, в. Яхімаўшчына Маладзечанскага р-на, в. Сенніца Мінскага р-на, в. Бяларучы, в. Старая Беліца Сенненскага р-на, в. Косіна Лагойскага р-на, у г. Мар'іна Горка, Барысаве, Маладзечне, Капылі. Пастановай Савета Міністраў БССР у 1959 устаноўлена Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы (з 1965 Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы).

На Беларусі імем Янкі Купалы названы 4 калгасы — у Стаўбцоўскім, Пухавіцкім, Аршанскім і Клімавіцкім р-нах, саўгасы — у Маладзечанскім і Воранаўскім р-нах; пасёлак у Глускім, вёска ў Пухавіцкім р-нах. Яго імем названа 10 бібліятэк: гарадскія — Лідская, Мінская цэнтральная, Брэсцкая, Полацкая, Магілёўская, Віцебская і 6-я Гомельская, раённыя — Ляхавіцкая, Крупская, Вялікакракоцкая сельская; 8 сярэдніх школ: № 3 г. Мазыра, № 19 г. Мінска, № 1 г. Маладзечна, № 5 г. Бабруйска, Бяларуцкая Лагойскага, Копыская Аршанскага, Камунараўская 8-гадовая Любанскага і Сенніцкая Мінскага раёнаў. Імем паэта названа больш за 60 вуліц і завулкаў у гарадах і вёсках Беларусі: у Мінску, ва ўсіх абласных цэнтрах, у гарадах Ашмяны, Бабруйск, Барысаў, Баранавічы, Быхаў, Ваўкавыск, Жлобін, Лагойск, Ліда, Мазыр, Маладзечна, Навагрудак, Орша, Пінск, Полацк і інш., гарадскіх пасёлках Глуск, Івянец, Радашковічы, Ружаны, Свіслач і інш., вёсках Сноў Нясвіжскага р-на і Лебедзева Маладзечанскага р-на. Пра ўсенароднае ўшанаванне памяці паэта сведчаць купалаўскія найменні за межамі Беларусі: сярэдняя школа № 53 г. Душанбе, 40-я масавая бібліятэка г. Харкава, вуліцы ў Кіеве, Ташкенце, Тбілісі, Рызе, Ніжнім Ноўгарадзе, Душанбе, Запарожжы, Беластоку і інш. Імем Янкі Купалы названы цеплаход Дунайскага і параход Волжскага параходстваў. Устаноўлены мемарыяльныя дошкі, прысвечаныя песняру: у пас. Пячышчы, Вільнюсе, Санкт-Пецярбургу, Смаленску, Кіславодску, пас. Гаспра Ялцінскага гарсавета, в. Соф'іна Раменскага р-на Маскоўскай вобл. У г. Порту-Алегра (Бразілія) у 1932 імя Я.Купалы прысвоена бібліятэцы-чытальні пры аб'яднанні «Асвета». У 1992 у гонар паэта была выпушчана манета вартасцю ў 1 рубель.

Вобраз Янкі Купалы заняў годнае месца ў літаратуры і мастацтве. Яму прысвечаны вершы і п'есы, музычныя і кінематаграфічныя, жывапісныя і графічныя творы. Кампазітарам В.Помазавым напісаны вакальна-сімфанічны твор «Янка Купала». Жыццю і творчасці паэта прысвечаны хранікальна-дакументальны фільм «А зязюля кукавала» (1972), тэлефільмы «Паклон мой народу за песні» (1982), «Ніколі я не паміраў» (1992), «Імша па Купалу» (1993). Да юбілеяў Я.Купалы былі прыўрочаны мастацкія выстаўкі (1972, 1982, 1992). Творы паэта сталі крыніцай натхнення многіх кампазітараў. На сюжэт «Кургана» Я.Глебаў напісаў аднайменны балет, а І.Лучанок паэму-легенду «Гусляр», паводле «Паўлінкі» Ю.Семяняка стварыў аднайменную музычную камедыю. Г.Гарэлава напісала сімфанічную паэму «Бандароўна», А.Мдзівані стварыў цыкл хораў, Л.Шлег — харавую паэму «Вяснянка» паводле паэмы «Яна і я». Оперу-прытчу «Песня пра долю» на словы Купалы выконвае ансамбль «Пес-

няры». Вершы паэта паклалі на музыку М.Аладаў, М.Анцаў, А.Багатыроў, К.Галкоўскі, А.Грыневіч, М.Мацісон, С.Палонскі, А.Пашчанка, Р.Пукст, Л.Рагоўскі, А.Сакалоўскі, А.Туранкоў, У.Тэраўскі, Я.Цікоцкі, М.Чуркін, Л.Ямпольскі і інш. На кінастудыі «Беларусьфільм» паводле п'ес Я.Купалы «Паўлінка», «Раскіданае гняздо» і паэмы «Магіла льва» былі створаны фільмы.

Складаны лёс напаткаў архіў Я.Купалы. Вялікая частка напісанага ім прапала: паэт успамінаў, што калі жыў на вёсцы, шмат напісанага перадаваў У.Самойлу, — пры вобысках ці іншых абставінах частка рукапісаў была страчана; дасылаў у Вільню ў рэдакцыю «Нашай нівы» рэвалюцыйныя вершы, якія па тагачасных умовах не былі надрукаваныя і недзе згубіліся. Частка матэрыялаў разам з бібліятэкай паэта знікла з Мінска ў час нямецкай акупацыі (1918). Пазней частка матэрыялаў знайшлася ў архіве Б.Эпімах-Шыпілы. У 1919—20 архіў Купалы быў канфіскаваны польскай дэфензівай, у 1921 — савецкай «надзвычайкай». У гады Вялікай Айчыннай вайны многія рукапісы паэта згарэлі разам з яго домам у Мінску і дачай у Ляўках. Аўтографы Купалы, што захоўваліся ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР, былі вывезены ў Германію. Пасля смерці паэта былі прыняты захады, каб сабраць і зберагчы яго рукапісную спадчыну. Пастановай СНК БССР і Бюро ЦК КП(б)Б, ад 2.7.1942 усе кнігі, рукапісы, лісты, фатаграфіі і інш. матэрыялы, якія адносяцца да жыцця і дзейнасці паэта, былі абвешчаны дзяржаўнай уласнасцю. У Літаратурным музеі Янкі Купалы сабраны і зберагаецца яго асноўны рукапісны фонд — больш за 500 рукапісаў. Сярод іх уласна аўтографы займаюць 1154 старонкі, аўтарызаваны машынапіс на правах рукапісу 107 старонак, друкаваны тэкст на правах рукапісу 827 старонак. Яго аўтографы зберагаюцца таксама ў многіх сховішчах краіны: Інстытуце рускай літаратуры (Пушкінскім доме) Расійскай АН (фонд Л.Клейнбарта), Архіве Расійскай АН (фонд Я.Карскага), Расійскім дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва (фонд І.Белавусава), Інстытуце сусветнай літаратуры імя М.Горкага Расійскай АН (фонд К.Накаракава), Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве ў Санкт-Пецярбургу (фонд Галоўнага ўпраўлення па справах друку), Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве г. Масквы (фонд універсітэта імя А.Шаняўскага), Беларускім дзяржаўным архіве (фонд Наркамасветы, ЦВК БССР), Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы АН Беларусі і інш. Ёсць аўтографы Купалы ў прыватных калекцыях, а таксама за мяжой (зб. «Гусляр» з дарчым надпісам кампазітару Л.Рагоўскаму — ў бібліятэцы імя Асалінскіх у Вроцлаве, Польшча; рукапісы паэта — ў бібліятэцы і музеі імя Ф.Скарыны ў Лондане).

І.Э.Багдановіч, Ж.К.Дапкюнас.

Бібліяграфія

1.1.

Зб. тв.: [У 6 т.]. Мн., 1925—[1932]. Т. 1. Жалейка; Гусляр. Мн., 1925. Рэц.: Уліцзе [Дзяржынскі У.] // Полымя. 1925. № 6. Т. 2. Шляхам жыцця. Мн., 1926. Т. 3. Раскіданае гняздо; Тутэйшыя; Паўлінка; Прымакі. Мн., 1927. Т. 4. Сон на кургане; Адвечная песня; На папасе; Песня аб паходзе Ігара; Галька (пераклад). Мн., 1928. Рэц.: Веркін А. // Маладняк. 1928. № 9; Плашчынскі Я. // Узвышша. 1928. № 3; Цвяткоў Л. // Літ. дад. да газ. «Сав. Бел». 1928. № 17; Т. 5. Спадчына. Мн., 1928. Т. 6. [Вершы і пераклады дакастрычніцкага і савецкага перыяду]. Мн., 1932.

Зб. тв. Т. 1—3. Мн., 1928—32. Т. 1. Жалейка. Гусляр. (Вершы). Мн., 1928. Рэц.: Плашчынскі Я. // Узвышша. 1929. № 2; Т. 2. Шляхам жыцця: (Вершы). Мн., 1929. Т. 3. Раскіданае гняздо; Паўлінка; Прымакі. Мн., 1932 [На вокл. 1933].

Зб. тв. Мн., 1951—54. Т. 1. Вершы (1904—1907). Мн., 1951, 1954. Рэц.: Бурносов В. // За высокую требовательность в издании произведений классиков // Сов. Бел. 1951. 14 окт.; Клешчанка В. // Чырв. змена. 1951. 20 вер.; Новыя кнігі // Віцеб. рабочы. 1951. 19 мая; Т. 2. Вершы: (1908—1910). // Мн., 1952. Т. 3. Вершы: (1911—1917). Мн., 1953. Т. 4. Вершы: (1918—1942). Мн., 1953. Т. 5. Паэмы; Пераклады. Мн., 1954. Т. 6. Драматычныя творы. Мн., 1954. Рэц.: Бурносаў В. Думы вялікага песняра // Полымя. 1955. № 5; Івашын В. Важная падзея ў культурным жыцці рэспублікі // Камуніст Бел. 1955. № 11; Яго ж. Неўміручая паэзія // Звязда. 1954. 28 ліст.; Казека Я. Неўміручая спадчына: (Да выхаду Збору твораў Я.Купалы) // ЛіМ. 1955. 8 студз.; Камінскі Н. Аб заўвагах да «Збору твораў Янкі Купалы» // Там жа. 1957. 9 студз.; Ковальчук И. Значительное событие в культурной жизни республики: К выходу в свет Собрания сочинений Я.Купалы // Сов. Бел. 1954. 31 окт.; Яго ж. Событие в культурной жизни Белоруссии: К выходу в свет собрания сочинений Я.Купалы // Русский Голос (Нью-Йорк). 1954. 24 нояб.

Зб. тв.: У 6 т. Мн., 1961—63. Т. 1. Вершы і паэмы. (1904—1907). Мн., 1961. Т. 2. Вершы і паэмы: (1908—1910). Мн., 1961. Т. 3. Вершы і паэмы: (1911—1917). Мн., 1961. Т. 4. Драматычныя творы; Паэмы і п'есы. Мн., 1962. Т. 5. Вершы і паэмы: (1918—1932). Мн., 1962. Т. 6. Вершы і паэмы: (1933—1942); Публіцыстыка; Лісты. Мн., 1963. Рэц.: Бурносаў В. Здабыткі і страты // Полымя. 1965. № 12.

Зб. тв.: У 7 т. Мн., 1972—76. Т. 1. Вершы; Пераклады (1904—1907). Мн., 1972. Т. 2. Вершы; Пераклады: (1908—1910). Мн., 1973. Т. 3. Вершы; Пераклады: (1911—1917). Мн., 1973. Т. 4. Вершы; Пераклады: (1918—1942). Мн., 1974. Т. 5. Паэмы; Пераклады. Мн., 1974. Т. 6. Драматычныя творы; Паэмы; П'есы. Мн., 1975. Т. 7. Пераклады п'ес; Публіцыстыка; Пісьмы; Летапіс жыцця і творчасці. Мн., 1976.

Выбр. тв. Мн., 1935. (Школьн. серыя).

Выбр. тв.: [У 4 т.]. Мн., 1935—40. Т. 1. 1905—1916: Вершы. Мн., 1935. Т. 2. 1905—1916: Паэмы і апавяданні вершамі. Мн., 1936. Т. 3. Вершы і паэмы савецкага перыяду. Мн., 1937. Т. 4 [Пад назв. Збор твораў. Т. 4]. 1905—1912: Вершы. Мн., 1940.

Выбр. тв. Мн., 1946. Рэц.: Новыя кнігі // Сав. селянін. 1946. 28 ліп.

Выбр. тв. Мн., 1947. Рэц.: Климкович М. Бессмертное слово поэта // Сов. Бел. 1948. 28 июля.

Выбр. вершы. Мн., 1948. (Б-ка школьніка).

Выбр. тв. Мн., 1952. Рэц.: Карпачоў М. Аднатомнік твораў Янкі Купалы // Гомел. праўда. 1953. 25 студз.

Выбр. лірыка. Мн., 1967.

Вершы. Мн., 1970. (Б-ка бел. паэзіі).

Выбранае. Мн., 1980. Рэц.: Багдановіч І. Вышыня купалаўскага сонца // ЛіМ. 1980. 21 ліст.

Выйдзі з сэрцам, як з паходняй!..: Выбранае. Мн., 1982. (Паэтыч. б-ка). Рэц.: Міхайлаў А. // ЛіМ. 1983. 21 студз.

1.2.

Жалейка: [Вершы]. Пб., 1908. Рэц.: Ядвигин Ш. «Жалейка» Янки Купалы // Мин. эхо. 1908. 9 июля; J.U. [Урбан І.] Żalejka J.Kupały // Przegl. Powsz. 1910.

T. 108; L.L. Žalujkaj: Pesmi Januka Kupale // Dom in Svet. Ljubljana, 1908.

Адвечная песня: У XII праявах. Пб., 1910. Рэц.: С.Вл. [Самойла У.] Адвечная песня Янкі Купалы // Н. н. 1910. 16 вер.; Jankowski Cz. Poemat białoruski // Kurjer Warsz. 1910. 8 grud.; Pietkiewicz Z. Adwiečnaja pieśnia: J.Kupała // Prawda. 1910. Nr 39. 2 выд. Вільня, 1927.

Huślar. Pb., 1910. Рэц.: Бульба А. // Н. н. 1910. 21 кастр.

Сон на кургане: У 4-х абразох. Пб., 1912 [На вокл. 1913].

Шляхам жыцця. Пб., 1913. Рэц.: а-н-а [Навіна А.] «Шляхам жыцця» // Н. н. 1913. 26 крас.; 2 выд. Вільня, 1923. Рэц.: Н.М. // Падняты сцяг. 1923. 16 жн.; 3 выд. Вільня, 1935.

Паўлінка: Сцэны з шляхоцкага жыцця. Мн., 1918. (Зборнік сцэнічных твораў). 2 выд. Вільня, 1927.

Раскіданае гняздо: Драма ў 5 актах. Вільня, 1919. Рэц.: А-віч [Аляхновіч Ф.] // Бел. жыццё. 1919. № 1; А-ч Г. «Раскіданае гняздо» // Звезда. 1921. 16 апр.; Бядуля З. // Беларусь. 1919. 28 ліст.; Знаёмы С. // Звезда. 1921. 11 апр.

Спадчына: Вершы. Мн., 1922. Рэц.: Грыб Т. // Перавясла. 1924. № 2; Любецкі П. // Адраджэнне. 1922. Сш. 1; I.R. // Przegl. Wileński. 1924. Nr 8.

Безназоўнае: Зборнік вершаў. Мн., 1925. Рэц.: Навіна А. // Іскра. 1925. 24 чэрв.; Улідзе [Дзяржынскі У.] // Полымя. 1925. № 5. 2 выд. Мн., 1928.

Апавяданні вершам. Мн., 1926. Кн. 1, 2.

Магіла льва: Паэма. Мн., 1927.

На куццю: Абразок у 1 акце / Інсцэніроўка А.Шчансновіча. Вільня, 1928.

Адцвітанне: Вершы. Мн., 1930. (Мастацкае слова — масам).

За што: Паэмы. Мн., 1930. (Мастацкае слова — масам).

Песня-байка: Вершы. Мн., 1930. (Мастацкае слова — масам).

1918—1928: Творы. Мн., 1930.

Над ракою Арэсай: [Паэма]. Мн., 1933. Рэц.: Галавач П. // Полымя рэвалюцыі. 1933. № 11; Дунец Х. Акно ў сацыялістычную рэканструкцыю // ЛіМ. 1933. 26 ліст.; Крытыка-бібліяграфічны зборнік. Мн., 1934. С. 52—53; 2 выд. Мн., 1934. Рэц.: Літаратурны мінімум // Чырв. змена. 1935. 23 сак.; Шарахоўскі Л. «Над ракой Арэсай» Янкі Купалы // ЛіМ. 1935. 8 студз.; Палес. праўда. 1935. 28 лют.; 3 выд. Мн., 1936; 4 выд. Мн., 1937. (Школьная серыя); 5 выд. Мн., 1940. (Масавая б-ка); 6 выд. Мн., 1949; 7 выд. Мн., 1953.

Шляхам жыцця: Зб. вершаў. Вільня, 1933.

Вялікаму Сталіну: Пісьмо народаў Савецкай Беларусі. Мн., 1936 / У сааўт.

Дванаццаць песень пра нашу непераможную Чырвоную армію, пра яе тварца і натхніцеля Вялікага Сталіна, пра яе палкаводца Клімента Варашылава... Мн., 1936 / У сааўт.

Песня будаўніцтву: Вершы. Мн., 1936. Рэц.: Песня будаўніцтву // ЛіМ. 1937. 30 чэрв.

Пісьмо народаў Савецкай Беларусі правадыру працоўных вялікаму Сталіну. Мн., 1936 / У сааўт.

Прымакі: Сцэнічны жарт у адным акце. Мн., 1936.

Беларусі ардэнаноснай: Вершы. Мн., 1937. Рэц.: Броўка П. Вершы Я.Купалы // ЛіМ. 1938. 16 лют.

Вялікаму Сталіну ад беларускага народа. Мн., 1937 / У сааўт.

Паўлінка: Камедыя у 2-х актах. Мн., 1937.

Хлопчык і лётчык: Вершы. Мн., 1937.

Радзіме і правадыру: Вершы і песні аб Сталінскай канстытуцыі. Мн., 1938 / У сааўт.

Ад сэрца: Вершы. Мн., 1940.

Дванаццаць песень... Мн., 1940 / У сааўт.

Для дзяцей: Вершы. Мн., 1940. Рэц.: Варанецкі М. Карысная кніжка // ЛіМ. 1941. 11 студз.; Шведзік Г. Новыя кнігі // Піянер Бел. 1941. 26 студз.

Курган: Паэмы. Мн., 1940.

Паэмы. Мн., 1940. Рэц.: «Паэмы» Янкі Купалы // Палес. праўда. 1940. 11 снеж.

Народ-мститель. М., 1941. (Б-ка красноармейца).

Беларускім партызанам: [Артыкул і вершы]. [Б.м.], 1942.

Беларускія сыны: Вершы. Казань, 1942.

Творы: Вершы. М.; Л., 1942.

Узнімайся, народзе мой, на вялікую расплату! Зварот да беларускага народа. [Б.м.], 1942. (Выд. Аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б).

Арлянятам: Вершы для дзяцей. Мн., 1945.

Алеся. М.; Л., 1946. (Школьная б-ка).

Вершы. Мн., 1947.

Вершы і паэмы. Мн., 1948. Рэц.: Шарахоўскі Я. Паэмы Янкі Купалы // ЛіМ. 1948. 26 чэрв.

Славуты домік. Мн., 1948. (Першая б-чка школьніка).

Паэмы. Мн., 1949. Рэц.: Новыя кнігі // Віцеб. рабочы. 1950. 30 ліп.

Драматычныя творы. Мн., 1952.

Песні і думы: Вершы аб У.І.Леніне. Мн., 1952.

На нашым полі: [Вершы]. Мн., 1953. Рэц.: Новыя кнігі // Калг. праўда. 1953. 25 крас.

Хлопчык і лётчык; Алеся: [Вершы]. Мн., 1953.

Паўлінка: Камедыя. Беласток, 1956.

Паэмы. Мн., 1957.

Паэмы, драматычныя творы. Мн., 1957.

Вершы; Паэмы. Мн., 1958.

Вершы і паэмы. Мн., 1958. Рэц.: Скрыган Я. Выбраны том Янкі Купалы // Полымя. 1959. № 4.

Мой край: Вершы. Мн., 1958. (Школьная б-ка).

Прымакі: Сцэнічны жарт у адным акце. Беласток, 1958.

Драматычныя творы: Адвечная песня; Сон на кургане; Паўлінка; Раскіданае гняздо. Мн., 1961.

Курган; Бандароўна; Магіла льва: [Паэмы]. Мн., 1962.

Паўлінка: Камедыя ў 2-х актах. Беласток, 1965.

Вершы. Паэмы. Мн., 1966. (Школьная б-ка).

Курган. Паэма. Мн., 1967 / Бел., рус., укр.

Паўлінка; Раскіданае гняздо. Мн., 1967. (Школьная б-ка).

Паўлінка. Камедыя ў 2-х актах. Мн., 1969. (Б-ка бел. драматургіі).

Алеся; Хлопчык і лётчык: Вершы. Мн., 1970.

Паэмы. Мн., 1971. (Школьная б-ка).

Вершы. Мн., 1972.

Вечарынка: Гумар і сатыра: Вершы. Мн., 1972. (Б-ка «Вожыка»).

Курган; Бандароўна; Магіла льва: Паэмы. Мн., 1972.

Публіцыстыка. Мн., 1972.

Раскіданае гняздо: [Драма ў 5-ці актах]. Мн., 1973. (Б-ка бел. драматургіі).

Тарасова доля: Паэма. Мн., 1975 / Бел., рус., укр.

Драматычныя творы. Мн., 1978. (Школьная б-ка).

Паэмы. Мн., 1978.

Паэмы. Мн., 1979. (Школьная б-ка).

Яна і я: Паэма. Мн., 1979.

Адвечная песня: Драматычная паэма. Мн., 1981.

Алеся: Вершы. Мн., 1981. (Мая першая кніжка).

Лірыка. Мн., 1981. (Школьная б-ка).

Вершы. Мн., 1982. Рэц.: Дромін А. // ЛіМ. 1983. 7 студз.

Вершы і паэмы. Мн., 1982.

Жалейка. Мн., 1982. Факс. выд.: Пб., 1908. Рэц.: Васюковіч Л., Мароз В. Даследуецца мова песняроў // ЛіМ. 1982. 23 крас.

Вершы. Мн., 1987.

Курган: Паэма. Мн., 1987.

Сыны: Вершы. Мн., 1987. (Працу кожную шануй).

Спадчына: Вершы і паэмы. Мн., 1988. (Школьная б-ка).

Арлянятам: Вершы. Мн., 1989.

Паэмы; Драматычныя творы. Мн., 1989.

Хлопчык і лётчык: Вершы. Мн., 1990. (Мая першая кніжка).

Мой край: Вершы. Мн., 1991. (Залаты ключык).

П'есы, пераклады. Мн., 1992.

Спадчына: Вершы. Мн., 1992. Факс. выд.: Мн., 1922. 1.3.

1903. Modlitwa: [Верш] // Ziarno. Nr 13 / Пад крыпт. I.L. Аўт. спрэчнае.

1905. Мужык! [Верш] // Сев.-Зап. край. 15 мая.
1906. Гурка і Лідвалі: [Верш] // Н.н. 8 снеж. / Пад. крыпт. Я.К. Аўт. спрэчнае.
1907. [Допіс] // Н.н. 13 крас. / Пад. крыпт. І.К.; Касцу: [Верш] // Там жа. 11 мая / Пад. псеўд. Янук Купала; Лета; Ці ж гэта многа?..: [Вершы] // Там жа. 6 ліп. / Пад псеўд. Янук Купала; [Допіс] / Пад крыпт. І.Л.; З песень беззямельнага / Пад псеўд. Янук Купала: [Верш] // Там жа. 20 ліп.; Старыя праўды на новы лад / Пад псеўд. Янук з-пад Мінска; Непагода / Пад псеўд. Янук Купала: [Верш] // Там жа. 3 жн.; Хто к лесу, а хто к бесу: Жарт / Пад псеўд. Янук з-пад Мінска; Вучыся!... / Пад псеўд. Янук Купала: [Верш] // Там жа. 17 жн.; З песень аб мужыцкай долі: [Верш] // Там жа. 31 жн. / Пад псеўд. Янук Купала; Старая песня на новы лад: [Верш] // Там жа. 14 вер. / Пад псеўд. Янук Купала; Аб усім патроху / Пад крыпт. К.; Нашто? / Пад псеўд. Янук Купала: [Верш] // Там жа. 28 вер.; Чары: [Верш] // Там жа. 12 кастр. / Пад псеўд. Янук Купала; Прышла восень...: [Верш] // Там жа. 26 кастр. / Пад псеўд. Янук Купала.
1908. Што ты спіш?: (Пабудка); Там: [Вершы] // Святіцький І. Відроджене білоруського письменства. Львів / Пад псеўд. Марка Бяздольны; «Чаго хмурыцца неба сіняе?..»: [Верш] // Н. н. 4 студз. / Пад псеўд. Янук Купала; «За праўду, за шчасце, за лепшую долю...»: [Верш] // Там жа. 15 лют. / Пад псеўд. Янук Купала; З песень беззямельнага: [Верш] // Там жа. 14 сак. / Пад псеўд. Янук Купала; Аратаму; «За пасвяшчэнне, вершык харошы...»: [Вершы] // Там жа. 25 крас. / Пад псеўд. Янук Купала; Асёл і навука: [Байка] / Пад крыпт. И.Л.; Песня / Пад псеўд. Янук Купала: [Верш] // Там жа. 9 мая; Ворагам беларушчыны: [Верш] // Там жа. 6 чэрв. / Пад псеўд. Янук Купала; Касцам: [Верш] // Там жа. 20 чэрв. / Пад псеўд. Янук Купала; К моладасці; На сенажаці: [Вершы] // Там жа. 4 ліп. / Пад псеўд. Янук Купала; Развейся, туман: [Верш] // Там жа. 18 ліп. / Пад псеўд. Янук Купала; Сват: (Апавяданне старога дзецюка) / Пад крыпт. І.Л.; Хмары і думы; З песень жыцця / Пад псеўд. Янук Купала: [Вершы] // Там жа. 1 жн.; Лявон: (Песня-казка) / Пад крыпт. І.Л.; Як выйду за хату... / Пад псеўд. Янук Купала: [Верш] // Там жа. 15 жн.; «Як не выйдуць чорнасотнікі...» / Пад псеўд. Левы; Дзе вы? / Пад псеўд. Янук Купала: [Вершы] // Там жа. 28 жн.; Страх / Пад псеўд. Вайдэльота; «Не пужайся, што здрадныя хмары...» / Пад псеўд. Янук Купала: [Вершы] // Там жа. 11 вер.; Бор: [Верш] // Там жа. 25 вер. / Пад псеўд. Янук Купала; Гарадок [Допіс] // Там жа. 23 кастр. / Пад крыпт. К.; Ужо днее...: [Верш] // Там жа. 7 ліст.; Белавежская пушча / Пад крыпт. І.Л.; З песень беззямельнага / Пад псеўд. Янук Купала: [Верш] // Там жа. 20 ліст.; Зіма: [Верш] // Там жа. 4 снеж. / Пад псеўд. Янук Купала; У Піліпаўку: Паэма // Там жа. 18 снеж. / Пад псеўд. Янук Купала.
1909. Навагоднія жаданні: [Верш] // Н.н. 1 студз.; За што?: Паэма («Ой мае вы песні...») // Там жа. 15 студз.; Вучыцелям людскім: [Верш] // Там жа. 20 лют.; Думкі хлебароба на прадвесні: [Верш] // Там жа. 27 лют.; Памяці Шаўчэнкі: [Верш] // Там жа. 12 сак.; Два мужыкі і глушэц: Байка // Там жа. 19 сак.; Вялікдзень: [Верш] // Там жа. 26 сак.; Паводка: [Верш] // Там жа. 9 крас. / Усе пад псеўд. Янук Купала; З Беларусі і Літвы // Там жа. 16 крас. / Пад псеўд. Здарэнец; З песень беззямельнага: (З вясной): [Верш] // Там жа. 23 крас.; Да дзяўчынкі: [Верш] // Там жа. 14 мая; Песня-байка // Там жа. 21 мая; У шынку: [Верш] // Там жа. 4 чэрв.; «Не ўздыхай, не бядуй, брат замучаны мой!..»: [Верш] // Там жа. 11 чэрв.; Песняру-беларусу: [Верш] // Там жа. 18 чэрв.; Заклятая кветка: [Верш] // Там жа. 25 чэрв.; Забытая скрыпка: [Верш] // Там жа. 23 ліп.; Зажынкі: [Верш] // Там жа. 6 жн.; Ігнат і п'яўкі: Байка // Там жа. 13 жн.; «Зоркі не ўбачыш і мгла непрыхільная...»: [Верш] // Там жа. 10 вер.; Явар: [Верш] // Там жа. 1 кастр.; «Як я полем іду, гнецца колас ка мне...»: [Верш] // Там жа. 8 кастр.; Адцвітанне: [Верш] // Там жа. 29 кастр.; З мінуўшых дзён: «Нашай ніве» ў дзень яе трохлетняй гадаўшчыны: [Верш] // Там жа. 12 ліст. / Усе пад псеўд. Янук Купала; Памяці Т.Шаўчэнкі // Свабода (Нью-Йорк). 15 квіт.
1910. Песня званара: [Верш] // Першы беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1910 г. Вільня; Мой дом: [Верш] // Н. н. 17 чэрв.; На купалле: [Верш] // Там жа. 24 чэрв.; Песня сонцу: [Верш] // Там жа. 1 ліп.; Мая дзяўчынка: [Верш] // Там жа. 8 ліп.; З Фінляндыі / Пад крыпт. Я.К.; Жніво: [Верш] // Там жа. 15 ліп.; З Фінляндыі / Пад крыпт. Я. К-а; Над Іматрай: [Верш] // Там жа. 22 ліп.; Брату ў чужыне: [Верш] // Там жа. 5 жн.; Я ад вас далёка...: [Верш] // Там жа. 12 жн.; Воўк: [Верш] // Там жа. 19 жн.; Мая думка (Ахвярую Канстанцыі Буйло): [Верш] // Там жа. 2 вер.; Ноч за ночкай...: [Верш] // Там жа. 9 вер.; Дудар (Аўтару «Беларускай гісторыі» Власту): [Верш] // Там жа. 30 вер.; Памяці Марыі Канапніцкай: [Верш] // Там жа. 7 кастр.; Мой край: [Верш] // Там жа. 5 ліст.; Сельскія могілкі: [Верш] // Там жа. 11 ліст.; Памяці Вінцука Марцынкевіча: [Верш] // Там жа. 25 ліст.; Роднае слова: Рэдакцыі, супрацоўнікам, чытачам і прыхільнікам «Нашай Нівы»: [Верш] // Там жа. 16 снеж.; Сэрца спытай...: [Верш] // Там жа. 23 снеж.
1911. Явар і Каліна: [Верш] // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1911 год. Вільня; Ваўкалак: [Верш] // Н. н. 6 студз.; Гэй, капайце, далакопы...: [Верш] // Там жа. 27 студз.; Зіма: [Верш] // Там жа. 10 лют.; [Допіс аб вечарынцы ў Пецербурзе 15 лютага 1911 г. з вершам «Важна рэй Ігнат Буйніцкі»] // Там жа. 24 лют.; Рэчка: [Верш] // Там жа. 10 сак.; З нашага жыцця / Пад псеўд. Стары Мінчук / Аўт. спрэчнае; З песень аб вясне: [Верш] // Там жа. 24 сак.; Сад: [Верш] // Там жа. 12 мая; Сёмуха: [Верш]; З нашага жыцця: Аб мове у касцёле / Пад псеўд. Стары Мінчук. Аўт. спрэчнае // Там жа. 26 мая; Дуб: [Верш] // Там жа. 9 чэрв.; Як у лесе зацвіталі: [Верш] // Там жа. 16 чэрв.; У купальскую ноч: [Верш] // Там жа. 1 ліп.; З летніх малюнкаў: [Верш] // Там жа. 21 ліп.; З гуты «Залессе»: (Ад свайго карэспандэнта) / Пад псеўд. Ня-Гутнік; Над ракою ў спакою: [Верш] // Там жа. 11 жн.; З нашага жыцця // Там жа. 18 жн. / Пад псеўд. Стары Мінчук. Аўт. спрэчнае; Летняя раса: [Верш] // Там жа. 1 вер.; Чатыры крыжы: [Верш] // Там жа. 22 вер.; Ты прыдзі: [Верш] // Там жа. 29 вер.; З недацветаў: (Таварышу К.С.Л-э): [Верш] // Там жа. 10 ліст.; «Не загаснуць зоркі ў небе...: («Нашай Ніве» са шчырым прыветам...): [Верш] // Там жа. 1 снеж.; Не праспі...: [Верш] // Там жа. 8 снеж.; На куццю: [Паэма] // Там жа. 22 снеж.; К кровавому навету на евреев // Речь. 13 дек. / У сааўт.; «Важна рэй Ігнат Буйніцкі...»: [Верш] // Litwa. № 8.
1912. «Як ідзе Новы год, на ўсім свеце народ...»; Жніво: [Вершы] // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1912 год. Вільня; Памяці Шаўчэнкі; Памяці Т.Шаўчэнкі: [Вершы] // Вінок Т.Шевченкові із віршів українських, галицьких, російських, білоруських і польських поетів. Одеса; Курган: Паэма // Зборнік «Нашай нівы». Вільня. № 2; Н. н. 21 чэрв.; Сон на кургане: (Драматычная паэма ў 4-х абразах) // Маладая Бел. Сер. 1. Сш. 1; Каб я князем быў уладарным...: [Верш] // Н. н. 5 студз.; На рынку: [Верш] // Там жа. 26 студз.; З нашага жыцця: Як вучыць рэлігіі // Там жа. 15 сак. / Пад псеўд. Стары Мінчук; На жалейцы: [Верш] // Там жа. 22 сак.; «Бледныя буднія дні...»: [Верш] // Там жа. 5 крас.; Ты, зялёная дубрава: [Верш] // Там жа. 3 мая; Выйдзі...: [Верш] // Там жа. 10 мая; Гэй наперад: [Верш] // Там жа. 14 чэрв.; Святкаванне Купалы ў Вільне // Там жа. 28 чэрв.; Русалка: [Верш] // Там жа. 9 жн.; Мая малітва: [Верш] // Там жа. 20 вер.; З цыклу «Казкі бацькаўшчыны»: Пад крыжам: [Верш] // Там жа. 2 ліст.; Чужым: [Верш] // Там жа. 9 ліст.; На дзяды: [Верш] // Там жа. 29 ліст.; Прарок: [Верш] // Там жа. 21 снеж.; «Лірнік вясковы»: Памяці Ул.Сыракомлі: [Верш] // Litwa i Ruś. T. 3. Z. 2.
1913. Чатыры крыжы: [Верш] // Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1913 г. Вільня; Прарок: [Верш]

// Белорусский научно-литературный кружок студентов С.-Петербургского университета. СПб.; Песня і народ: (Трохі казка); Дзе не кінь — так клін: [Верш] / Пад крыпт. К-а // Калядная пісанка. Вільня; З кутка жаданняў: [Верш] // Н. н. 15 лют.; Калі пачнуць...: [Верш] // Там жа. 15 сак.; Для зямлі прадзедаў маіх...: [Верш] // Там жа. 12 крас.; Ня шукай...: [Верш] // Там жа. 5 ліп.; Навука: [Верш] // Там жа. 12 ліп.; Бандароўна: (З народнай песні): [Паэма] // Там жа. 19 ліп.; Чаму плача песня наша? (Адказ Юрцы Верашчаку) / Пад псеўд. Адзін з «парнаснікаў»; Жар не згас: [Верш] // Там жа. 26 ліп.; Брату-беларусу: [Верш] // Там жа. 28 вер.; Песня: (З народнай) // Там жа. 17 кастр.; Чым чорт не шуціць: Маленькі фельетон; У мутным віры («Прачытаўшы ў газеце...»): [Верш] // Там жа. 24 кастр. / Пад крыпт. К-а; У мутным віры: («Кожны ведае ў Расеі...») / Пад крыпт. К-а; Асеннім вечарам: [Верш] // Там жа. 31 кастр.; У мутным віры: («Неяк стрэўшыся наўмысне...»): [Верш] // Там жа. 7 ліст. / Пад крыпт. К-а; У мутным віры: («Заспрачаўся кажух з ватай...»): [Верш] // Там жа. 21 ліст. / Пад крыпт. К-а; У мутным віры: («Селі ў Думу думаць думу...») / Пад крыпт. К-а; Агляд кніг / Пад крыпт. І.Л.; Стогне ліха: [Вершы] // Там жа. 12 снеж.; У мутным віры: («Стаў даводзіць селяніну...»): [Верш]; Шарада № 1: (З наградай) // Там жа. 21 снеж. / Пад крыпт. К-а.

1914. Роднае слова; Шчасце: [Вершы] // Апавяданні і легенды розных аўтараў. Вільня; На Новы Год; Бот і лапаць; Шчасце; Чары; «Святая праўда»; Чужым: [Вершы] // Беларускі каляндар на 1914 год. Вільня; Дзе не кінь — усё клін: [Верш] // Беларускі каляндар на 1915 год. Вільня / Пад крыпт. К-а; Валачобнікі // Велікодная пісанка. Вільня; Песні вайны: I. Варожбы; II. Перад бурай; III. Склік; IV. Разлука; V. Асталіся нівы, сёлы: [Вершы] // Дзень штукарства. Вільня; Н. н. 2, 9, 23 кастр., 6 ліст., 25 снеж.; Моладзі: [Верш] // Лучынка. № 2; Страшны вір: [Верш] // Там жа. № 3; З вясной: [Верш] // Там жа. № 4; Запела вясна сваю песню: [Верш] // Там жа. № 5; У мутным віры: («Пад гарою ў селяніна...»): [Верш] // Н. н. 4 студз. / Пад крыпт. К-а; У мутным віры: («Гругган, сустрэўшы салаўя...»): [Верш]; Шарада № 2 // Там жа. 17 студз. / Пад крыпт. К-а; У мутным віры («Асёл, убачыўшы ў вадзе...»): [Верш] / Пад крыпт. К-а; Песня: (З народных матываў) // Там жа. 31 студз.; У мутным віры: («Свінапас, злавіўшы здрадна...»): [Верш] // Там жа. 13 лют. / Пад крыпт. К-а; На шляху: [Верш] // Там жа. 27 лют.; Шарада № 3 / Пад крыпт. К-а; Праявы: [Верш] // Там жа. 7 сак.; Шарада № 4 / Пад крыпт. К-а; З вячэрніх дум: [Верш] // Там жа. 3 крас.; Ці маем мы права выракацца роднай мовы? // Там жа. 17 крас. / Пад крыпт. І.Л.; Б'юць трывогу званы: [Верш] // Там жа. 25 крас.; Адступнік: [Верш] // Там жа. 8 мая; Уладыслаў сын Ігната Эпімах-Шыпіла: (Пасмертны ўспамін) / Пад крыпт. К-а; Светлай памяці Уладыслава Эпімах-Шыпіла: [Верш] // Там жа. 16 мая; А ўсё ж такі мы жывём!.. // Там жа. 6 чэрв. / Пад крыпт. І.Л.; Вера і нацыянальнасць / Пад крыпт. І.Л.; Летам: [Верш] // Там жа. 10 ліп.; Хай рунь красуе... // Там жа. 4 вер. / Пад крыпт. Я.К-а; Вайна і самапомач // Там жа. 25 вер. / Пад крыпт. К-а; Вайна і налогі // Там жа. 9 кастр. / Пад крыпт. І.Л.; Чвэрць года вайны // Там жа. 23 кастр. / Пад крыпт. К-а; 1914-ты: [Верш] // Там жа. 25 снеж.; Сын беларуса. 1 жн.

1915. «Маё цярпенне, мой крывавы боль...»: [Верш] // Н. н. 16 студз.; Успомні... (Прысвячаю Ул.Станкевічанцы): [Верш] // Там жа. 23 студз.; Таварыш мой...: [Верш] // Там жа. 31 студз.; Залёты. Аперэтка Вінцука Дуніна-Марцынкевіча / Пад крыпт. К-а; Быў гэта сон...: [Верш] // Там жа. 6 лют.; Вечар: [Верш] // Там жа. 21 лют.; На вуліцы: [Верш] // Там жа. 27 лют.; Сярод магіл: [Верш] // Там жа. 14 сак.; На суд: Пасвячаю лжэязычнікам: [Верш] // Там жа. 2 крас.; Чаму...; Бацькаўшчына: [Вершы] // Там жа. 24 крас.; Вясна 1915-я: [Верш] // Там жа. 12 чэрв.; Мусіць, трэба было!..: [Верш] // Там жа. 19 чэрв.; Смейся!: [Верш] // Там жа. 2 ліп.; А яна..: [Верш] // Там жа. 17 ліп.; «Гэй, ты дзяўчына, кветка-ліпея...»: Ул.Станкавічанцы: [Верш] // Там жа. 7 жн.

1916. Курган: Паэма // Беларускі каляндар на 1916 г. Вільня, [1916]; Сваякам па гутарцы; Гэй, наперад!: [Верш] // Беларускі каляндар на 1917 год. Вільня; «Пассякайце тое дрэва»: [Верш] // Гоман. 17 ліст.

1917. Сваякам па гутарцэ; Гэй, наперад: [Вершы] // Беларускі каляндар на 1917 год. Вільня; А хто там ідзе?: [Верш] // Бел. рада. 3 дек.; Вялікдзень: [Верш] // Гоман. 10 крас.; На Купалле: [Верш] // Там жа. 22 чэрв.

1918. З песняў аб няволі; Мая вера; У вечным боры; Паўлюк: [Вершы] // Зажынкі. М.; Паўлінка: Сцэны з шляхоцкага жыцця // Зборнік сцэнічных твораў. Сшытак першы. Мн.; Вольная Бел. № 3; Забраны край: Як цені; Крыўда; З дня ў дзень...; З думак жабрака; Матуля: [Вершы] // Чырв. шлях. № 7—8.

